Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
Гістарычны факультэт
Кафедра ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі

Рэг.№ УМК(УМК)26-2-16/2023

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_____________В.А. Йоцюс
«5» 10 2023 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
_____________С.П. Шупляк
«5» 10 2023 г.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ « ЭТНАЛОГІЯ БЕЛАРУСІ»

для спецыяльнасці
6-05-0113- 01 Гістарычная адукацыя

Складальнік:
Д.У.Дубінін, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета факультэта 5 октября 2023 г., пратакол № 1.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
Гістарычны факультэт
Кафедра ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі

Рэг.№____________

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
____________В.А. Йоцюс
« » 2023 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
____________С.П. Шупляк
« » 2023 г.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «ЭТНАЛОГІЯ БЕЛАРУСІ»

для спецыяльнасці
6-05-0113- 01 Гістарычная адукацыя

Складальнік:
Д.У.Дубінін, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета факультэта ___ __________2023 г., пратакол № ___.

# Змест


ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ............ 3

ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ............ 5

ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ............ 138

РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ............ 162

ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ............ 185

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Электронны вучэбна-метадычны комплекс «Этналогія Беларусі» складзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі, зацверджанага Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 08.11.2022 № 427.

ЭВМК прызначаны для выкарыстання выкладчыкамі, студэнтамі дзённай і завочнай формаў атрымання адукацыі гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» па спецыяльнасці 6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя.

Распрацоўка ЭВМК абгрунтавана неабходнасцю вывучэння этналогіі і гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі як аднаго з найважнейшых сродкаў адукацыі і выхавання асобы. Вывучэнне этналогіі Беларусі станоўча ўплывае на павышэнне якасці гістарычнай адукацыі, садзейнічае грамадзянска-патрыятычнаму, эстэтычнаму, экалагічнаму і фізічнаму выхаванню студэнтаў, усебаковаму развіццю іх здольнасцей, фарміраванню практычных навыкаў і ўменняў праводзіць самастойныя навуковыя даследаванні.

ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне «Этналогія Беларусі» распрацаваны з мэтай павышэння ўзроўню прафесійных кампетэнцый студэнтаў і ўяўляе сабой дыдактычны інструментарый навучання па дысцыпліне «Этналогія Беларусі».

Мэта ЭВМК складаецца ў забеспячэнні і суправаджэнні адукацыйнага працэсу па дысцыпліне «Этналогія Беларусі» ў адзінстве з мэтамі, задачамі і зместам вучэбнай праграмы, а менавіта:

- авалоданні студэнтамі ведамі аб этнаграфічнай спадчыне Беларусі, метадах яе зберажэння і выкарыстання;
- падрыхтоўцы будучых настаўнікаў да самастойнай этнаграфічнай работы, да выкарыстання яе як важнага сродку адукацыйнага працэсу, знаёмства з гісторыка-культурнай спадчынай Беларусі;
- патрыятычным выхаванні студэнтаў, фарміраванні ў іх беражлівых адносін да этнаграфічных каштоўнасцяў.

Задачы ЭВМК:

садзейнічаць авалоданню студэнтамі markers рознабаковымі кампетэнцыямі па этнаграфіі і культуры беларускага краю на аснове пісьмовых, вусных і рэчавых крыніц;

спрыяць фарміраванню навыкаў самастойнай працы студэнтаў;

спрыяць выхаванню духоўнасці, грамадзянскасці, патрыятызму.

У выніку выкарыстання матэрыялаў ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне «Этналогія Беларусі» студэнты павінны ведаць:

гісторыю этналагічнага вывучэння Беларусі;

этнаграфічную спадчыну, геаграфію і тапаніміку Рэспублікі Беларусь;

асноўныя метады комплексных даследаванняў у этналогіі.

У працэсе вырашэння пастаўленых задач ў студэнтаў фарміруюцца ўменні выяўлення, фіксацыі і апісання этнаграфічных помнікаў; арганізацыі школьнага этнаграфічнага міні-музея; выкарыстання дадзеных этналогіі ў вучэбнай і пазакласнай рабоце.

ЭВМК ўключае матэрыялы для аптымізацыі вучэбнай дзейнасці студэнтаў як для аўдыторных (лекцыйных, семінарскіх і практычных) заняткаў, так і іх самастойнай працы.

ЭВМК ўключае раздзелы: тэарэтычны; практычны; кантролю ведаў; дапаможны.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны вучэбнам планам адводзіцца ўсяго 100 гадзін, 48 гадзіны – аўдыторныя заняткі: 20 гадзін – лекцыі, 8 гадзін – практычныя заняткі, 20 гадзін – семінарскія заняткі, экзамен у першым семестры. На кіруемую самастойную работу па вучэбнай дысцыпліне адводзіцца 4 гадзіны, з іх 4 гадзіны – лекцыі. Самастойная (пазааўдыторная) работа – 52 гадзіны. У ходзе выканання самастойнай работы студэнты вывучаюць асноўную і дадатковую літаратуру, ажыццяўляюць падрыхтоўку да практычных і семінарскіх заняткаў, экзамену.

На завочнай форме атрымання адукацыі на вывучэнне дысцыпліны вучэбнам планам адводзіцца усяго 100 гадзін, з іх 12 – аўдыторных гадзін (4 гадзіны – лекцыі, 8  гадзін – семінарскія заняткі).

Вучэбная дысцыпліна «Этналогія Беларусі» вывучаецца студэнтамі дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі ў 1 семестры на 1 курсе. Прамежкавая форма атэстацыі ведаў і кампетэнцый – экзамен.

## ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

**Тэараэтычны матэрыял да лекцый па вучэбнай дысцыпліне «Этналогія Беларусі»**

**Тэараэтычны матэрыял да лекцыі №1.**
**Уводзіны ў курс «Этналогія Беларусі» -2 гадзіны**

1. Прадмет і задачы этналогіі.
2. Паняцці “быт”, “культура”, “этнас”, “этнічная тэрыторыя”. Іх адзнакі.
3. Метады і асноўныя праблемы этналагічных даследаванняў. Этнаграфічныя веды як фактар нацыянальнай свядомасці і жыццяздольнасці беларускага народа.
4. Віды крыніц этналогіі. Архіўныя і музейныя зборы.
5. Класіфікацыя народаў свету (геаграфічная, антрапалагічная, моўная, гаспадарча-культурная).
6. Фарміраванне этнаграфіі як самастойнай навукі ў сярэдзіне XIX ст. Эвалюцыйны кірунак. Л. Г. Морган. Дыфузіяніскі кірунак. Ф. Грэбнеў. Псіхалагічная канцэпцыя ў этнаграфіі. Рэлятывізм. Неаэвалюцыяністы.

Этнало́гія(грэч.: ἔθνος, племя, народ + -логас - вучэнне, навука) — навука, якая вывучае працэсы паходжання, рассяленне, побыту і культуры этнасаў (народаў). Станаўленне этналогіі як навукі ў 2-й палове XIX ст. звязана з эвалюцыйнай школай (Э. Тайлар, Л. Г. Морган і інш.), што зыходзіла з ідэі адзінства культуры чалавецтва.

З канца XIX ст. этналогія даследуе рэгіянальныя культуры і іх узаемаўплыў. Развіццё тэарэтычнай этналогіі ў XX ст. звязана з канцэпцыямі Э. Дзюркгейма, З. Фрэйда, Л. Леві-Бруля, Б. Маліноўскага, А. Радкліф-Браўна, К. Леві-Строса і іншых.

У Беларусі этналогія развіваецца ад пачатку XIX ст. і на працягу доўгага перыяду аб'ектам яе вывучэння была духоўная культура беларускага этнасу - песні, паданні, вераванні, абрады. З 1880 - 1890-х г. галоўным у беларускай этналогіі стаў эвалюцыйны кірунак, прадстаўнікі якога (У. М. Дабравольскі, М. В. Доўнар-Запольскі, Я. Ф. Карскі, М. Я. Нікіфароўскі, Е. Р. Разанаў, І. А. Сербаў, А. К. Сержпутоўскі) разам з духоўнай і матэрыяльнай культурай народа, распрацоўвалі канцэпцыю гістарычнай асаблівасці і самастойнасці беларусаў як этнічнай супольнасці.

У сучасны перыяд вучоныя-этнолагі Беларусі даследуюць праблемы этнагенезу, этнічнай гісторыі беларусаў, разнастайнасць шматвяковых традыцый беларускага народа, ролю і месца беларускага этнасу ў еўрапейскай цывілізацыі. Паралельна вядзецца вывучэнне і іншых нацыянальнасцей, якія насяляюць тэрыторыю Беларусі (татарскай, польскай, яўрэйскай), этнічных супольнасцей іншых краін

У залежнасці ад розных падыходаў прадметам этналогіі з’яўляюцца :
- агульныя законы сацыяльнага і культурнага развіцця чалавека,

- розныя тыпы культур і шляхі іх пераўтварэння,
- прымітыўныя і традыцыйныя грамадскія сістэмы,
- дынаміка культуры,
- культура першабытных традыцыйных і сучасных грамадстваў

Такім чынам у агульным выглядзе прадметам этналогіі з'яўляецца этнас і этнічныя працэсы. Яны тлумачаць, што знешне адбываецца з этнасамі. Навукоўцы выдзяляюць наступныя тыпы этнічных працэсаў:

- эвалюцыйныя – выражаюцца ў змяненні кожнага элемента этнаса, перш за ўсё мовы і культуры;
- трансфармацыйныя – такія змены элементаў, якія вядуць да перамены этнічнай прыналежнасці;

Этналогія вывучае матэрыяльную (пасяленні і пабудовы, адзенне і ежу, прылады працы) і духоўную культуру (рэлігія, народны эпас, фальклор, мастацтва і г.д.)народа. Асабліва дасканала вывучаецца быт народа, яго вобраз жыцця.

Да асноўныхзадач этналогіі адносяцца:

- вывучэнне этнічных традыцый;
- вывучэнне этнагенезу;
- складанне прагнозаў развіцця этнасаў.

У гэтай сувязі вельмі важна вызначаюць, што азначаюць паняцці "культура", "этнас", "этнічная тэрыторыя".

У навуковай літаратуры можна сустрэць шмат трактаванняў гэтага паняцця "этнас". Ю. В. Брамлей разглядае этнас, як «сацыяльную сукупнасць"; Л. М. Гумілёў, як «сацыяльна – біялагічныя папуляцыі»; С. А. Аруцюнаў, як «чыста чалавечую з'яву", С. І. Ожэгаў, як сукупнасць гістарычна слажыўшыхся на пэўнай тэрыторыі асаблівасцей мовы, культуры і псіхалагічнага складу; С. М. Шырокагораў, як агульнае для пэўнай групы людзей ўтварэнне, адзіная мова, комплекс звычаяў і агульны склад жыцця.

Аднак, большасць навукоўцаў у якасці асноўных характарыстык этнасу вызначаюць: асэнсаванне адзінства свайго ўтварэння зафіксаванага ў самасвядомасці (этноніме).

Этнічная культура праяўляецца літаральна ва ўсіх галінах жыцця этнаса, у выхаванні дзяцей, у адзенні, ва ўладкаванні жылля, ў хатняй гаспадарцы, у фальклоры. Па зазначэнні Ю. В. Брамлея, этнас уяўляе сабой пэўную культурную цэласнасць і культура ў шырокім значэнні гэтага слова забяспечвае ў грамадстве этнічную пераемнасць. Менавіта ў сферы культуры звычайна знаходзяцца асноўныя вызначальныя прыкметы этнасаў.

Вызначаючы культуру, як свод матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей народа, неабходна вызначыць і разглядзець паняцці «матэрыяльная культура» и «духоўная культура» народа.

Традыцыйная *матэрыяльная культура* – гэта прадметны свет, абумоўлены бытам, гаспадарчым укладам, геаграфічнымі ўмовамі і этнакультурнымі кантактамі ў пэўных гістарычных умовах на пэўным урыўке часу. Матэрыяльная культура выступае як адно з важных сродкаў выяўлення этнічнай адметнасці таго ці іншага народа.

Што да вызначэння традыцыйнай *духоўнай культуры*, то аналіз этнаграфічнай літаратуры дазваляе разглядаць яе, як: «комплекс уяўленняў і правіл, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення»; «комплекс уяўленняў пра навакольны свет і самога чалавека ў гэтым свеце (г. зн. традыцыйнае светаўспрыманне)»; «уся сістэма вытворчых навыкаў, звязаных з гаспадарчым, сацыяльным, і сямейным жыццём", розныя віды народнай творчасці (фальклор і выяўленчае мастацтва); "рэлігійныя вераванні, звычаі, абрады, народнае выхаванне, этыка паводзін і г. д.».

Этнакультура кожнага народа мае свой унікальны пласт матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, які змяшчае магутны выхаваўчы патэнцыял для развіцця і фарміравання паўнацэннай асобы.

Як ужо адзначалася, этнас, этнічная супольнасць (ад грэч. еіішоз народ) — устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі, мае агульную мову, культуру, побыт, псіхалагічныя рысы і самасвядомасць. Асноўныя гістарычныя формы этнасу — род, племя, народнасць, нацыя — характарызуюцца і пэўнымі сацыяльнаэканамічнымі асаблівасцямі. Галоўныя прыкметы этнасу мова, самасвядомасць, культура, побыт, псіхіка і інш. — змяняюцца з цягам часу не так істотна, як сацыяльна-эканамічныя адносіны, якія адпавядаюць пэўнай гістарычнай ступені развіцця. Адной з галоўных прыкмет этнасу з'яўляецца этнічная тэрыторыя — тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа. Этнічная тэрыторыя гэта не толькі сфера пражывання, але і жыццёвая аснова, што абумоўлівае спецыфіку гаспадарчых заняткаў і вытворчай культуры, жывіць канкрэтнымі вобразамі духоўныя скарбы народа, яго мову і фальклор. Мова народа з'яўляецца спецыфічным сродкам захавання і перадачы яго сацыяльнага вопыту, культурных традыцын. Праз мову рэалізуецца пераемнасць розных пакаленняў і гістарычных эпох.

Авалоданне той ці іншай навукай, у тым ліку і этналогіяй, магчыма з дапамогай агульных метадаў. Да іх адносяцца:

- канкрэтна-індуктыўны (эмпірычны), з дапамогай якога, да фармуліроўкі асноўных катэгорый навукі і да пастаноўкі яе агульных праблем можна даходзіць, зыходзячы з эмпірычных назіранняў прыватных фактаў, паступовага іх пашырэння і абагульнення;
- дэдуктыўна-сістэматычны (гістарыяграфічны): ад вывучэння агульных катэгорый і вызначэнняў рухацца ў бок большай іх канкрэтызацыіі.

Этналогія як навука мае і свае спецыяльныя метады даследавання.

Да іх адносяцца :

- вывучэнне пісьмовых крыніц (гісторыя народаў, уласна імі напісанная, апісанне культур розных народаў) – адзін з самых вызначальных і галоўных метадаў этналогіі;
- вывучэнне вусных паданняў (адлюстраванне гістарычнай самасвядомасці);
- археалагічныя матэрыялы;
- параўнальнае мовазнаўства;
- статыстычныя метады;

- палявыя даследаванні – гэты метад дазваляе атрымаць звесткі як аб матэрыяльнай, так і духоўнай культуры народа;
- назіранне --- а) экспедыцыя, б) стацыянарнае;
- параўнальна-гістарычны метад (выкарыстоўваецца для рэканструкціі сучасных з'яў);
- этнічная картаграфія;
- метад колькаснага аналіза (анкетаванне – пытанні пра бытавую і духоўную культуру);
- комплексны метад і іншыя.

Этналогія ўзаемадзейнічае з многімі сумежнымі і самастойнымі дысцыплінамі, перш за ўсё гістарычнымі. Яна выкарыстоўвае іх метады даследавання і распрацоўкі.

Этналогія мае свае старажытныя карані. Першыя звесткі аб падзеях, што адбыліся на тэрыторыі Беларусі. сустракаюцца ў такіх пісьмовых крыніцах Кіеўскай Русі, як: "Повесть временных лет", Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі летапісы,"Поучение" Ўладзіміра Манамаха і інш.

Найбольшую каштоўнасць у вывучэнні этналогіі прадстаўляюць беларуска-літоўскія летапісы:"Летапісец вялікіх князёў літоўскіх", Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г, "Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага", "Хроніка Быхаўца", "Баркулабаўскі летапіс", "Хроніка горада Магілёва". Шмат цікавых матэрыялаў аб вывучэнні роднага краю ўтрымлівае "Хроніка польская, жмудская і ўсёй Русі" М. Стрыйкоўскага.

Да важнейшых крыніц этналогіі ў Беларусі часоў Вялікага княства Літоўскага належаць такія закананадаўчыя матэрыялы, як "Судзебнік Казіміра 1468г", "Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588г". Яны даюць уяўленні аб грамадска-палітычных і эканамічных адносінах, аб маралі, быце, культуры і мове людзей таго часу.

З актавых матэрыялаў першаснае значэнне для краязнаўцаў мае архіў Вялікага княства Літоўскага ( "Літоўская метрыка" і Актавыя кнігі княства (1516-1831), дакументальныя матэрыялы камісіі літоўскай казны (1607-1799), Галоўнага літоўскага трыбунала ( 1615-1811) і Галоўнага літоўскага суда (1791-1831). У іх утрымліваюцца звесткі аб палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці Беларусі з XIV і да канца XVIII стагоддзя.

Каштоўнымі крыніцамі па этналогіі лічацца прывілеі ("жалаваныя граматы"), якія выдаваліся вялікімі князямі літоўскімі і каралямі Рэчы Паспалітай гарадам на самакіраванне.

Важнае значэнне пры вывучэнні этналогіі належыць розным гаспадарчым дакументам, якія складваліся ў XVI-XVIII стагоддзях. Сярод іх інвентары маёнткаў, дзе ўказаны колькасць двароў у горадзе, вёсцы, павіннасці і заняткі насельніцтва, стан рамясла і гандлю.

Вялікае значэнне для характарыстыкі эканамічнага і палітычнага развіцця гарадоў і асобных рэгіёнаў Беларусі маюць розныя гаспадарчыя дакументы і рэвізіі, пісцовыя кнігі, люстрацыі, інвентары, актавыя кнігі гарадскіх магістратаў, дакументы мытнага справаводства, матэрыялы камеральных і э анамічных дадаткаў да тапаграфічных картаў.

Сучасная этнічная карціна свету складаецца з больш чым за 200 суверэнных дзяржаў, у якіх пражывае ад 3 да 5 тыс. этнасаў і этнічных груп. У гэтай этнічнай разнастайнасці звяртае на сябе ўвагу падабенства культур народаў, якія жывуць па суседству. Гэта акалічнасць паслужыла падставай для яшчэ аднаго віду класіфікацыі народаў свету, які атрымаў назву гаспадарча-культурнай класіфікацыі .

Сучасная этнічная карціна свету пераконвае нас у тым, што існуе бясспрэчная біялагічная рэальнасць фенатыпічнай разнастайнасці людзей, г.зн. паміж людзьмі маюцца фізічныя (цялесныя) адрозненні. Звычайна яны вызначаюцца візуальна (колер скуры, рысы асобы, шкілет, тып валасоў і г.д.). Асабліва прыкметныя ў гэтым стаўленні цялесныя, або антрапалагічныя, адрозненні паміж тэрытарыяльнымі групамі людзей, якія жывуць у рознай натуральна-геаграфічнай абстаноўцы. Гэта фенатыпічная разнастайнасць адлюстроўвае перш за ўсё здольнасць любых формаў жыцця да эвалюцыі, праз механізм якой і ўзнікае разнастайнасць чалавечых тыпаў. У паўсядзённым жыцці і ў навуцы падобныя адрозненні паміж фізічнымі тыпамі людзей звычайна называюць расавымі .

Развіццё чалавечага грамадства суправаджалася пашырэннем ведаў людзей аб навакольным свеце, назапашваннем звестак аб суседніх і далёкіх народах. Так, яшчэ ў антычны час склалася гіпотэза «трохступеністага» развіцця гаспадаркі: ад збіральніцтва і палявання да жывёлагадоўлі, а затым да земляробства. Яна атрымала шырокае распаўсюджванне і аказвала ўплыў на погляды многіх навукоўцаў да канца мінулага стагоддзя.

У сярэднявеччы працягвалася назапашванне этнаграфічных назіранняў, але яны не атрымалі глыбокага тэарэтычнага асэнсавання.

Разам з тым погляды тагачасных асветнікаў і энцыклапедыстаў мелі вялікае значэнне для развіцця этнаграфічных уяўленняў, а затым і этналогіі як навукі. Самастойнайная навука этналогія складваецца на пачатку XIX стагоддзя. Магчымасць яе ўзнікнення была абгрунтавана заснавальнікамі эвалюцыянізму Ж. Б. Ламаркам, Ч. Дарвінам, якія стварылі тэорыю, паводле якой усё ў свеце развіваецца і змяняецца ад простага да складанага, прычым эвалюцыя ідзе не выпадкова, а падпарадкоўваецца пэўным, універсальным заканамернасцям, і гістарычнае развіццё азначае прагрэс.

Гэтае вучэнне было пакладзена ў аснову новай навукі пра народы-этналогіі. Выкарыстоўваючы тэарэтычныя палажэнні эвалюцыянізму, навукоўцы сталі даследаваць гісторыю першабытнага грамадства і чалавечую культуру, карыстаючыся пры гэтым параўнальна-этнаграфічным метадам.

Сярод стваральнікаў і класікаў эвалюцыйнага накіравання ў замежнай этналогіі XIX ст. варта назваць у першую чаргу А. Вастиана, І. Бахофена, Д. Т. Мак-Леннана, Эд. Тэйлара, Дж. Леббока, Л. Г. Моргана.

Аблівае месца сярод буйнейшых вучоных-эвалюцыяністаў займае Л. Г. Морган. Ён быў першым, хто зрабіў спробу стварыць перыядызацыю гісторыі першабытнага грамадства на аснове развіцця вытворчасці і культуры. Г. Морган паказаў гістарычны характар і значэнне роду як асноўны універсальнай

гістарычнай ячэйкі першабытнага грамадства. Вялікая ўвага нададзена ў яго працах эвалюцыі сям'і і шлюбу, сістэм сваяцтва.

Да канца XIX і асабліва ў пачатку XX ст. усё ў большай ступені стала разгортвацца крытыка тэарэтычных і метадычных канцэпцый эвалюцыянізму. Шмат у чым яна была справядлівай і адзначала сапраўдныя недахопы эвалюцыяністкага вучэння. Але звычайна адмаўлялася і тое найбольш каштоўнае, што было дасягнута эвалюцыяністкім вучэннем: прадстаўленне аб універсальнасцігістарычных законаў развіцця грамадства, ідэі адзінства чалавецтва і яго культуры.

У ходзе крытыкі эвалюцыяністкай тэорыі і метаду сталі ўзнікаць новыя этналагічныя вучэнні.

У канцы XIX - пачатку XX ст. усё большае распаўсюджванне атрымліваюць канцэпцыі, заснаваныя ў той ці іншай ступені на прызнанні дыфузіі як галоўнага фактару ў развіцці культуры, а этналогіі - як навукі аб культуры. Большая частка прыхільнікаў дыфузіянізма разглядала культуру ў адрыве ад яе жывога носьбіта - этнасу - як сукупнасць адзінкавых, непаўторных з'яў.

Адным з першых кірункаў, звязаных з ідэяй дыфузіі, было вучэнне, вядомае пад назвай антрапагеаграфіі. Заснавальнік гэтага вучэння Фрыдрых Ратцэль і шматлікія яго паслядоўнікі лічылі, што вызначальную ролю ў развіцці культуры і грамадства адыгрываюць дыфузія і геаграфічная асяроддзе.

Характэрнымі прадстаўнікамі дыфузіяніскай плыні былі школа «культурнай марфалогіі» Леа Фрабеніуса, школа "культурных колаў» Фрытца Грэбнера і венская каталіцкая "культурна-гістарычная»школа Вільгельма Шміта, якія атрымалі вялікае распаўсюджанне ў пачатку XX ст. Хоць і з розных пазіцый, прыхільнікі гэтых напрамкаў вялі крытыку эвалюцыянізму, выступалі супраць прынцыпу гістарызму ў этналогіі, а тым самым супраць прызнання гістарычных заканамернасцяў у развіцці этналагічных з'яў.

Л. Фрабеніус распрацаваў вучэнне аб «культурнай марфалогіі», якое разглядала развіццё культуры з пункту гледжання біялагічных заканамернасцяў. Ф. Гребнер зрабіў спробу растлумачыць развіццё культуры не гістарычнымі заканамернасцямі, а узаемадзеяннем «культурных колаў», адвольна сканструяваных ім з некаторых з'яў матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Вільгельм Шміт і яго паплечнікі, хоць і называлі сваю школу «гістарычнай», у рэчаіснасці выступалі супраць гістарызму, разумеючы гісторыю як дыфузію рэчаў, ідэй, «культурных колаў». Высновы прадстаўнікоў школы будаваліся па большай частцы на суб'ектыўных меркаваннях, што нярэдка адбівалася і на методыцыпалявых даследаванняў і дакладнасці збіранага матэрыялу. В. Шміт на працягу ўсяго жыцця беспаспяхова спрабаваў «абгрунтаваць» шэраг біблейскіх палажэнняў: ідэю адзінага бога, уяўленне пра адвечную манагамную сям'ю, пра адвечную прыватную уласнасць. У некалькі больш стрыманым і асцярожным выглядзе ідэі дыфузіянізма развіваліся ў працах вядомых этнолагаў Р. Гейне-Гельдерна, У. Рыверса і інш

Некаторыя ўяўленні, звязаныя са з'явамі дыфузіі, адыгрываюць вядомую ролю і ў сучасных этнаграфічных канцэпцыях.

**Тэараэтычны матэрыял да лекцыі № 2.**
**Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі – 2 гадзіны**

1. Першапачатковае назапашванне этнаграфічных звестак аб Беларусі.
2. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст.
3. Развіццё беларускай этнаграфіі ў канцы XIX — пачатку XX ст.
4.Уклад Я. Карскага ў беларускую этнаграфію.
5. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў савецкі час.
6. Пачатак сістэматычнага вывучэння беларускай этнаграфіі з сярэдзіны 1950-х гг.
7. Абагульняючыя працы па этналогіі другой паловы XX ст.

Першыя пісьмовыя звесткі пра Беларусь вядомы больш за 2 тыс. гадоў таму. Дакладнае апісанне старажытнага насельніцтва Беларусі – крывічоў (палачан), дрыгавічоў, радзімічаў, літву, яцвягаў і іншых можна знайсці ў летапісах, у прыватнасці "Повесть временных лет", пач. XII ст.). Летапіс расказвае пра паходжанне славян, іх рассяленне на Ўсходне-Еўрапейскай раўніне, лад жыцця, звычаі, вераванні; пра ўзаемаадносіны з суседзямі (венграмі, хазарамі, германцамі, балтамі і інш.).

У XIV – XVII стст. пад уплывам ідэй Адраджэння, этнаграфічныя звесткі пра Беларусь, адлюстраваныя ў летапісах, хроніках, суправаджаюцца навуковым аналізам. Прыкладам таму з'яўляюцца грунтоўныя і разнабаковыя звесткі пра звычаі беларусаў, іх рэлігійныя вераванні, архітэктуру, кнігадрукаванне, акрэсленыя ў выданнях Я. Ласіцкага (1534-1605), а таксама ў такіх працах, як "Хроніка Быхаўца" (1-ая пал. XVI ст.), "Баркулабаўскі летапіс" (пач. XVII ст.), "Хроніка горада Магілёва". У іх побач з запісамі гістарычных падзей даецца цікавая інфармацыя аб этнічнай геаграфіі сярэднявечча, аб ладзе жыцця, звычаях і вераваннях мясцовага насельніцтва.

Ян Ласіцкі ў працы «Пра рэлігію, ахвярапрынашэньне, вясельныя і пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў і татараў» (назва пазычаная з трактата Одэрборна) (1582г.), апісаў народнае адзенне, стравы, абрады беларусаў, архітэктуру Вільні, Полацка, беларускіх вёсак.

У гэты ж час звесткі апісальнага характару пра Беларусь з'яўляюцца ў дзённіках (дыярыушах), мемуарах фламандца Ж. дэ Ланаа, нямецкага дыпламата С. Герберштэйна, чэха Б. Танера, рускага стольніка П.А. Талстога, італьянца А. Гваньіні, сакратара пасольства «Свяшчэннай Рымскай імперыі Ё.Г. Корба, папскага нунцыя К. Рангоні, якія падарожнічалі па Беларусі ў 15-17стагоддзях.

Так, італьянец А. Гваньіні выдаў «Хроніку Еўрапейскай Сарматыі» на лацінскай (1578, 1581) і польскай (1611) мовах, у якой даў шмат звестак па гісторыі і геаграфіі Вялікага княства Літоўскага.

Першым друкаваным творам М. Стрыйкоўскага была генеалагічная паэма "Goniec cnoty", прысвечаная валадарам Польшчы і ВКЛ. Творчая спадчыны гістарыёграфа не абмежаваная толькі ягонымі прыжыццёвымі выданнямі. У першай палове XVII ст. у Любчы быў апублікаваны фрагмент з "Ганца цноты" пад назвай "Genealogia albo krotkie opisanie wielkich książątlitewskich" , ў другой палове XVIII ст. з'явілася перавыданне "Хронікі", а ў сярэдзіне XIX ст. выйшла з друку тое выданне "Хронікі" Мацея Стрыйкоўскага, да якога і сёння найчасцей звяртаюцца даследчыкі.

Каштоўнымі этналагічнымі крыніцамі гэтага часу з'яўляюцца трактат М. Літвіна «Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцян» (выдадзены ў 1615 у Базелі на лацінскай мове), «Зборнік прыказак і прымавак» (Любча, 1618), выдадзены беларускім вучоным С. Рысінскім.

Са знакамітых дзеячаў сярэднявечча, якія ўнеслі каштоўны ўклад у вывучэнне праблем этнічнай культуры, мясцовага быту і звычаевага права, варта назваць Саламона Рысінскага[1560(?)—13.11.1625] і Льва Сапегу (1557 – 1633).

Вялікую цікавасць да Беларусі, пачынаючы з канца XVIII стагоддзя, праяўлялі польскія і рускія даследчыкі. Першыя звесткі пра Беларусь руская навука атрымала ад публікацый у выніку падарожжаў акадэмікаў І. Ляпёхіна і В. Севяргіна, а таксама дзейнасці дзяржаўных устаноў, якія ажыццяўлялі генеральнае межаванне зямельнага фонду Беларусі.

Звесткі пра Беларусь канца XVIII стагоддзя даюць таксама апісанні асобных тэрытарыяльных адзінак і запісак падарожнікаў. Сярод іх трэба адзначыць "Апісанне Крычаўскага графства", складзенае ў 1786г. А. Мейерам і працу В. Севяргіна "Записки путешествия по Западным провинциям Российского государства" (1803г.)

Першай распрацаванай і апублікаванай праграмай па збору этнаграфічнага матэрыялу з'яўляецца праект праграмы(1810г.) вывучэння народнай культуры Гугу(Гуга) Калантая, які заклікаў не адрываць гісторыю чалавецтва ад геаграфічнага асяроддзя. Ён лічыў, што прадметам даследаванняў павінен быць увесь комплекс жыццядзейнасці чалавека - вытворчасць, звычаі, заканадаўства, навука, асвета і г. д.

У пачатку XIX стагоддзя Беларусь двойчы наведаў вядомы рускі вучоны П. Кепен для збору матэрыяла аб гістарычных старажытнасцях.

Значную ўвагу вывучэнню свайго краю надавала мясцовае духавенства. Так ў 1824 годзе протаірэй Грыгаровіч выдаў ў Маскве зборнік "Беларускі архіў старажытных актаў" , у прадмове да якога аўтар падкрэсліваў, што гэтыя дакументы «з'яўляюцца крыніцай да гісторыі Беларусі, царкоўнай і грамадзянскай, і ў гэтых адносінах змяшчаюць у сабе шмат вартага і цікавага».

У першай трэці XIX стагоддзя ў віленскім і пецярбургскім перыядычным друку з'явіліся першыя публікацыі апісанняў беларускіх народных абрадаў, падрыхтаваныя М. Чарноўскай, І. Шыдлоўскім, К. Фалютынскім.

Марыя Чарноўская ўпершыню выдала ў арыгінальным вымаўленні беларускія народныя песні з нотамі і навуковым каментарыем. У артыкуле"Рэшткі славянскай міфалогіі, захаваныя ў звычаях вясковага люду на

Белай Русі" (1827), яна апісала Купалле, Радаўніцу і іншыя святы, вобразы народнай міфалогіі, стравы, адзенне, сялянскі побыт беларусаў.

У 1819 г. у "Тыгодніку Віленскім" была апублікавана праца "Вясельныя абрады вясельнага люду ў Мінскай губерні, уБарысаўскім павеце, у парафіі Гаенскай, назіраныя ў 1800, 1801 і 1802 гадах, з некаторымі песнямі і іх звычайнымі нотамі", аўтарам якой лічыцца Ігнат Іосіфавіч Шыдлоўскі.

Праца Ігната Іосіфавіча Шыдлоўскага не страціла навуковай вартасці і сёння, яна ўключана ў том "Вяселле. Абрад" (1978) шматтомнагазвода беларускай народнай творчасці (БНТ).

Шэраг фальклорных твораў розных відаў і жанраў (вясельныя песні, легенды, паданні, прыказкі і інш.) апублікаваў Рамуальд Андрэевіч Падбярэскі ў часопісе "rocznikliteracki", які ён выдаваў у 1843-1846 гг.

Першым збіральнікам вусна-паэтычных твораў польскага, украінскага, беларускага і іншых славянскіх народаў даследчыкі называюць Зарыяна Даленгу-Хадакоўскага (Адама Чарноцкага). Ён ўпершыню склаў чатырохтомны “Слоўнік назваў гарадзішчаў і урочышчаў”, сярод якіх ім зарэгістравана каля 200 адзінак менавіта на тэрыторыі Беларусі.

Але з сабранага багацейшага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу З. Даленгу-Хадакоўскаму самому не ўдалося нічога апублікаваць.

Спадчына З. Даленгі-Хадакоўскага выдавалася П. Бяссонавым, А.І. Дэем, Л.А. Малаш і іншымі даследчыкамі, што цікавіліся яго дзейнасцю.

Вялікую ўвагу надавалі вывучэнню фальклору і этнаграфічных матэрылаў беларускага краю Я.Чачот, Я. Баршчэўскі

На багатым дакументальным матэрыяле Т. Нарбутам падрыхтавана «Гісторыя літоўскага народа» (т. 1—9, 1835 -- 41), ваенным тапографам М.В. Без-Карніловічам “Гістарычныя звесткі пра выдатныя мясціны на Беларусі з дадаткам іншых звестак, якія да яе адносяцца” (1855).

На працягу 1837—1846 ЯнЧачот (1797-1847) выдаў у Вільні шэсць зборнікаў народных песень «Сялянскія песьні», куды ўвайшло каля 1000 песень у перакладзе на польскую мову і ў арыгінале, уласна беларускія вершы, а таксама прыказкі і прымаўкі, слоўнік беларускай мовы (200 слоў).

З вялікай цікавасцю да вуснай паэтычнай творчасці беларускіх сялян ставіўся Ян Баршчэўскі, якога сучаснікі называліпершым беларускім пісьменнікам. У яго творчасці фальклор займаў прыкметнае месца, асабліва ў зборніку апавяданняў "Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычныхапавяданнях", у якім народныя апавяданні, пачутыя з вуснаў народа, ён пераклаў на польскуюмову.

У акрэслены час значны ўклад ў этналогію ўнёс беларускі этнограф, пісьменнік і публіцыст Павел Міхайлавіч Шпілеўскі (1823—1861). У 1853 Шпілеўскі. накіраваўся ў экспедыцыю па Беларусі. Свае назіранні і ўражанні Шпілеўскі надрукаваў у часопісе «Современник» у 1853—55 пад назвай «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі» (13 гісторыка-этнаграфічных і публіцыстычных нарысаў). У «Падарожжы...» аўтар прыводзіў гістарычныя звесткі пра населения пункты, якія яму давялося наведаць, шмат увагі надаваў

іх этнаграфічнаму апісанню (побыт сялян, іх адзенне, жыллё, абрады, кірмашы і святы, песні, казкі і паданні).

У пачатку XIX стагоддзя, рэформа адукацыйнай сістэмы  дае штуршок захапленню збіральніцкай дзейнасцю і этнаграфіяй прадстаўнікоў сярэдняй шляхты, ітэлігенцыі, духавенства.  Унікальныя  калекцыі этнаграфічнага накірунку мелі Чапскія, Тызенгаузы, Плятэры, Гюнтэры, Ельскія, Пшаздзецкія, Ходзькі, Тышкевічы і інш.

Этнаграфічны матэрыял, сабраны братамі К.П. Тышкевічам і Я.П. Тышкевічам, стаў асновай  для стварэння імі музея ў Лагойску, Віленскага музея старажытнасцей, а публікацыі — фундаментам для далейшага развіцця розных кірункаў этнаграфіі. Навуковыя працы гэтых даследчыкаў па археалогіі, этнаграфіі,  фальклярыстыцы, музеязнаўству вызначаліся шматграннасцю і фундаментальнасцю.

Шмат этнаграфічных матэрыялаў гэтага часу публікавалася ў перыядычных выданнях – навуковых зборніках, часопісах, газетах. У ліку гэтых выданняў ужо згаданыя “Этнографический сборник», «Записки Русского географического общества», «Записки Северо-Западного отдела Русского географического общества», а таксама “Современник» (1836 – 1866), «Этнографическое обозрение» (1889 – 1916), «Живая старина» (1890 – 1916), «Вестник Западной России» (1864 – 1871).

Тут друкавалі свае працы вядомыя збіральнікі і даследчыкі беларускай этнаграфіі – П.М.Шпілеўскі, А.К.Кіркор, М.Я.Нікіфароўскі, Е.Р.Раманаў, М.М.Косіч, А.М.Пыпін, М.Я.Янчук, Я.Ф.Карскі, М.В.Доўнар-Запольскі, А.М.Харузін, А.К.Сержпутоўскі, І.А.Сербаў і інш.

Такім ч ы н а м  у другой палове XIX ст. закладваюцца асновы этнаграфіі (этналогіі) як навукі аб народах-этнасах, іх гісторыка-культурных стасунках і заканамернасцях развіцця ў прасторы і часе. Гэты перыяд характарызаваўся з’яўленнем цэлай плеяды таленавітых этнографаў.

Асобныя рэгіёны Беларусі ў XIX стагоддзі вывучалі З.Я. Даленга-Хадакоўскі, Э.Ф. Плятэр, К. Халдзіеўскі, А.М. Семянтоўскі, К.А. Гаворскі, Р.А. Падбярэскі, А.Ф. Рыпінскі, А.П. Сапуноў (Полаччына і Падзвінне), П.М. Шпілеўскі (Міншчына, Палессе), Р.С. Зянькевіч, О. Кольберг (Палессе), А. Кіркор (Віленшчына, Магілёўшчына, Палессе), М.Ф. Кусцінскі (Віцебшчына), Ч. Янкоўскі (Віленшчына, Гродзеншчына).

Краязнаўчыя працы пра Міншчыну і Гродзеншчыну пакінулі У. Сыракомля( "Вандроўкі па маіх былых ваколіцах" (1853), "Мінск" (1857), "Нёман ад вытокаў да вусця" (1861); "Кароткае даследаванне мовы і характару русінаў Мінскай правінцыі" (1856)),  Я. Ходзька (Ян са Свіслачы), які напісаў шмат і артыкулаў па гісторыі Міншчыны, адметных жывасцю апавядання і значнай колькасцю беларусізмаў.

На багатым дакументальным матэрыяле Т. Нарбутам падрыхтавана «Гісторыя літоўскага народа» (т. 1—9, 1835 -- 41), ваенным тапографам М.В. Без-Карніловічам “Гістарычныя звесткі пра выдатныя мясціны на Беларусі з дадаткам іншых звестак, якія да яе адносяцца” (1855).

Вялікую цікавасць прадстаўляюць работы Адама Ганорыя Карлавіча Кіркора. Яшчэ ў гады навучання ў гімназіі ён зацікавіўся фальклорам і этнаграфіяй і надрукаваў у зборніку лепшых сачыненняў выхаванцаў Беларускай навучальнай акругі (1839) свой першы артыкул «Рэшткі язычніцкіх звычаяў на Беларусі». А. Кіркор вёў шматлікія археалагічныя раскопкі ў Літве і на Беларусі, раскапаў (часткова сумесна з археолагам Я. Тышкевічам) каля 1000 курганоў. Актыўны ўдзел прыняў у арганізацыі Музея старажытнасцей у Вільні (1855), стаў яго хавальнікам і сакратаром Археалагічнай камісіі.

Выдатны знаўца гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы, ён падрыхтаваў некалькі папулярных даведнікаў па Вільні і яе ваколіцах, друкаваў шматлікія навуковыя матэрыялы ў рускай і польскай перыёдыцы.

Асабліва каштоўнай для беларускай навукі была яго праца «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1857—59), складзеная паводле праграмы Рускага геаграфічнага таварыства. У ёй выказана вялікая павага да духоўнага жыцця працоўнага народа, прыведзена больш за 100 беларускіх песень, 200 прыказак, слоўнік беларускай мовы. ). У гэтай жа працы ён разгледзеў звычаёвае права сялян і іншыя этнаграфічныя праблемы.

Важнейшай заслугай А. Кіркора з'яўляецца першае праўдзівае і асэнсаванае грунтоўнае апісанне матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў Віленскай губерні і Палесся.

Збіраннем беларускай вуснапаэтычнай творчасці, асабліва тапанімічных і міфалагічных легенд займаўся Міхаіл Аляксеевіч Дзмітрыеў [1832—14(26).5.1873], член Рускага геаграфічнага таварыства. Выдаў зборнік беларускай народнай паэзіі «Вопыт збірання песень і казак сялян Паўночна-Заходняга краю» (1868) і «Збор песень, казак, абрадаў і звычаяў сялян Паўночна-Заходняга краю» (1869). У «Збор...» уключана 277 сямейна-бытавых, каляндарна-абрадавых і пазаабрадавых песень, 8 казак і апісанні абрадаў.

У гісторыі беларускай фальклcraрыстыкі другой паловы XIX ст. крытычную ацэнку атрымаў "Зборнік помнікаў народнай творчасці ў Паўночна-Заходнім краі" (1867), падрыхтаваны да друку П.А. Гільтэбрантам, які ўключыў у яго 300 песень, 151 прыказку, 93 загадкі, сабраныя ў Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях вучнямі Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі і іншымі збіральнікамі фальклорных твораў. П. Гільтэбрант у прадмове выказаў свае шавіністычныя погляды пры разглядзе твораў зборніка, выявіў сваю прыхільнасць да русіфікацыі насельніцтва "Паўночна-заходняга краю", зрабіў спробу фальсіфікацыі фальклорнага працэсу, за што з'едліва крытыкаваўся ў друку.

Вялікі уклад ў беларускую алогію зрабіў Павел Васілевіч Шэйн [1826—14(27).8.1900]. У 1873 г. П. Шэйн выдае "Беларускія народныя песні" ў пятым томе "Запісак РГТ па "Аддзяленню этнаграфіі" (праз год зборнік выйшаў у свет асобным выданнем). Найбольш поўны беларускі матэрыял прадстаўлены ў кнізе «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва ПаўночнаЗаходняга краю» (т. 1—3, 1887—1902). У ёй апісваюцца хрэсьбіны, калядныя, масленічныя, купальскія, жніўныя, вясельныя, пахавальныя абрады беларусаў з песнямі і фальклорнымі тэкстамі, міфалагічныя і бытавыя казкі пра

жывёл, легенды, паданні, анекдоты, прыказкі, прымаўкі, загадкі, звесткі пра матэрыяльную культуру беларусаў (жыллё, адзенне, ежу, заняткі) і інш.

Да гэтага ж часу адносіцца этнаграфічна-фалькларыстычная дзейнасць Ю.Ф. Крачкоўскага. Юльян Фаміч Крачкоўскі (25.7.1840—25.7.1903) у 1888—1902 быў старшынёй Віленскай археаграфічнай камісіі, укладальнікам 16-га і 20-га тамоў, аўтар прадмоў да іх і да 25-га тома «Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі».

Значную цікавасць для беларускай этналогіі прдстаўляюць працы Аляксандра Максімавіча Семянтоўскага (1821—1893). Ім выдадзна 159 прац і публікацый, з іх 126 прысвечана беларускай тэматыцы, найбольш Віцебшчыне (1862—1891). Першае даследаванне — «Статыстычнае апісанне Віцебскай губерні ў лясных адносінах» («Труды вольного экономического общества», 1862г.). Даследчык апісаў многія старажытнасці Віцебшчыны, сабраў цікавую ўласную калекцыю. Апублікаваў апісанне археалагічных помнікаў Гарадоцкага павету, кнігу пра археалагічныя старажытнасці Віцебскага краю (1867, упершыню ў Беларусі). Сабраў і сістэматызаваў вялікую колькасць матэрыялу па Віцебскім краі ў грунтоўнай кнізе «Беларускія старажытнасці» (СПб., 1890), станоўча адзначанай на 9 археалагічным з'ездзе А. П. Смародскім (Вільня, 1893).

Значнае месца ў этналагічнай спадчыне беларусаў займаюць фальклорна-этнаграфічныя працы Івана Іванавіча Насовіча [26.9(7.10). 1788—26.7(6.8). 1877], у якіх аналізуецца і асэнсоўваецца жыццё і побыт народа, яго духоўны свет і мараль, звычаі і павер'і, практычная мудрасць і вусная паэтычная творчасць.

Здабыткам беларускай фалькларыстыкі сталі яго зборнікі «Беларускія прыказкі і прымаўкі» (1852), «Беларускія прыказкі і загадкі» (1868), «Зборнік беларускіх прыказак» (1867). У апошнім ён змясціў каля 3500 прыказак, прымавак і блізкіх да іх прыгаворак, праклёнаў, скорагаворак і інш., тонка прааналізаваў змест і сэнс «маральнапрактычнай філасофіі простага народа», мудрых гаспадарчых і прыродных назіранняў. У зборніку «Беларускія песні» (1873), акрамя 350 тэкстаў песень, даследчык змясціў шэраг артыкулаў, прысвечаных песеннай культуры беларусаў.

У гэты ж час свяшчэннік Дз.Г. Булгакоўскі выдае зборнік "Пінчукі"(1890г.), у якім ён змясціў каляндарна-абрадавыя песні (калядныя, веснавыя, летнія), вясельныя, пазаабрадавыя песні, загадкі, прыказкі і прымаўкі, апісанні абрадаў і звычаяў, варажбы і інш.;тлумачальны слоўнік дыялектных слоў, які даваўся ў канцы кнігі.

Вывучэнню этнаграфічнай спадчыны беларусаў аддаў шмат сіл і энергіі вядомы беларускі этнограф Раманаў Еўдакім Раманавіч(11.9.1855— 20.1.1922). Аўтар больш як 200 прац па этнаграфіі, фальклоры, гісторыі, археалогіі і мове беларусаў, сабраў і надрукаваў больш як 10 тысяч фальклорных твораў. Галоўная фальклорна-этнаграфічная праца Е.Раманава «Беларускі зборнік» (вып. 1—9, 1886—1912) з'яўляецца своеасаблівай энцыклапедыяй побыту і культуры беларусаў дарэвалюцыйнага часу. Тут знайшлі адлюстраванне амаль

усе бакі народнай культуры і быту – песні, танцы, гульні, абрады, звычаі, народныя веды, аграрны каляндар, прыкметы, павер'і і г.д..

Значны ўклад ў этнаграфію зрабілі даследаванні Нікіфароўскага Мікалая Якаўлевіча [5(17).5.1845— 28.5(10.6). 1910]. Беларускі этнограф,фальклярыст, асветнік. Болып як 20 гадоў Нікіфароўскі быў карэспандэнтам Шэйна, а з 1890х гадоў выступаў з самастойнымі працамі. Апублікаваў каля 20 даследаванняў па этнаграфіі, фальклоры і гісторыі Віцебшчыны, якія з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, іх вуснапаэтычнай творчасці.

Этналагічныя даследаванні займалі важнае месца ў шматграннай навуковай дзейнасці Мікалая Андрэевіча Янчука[17(29) 11.1859—6.12.1921] Навуковы інтарэс да беларускага фальклору праявіўся ў М. Янчука яшчэ са студэнцкіх гадоў. Адзін з першых М. Янчук на навуковай аснове пачаў збіраць і вывучаць беларускі музычны фальклор. Ён даў аб'ектыўную эстэтычную ацэнку беларускаму песеннаму меласу. У 1886г. Янчук наладзіў экспедыцыю ў Мінскую губерню для этнаграфічных і антрапалагічных даследаванняў. Па матэрыялах экспедыцыі напісаў працу «Па Мінскай губерні» (1889г.), дзе адлюстраваў жыццё беларусаў, іх духоўную культуру (пераважна вераванні), у дадатку змясціў 158 беларускіх народных песень (пераважна абрадавых) і 33 нотныя запісы песенных мелодый, якія размеркаваў такім чынам: вясельныя, радзінныя і хрэсьбінныя, пасядзелкавыя, калядкі і шчадроўкі, масленічныя, веснавыя, купальскія, жніўныя і пакосныя, летнія, гістарычныя і розныя.

У «Этнаграфічным нарысе Беларусі» (1918—20) зрабіў выснову, што беларускі народ па сваёй культуры стаіць на адным узроўні з суседнімі народамі і мае права на самастойнае існаванне.

Навуковая спадчына М.А. Янчука надзвычай багатая, не ўся яна апублікавана. Вялікая заслуга яго і ў развіцці вышэйшайадукацыі ў Беларусі: удзельнічаў у стварэнні Беларускага дзяржаўнага універсітэта, быў яго прафесарам , выкладаў курс беларусазнаўства.

Прыкметны ўклад у вывучэнне побыту, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў унёс Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі (1867-1934) - выдатны этнограф, гісторык. У 1888г. у Кіеве выйшла кніга "Беларускае вяселле і вясельныя песні". М. Доўнар-Запольскігрунтоўна даследуе і апісваерозныя праблемы абраду іасобныя этапы вяселля ў наступныхпрацах: "Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках", "Сватаўство і дружынажаніха ў беларускім вяселлі", "Рытуальныя значэнні каравайнага абраду ў беларусаў" і інш. Аналізуе ён і вясельную паэзію ("Матывывясельных песень пінчукоў", "Сонейка і месяц у беларускай вясельнай паэзіі" і інш.).

У беларускім народазнаўстве прыкметны след пакінуў Адам Ягоравіч Багдановіч (1860 - 1940) .

Адам Багдановіч захапляўся этнаграфіяй. У зборніках Акадэміі навук і інш. выданнях, перыядычным друку таго часу былі апублікаваны яго навуковыя артыкулы і матэрыялы па этнаграфіі, нататкі пра народную адукацыю, зямельную справу, археалогію, У1894г. А. Багдановіч апублікаваў у часопісе "Научное обозренне" нарыс "Перажыткі старажытных вераванняў у

беларусаў". Праз годяго дапрацаваў і выдаў у Гродне асобнай кніжкай пад назвай "Перажыткі старажытнага сузірання ў беларусаў. Этнаграфічнынарыс".

Да этнаграфічных з поўнай упэўненасцю можна аднесці асобныя творы тагачасных паэтаў і пісьменнікаў. Пра гісторыю іпомнікі Палесся, Брэстчыны і Віленшчыны пісаў Ю. Крашэўскі (“Старажытная Літва. Яе гісторыя, законы, мова, вера, звычаі, песьні», «Барысаў», «Пінск і Піншчына», «Адзенне мяшчан і сялян з ваколіц Берасця, Кобрыня і Пружан». )

Паэтычнай энцыклапедыяй ведаў пра Беларусь справядліва называюць паэму А.Міцкевіча «Пан Тадэвуш”. У гэтай паэме з натхненнем апісваеццашырокая панарама народнага жыцця Беларусі ў пачатку XIX ст., яскрава апісаны лад жыцця і побыт мясцовай шляхты.

Родныя краявіды адлюстроўваюць у сваіх карцінах мастакі Ю. Пешка, М. Кулеша, Н.Орда.

На тпачатку XX стагоддзя этнаграфічны матерыял збіраюць камітэты і камісіі, арганізаваныя пад патранатам царквы. Так, у 1908 годзе пры Мінскай епархіі створаны Мінскі Царкоўны гісторыка-археалагічны камітэт, у якім працавалі вучоныя Дз.І. Даўгяла, А.К. Снітка, А.А. Шахматаў. У 1909 годзе заснавана Віцебская вучоная архіўная камісія, у 1911 годзе па яе ініцыятыве — Віцебскае аддзяленне Маскоўскага Археалагічнага інстытута, у 1912 — Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі.

У канцы XIX — пачатку XX стагоддзя пачынаецца актыўнае вывучэнне этнаграфічных матэрыялаў беларускімі навукоўцамі Я.Ф Арлоўскім, А.Я. Багдановічам, М.В. Доўнар-Запольскім, А. К. Ельскім, Я.Ф. Карскім, Ю.Ф. Крачкоўскім, В.Ю. Ластоўскім, І.І. Луцкевічам, М.Я. Нікіфароўскім, Ф.В. Пакроўскім, З.Ф. Радчанка, Е.Р. Раманавым, І.А. Сербавым, А.К. Сержпутоўскім, І.І. Стабраўскім, У.К. Стукалічам, Г.Х. Татурам, Г. Тэадаровічам, А.М. Уласавым, В.П. Федаровічам, М.А. Федароўскім, В.А. Шукевічам, П. В. Шэйнам і інш.

Пачатак XX стагоддзя адзначаны выхадам усвет буйнейшай абагульняючай працы Я.Ф.Карскага “Беларусы” (1 – 3 т., 7 выпускаў; 1903 – 1922). Яўфім ФедаравічКарскі.Філолагславіст, заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, фалькларыст, палеограф. Акадэмік Пецярбургскай АН (з 1916, член-карэспандэнт з 1901), правадзейны член Інстытута беларускай культуры (1922), Чэшскай АН (з 1929). За працы па беларусазнаўстве ў 1894г. узнагароджаны вялікім залатым медалем Рускага геаграфічнага таварыства. У 1896г. за даследаванне «Заходнерускія пераклады псалтыра ў XV—XVII ст.ст.» савет Маскоўскага універсітэта прысудзіў яму вучоную ступень доктара філалогіі. Ён быў абраны членам Археаграфічнай камісіі Маскоўскага археалагічнага таварыства, членам-карэспандэнтам Таварыства аматараў старажытнага пісьменства (1898г.).

Асобна варта адзначыць уклад Я.Карскага ў арганізацыю навукі на Беларусі і развіццё беларускай культуры. Яшчэ ў дарэвалюцыйны час ён падрыхтаваў «Праграму для збору асаблівасцей беларускіх гаворак» (1897 і 1916). Вывучаў мясцовыя беларускія гаворкі па помніках пісьменнасці і па этнаграфічных камандзіроўках, асабліва па Гродзеншчыне, Віленшчыне,

Міншчыне. У запісах фальклорных твораў («Беларускія песні с. Беразавец Навагрудскага пав. Мінскай губ.»,1884-85; «Беларускія песні в. Навасёлкі-Затрокскія Віленскай губ. Трокскага пав.», 1889) дакладна перадаў асаблівасці мясцовых гаворак, супрацоўнічаў з П.Шэйнам, М.Нікіфароўскім, Е.Раманавыы, падтрымліваў першыя беларускія выдавецтвы, «Нашу ніву» і навукова-літаратурны гурток студэнтаў Пецярбургскага універсітэта.

У савецкі час быў старшынёй камісіі па адкрыцці ў Мінску Беларускага дзяржаўнага універсітэта, правадзейным членам Інбелкульта і ўдзельнічаў у распрацоўцы яго статута.

Сапраўднай энцыклапедыяй беларусазнаўства стала фундаментальная трохтомная праца «Беларусы» (вып. 1—7; 1903—22), у якой на аснове глыбокага параўнальна-гістарычнага даследавання гісторыі мовы, фальклору, пісьменнасці, шматвяковай культуры беларускага народа ўпершыню была навукова абгрунтавана яго нацыянальная самабытнасць як самастойнага славянскага народа.

Фундамэнтальная сямітомная праца Карскага «Беларусы» лічыцца «энцыкляпэдыяй беларускага мовазнаўства, унікальнай па ахопе і глыбіні матэрыялу» (М. С. Дзяржавін)«непараўнальнай паводле вычарпальнасьці з кожным іншым дасьледваньнем славянскіх народаў» (А. Ляпуноў).

У т. 1 «Уводзіны да вывучэння мовы і народнай славеснасці» (Варшава, 1903, Вільня, 1904) даследаваў паходжанне беларускага народа. Прарадзімай славян Я. Карскі лічыў Палессе (басейн Прыпяці, верхняга Нёмана і ніжняй Бярэзіны), вызначыў час фарміравання беларускай народнасці (XII-XV ст.), сцвярджаў, штр ў аснову беларускай народнасці ляглі плямёны дрыгавічоў, радзімічаў і крывічоў, прыйшоў да вываду, што беларусы былі аўтахтонамі на сваіх землях. Акрэсліў этнічныя межы беларускага народа, даў этнаграфічную карту Беларусі пач. XX ст., асвятліў важнейшыя этапы гісторыі беларускай мовы, яе спецыфічныя асаблівасці і ўзаемасувязі з рускай, украінскай, польскай, літоўскай і іншымі мовамі, вызначыў асноўны фонд рукапісаў і помнікаў пісьменства беларускага паходжання.

У т. 2 «Мова беларускага племені» (вып. 1-3, 1908-12) абгрунтаваў вучэнне пра гукавы і граматычны лад старабеларускай і сучаснай беларускай мовы ў яе народна-дыялектнай і літаратурнай формах.

Т. 3 «Нарысы славеснасці беларускага племені» складаецца з 3 выпускаў. У вып. 1 «Народная паэзія» (1916) асветлена гісторыя развіцця беларускага фальклору, ахарактарызаваны асноўныя жанры і віды народнай паэзіі беларусаў; даследаваны культурны стан плямён, якія склалі аснову беларускай народнасці, паказаны іх сямейныя і грамадскія ўзаемаадносіны, апісаны жыллё, ежа, заняткі, побыт, светапогляд, рэлігійныя вераванні, мова, міфалогія, выказаны думкі пра ўзнікненне народнай паэзіі і яе асаблівасці ў старажытнасці; у цеснай сувязі з паказам асаблівасцей абрадаў і звычаяў разгледжаны разнастайныя фальклорныя жанры — замовы, абрадавыя і бытавыя песні, прыпеўкі, прыказкі і прымаўкі, загадкі, казкі; прасочаны сляды гераічнага эпасу, паказана сувязь беларускага фальклору з фальклорам рускага і ўкраінскага народаў.

Яўхім Карскі аўтар больш як 700 прац па славістыцы, беларусістыцы і русістыцы, у т.л. даследаванняў па гісторыі беларускай мовы, дыялекгалогіі, фальклоры, этнаграфіі, гісторыі беларускай літаратуры і інш.

У сваіх даследаваннях Я. Карскі паспяхова развіваў прынцыпы культурна-гістарычнай школы, зрабіў значны ўклад у многія галіны гістарычных ведаў, у т.л. ў спецыяльныя гістарычныя навукі — крыніцазнаўства, палеаграфію, археаграфію. Навуковая спадчына Я. Карскага не страціла і сёння сваёй значнасці, яна з'яўляецца асновай для далейшай распрацоўкі беларусазнаўства.

Погляды Карскага на беларускія этнічныя гісторыю і тэрыторыю пераглядаліся В. Бандарчыкам (каля 1998—1999). Значныя дапаўненні да выкладзенай Карскім гісторыі вуснага фальклёру былі зроблены А. Фядосікам (каля 1998) і іншымі.

Такім чынам, у выніку самаадданай працы рупліўцаў - збіральнікаў і даследчыкаў этналогіі беларусаў была створана багатая скарбніца - навуковая база для глыбокага вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры народа - і закладзены падмурак для развіцця нацыянальнай этналогіі яшчэ ў XIX - пачатку XX ст.

У збіранні і вывучэнні беларускай вусна-паэтычнай творчасці ўнеслі значны ўклад польскія вучоныя О. Кольберг, Ч. Пяткевіч, К. Машынскі.

Пачатак XX стагоддзя быў адзначаны ўздымам грамадска-палітычнага руху, ростам нацыянальнай самасвядомасці, шырокай хваляй нацыянальна-культурнага адраджэння. Прыкметную ролю ў выхаванні новай генерацыі даследчыкаў народнай культуры і быту адыграла газета “Наша ніва” (1906 – 1915). Яна была заснавана ў Вільні братамі І. Луцкевічам і А. Луцкевічам, В.Іваноўскім і іншымі дзеячамі Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

Браты Луцкевічы былі і заснавальнікамі Беларускага музея ў Вільні (Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей). Яго асновай паслужыла прыватная калекцыя старасвецкіх рэчаў, сабраная І.Луцкевічам.

Этналагічная дзейнасць Я.Ф. Карскага, як і некаторых іншых вучоных (А.К. Сержпутоўскага, Т.А. Сербава), працягвалася і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У студзені 1922 г. быў створаны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Ён стаў каардынацыйным цэнтрам краязнаўчых арганізацый. Асноўнай задачай яго стварэння выступала арганізацыя планамернага вывучэння мовы, літаратуры, этнаграфіі, гісторыі, прыроды, эканомікі на тэрыторып Беларусі.

Часопіс "Наш край" пачаў выходзіць з кастрычніка 1925 г., Ў прыватнасці там была змешчана "Праграма-інструкцыя для збіральнікаў беларускай музычна-этнаграфічнай творчасці", складзеная А. Грыневічам - сакратаром Песеннай камісіі Інбелкульта. У гэтым жа часопісе ў 1928 г. (№ 4) апублікаваў "Праграму для запісвання помнікаў вуснай народнай творчасці" А.А. Шлюбскі. Ён жа падводзіў вынікі сабраных матэрыялаў і рабіў іх агляд у часопісе "Наш край".

Найбольш буйнымі працамі, якія друкаваліся ў 20-я гады XX стагоддзя былі "Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета" (1926), А.К. Сержпутоўскага, "Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны" у 2-х частках( 1927-1928), А.А. Шлюбскага, "Народныя песні з мелодыямі" (1928), М. Гарэцкага іА. Ягорава.

У зборніку фальклорных матэрыялаў А. А. Шлюбскага песні сістэматызуюцца па жанрах і відах: калядныя, запусныя, веснавыя,

русальныя, купальскія, працоўныя, хрэсьбінныя, вясельныя песні і прыпеўкі, хаўтурныя галашэнні.

У кнізе М. Гарэцкага і А. Ягорава апублікавана 318 песень, запісаных у вёсцы Багацькаўка Мсціслаўскага павета ад маці Гарэцкай Ефрасінні Міхайлаўны. Ад яе запісаў напевы А. Ягораў і каля 125 паравёў на ноты. У зборнік увайшлі песні земляробчага

календара (зімовыя, веснавыя, купальскія, жніўныя, вясельныя--іхнайбольш - 117).

У 1929 годзе на базе Інбелкульта была створана Беларуская акадэмія навук, а ў Інстытуце гісторыі быў утвораны сектарэтнаграфіі і фальклору, які стаў цэнтрам збірання і даследавання вуснай народнай творчасці ў рэспубліцы.

У 1938 выйшла дырэктыва Наркама асветы СССР "Аб пастаноўцы і арганізацыі краязнаўчай работы" ў адпаведнасці з якой уся навукова-метадычная і краязнаўчая работа перакладалася на мясцовыя краязнаўчыя музеі.

У час Вялікай Айчыннай вайны беларускія фальклорныя творы, традыцыйныя і новыя, шырока бытавалі і сярод насельніцтва, і сярод партызан. У жанравых адносінах пераважалі песні, прыпеўкі,анекдоты, прыказкі. У 1944 г. быў апублікаваны невялікі зборнік "Беларускія народныя песні", выдадзены маёрам Б. Ярустоўскім, які змясціў у ім 24песні і многа прыпевак.

Асобныя бакі матэрыяльнай культуры і вытворчай дзейнасці былі разгледжаны ў працах І.М.Браіма (рыбалоўства), М.Я.Грынблата (адзенне, промыслы), В.С.Гуркова (жылле, пчалярства), Г.М.Курыловіч (ткацтва), А.І.Лакоткі (жылле), Л.А.Малчанавай (матэрыяльная культура), С.А.Мілючэнкава (ганчарства), І.Д.Назінай (музычныя інструменты), М.Ф.Раманюка (адзенне), Я.М.Сахуты (мастацкія промыслы), В.Я.Фадзеевай (вышыўка), В.С.Цітова (матэрыяльная культура, промыслы), С.Ф.Цярохіна (пчалярства, паляванне).

Адной з важнейшых прац фалькларыстаў Нацыянальнай акадэміі навук з'явілася шматтомнае выданне беларускай народнай творчасці, падрыхтаванае калектывам супрацоўнікаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Звод беларускай на-роднайтворчасці (БНТ) распачалі друкавацьу 1970 годзе і да 2000 года выпусцілі 45 тамоў. Усе тамы БНТ забяспечаны паказальнікамі: геаграфічнымі, імяннымі запісчыкаў іінфарматараў, у некаторых тамах - алфавітнымі.

Звод "Беларуская народная творчасць" атрымаў высокую ацэнку грамадскасці. 30 тамоў яго, выдадзеныя ў 1970 -1985 гадах, былі ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР за 1986 год (А.С. Фядосік, М.Я. Грынблат, В.І.

Ялатаў, К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч, А.І.Гурскі, А.С. Ліс, Л.А. Малаш, Л.М. Салавей, І.К. Цішчанка).

Прыкметнай з'явай у гісторыі беларускай этнаграфіі з'явілася выданне энцыклапедыі "Этнаграфія Беларусі" (1989), у стварэнні якой прымала ўдзел шырокая навуковая грамадскасць. Разам з тым распачалася работа над шматтомным выданнем "Беларусы" у шасці тамах, кожны з каторых прысвечаны асобнаму раздзелу этнаграфічных ведаў аб Беларусі, этнагенезу і этнічнай гісторыі яе народаў, традыцыйнай гаспадарчай, матэрыяльнай і духоўнай культуры.

З пачатку 90-х гг. XX ст. у беларускай этналогіі адбыліся значныя змены. Яны былі звязаны з пашырэннем увагі да тэарэтыка-метадалагічных палажэнняў сусветнай этналогіі. Пад тэрмінам «беларуская этналогія» разумелася навука аб беларускім народзе, этнічных супольнасцях Беларусі, якая адначасова збірае і сістэматызуе матэрыялы і ажыцяўляе тэарэтычны аналіз гэтых матэрыялаў, робіць буйныя навуковыя абагульненні, распрацоўвае тэарэтычныя праблемы развіцця беларускага народа, яго культуры

Разам з традыцыйным для беларускай этналогіі параўнальна-гістарычным метадам з 90-х гг. XX ст. пачалі выкарыстоўвацца такія метады сусветнай этналогіі, як дыфузіяніскі, функцыянальны, структурны і інш. Гэтыя метады дазваляюць па іншаму, больш шырока звярнуцца да вывучэння розных аспектаў культуры беларусаў. Увага да гэтых канцэпцый з боку беларускай этналогіі была выклікана некалькімі момантамі. Па-першае, характарам, колькасцю і якасцю беларускіх этнаграфічных матэрыялаў, сабраных на працягу XIX–XX стст., якія патрабуюць глыбокага тэарэтычнага асэнсавання. Па-другое, жыццяздольнасцю саміх этналагічных канцэпцый, якія прайшлі выпрабаванні часам і паказалі сваю высокую навуковую якасць высноў.

Магчымасці выкарыстання сусветнавядомых этналагічных канцэпцый у беларускай этналогіі былі рагледжаны М. Ф. Піліпенкам у шэрагу прац: «Роля эвалюцыі і дыфузіі ў гісторыі традыцый» (1990), «Сучасныя метады этналогіі» (1991), «Культура як прадмет беларускай этналогіі» (1993), «Беларуская традыцыйная культура як феномен еўрапейскай цывілізацыі» (1995), «Метадалагічныя праблемыэнагенезу» (1998), «Канцэпцыі ўзнікнення Беларусі» (2000). Увага да неабходнасці выкарыстання сусветных традыцый этналагічных даследванняў паўплывала на фарміраванне новага накірунка ў айчыннай гістарыяграфіі, прысвечанага вывучэнню сусветных этналагічных канцэпцый і іх уплыву на беларускую этналогію. На пачатку XXI ст. распрацоўваюцца пытанні этналагічнага вывучэння Беларусі з пазіцый канцэпцыі эвалюцыянізма, функцыяналізма, культурнага матэрыялізма.

Новыя падыходы да сучаснай беларускай этналагічнай навукі патрабавалі іншага падыходу да яе перыядызацыі. Такую перыядызацыю на пачатку XXI ст. прапанаваў М. Ф. Піліпенка. У падмурак гэтай перыядызацыі былі пакладзены тэарэтычныя асновы этналагічных даследванняў. Ён справядліва лічыць, што найбольш важнай рысай кожнага перыяду з'яўляецца метадалагічная база і спосабы (Піліпенка М. Беларуская этналогія: што гэта такое? // Беларускі гістарычны часопіс.1993. № 2.-С.98) навуковага даследвання. У адпаведнасці з

гэтым тэзісам ѐн прапануе вылучаць перыяд існавання міфалагічнага накірунка (першая паловая і трэцяя чвэрць XIX ст.), затым перыяд панавання эвалюцыйнага накірунка (апошняя чвэрць XIX – першая чвэрць XX ст.) 1930–1980 гг. адзначаны як час актыўнага ўжывання параўнальна-гістарычнага метада. З пачатку 1990-х гг. па сеняшні дзень у беларускай этналогіі разам с параўнальна-гістарычным метадам пачалі выкарыстоўваць структурны, функцыянальнальны, дыфузіяніcцкі метады

Менавіта гэты падыход падаецца найбольш карысным для сучаснай беларускай этналогіі.

На пачатку 90-х гг. ХХ ст. Інстытут мастацтвазнаўства этнграфіі і фальклору працягваў заставацца буйной навуковай арганізацыяй, якая захавала выдатны калектыў даследчыкаў і сістэматычна займалася этналагічным вывучэннем Беларусі. Галоўнай задачай, якая стаяла перад супрацоўнікамі аддзела этналогіі, стала стварэнне першай шматтомнай этналагічнай працы аб беларускім народзе, яго нацыянальных традыцыях, якая атрымала назву «Беларусы» (1995–2007). Пры Інстытуце дзейнічае адзіны ў Рэспубліцы Беларусь савет па абароне дысертацыі па спецыяльнасці 07.00.07 – этналогія, этнграфія і антрапалогія. На прыканцы ХХ – пачатку ХХІ ст. па этналогіі былі абаронены доктарскія дысертацыі І. У.Чаквіна, Г. І. Каспяровіч, А. У. Гурко, кандыдацкія дысертаціі па этналогіі абаранілі такія маладыя даследчыкі як М. Міхайлец, К. Шумскі, Ю. Унуковіч.

З пачатку ХХІ ст. значная ўвага пачала надавацца выхаванню маладога пакалення беларускіх этнолагаў.

На працягу канца ХХ – пачатку ХХІ ст. у вышэйшых навучальных установах Беларусі з’явіўся шэраг кафедр, сярод асноўных накірункаў дзейнасці якіх стала выкладанне дысцыплін этналагічнага цыкла. На сѐняшні дзень этналогія выкладаецца ў УВА Мінска, Гародні, Гомеля, Полацка. Вядзецца падрыхтоўка вучэбна-метадычных матэрыялаў па этналогіі і этнграфіі Беларусі

У 2001 г. на гістарычным факультэце БДУ была створана кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў. Першым загадчыкам гэтай кафедры стаў к. г. н. П. У. Церашковіч. Кафедра з’явілася дзякуючы моцнаму навуковаму калектыву этнолагаў, які сфарміраваўся на прыканцы 90-х гг. на гістарычным факультэце БДУ. Супрацоўнікамі кафедры з’уляліся і з’уляюцца такія беларускія этнолагі,як доктар гістарычных навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, прафесар М. Ф.Піліпенка, к. г. н. дацэнт П. Ў. Церашковіч, к. г. н. дацэнт Т. А. Навагродскі, к. г. н. дацэнт І. С.Махоўская і інш. Яны распрацавалі і прапанавалі для выкладання шэраг арыгінальных курсаў і спецкурсаў, якія тычацца сусветнай і беларускай этналогіі. Напрыклад, «Сацыяльна-культурная антрапалогія», «Гісторыя нацыі і нацыяналізму», «Этнічная гісторыя Беларусі». Студэнты спецыяльнасці «этналогія» маюць магчымасць працягнуць далейшае навучанне ў магістратуры і аспірантуры пры кафедры.

Актыўна развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва, у якім удзельнічаюць беларускія этнолагі. У 2000–2004 гг. разам з даследчыкамі Інстытута этналогіі і

антрапалогіі імя М. М. Міклухі-Маклая Расійскай акадэміі навук Р. А. Грыгор’евай і М. Ю. Мартынавай), беларускія этнолагі (А. І. Лакотка,Г. І. Каспяровіч) вывучалі беларуска-рускае пагранічча. Вынікі сумеснай працы былі апублікаваны ў сумеснай манаграфіі1

Разам з супрацоўнікамі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны праводзілася вывучэнне традыцыйнай культуры насельніцтва Беларускага і Украінскага Палесся. У супрацоўніцтве з польскімі навукоўцамі вывучалася традыцыйная культура беларуска-польскага пагранічча. Вынікі гэтага даследвання апублікаваны ў навуковым зборніку «Беларуска-польскія культурныя сувязі» (1991)

Унікальнай з’явай у гісторыі айчыннай этналогіі стаў ўдзел супрацоўнікаў кафедры этналогіі,музеязнаўства і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ ў міжнароднай этнаграфічнай экспедыцыі ў Балгарыі ў 2002 г. Супрацоўнікі кафедры ўдзельнічалі ў праграме Еўрасаюза па супрацоўніцтву паміж універсітэтамі Заходняй і Усходняй Еўропы TEMPUS (Эсэкскі ўніверсітэт,Вялікабрытанія; Утрэхтскі ўніверсітэт, Нідэрланды, БДУ).

У кастрычніку 2001 г. кафедра правяла сумеснае даследаванне з інстытутам сацыялогіі ўніверсітэта імя Марыі Складоўскай-Кюры (Люблін, Польшча).

Асабліва значныя вынікі прынесла супрацоўніцтва з Цэнтрам вывучэння класічных традыцый Польшчы і Цэнтральна-Усходняй Еўропы (OBTA) Варшаўскага ўніверсітэта, сумесна з якім кафедра правяла ў Мінску сесію Міжнароднай гуманітарнай школы «Традыцыі і сучаснасць. Мова. Гісторыя. Культура».

Супрацоўнікі і навучэнцы кафедры штогод прымаюць удзел у Міжнароднай летняй школе «Памежжа. Гісторыя. Мова. Культура». У 2002 г. студэнты і выкладчыкі кафедры ўдзельнічалі ўМіжнародным кангрэсе «Археалогія і этнологія Усходняй Еўропы» у Адэссе.

На працягу канца XX – пачатку XXI ст. у беларускай этналогіі з’явіўся шэраг буйных навуковых даследванняў. І ў першую чаргу значная ўвага надавалася праблемам этнічнай гісторыі Беларусі. У 1991 г. было апублікавана грунтоўнае даследаванне М. Ф. Піліпенкі «Узнікненне Беларусі: новая канцэпцыя».

Аўтар прымяніў новы тэарэтычны падыход да вывучэння праблем беларускага этнагенезу. Ён падкрэсліў,што побач з эвалюцыяй, важную ролю ў фарміраванні беларускага народа адыграла дыфузія культурных і моўных з’яў. Ён прывёў шмат доказаў таго, што непасрэднымі продкамі беларускага этнасу былі дзве вялікія групы агульнаўсходнеславянскай этнічнай супольнасці, якія сфарміраваліся ў Падзьвінні і Папрыпяцці. І беларускі этнас сфарміраваўся ў выніку кансалідацыі паўднёвай часткі старажытнабеларускага (падзвінска-дняпроўскага) і паўночнай часткі старажытна-палескага (папрыпяцкага) субэтнасаў стсаражатнага агульнаўсходнеславянскага этнасу. У даследванні паказана, што цэнтрам фарміравання беларускага народа былі Гродзеншчына, Міншчына і Магілёўшчына, якія эканамічна, палітычна і культурна злучылі ў

адно целае тэрыторыі, размешчаныя на поўдні і поўначы ад іх – паўночную частку Папрыпяцця і паўночную частку Падзвіння.

Вялікую ўвагу даследчык надаў аналізу гістарыяграфіі праблемы, параўнаўшы ўласную (старажытнабеларускую) канцэпцыю з ранейшымі канцэпцыямі – «польскай», «вялікарускай», «балцкай» і інш.

Пытанням этнічнай гісторыі беларусаў XIV – першай паловы XVII ст. была прысвечана праца І. У. Чаквіна «Этнічная гісторыі беларусаў эпохі феадалізму», (1995). Гэта манаграфія ўзбагаціла беларускую этналогію новым фактычным матэрыялам, які ѐн выкарыстаў для даследавання этнічнай гісторыі беларусаў гэтага перыяду (летапісы, хронікі, дзѐннікі, інвентары, прывелеі, статуты і інш.), і новым у беларускай этналогіі метадалагічным падыходам, кампетэнтным аналізам. Працягам працы ў гэтым накірунку стала дысертацыйнае даследванне І. У. Чаквіна, у якім ѐн грунтоўна асэнсаваў фактары фарміравання беларускага этнасу (сацыяльна-эканамічны, палітычны, канфесійны, геаграфічны і інш.),звярнуў увагу на зямляцкія аб’яднанні, якія папярэднічалі ўтварэнню беларускага народа, даследаваў іх назвы

У 2001 г. калектывам этнолагаў (М. Ф. Піліпенка, І. У. Чаквін, Г. І. Каспяровіч і інш.) створана абагульняючая праца па апраблеме паходжання і этнічнай гісторыі беларускага народа «Беларусы. Т.4. Вытокі і этнічнае развіццѐ». У ѐй глыбока вывучаны змены ў сацыяльнай і канфесіянальнай структуры беларускага этнасу на працягу XIV–XIX стст., змястоўна даследавана этнічнае развіццѐ беларусаў у навейшы час, грунтоўна паказаны ўплыў эканамічнай дзейнасці на дэмаграфічныя працэсы, сацыяльную структуру, матэрыяльную культуру. У абагульняючай працы разгледжаны новыя з’явы ў духоўнай культуры, змены эканамічнай самасвядомасці, паказана, што ў XX ст. яна ўзмацнілася ў параўнанні з XIX ст., адзначана, што ў 1990-я гг. значэнне тэрміна беларусы ўзбагацілася. У гэты перыяд ѐн не толькі з’яўляецца назвай беларускай этнічнай супольнасці, але і пачаў абазначаць таксама беларускую палітычную супольнасць, у якую ўваходзіць як беларускі этнас, так і іншыя этнічныя супольнасці РБ.

Значным укладам у распрацоўку праблемы этнічнай гісторыі Беларусі стала манаграфія П. У. Церашковіча, прысвечаная параўнальнаму аналізу этнічных працэсаў у народаў рэгіѐна ЦэнтральнаУсходняй Еўропы Праца вылучаецца аўтарскім, даволі абгрунтаваным поглядам на праблему фарміравання беларускай нацыі. Аўтар вылучыў шэраг фактараў, якія ўплываюць на фарміраванне нацыянальнага руху, да якіх аднѐс – рынкавую актыўнасць, урбанізацыю, сацыяльную мабільнасць, пісьменнасць, этналінгвістычную і канфесіянальную своеасаблівасць, універсітэцкія цэнтры, «гістарычную памяць». Карыстаючыся шматлікімі крыніцамі ѐн паказаў уплыў гэтых фактараў на працэс фарміраванне нацыі ў літоўцаў, латышоў, эстонцаў, украінцаў, палякаў, славакаў і беларусаў.

Гэта дазволіла яму паказаць спецыфіку працэсаў, якія паўплывалі на фарміраванне беларускай нацыі і патлумачыць іх спецыфіку.

Адной з умоў існавання беларускага і іншых славянскіх народаў у будучым з’яўляецца захаванне ўласнай ідэнтычнасці.

Вывучэнню праблемы ўзаемасувязі беларускіх духоўных традыцый і традыцый іншых славянсскіх народаў было прысвечана калектыўнае даследванне «Беларусы. Т. 10. Славянскія этнакультурныя традыцыі» (2007), аўтары І. У. Чаквін, А. У. Гурко, Т. І. Кухаронак.

Абагульняючую працу па гісторыі беларускай этналогіі ў канцы XX ст. прапанаваў В. К. Бандарчык.

Ён сабраў і прааналізваў матэрыялы па беларускай этналогіі, пачынаючы з перыяду канца XVIII ст. да 90-х гг. XX ст. Яму належыць перыядызацыя гісторыі беларускай этналогіі, ў аснову якой пакладзены сацыяльна-эканамічны падыход. На сѐняшні дзень трэці том «Беларусы. Т. 3 Гісторыя этналагічнага вывучэння» (1999) фактычна адзіная праца, якая ахоплівае амаль што ўвесь час існавання беларускай этналогіі.

Этналагічнаму вывучэнню Заходняй Беларусі ў міжваенны час на Беларусі прысвечаны працы беларускіх даследчыкаў У. Васілевіча і М. А. Міхайльца. У. Васілевіч звярнуўся да навуковай спадчыны такіх вядомых польскіх этнолагаў, даследчыкаў Беларусі, як К. Машынскі, Ч. Пяткевіч і інш.,працы якіх ѐн перакладае з польскай мовы на беларускую. Гісторыі вывучэння матэрыяльнай культуры беларусаў польскімі этнолагамі прысвечана праца М. А. Міхайльца «Польская этналогія XIX – першай паловы XX ст. аб матэрыяльнай культуры беларусаў» (2008) Польскі этнолаг А. Энгелькінг і беларускі І.Алюніна даследуюць навуковую спадчыну польскага этнолага Ю. Абрэмбскага.

Распачата праца па перавыданню прац беларускіх этнолагаў і этнографаў, разам з вялікімі прадмовамі гістарыяграфічнага кшталту. Так было перавыдадзена праца «Беларусы» Я. Ф. Карскага ў 2001 г., ў 1995 г. – «Перажыткі старажытнага светапогляду беларусаў» А. Я. Багдановіча, «Вічынскія паляне» І. А.Сербава перавыдадзена ў 2005 г. Значная ўвага з боку гісторыкаў была звернута да навуковай спадчыны выдатных беларускіх этнолагаў ранейшых перыядаў. Традыцыяй стала правядзенне «Доўнараўскіх чытанняў» (Гомель-Рэчыца), прысвечаных навуковай спадчыне М. В. Доўнар-Запольскага і «Раманаўскіх чытанняў» (Магілѐў) прысвечаных Е. Р. Раманаву.

Есць навуковыя дасягненні этнолагаў і ў даследаваннях традыцыйнай сацыяльнай культуры беларускага этнасу. Імі вывучана гісторыя сацыяльнай ( Гурко А. У. Беларуская этналогія ў XXI ст.: праблемы і перспектывы // Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. № 1. 2009. 84 с.,Пяткевіч Ч. Рэчыцкае Палессе / Часслаў Пяткевіч: уклад., прадм. У. Васілевіча; пер. с пол. Л. Салавей і У.Васілевіч. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.) арганізацыі беларсаў. С. Ф. Цярохіным, І. У. Чаквіным і У. С. Гурковым прасочана эвалюцыя сялянскай абшчыны на працягу ўсяго перыяду яе існавання («Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі» (1990). В. Ф. Бацяеў даследаваў развіцце ў XIX – 20-я гг. XX ст. грамадскіх сельскагаспадарчых аб’яднанняў (2000), паляўнічых таварыстваў (2002), экалагічных аб’яднанняў (2004), медыцынскіх таварыстваў (2004), навуковых (2005), асветніцкіх (2004) і інш. В. М. Бялявіна разгледзела дзейнасць земстваў (2002), Г. І. Каспяровіч – праваслаўных брацтваў (2002). У 2001 г. Т. І.

Кухаронак надрукавала кнігу «Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў», Т. Валодзіна выдала працу «Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў» (1999). У 2002 г. этнолагі Інстытута апублікквалі абагульняючую працу аб грамадскіх традыцыях беларусаў «Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі». У ѐй, апрача традыцыйных грамадскіх аб'яднанняў, разгледжаны формы дваранскага і гарадскога самакіравання (В. М. Бялявіна), звычаѐвае права (І. У. Чаквіна), судовая сістэма і грамадскія формы выкарыстання вольнага часу (В. М. Бялявіна), дзяржаўныя святы (Л. В. Ракава), прафесійныя (В. М. Бялявіна) і каляндарныя святы (Т. І. Кухаронак), хрысціянскія святы (А. У. Гурко). У гэтай абагульняючай працы прасочана трансфармацыя сістэмы грамадскіх традыцый беларускага этнасу з сярэдніх вякоў да канца XX ст.

Акрамя грамадскіх традыцый, этнолагі даследавалі і другую важную частку сацыяльнай культуры беларускага этнасу – сям'ю і сямейныя традыцыі. Вывучэнню сям'і як сацыяльнай арганізацыі ў сялян і гараджан на Беларусі прысвечана калектыўная праца (Г. М. Курыловіч, Л. В. Ракава) «Сям'я і сямейны быт беларусаў» (1990). Л. В. Ракава даследавала традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вѐсцы ў манаграфіі «Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вѐсцы» (2000). Значэнне народнай педагогікі беларусаў і роля беларускіх этнолагаў у яе вывучэнні ахарактарызавана М. Ф. Пілепенкам і В. К. Бандарчыкам у калектыўнай манаграфіі «Народная педагогіка беларусаў» (1996). Т. І. Кухаронак сабрала і сістэматызавала вялікі палявы этналагічны матэрыял аб радзінных звычаях і абрадах беларусаў у канцы

XIX–XX ст. Свае погляды на гэтую праблему яна прапанавала ў працы «Радзінныя звычаі і абрады беларусаў» (1993). У 2001 г. калектывам этнолагаў інстытута (Г. М. Курыловіч, Л. В. Ракава, Т. І. Кухаронак і інш.) апублікавана абагульняючая праца аб сям'і, сямейных традыцыях беларусаў «Беларусы.

Т. 5. Сям'я» (2001). У гэтым даследванні падаецца цэласнае навуковае ўяўленне аб сям'і беларусаў, жыллѐвых і санітарна-гігіенічных умовах яе існавання, гаспадарчай дзейнасці, узаемаадносінах у сям'і, традыцыях выхавання, сямейных абрадах. Аўтары прасачылі эвалюцыя гэтых бакоў сямейнага жыцця беларусаў на працягу многіх стагоддзяў – ад сярэдніх вякоў да канца XX ст., выявілі сістэмны характар трансфармацыі сям'і беларусаў, паказалі яе сучасны стан1 Беларускія этнолагі звярнулі ўвагу і на канфесіі Беларусі. Гісторыі хрысціянскіх традыцый на Беларусі прысвечана праца А. У. Верашчагінай. Яна ж даследавала пытанне фарміравання канфесій на Беларусі ў XX ст. характар іх дзейнасці, месца і ролю ў сучасным грамадстве. Ей належаць такія даследаванні як «Гісторыя канфесій на Беларсі ў другой палове XX ст. ». (1999) у сааўтарстве з А. В. Гурко, «Гісторыя канфесій на Беларусі ў XX ст. », (2000), «Канфесіі, характар іх дзейнасці, адносіны, месца і роля ў сучасным беларускім грамадстве», (2000).

Працягам сумеснай працы з А. В. Гурко сталі абагульняючыя працы па гісторыі канфесій Беларусі «Гісторыя канфесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць» (2000), «Рэлігія і царква» (2005).

Традыцыйна высокая ўвага з боку беларускіх этнолагаў даставалася даследванням матэрыяльнай культуры. Вынікі даследавання промыслаў і

рамèстваў, іх развіцця на працягу многіх стагоддзяў, з часу фарміравання беларускага этнасу да канца XX ст., падведзены ў абагульняючай працы «Беларусы. Т. 1.Прамысловыя і рамèсныя заняткі» (1995), у якой адлюстраваны мнагавекавы шматгранны вопыт і талент беларускага народа, высокі ўзровень культуры ў рамесна-прамысловай дзейнасці.

На прыканцы XX – пачатку XXI ст. быў апублікаваны шэраг манаграфій А. І. Лакоткі аб беларускім дойлідстве: «Беларускае народнае дойлідства» (1991), «Сілуэты старога Мінска.

Нарысы драўлянай архітэктуры» (1991), «Беларусы. Т. 2. Дойлідства» (1997), «Нацыянальныя рысы беларуска архітэктуры» (1999), «Драўлянае сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі» (2003), «Архітэктурная спадчына Беларусі» (2004). Аўтар гэтых прац вылучыў і сістэматызаваў агульныя рэгіянальныя асаблівасці вясковага жылля беларусаў, прааналізаваў яго этнічныя рысы, распрацаваў тыпалагічную класіфікацыю ўсіх кампанентаў вясковага жылога комплекса, якая ўлічвае не толькі канструктыўныя асаблівасці, але і сацыяльна-эканамічныя, і культурна-гістарычныя фактары, даследаваў уплыў ландшафтных умоў на фарміраванне жылога асяроддзя, узаемасувязь вясковага і традыцыйнага гарадскога жылля, раскрыў ролю ўсходнееўрапейскіх і заходнееўрапейскіх традыцый у эвалюцыі беларускіх гарадоў, ахарактарызаваў гістарычныя працэсы зменлівасці тыпаў паселішчаў, выявіў прычыны рэгіянальных адрозненняў беларускага сакральнага дойлідства, да якіх адносяцца адчуванне маштабу і суразмернасці ў асяроддзі, традыцыйнае разуменне суадносін гармоніі і памераў, светапоглядныя ўяўленні аб прыгажосці той ці іншай формы, кампазіцыі (яруснай, восевай). А. І. Лакотка стварыў новую навуковую канцэпцыю гістарычнага феномена беларускай архітэктуры як своеасаблівага сінтэзу ўсходнееўрапейскіх і заходнееўрапейскай традыцый дойлідства, яскрава паказаў, што беларускае дойлідства з’яўляецца адной з выразных культурных адзнак беларускага этнасу, прасачыў эвалюцыю архітэктуры беларускага этнасу з часоў яго фарміравання да сèнняшніх дзèн. Вынікі навуковых даследаванняў А. І. Лакоткі адкрываюць новыя гарызонты для пошуку сучасных форм мастацка-стылèвай выразнасці планіроўкі і забудовы паселішчаў, для дэталèвага вывучэння рэгіянальнай і лакальнай спецыфікі беларускага дойлідства, для рэстаўрацыі архітэктурных помнікаў Беларусі

Беларускімі этнолагамі была звернута ўвага і на іншыя часткі традыцыйнай матэрыяльнай культуры.

Гісторыі традыцый харчавання беларусаў прысвечана даследаванне Т. А. Навагродскага «Беларуская народная кулінарыя XIX – пачатку XX ст.» (1995). Ён распрацаваў сучасны тэарэтычны падыход да аналізу традыцый харчавання беларусаў, вызначыў стан вывучэння традыцый харчавання беларусаў у этналагічнай літаратуры, распрацаваў класіфікацыю страў беларускай народнай кулінарыі XIX – пачатку XX ст, тыпалогію трапез, прасачыў змены ў традыцыях харчавання беларусаў у XIX – пачатку XX ст.

Значную навуковую цікавасць прадстаўляюць манаграфіі «Жаночы касцюм на Беларусі» (2007) і «Мужчынскі касцюм на Беларусі» (2007), якія

былі створаны калектывам аўтарам (В. М. Бялявіна і Л. В. Ракава). У даследванні ўпершыню на аснове разнастайных гістарычных крыніц (старажытных летапісаў, хронік, актавых дакументаў XV–XVIII стст. і інш.), этнаграфічнай і этналінгвістычнай літаратуры XIX– XX стст. комплексна, ва ўсёй сваёй шматварыянтнасці паказаны працэс развіцця жаночага і мужчынскага касцюма розных сацыяльных слаёў насельніцтва Беларусі з глыбокага мінулага да сучаснасці. Неабходна падкрэсліць, што даследаванне ўтрымлівае багаты арыгінальны ілюстратыўны матэрыял з малюнкаў,рэканструкцый, фотаздымкаў.

Даследванню беларускага народнага мастацтва прысвечаны працы В. Фадзеевай «Беларускі ручнік» (1994) і В. Лабачэўскай «Повязі часоў – беларускі ручнік» (2002), Я. Сахута «Народнае мастацтва», І. Назінай «Беларускія народныя музычныя інструменты» (1997). Традыцыям беларускай музычнай культуры была прысвечана калектыўная манаграфія «Беларуская этнамузыкалогія: Нарысы гісторыі (XIX– XX стст.)» (1997) аўтарамі якой былі З. Мажэйка, Т. Варфаламеева, І. Назіна.

Была распрацавана і праблема гістарычна-этнаграфічнага раянавання традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларускага этнасу. Найбольш поўнае абагульненне этналагічных матэрылаў па гэтай праблеме зроблена В. С. Цітовым («Гістарычна-культурныя раёны Беларусі» 2002). Высновы супрацоўнікаў Інстытута аб рэгіянальных асаблівасцях матэрыяльнай культуры сталі навуковай базай для стварэння Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Гэта праца была распачата яшчэ ў другой палове 70-х гг. XX ст. Ён стаў першым беларускім этнаграфічным музеям скансенам. Яго экспазіцыя знаходзіцца ў в. Строчыца на беразе р. Пціч побач з Мінскам. Экспазіцыйная структура музея ўключае 6 архітэктурна-этнаграфічных сектараў, якія адпавядаюць гісторыка-этнаграфічным рэгіёнам рэспублікі: Паазер’е (Поўнач Беларусі), Падняпроўе (басейн Дняпра і Сожа), Цэнтральны рэгіён, Усходняе і Заходняе Палессе, Панёманне (басейн Нёмана). Пакуль створаны толькі тры раёна: Цэнтральная Беларусь (Менская вобласць), Паазер’е (Віцебская вобласць) і Падняпроўе (Магілёўская вобласць). Усе помнікі драўлянай архітэктуры аб’ядноўваюцца ў комплексы, адлюстроўваючы традыцыйны характэрны этнаграфічнаму рэгіёну тып селішча, сядзібы і г. д. Вялікі ўдзел у стварэнні гэтага музея прынялі супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы АН Беларусі на чале з А. І. Лакотка, аўтарам шматлікіх прац па беларускай народнай архітэктуры.

Яшчэ адзін музей-скансэн быў створаны ў 1994 г. у в. Дудуткі Мінскага р-на пісьменнікам Е. Будзінасам. На сённяшні дзень Музей старажытных промыслаў і тэхналогій Дудуткі прапануе наведвальнікам пазнаеміцца са старадаўнімі беларускімі тэхналогіямі ў кузні, млыне, сталярнай майстэрні, сыраварні і г. д.

На пачатку XXI ст. адбылося абнаўленне экспазіцый Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, адчыненага ў Мінску ў 1979 г.

Этнаграфічная частка экспазіцыі дазваляе пазнаёміцца з матэрыяльнай культурай беларусаў XIX–XX стст.: прылады працы, прылады для рыбалоўства, пчалярства, ткацтва, сталярства, бандарства. Частка калекцыі прысвечана ўзорам керамікі, керамічным цацкам, кафлі. У экспазіцыі музея прадстаўлена цудоўная калекцыя народнага адзення – навагарудскі строй, кобрынскі строй, маларыцкі, ткацкія вырабы – посцілкі, ручнікі, абрусы, паясы. Працягваюць збіраць і захоўваць этнаграфічныя матэрыялы

Веткаўскі музей народнай творчасці (1987), які адлюстроўвае цікавую асаблівасць рэгіёна, звязаную з культурай старавераў на Беларусі і Музей этнагарфіі ў Магілёве (1981)

**Тэараэтычны матэрыял да лекцыі № 3**
**Этнічная гісторыя Беларусі - 2 гадзіны**

1. Старажытнейшае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў эпоху старажытнакаменнага веку.
2. Перадумовы фарміравання беларускага этнасу ў раннім сярэднявеччы.
3. Фарміраванне тэрыторыі Беларусі ў познім сярэднявеччы.
4. Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў: велікаруская, велікапольская, старажытна-руская, крывіцкая, крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая, балцкая, фіна-угорская, эвалюцыйна-дыфузійная.
5. Этнічнае развіццё беларускага народа.
6. Фарміраванне беларускай нацыі. Беларуская нацыя ў 20—90-я гг. XX ст.
7. Беларуская дыяспара. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны.

Этнічную гісторыю Беларусі ўмоўна можна падзяліць на два перыяды.

Першы — даіндаеўрапейскі перыяд. Яго храналагічныя рамкі: 40 тыс. гадоў да н.э. 32 тыс. гадоў да н.э. Даіндаеўралейскі перыяд характарызуецца панаваннем такіх форм гаспадаркі, як паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва. Ён супадае з каменным векам, калі адбылося засяленне чалавекам тэрыторыі сучаснай Беларусі.

У навуковай літаратуры маецца некалькі пунктаў гледжання наконт часу з'яўлення на сучаснай беларускай тэрыторыі першых людзей.

Адны даследчыкі лічаць, што гэта адбылося 100 тыс. гадоў таму (сярэдні палеаліт). Прыкладнаў канцы сярэдняга палеаліту ў асноўным завяршылася фарміраванне чалавека сучаснага фізічнага тыпу — неаантрапа (краманьёнца).

Другія лічаць, што першыя людзі на беларускіх землях з'явіліся 40 тыс. гадоў таму, у верхнім палеаліце, падчас існавання чалавека разумнага, калі працэс антрапагенезу ўжо завяршыўся.

У 1926 г. беларускі археолаг К.М.Палікарповіч знайшоў дзве першыя і пакуль адзіныя на Беларусі палеалітычныя стаянкі чалавека — адну каля в.Бердыж (Чачэрскі р-н Гомельскай вобл.), другую — на Прыпяці, недалёка ад

Мазыра, каля в.Юравічы. Пры раскопках Бердыжскай стаянкі высветлілася, што культурны пласт верхняга палеаліту метрам вышэй быў перакрыты пластом з крэменем болып архаічнага выгляду (апошні, магчыма, быў змыты і перанесены водамі з суседняй болып старажытнай стаянкі). Сярод знаходак гэтага старажытнага пласта Палікарповіч вылучыў некалькі скрабкоў, тыповых прылад мусцьерскай стадыі палеаліту. Акрамя таго, каля Быхава, у раёне Свяцілавіч і іншых месцах Беларусі былі знойдзены вырабы з крэменю — скрабкі, якія мелі мусцьерскі выгляд. Усё гэта дазволіла Палікарповічу зрабіць вывад аб з'яўленні людзей на тэрыторыі Беларусі ў сярэднім палеаліце (100- 40 тыс. гг. таму назад).

Аднак у 60- 90-я гады вучоныяархеолагі (У.Д.Будзько, А.Г.Калечыц і інш.) перагледзелі матэрыялы па палеаліту Беларусі і не пагадзіліся з вывадамі К.М.Палікарповіча. У шэрагу прац яны прыйшлі да высновы, што знаходкі Бердыжскай стаянкі не выходзяць за рамкі верхнепалеалітычнай культуры, таму сцвярджаць аб магчымасці з'яўлення людзей на беларускіх землях у сярэднім палеаліце можна толькі ў гіпатэтычным плане.

Матэрыялы з Бердыжа далі дзве даты — 23 і 15 тыс. гадоў таму. Юравіцкая стаянка датуецца 26 тыс. гадоў таму. Гэта пакуль што самыя раннія даты, звязаныя са з'яўленнем чалавека на тэрыторыі Беларусі. Яны не выходзяць за рамкі верхняга палеаліту, і з іх трэба сёння пачынаць гісторыю Беларусі.

Насельніцтва ў палеаліце было нешматлікім. На кожнай стаянцы жыло ў сярэднім па 25 чалавек. На вядомыя нам Бердыжскую і Юравіцкую стаянкі прыходзілася 50 жыхароў. Але мы не ведаем дакладна, колькі было такіх стаянак. Мабыць, няшмат. Як лічыць беларускі гісторык і археолаг Э.М.Загарульскі, колькасць верхнепалеалітычнага насельніцтва не перавышала сотні чалавек (Загорульскіій Э.М. Начало формнрования населення Белорусснн. Мн., 1996. С.43).

Раскопкі Бердыжскай і Юравіцкай стаянак паказалі, што ўжо тады існавала раннерадавая абшчына. Спажыванне было калектыўным. Ажыццяўлялася ўраўняльнае размеркаванне прадуктаў палявання і рыбалоўства паміж членамі абшчыны. Некалькі абшчын аб'ядноўваліся ў род. У яго склад уваходзілі ўсе сваякі па маці. Такі род называўся мацярынскім. Род быў уласнікам пэўнай тэрыторыі, вёў агульную гаспадарку, меў агульную маёмасць

Прыкладна 16 тыс. гадоў таму адбылося моцнае пахаладанне, і чалавек на доўгі час пакінуў тэрыторыю Беларусі. Прыблізна 10 — 8 тыс. гадоў да н.э. закончыўся ледніковы перыяд. Пачалося інтэнсіўнае асваенне новых тэрыторый. Гэту эпоху называюць мезалітам (сярэдні каменны, век, 8 5 тыс. гг. да н.э.).У мезаліце адбылося поўнае засяленне чалавекам тэрыторыі Беларусі. Адзін са шляхоў засялення ішоў з паўднёвага ўсходу, з Рускай раўніны. Патомкі верхнепалеалітычнага насельніцтва занялі ў асноўным Усходнюю Беларусь Верхняе Падняпроўе. Другі паток ішоў з поўдня па Дняпры, яго асноўнае насельніцтва рассялілася ў Сярэдняй Беларусі і Усходнім Палессі, а частка дасягнула паўднёвых раёнаў Заходне-Дзвінскага басейна і Панямоння.

Трэцяя міграцыйная хваля распаўсюдзілася на паўднёва-заходнія раёны Беларусі і была звязана з рухам насельніцтва з Паўднёвай Польшчы. 1 нарэшце, чацвёртая група плямён прыйшла з Заходняй Еўропы цераз Полыпчу і рассялілася ў Заходняй Беларусі і суседняй Літве.

На Беларусі вядома 120 мезалітычных стаянак, у тым ліку на Палессі — 61. У мезаліце ў далінах буйных рэк Беларусі жыло ўжо першае сталае (аўтахтоннае) насельніцтва. З'явіліся і болып складаныя прылады працы:крамянёвыя пласціны, сякеры, цёслы, разцы, скрабкі, скоблі. Памочнікам чалавека на паляванні стаў сабака. У гаспадарцы значнае месца займала рыбалоўства.

Каменны век завяршыўся эпохай неаліту (новы каменны век, 4—3 тыс. гг. да н.э.). У басейне Прыпяці даволі шчыльна было заселена яе вярхоўе і суседнія азёры, берагі Стыры, Гарыні, Ясельды, раёны Нароўлі і Мазыра. На тэрыторыі сучаснай Беларусі выяўлена больш за 500 паселішчаў эпохі неаліту, агульная колькасць насельніцтва 27- 36 тыс. чалавек. Паблізу жылля вырабляліся крамянёвыя прылады. Крэйдавы крэмень здабывалі ля берагоў Сожа, Бесядзі, Нёмана, Ясельды. Таму і закладваліся шахты, што пацвярджаецца іх рэшткамі, выяўленымі паблізу пас. Краснасельскі Ваўкавыскага раёна.

У эпоху неаліту з'явіўся гліняны посуд, пераважна вастрадонны, зроблены ў тэхніцы ручной лепкі, з арыгінальнымі арнаментамі і іх размяшчэннем. Па тыпах посуду і арнаментах археолагі вызначаюць асобныя неалітычныя культуры: нёманскую, грабеньчатанакольчатай керамікі (днепраданецкую), з тыповай ямачнаграбеньчатай керамікай, верхне-дняпроўскую і дзяснінскую. З'явілася таксама прадзенне і ткацтва, значныя поспехі дасягнуты ў апрацоўцы дрэва. Пастаянна ўдасканальваліся прылады працы: сякера, цясла, долата. 3 эпохі неаліту дайшлі да нас некаторыя мастацкія вырабы: галава качкі з косці, драўляная галава чалавека, зробленая з косці выява гадзюкі з галоўкай і арыгінальна перададзенай скурай і інш.

Вызначыць этнічную прыналежнасць старажытнага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў палеаліце, мезаліце і на працягу болыпай часткі неаліту няма магчымасці. Мовы гэтага насельніцтва невядомы. Сляды іх не знойдзены.

Разам з тым даныя археалогіі і гістарычнага мовазнаўства, у прыватнасці гідраніміі (старажытных назваў рэк, азёр), даюць магчымасць вызначыць этнічную прыналежнасць некаторых груп мясцовага насельніцтва ў канцы каменнага веку.

Прыкладна ў III тысячагоддзі да н.э. у Падзвінні і Падняпроўі з'явілася фіна-угорскае насельніцтва, а накрайнім паўднёвым захадзе Падпрыпяцця невялікія групы індаеўрапейскага насельніцтва. Пачаўся паступовы пераход да вытворчай гаспадаркі земляробства і жывёлагадоўлі. Гэты вялікі ў гісторыі чалавецтва гаспадарчы пераварот атрымаў назву неалітычнай рэвалюцыі.

Другі, індаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі пачаўся ў бронзавым веку з часу рассялення на яе тэрыторыі індаеўрапейскіх плямён (32 тыс. гг. да н.э. да нашага часу).

Прыкладна 32 тыс. гадоў да н.э. адбыўся дэмаграфічны выбух. На велізарных прасторах Еўропы ад Рэйна на захадзе да верхняй і сярэдняй Волгі

на ўсходзе, ад Прычарнамор'я на поўдні да Скандынавііна поўначы рассяліліся плямёны жывёлаводаў-вандроўнікаў — плямёны індаеўрапейскай моўнай групы.

Існуе некалькі канцэпцый прарадзімы індаеўрапейцаў. У мінулым стагоддзі панавала канцэпцыя еўрапейскай прарадзімы (Паўночная Германія і Паўднёвая Скандынавія), сфарміраваная і абгрунтаваная нямецкімі вучонымі пад уплывам іх пангерманскіх настрояў. У больш позні час гэта канцэпцыя атрымала расісцкую афарбоўку і была ўзята на ўзбраенне фашысцкімі заправіламі Германіі. Адзінымі сапраўднымі патомкамі праіндаеўрапейцаў, без аніякіх прымесяў, "чыстымі" арыйцамі (арыямі называла сябе ў старажытнасці адна з усходніх індаеўрапейскіх груповак) былі аб'яўлены германскія народы.

Аднак гэта канцэпцыя не давала адказаў на многія пытанні. Лінгвістычныя матэрыялы паказвалі, што індаеўрапейцы з даўніх часоў былі жывёлаводамі і гэту форму гаспадаркі разнеслі па ўсімсвеце разам са сваёй міграцыяй. У той жа час археалагічныя матэрыялы сведчылі, што ў Паўночнай Еўропе жывёлагадоўля распаўсюдзілася пазней, чым, напрыклад, на Балканах, што ў Еўропе насельніцтва рухалася з поўдня на поўнач, а не наадварот.

Таму ў канцы ХІХ пачатку ХХ ст. шырокае распаўсюджанне атрымала балканская канцэпцыя, Яна ў многім давала адказы на тыя пытанні, на якія не адказвала канцэпцыя паўночна-еўрапейскай лакалізацыі праіндаеўрапейцаў. Былі прапанаваны і іншыя ідэі, якія разглядалі ў якасці прарадзімы індаеўрапейцаў паўднёвыя стэпы Усходняй Еўропы і значныя раёны Сібіры, што супярэчыць прынятым у навуцы ўяўленням аб тым, што пачатковая вобласць прарадзімы этнасаў не павінна быць вялікай (Загорульский Э.М. Начало формирования населения Белоруссии. С.22 — 23).

У 70 — пачатку 80-х гадоў спецыялістамі па старажытных індаеўрапейскіх мовах В.Івановым і Т.Гамкрэлідзе прапанавана канцэпцыя пярэдне-азіяцкай прарадзімы праіндаеўрапейцаў. Было высветлена, што праіндаеўрапейцы жылі на поўдні, сярод гор. Яны ведалі горныя леднікі, хуткія горныя рэчкі і горную расліннасць. Сярод вядомых ім звяроў былі леў і слон. Суседзямі праіндаеўрапейцаў былі семіцкія плямёны і картвельскія народы (продкі грузін). Гэтым самым выключаецца як паўночна-еўрапейская, так і балканская зона. Прарадзіма праіндаеўрапейцаў знаходзілася ў Пярэдняй Азіі. Канцэпцыя пярэдне-азіяцкай прарадзімы праіндаеўралейцаў з'яўляецца найбольш абгрунтаванай вынікамі даследаванняў сумежных навук (археалогіі, этнаграфіі, тапанімікі і інш.). Яна мае шмат прыхільнікаў сярод спецыялістаў розных галін ведаў.

У сувязі з перанаселенасцю праіндаеўрапейскімі плямёнамі іх прарадзімы, бурным развіццём жывёлагадоўлі і земляробства, паляпшэннем умоў жыцця людзей, скарачэннем дзіцячай смяротнасці, павелічэннем працягласці жыцця, шчыльнасці і колькасці насельніцтва, неабходнасцю асваення новых тэрыторый для адначасовага павелічэння пагалоўя жывёлы прыкладна 4—3 тыс. гадоў да н.э. пачалася вялікая міграцыя праіндаеўрапейскіх плямён на прасторах Азіі і Еўропы. Міграцыя заняла некалькі тысяч гадоў, і за гэты час змяніліся многія пакаленні людзей.

З тэрыторыі прарадзімы праіндаеўрапейцы мігрыравалі на захад, усход і поўнач. На захадзе яны прайшлі Малую Азію, выйшлі да Эгейскага мора, засялілі Балканы. Адна частка з іх абагнула Чорнае мора, прайшла праз тэрыторыю сучасных Балгарыі, Румыніі, Малдавіі, асвоіла Правабярэжную Украіну, стварыўшы там трыпольскую культуру. Гэта адна са старажытных індаеўрапейскіх міграцыйных хваль.

Была спроба прайсці Каўказ, дзе выяўлены цікавыя культуры індаеўрапейцаў. Сусветнай вядомасцю карыстаецца Майкопскі курган (3 тыс. гг. да н.э.), дзе знойдзены вырабы з золата і серабра. Пазней, у бронзавым веку, адбылося пранікненне індаеўрапейцаў на Каўказ (трыалецкая культура).

Частка праіндаеўрапейцаў рухалася на ўсход праз Іранскае пласкагор'е, адны выйшлі на тэрыторыю сучаснага Кітая, другія — на Індастанскі паўвостраў і сталі вядомыя як арыі. Асобная група індаеўрапейцаў ад Ірана павярнула на поўнач у Сярэднюю Азію. Яна прайшла паміж Каспійскім і Аральскім марамі, апынулася ў прыволжскіх стэпах і працягвала свой рух на захад да Дняпра, у Паўночнае Прычарнамор'е (старажытнаямная культура). Гэты магутны міграцыйны паток стаў крыніцай рассялення індаеўрапейцаў у Еўропе, у тым ліку і на Беларусі.

Пры сустрэчы з мясцовым насельніцтвам індаеўрапейцы, якія знаходзіліся на болып высокай ступені сацыяльна-эканамічнага развіцця (панавалі жывёлагадоўля і земляробства, выкарыстоўваўся метал, у той час як мясцовае насельніцтва займалася паляваннем, рыбалоўствам і збіральніцтвам), перамагалі яго і асімілявалі. Выключэннем было насельніцтва Індыі і Кітая. Індаеўрапейцы з'яўляліся вынаходнікамі кола і калёснага транспарту, патрэба ў якім была прадыктавана міграцыяй, іх рухомым ладам жыцця. Кола калясніц рабілі тады з кавалка дрэва цвёрдай пароды, пазней з металу. Новай з'явай стала пахаванне ў курганах, што было звязана з прыходам у Еўропу жывёлаводаў і земляробаў. Індаеўрапейцы прынеслі і больш высокую форму грамадскай арганізацыі — патрыярхат.

Пастулова ў выніку міграцыі і змешвання з карэнным насельніцтвам, а таксама пад уздзеяннем розных геаграфічных умоў індаеўрапейцы страчвалі сваё адзінства і нават падабенства і пераўтвараліся ў мазаіку народаў, іх культур і моў. Некаторыя даследчыкі налічваюць каля 40 народаў, якія з'явіліся вынікам змяшэння^ праіндаеўрапейцаў з мясцовым насельніцтвам. Да індаеўрапейцаў адносяцца народы, якія гавораць цяпер на славянскіх, германскіх, балцкіх, італійскіх (раманскіх), кельцкіх, індаіранскіх, грэчаскай, армянскай і албанскай мовах, прычым славяне, балты і германцы з'яўляюцца найболып блізкімі паміж сабой. Магчыма, яны развіліся ад адзінага продка паўночнай групы індаеўрапейцаў.

З тэрыторыі Паўднёва-Усходняй Еўропы і Паўночнага Прычарнамор'я індаеўрапейцы мігрыравалі ў двух асноўных напрамках: першы на захад і паўночны захад, у Заходнюю Еўропу; другі на поўнач, у Сярэднюю і Паўночную Еўропу. У IIIII тысячагоддзі да н.э. на вялікай тэрыторыі, якая ахоплівала басейны Віслы, Нёмана, Заходняй Дзвіны, Верхняга Падняпроўя, у выніку асіміляцыі мясцовага неалітычнага насельніцтва індаеўрапейцамі

адбываецца фарміраванне адной з галін індаеўрапейскай мазаікі народаў балтаў (літоўцы, латышы, прусы, яцвягі, куршы, земгалы, селы і інш.). На поўдні і паўднёвым усходзе балты межавалі са скіфамі, сарматамі і іншымі плямёнамі, на поўначы і паўночным усходзе іх суседзямі былі фінаугорскія плямёны, на захадзе — славяне і германцы.

У рамках індаеўрапейскага перыяду вылучаецца балцкі этап этнічнай гісторыі Беларусі, які храналагічна супадае з эпохай металу (32 тыс. гг. да н.э. IVV стст. н.э.).

Балты, якія прыйшлі на Беларусь з Сярэдняга Падняпроўя, засвойвалі мясцовы даіндаеўрапейскі субстрат. На працягу II тысячагоддзя да н. э. адбываўся працэс змешвання балтаў (індаеўрапейцаў) з мясцовым насельніцтвам, асіміляцыі апошняга: "чыстых" этнасаў не існуе, усе этнасы ўтвараюцца ў выніку змешвання народаў. Першапачаткова балты пасяліліся ў Папрыпяцці і Падняпроўі, а на поўначы Беларусі яшчэ тысячу гадоў мела ўплыў фінаугорскае насельніцтва. З рассяленнем індаеўрапейцаў змяніўся не толькі этнічны склад насельніцтва Беларусі, але змянілася і эпоха.

Каменны век уступіў месца бронзаваму веку (32 тыс. гг. да н.э. 1 тыс. гг. да н.э.). Старажытная эканоміка, заснаваная на рыбалоўстве, паляванні і збіральніцтве, пастунова замянялася земляробствам і жывёлагадоўляй. Індаеўрапейцы займаліся плужным земляробствам. Плуг вядомай канструкцыі, які дайшоў да нас у малюнках таго часу, быў знойдзены ў тарфяніку каля в.Капланавічы ў Клецкім раёне.

Індаеўрапейцы пакланяліся агню і сонцу. Агню надавалася значэнне ачышчальнай сілы, з ім асацыіраваўся чырвоны колер. Праяўленнем культу агню быў звычай пасыпаць цела нябожчыка мінеральнай чырвонай охрай, якая потым пераходзіла на косці, і пры раскопках робіцца ўражанне, быццам косці спецыяльна малявалі.

З дзейнасцю індаеўрапейцаў звязваюць арнамент, якім упрыгожвалі посуд, адбіткі шнура, накручанага на палачку. Такі арнамент называўся шнуравым, а археалагічная культура — культурай шнуравой керамікі. Яе арэалы распаўсюджання ахоплівалі вялікія тэрыторыі Еўропы, у тым ліку і землі Беларусі. З сярэдзіны бронзавага веку тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў арэал культур сярэднедняпроўскай, вісланёманскай, шнуравой керамікі Палесся, а таксама паўночнабеларускай.

Выкарыстанне больш эфектыўных бронзавых прылад працы, поспехі ў зямляробстве і жывёлагадоўлі стварылі ўмовы для накаплення багацця асобнымі сем'ямі, што было прывабай для іншых. Грабяжы і разбоі сталі адной з форм узбагачэння. Таму асноўным тыпам пасяленняў балтаў былі ўмацаваныя гарадзішчы, якіх на тэрыторыі Беларусі налічвалася каля 1 тыс. Па даных археолагаў,.на адным гарадзішчы жыло ў сярэднім ад 50 да 75 чалавек. Агульная колькасць насельніцтва ў бронзавым веку магла быць у памерах ад 50 да 75 тыс. чалавек. З развіццём земляробства гарадзішчы змяніліся адкрытымі селішчамівёскамі, дзе жылі некалькі вялікіх, а потым і малых сем'яў.

Трэба адзначыць, што неалітычнае насельніцтва Беларусі не было поўнасцю асімілявана. Яшчэ існавалі ранейшыя гаспадарчыя і культурныя

традыцыі. Некаторыя рэгіёны Беларусі былі слаба заселены балтамі. Але на болыпай частцы яе тэрыторыі сфарміраваўся балцкі этнас. Аб гэтым сведчыць той факт, што пераважная болыпасць назваў рэк (Верхіта, Волча, Гайна, Грыўда, Друць, Клёва, Лучоса, Мытва, Нача, Палата, Ула, Усяжа, Эса і інш.) захавалі карані і характэрныя канчаткі, якія ёсць у літоўскай і латышскай, г.зн. балцкіх, мовах. Можна прыгадаць і іншыя назвы, якія адносяцца да балцкай гідраніміі: Асвея, Дрысвяты, Лосвіда, Муйса, Нарач, Усвяча і інш. Найболып часта сустракаюцца гідронімы, звязаныя з балтамі, у басейнах рэк Бярэзіны (Мена, Ольса, Серуч, Уса) і Сожа (Рэхта, Рэста, Сноў, Туросна).

Паходжанне тэрміна "балты" звязваюць з лацінскай назвай вострава на поўначы Еўропы (ВаШа, Ваісіа), які апісаў Пліній Старэйшы (І ст. н.э.). Словы з коранем "балты" сустракаюцца ў германскага храніста Адама Брэменскага (ІІст.), у прускіх хроніках, старажытнарускіх і беларускалітоўскіх летапісах XIV — XVI стст. У навуковы ўжытак тэрмін "балты" ўведзены нямецкім лінгвістам Г.Несельманам у 1845 г. •

На тэрыторыі Беларусі ў жалезным веку (1 тыс. гг. да н.э. — IV— V стст. н.э.) сфарміравалася некалькі археалагічных культур: днепрадзвінская (на поўначы), культура штрыхаванай керамікі (сярэдняя і паўночназаходняя часткі Беларусі), мілаградская і зарубінецкая (на поўдні Беларусі). Культуры жалезнага веку былі дастаткова развітымі. Мясцовыя плямёны асвоілі жалезаапрацоўку, вырабы з жалеза былі дастаткова разнастайнымі: сякеры, нажы, сярпы, зброя, упрыгажэнні і г.д.

Такім чынам, балцкі этап этнічнай гісторыі Беларусі гэта час распаўсюджання на беларускіх землях індаеўрапейцаў з іх асноўнымі заняткамі — земляробствам і жывёлагадоўляй, час інтэнсіўнай асіміляцыі мясцовага неалітычнага насельніцтва, у тым ліку і фінаугорскага на поўначы Беларусі. Мясцовае неалітычнае насельніцтва паступова трансфармавалася ў індаеўрапейцаўбалтаў, адначасова аказваючы пэўны ўплыў на іх мову і культуру.

Новы, славянскі этап этнічнай гісторыі Беларусі пачаўся ў раннім сярэднявеччы. Яго храналагічныя рамкі: IV-V стст. н.э. да нашага часу.

Пра паходжанне славян вучоныя выказалі мноства супярэчлівых гіпотэз, асабліва пра месцазнаходжанне іх прарадзімы. Адны даследчыкі сцвярджалі аб лакалізацыі славян у Прыпяцка-Сярэднедняпроўскім рэгіёне (Ю.Растафінскі, К.Машынскі, Ф.Філін і інш.), другія вучоныя змяшчалі іх прарадзіму ў Вісла-Одэрскім міжрэччы (Т.Лер-Сплавінскі, Ю.Кастшэўскі, Я.Чаканоўскі і інш.), трэція — на шырокіх прасторах ад Одэра да Дняпра (Л.Нідэрле, П.Траццякоў, В.Генсель, Б.Рыбакоў і інш.).

Вучоныя пангерманскага накірунку сцвярджаюць, што славяне прыйшлі на нашу тэрыторыю з Азіі і паўднёвых стэпаў Усходняй Еўропы. Гэта т.зв. канцэпцыя "ўсходняй лакалізацыі славян", якая цалкам пабудавана на здагадках, быццам славяне азіяты, а немцы заўсёды жылі ў Германіі, дзе расце бук (т.зв. "букавы аргумент"), быццам славяне прыйшлі з Азіі ў Еўропу значна пазней, калі германцы пакінулі гэту тэрыторыю пасля "вялікага перасялення народаў".

Некаторыя вучоныя размяшчаюць на тэрыторыі Беларусі неўраў адзін з народаў, аб якім пісаў грэчаскі гісторык Герадот. Але іх лакалізацыя ў Герадота зусім супярэчлівая. Ён адзначаў, што за вобласцю, дзе жылі неўры, пачыналася пустыня. Растлумачыць гэта не магчыма. Іншыя вучоныя лічылі неўраў славянамі, тлумачачы па-свойму герадотаўскі аповяд аб здольнасці неўраў адзін раз на год пераўтварацца ў ваўкоў. Такой здольнасці не мае ніводны народ.

На падставе даных гісторыі, мовазнаўства, тапанімікі, археалогіі, антралалогіі і іншых навук многія даследчыкі сцвярджаюць, што з Паўднёва-Усходняй Еўропы і Паўночнага Прычарнамор'я індаеўрапейцы мігрыравалі не толькі на поўнач, у Сярэднюю і Паўночную Еўропу, дзе далі пачатак балтам, але і на захад і паўночны захад. Прыкладна ў III тысячагоддзі да н.э. яны з'явіліся ў Заходняй Еўропе, асімілявалі мясцовае насельніцтва, у выніку чаго ўтварылася яшчэ адна галіна індаеўрапейскай мазаікі народаў — славянская. Да II тысячагоддзя да н.э. працэс фарміравання славян у асноўным закончыўся (прыкладна 500 гадоў дастаткова для ўтварэння новых народаў).

Прарадзіму славян трэба шукаць паміж тэрыторыямі, якія ў III II тысячагоддзі да н.э. займалі, з аднаго боку, германцы (Ютландыя і Паўднёвая Скандынавія), а з другога — балты (Беларусь, Прусія, Літва, Латвія). У той час на поўнач і ўсход ад сучаснай Беларусі жылі фінаугорскія плямёны, на поўдзень ад яе іранамоўныя народы (скіфы і сарматы). Вядома там славян не магло быць. Адзіная тэрыторыя, якую можна лічыць прарадзімай славян, — гэта тэрыторыя паміж Эльбай, Віслай і Нёманам.

У' II тысячагоддзі да н.э. тэрыторыя, на якой жылі славяне, значна паменшылася ў сувязі з міграцыяй германскіх плямён з Ютландыі ўздоўж узбярэжжа Балтыйскага мора. Германскія плямёны злучыліся з балцкімі і адрэзалі славян ад мора, вось чаму ў апошніх марская тэрміналогія неразвітая.

Другая палова 1 тысячагоддзя н.э. была адзначана важнымі падзеямі ў гістарычным лёсе народаў Еўропы. Адыходзіла ў мінулае рабаўладальніцкая фармацыя, пачынаўся перыяд феадалізму. Славяне рабілі першыя крокі па перасяленню са сваёй прарадзімы.

Пасля другога "вялікага перасялення народаў", звязанага з распадам Рымскай імперыі, пад націскам плямён готаў і гунаў у IV VII стст. н.э. адбываецца значнае пашырэнне славянскага арэала, якое суправаджалася моўнай і этнічнай дыферэнцыяцыяй славян. Прычынамі славянскай міграцыі з'яляюцца:

- значнае павелічэнне колькасці славянскага насельніцтва на тэрыторыі паміж Эльбай, Віслай і Нёманам. Узровень развіцця гаспадаркі, перанаселенасць тэрыторыі выклікалі неабходнасць асваення новых зямель;

- славяне ў сваім сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці падышлі да класавага грамадства — перыяду ваеннай дэмакратыі. Маёмаснае размежаванне ў іх асяроддзі, грабежніцкія ваенныя напады падводзілі славян да захопу новых зямель;

- скарбы Рымскай імперыі, яе багатыя абшары вабілі да сябе славян. Акрамя таго, славяне ў той час адчулі на сабе націск з боку германцаў, авараў, хазараў і таму вымушаны былі шукаць новыя землі.

Са сваёй прарадзімы частка славян пачала масавы рух на поўдзень і ў VII — VIII стст. засяліла Балканы, землі сучаснай Югаславіі і Балгарыі, часткова Грэцыі, некаторыя іх групы дайшлі да Малой Азіі, Іспаніі, Сіцыліі, Паўночнай Афрыкі. У працэсе асіміляцыі смуглатварага фракійскага насельніцтва ўтварылася галіна славян, якіх называюць паўднёвымі славянамі (сёння гэта балгары, сербы, харваты, славенцы, македонцы і інш.).

Другая частка славян са сваёй прарадзімы рухалася на ўсход, дайшла да Дняпра, і ў VI — VII стст. на тэрыторыі сучаснай украінскай Валыні сфарміравалася новая галіна славян — усходнія славяне. На гэтай тэрыторыі ўсходнія славяне знаходзіліся да VIII IX стст., потым яны засялілі вялікія абшары Усходняй Еўропы да Дона, Акі, вярхоўяў Волгі (сёння гэта рускія, беларусы, украінцы).

Як мяркуюць некаторыя даследчыкі, тэрыторыя Беларусі на поўдзень ад Прыпяці была заселена славянамі ўжо ў VII VI стст. да н.э. Аб гэтым сведчаць старажытныя славянскія гідронімы (назвы рэк): Стыр, Стубла, Стубель, Свbooтоўка, Родча, Рубча і інш.

На тэрыторыі на поўнач ад Прыпяці яшчэ жылі народы балцкай галіны індаеўрапейцаў, сведчаннем чаго з'яўляюцц'а балцкія гідронімы: Лань, Арэса, Клева, Брожа, Ула, Гаўя, Эса і інш. Некаторыя ўральскія, фінаугорскія гідронімы (Дзвіна, Свір, Мардва і інш.) на поўначы Беларусі былі ўспрыняты балцкай групай індаеўрапейцаў. Утварыліся таксама гібрыдныя балтафінскія гідронімы, напрыклад Лынтупка, Дрыса.

Што датычыць заходніх славян (сёння гэта палякі, чэхі, славакі і сербылужычане), то яны засталіся на сваёй прарадзіме, нікуды не мігрыравалі і ні з кім не змешваліся. Да фарміравання беларускага этнасу заходнія славяне прамога дачынення не мелі.

Адначасова з пашырэннем славянскага арэала ішоў працэс утварэння ваеннаплемянных саюзаў антаў і склавінаў (славян). Звесткі пра гэтыя плямёны ёсць у аўтараў VI ст. Іардана, Іаана Эфескага, Пракопія Кесарыйскага і інш., якія адзначалі генетычную роднасць славянскай супольнасці або лічылі славян асобнымі адгалінаваннямі венедаў (упершыню гэта назва сустракаецца ў антычных аўтараў 1 II стст. Плінія Старэйшага, Тацыта, Пталамея). У VI — VIII стст. "склавіны", "склавены" паступова трансфармаваліся ў агульную назву "славяне", якая стала іх саманазвай.

Паступова абшчынна-племянная і ваенна-палітычная арганізацыя славян пачала замяняцца дзяржаўна-класавай, што садзейнічала складванню раннефеадальных славянскіх дзяржаў. Такімі дзяржавамі ў Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропе былі княствы Само ў Чэхіі, Першае Балгарскае царства, Велікамараўская, Польская і Сербская дзяржавы і інш. У межах гэтых дзяржаў пачалі фарміравацца славянскія народнасці: палякаў з плямён і племянных саюзаў палян, віслян, мазаўшан, памаран; чэхаў з чэхаў, дулебаў, лучан, дзячан. Утварыліся таксама са славянскіх плямён сербская, чарнагорская, баснійская,

македонская, харвацкая, балгарская і іншыя славянскія народнасці. Аднак такія працэсы адбываліся не ва ўсіх еўрапейскіх рэгіёнах. Там, дзе славяне складалі меншасць насельніцтва, яны самі паступова асіміляваліся. У Заходняй і Паўднёвай Еўропе славяне былі асіміляваны грэкамі, італьянцамі, венграмі, румынамі, немцамі. Акрамя таго, не ўсе славянскія плямёны змаглі захавацца і сфарміравацца ў народнасці. Напрыклад, палабскія і паморскія славянскія плямёны люцічы, вялеты, абадрыты і інш. у выніку нямецкай агрэсіі былі часткова знішчаны, а часткова анямечаны. Выключэнне складаюць лужыцкія сербы (сорбы), якія на тэрыторыі сучаснай Германіі захавалі сваю славянскую культуру, мову і самасвядомасць.

Гістарычны шлях славян Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы быў вельмі складаны. У X ст. пад уладай венгерскіх феадалаў апынуліся землі славакаў. У другой палове XIV— XVI стст. сербы, балгары, македонцы, чарнагорцы былі заняволены туркамі. Харваты, чэхі і славенцы былі ўключаны ў імперыю Габсбургаў. Спатрэбілася шмат часу, каб вызваліцца гэтым славянскім народам і стаць на шлях самастойнага развіцця.

Ва Усходняй Еўропе, г.зн. на тэрыторыі сучаснай Беларусі, Расіі і Украіны, славяне асімілявалі мясцовае, адпаведна балцкае, фіна-угорскае і цюркскае, насельніцтва. Рассяліўшыся, усходнія славяне ўяўлялі сабой адзіны народ, мелі агульную культуру, мову, а сваю назву атрымалі па месцы пражывання. У летапісах называюцца каля15 усходнеславянскіх супольнасцей дрыгавічы, радзімічы, крывічы, вяцічы, бужане, паляне, драўляне, валыняне і інш. Пазней яны ўвайшлі ва ўсходнеславянскае дзяржаўнае аб'яднанне — Кіеўскую Русь.

Раней адзначалася, што да VI — VII стст. на болыпай частцы тэрыторыі Беларусі пераважала балцкае насельніцтва. Славяне ў гэты час жылі кампактна, суцэльным масівам толькі ў басейне Прыпяці, галоўным чынам на поўдзень ад яе. Асноўным тыпам славянскіх пасяленняў былі селішчы (неўмацаваныя населеныя пункты), а тыпам жылля — паўзямлянка.

У VI — VII стст. пачалося пранікненне славян у балцкі арэал. У балтаў з'яўляюцца паўзямлянкі з пячамі-каменкамі, каменныя жорны, жалезныя нажы і іншыя славянскія рэчы, прылады працы.

У VIII — IX стст. адбываецца масавае рассяленне славян у балцкім арэале на тэрыторыі Беларусі спачатку ў верхнім цячэнні рэк Случ і Арэса, на правым беразе Дняпра, потым на Бярэзіне. У курганах знойдзены пахаванні па славянскаму абраду шляхам трупаспалення, а таксама славянская кераміка. Засяленне ішло з паўднёвай часткі Прыпяцкага басейна. Славяне праніклі ў Падняпроўе і Падзвінне ў IX ст., а да X ст. яны рассяліліся ў Верхнім Панямонні. Большая частка балцкага насельніцтва была асімілявана, другая — знішчана ці выціснута на паўночны захад, у Прыбалтыку, дзе прыняла ўдзел у фарміраванні этнічных літоўцаў і латышоў. Трэцяя частка балцкага насельніцтва працягвала жыць на сваіх былых месцах. Асіміляцыя гэтай часткі балтаў славянамі на тэрыторыі Беларусі працягвалася да XII — XIII стст. і нават пазней. У выніку славянабалцкага сінтэзу ў VIII X стст. узніклі новыя

этнічныя славянскія супольнасці, якія часта ўпамінаюцца ў сярэдневяковых пісьмовых крыніцах. Гэта дрыгавічы, радзімічы, крывічы.

Дрыгавічы займалі большую частку Паўднёвай і значную частку Сярэдняй Беларусі. У "Аповесці мінулых гадоў" адзначаецца, што яны жылі паміж Прыпяццю і Заходняй Дзвіной. У іх культуры пераважалі славянскія элементы. Мова была славянскай. Аднак у іх тагачаснай культуры зафіксаваны і балцкія элементы — спіральныя пярсцёнкі , змеегаловыя бранзалеты , падковападобныя спражкі. Дабалцкіх вытокаў адносіцца звычай пахавання нябожчыкаў у драўляных дамавінах-церамах.

Змешанае паходжанне дрыгавічоў у выніку славянабалцкага сінтэзу зафіксавана і ў назве гэтай супольнасці. Корань яе, відаць, балцкі. У літоўскай мове ёсць шмат слоў з гэтым коранем (сігё^пав — сыры, вільготны), якія адлюстроўваюць адну з асаблівасцеймясцовасці, дзе аселі дрыгавічы, а менавіта вільготнасць, забалочанасць зямлі ў парэччы Прыпяці.

Пазней да былой асновы было дададзона славянскае "ічы". Такім чынам, тэрмін "дрыгавічы" ўяўляе сабой славянізаваную назву былой, даславянскай формы, якая азначала групу балцкага насельніцтва ў адпаведнасці з асаблівасцю тэрыторыі пражывання. З геаграфічнай асаблівасцю тэрыторыі дрыгавічоў звязана і паходжанне слова "дрыгва" ў беларускай мове, што ў перакладзе на рускую азначае "тряснна".

Радзімічы, паводле звестак з "Аповесці мінулых гадоў", займалі землі паміж Дняпром і Дзясной. Асноўны арэал іх рассялення басейн р. Сож. Як і дрыгавічы, радзімічы сфарміраваліся ў выніку змяшэння славянскага і балцкага насельніцтва, асіміляцыі апошняга. У культуры пераважалі славянскія элементы. Мова была славянская. Разам з тым ў археалагічных помніках адзначаны і балцкія элементы:шыйныя грыўны, бранзалеты са стылізаванымі змяінымі галовамі, прамянёвыя спражкі.

Летапісная легенда аб паходжанні радзімічаў ад міфічнай асобы Радзіма адлюстроўвае, на наш погляд, хутчэй за ўсё біблейскі светапогляд аўтара гэтай легенды, чым існаванне сапраўднага чалавека. Тут мы сустракаемся з прыкладам міфатворчасці. На думку шэрага аўтараў (М.Піліпенка, Г.Хабургаеў), тэрмін "радзімічы" выяўляе блізкасць з балцкім тэрмінам "знаходжанне".

Крывічы займалі поўнач Беларусі і суседнія раёны Падзвіння і Падняпроўя (Пскоўшчыну і Смаленшчыну). Яны жылі ў вярхоўях рэк Заходняй Дзвіны, Дняпра і Ловаці і былі найбольш шматлікім усходнеславянскім насельніцтвам. Культура крывічоў дзялілася на дзве вялікія групы: полацка-смаленскую і пскоўскую.

У этнічным абліччы пераважалі славянскія рысы. Мова была славянскай. Да балцкіх элементаў у культуры крывічоў трэба аднесцібранзалеты са змяінымі галовамі, спіральныя пярсцёнкі, грыўны балцкага тыпу і г.д.

Што да назвы "крывічы", дык існуе некалькі гіпотэз. Адны вучоныя (гісторык В.Ластоўскі) выводзяць назву "крывічы" ад слова "кроў";тады яе можна разумець як "сваякі па крыві", "крэўныя". Вядомы гісторык С.М.Салаўёў сцвярджаў, што назва "крывічы" звязана з характарам мясцовасці, якую займала

гэта супольнасць (узгоркаватая, няроўная крывізна). Вялікая група вучоных (археолаг П.М.Траццякоў, гісторык Б.А.Рыбакоў, беларускі філолаг і гісторык М.І.Ермаловіч) сцвярджаюць, што ў назве "крывічы" захавалася імя язычніцкага першасвяшчэнніка Крыва-Крывейты.

Такім чынам, звесткі археалогіі, мовазнаўства, антрапалогіі сведчаць пра тое, што ранне-сярэдневяковыя этнічныя супольнасці дрыгавічоў, радзімічаў, крывічоў сфарміраваліся ў выніку змяшэння, сінтэзу славянскіх і балцкіх груп насельніцтва. У іх культуры і мове перапляліся славянскія і балцкія элементы з перавагай славянскіх рыс.

Менавіта крывічы, дрыгавічы, радзімічы, а не наступныя этнічныя супольнасці ўтрымлівалі ў сабе балцкі субстрат.Для характарыстыкі дрыгавічоў, радзімічаў, крывічоў важнае значэнне мае высвятленне тыпу гэтых этнічных супольнасцей. Неправамерна называць іх плямёнамі таму, што ў іх асяроддзі ўжо не было сацыяльнай роўнасці, аднолькавага становішча ўсіх членаў этнічнай супольнасці, знік родаплемянны падзел, з'явілася палітычнае кіраванне, утварыліся "княжанні", на чале якіх стаялі князі. Звесткі з археалогіі, пісьмовых крыніц сведчаць, што дрыгавічы, крывічы і радзімічы пераступілі мяжу абшчыннарадавога ладу і ўвайшлі ў пачатковы этап раннякласавага грамадства. Гэта пацвярджае і ўзровень развіцця іх эканомікі, які характарызуецца пачаткам грамадскага падзелу працы.

Дрыгавічы, крывічы, радзімічы з'яўляліся тэрытарыяльнымі культурнаэтнічнымі супольнасцямі і не сфарміраваліся ў народнасці. Яны ўяўлялі сабой не плямёны, як у раннім жалезным веку, а протанароднасці ("народцы") і адначасова пачатковыя дзяржаўныя ўтварэнні, ці протадзяржавы.

Дрыгавічы, крывічыпалачане, радзімічы паступова ўцягваліся ў працэс фарміравання беларускай народнасці. Прычым трэба адзначыць, што паміж славянамі і балтамі мелі месца і мірнае суіснаванне, і ваенныя сутыкненні, і асіміляцыйныя працэсы. Асімілявалі не толькі славяне балтаў, але ў шэрагу выпадкаў славяне былі асіміляваныя балтамі. Мелі месца істотныя адрозненні гэтых працэсаў на ўсходзе і захадзе Беларусі. На ўсходзе былі вельмі моцныя сувязі славянскай, балцкай і суседняй фіна-угорскай культуры, якія доўга ажыццяўляліся ў межах шырокай паласы, і працягласць іх была вельмі вялікай. У заходніх рэгіёнах Беларусі ўсходне-славянскія супольнасці дрыгавічоў, валынян, крывічоў суседнічалі і суіснавалі з усходне-балцкімі (літоўскімі), заходне-славянскімі (мазавецкімі), заходне-балцкімі (яцвяжскімі) плямёнамі. У адрозненне ад балтаў, якія жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі і Смаленшчыны і быліасіміляваны славянамі, балцкія плямёны ПаўднёваУсходняй Прыбалтыкі сталі асновай, на якой склаліся народнасці: літоўцы, латышы, прусы, яцвягі. Па мове балты гэтага рэгіёна падзяляліся на заходніх (прусы, яцвягі) і ўсходніх (літоўцы, латышы, куршы і інш.).

Тэрыторыю паміж Нёманам і вярхоўямі р. Нараў насяляла група яцвяжскіх плямён — судзінаў, дайновы, паляксянаў і ўласна яцвягаў. Іх мова была пераходнай паміж балцкімі і славянскімі мовамі. Некаторыя даследчыкі лічаць, што яцвягі займалі болып шырокую тэрыторыю, уключаючы Нёманска-Бугскае міжрэчча (У.Сядоў). У першай палове XIII ст. зямля яцвягаў была

часткова падпарадкавана галіцка-валынскімі і мазавецкімі князямі. У другой палове XIII ст. пасля кровапралітнай барацьбы яцвягі, як і суседнія роднасныя ім прусы, былі канчаткова заваяваны крыжакамі. Нейкая іх колькасць перасялілася ў суседнія землі — Літву, Полыпчу, Беларусь. Менавіта гэтым тлумачыцца тое, што ў заходніх раёнах Беларусі з'явіліся назвы населеных пунктаў Яцвязь, Ядзьвінкі, Прусы, Прусікі. Сляды знаходжання дайновы захаваліся ў тапонімах Дзейнава, Дайнова, Дайноўка, якія лакалізаваны ў раёнах Валожына, Гродна, Слоніма, Івянца. Такім чынам, ёсць усе падставы сцвярджаць, што яцвягі былі адным з кампанентаў у фарміраванні беларускай народнасці.

У заходнім рэгіёне Беларусі доўга пражывалі асобныя балцкія і змешаныя балцкаславянскія групы насельніцтва. У IX — XI стст. балцкаславянская мяжа праходзіла па лініі Гродна — Ліда — Іўе — Вілейка Мядзель Браслаў. У XII — XIII стст. яна адсунулася далей на захад і паўночны захад да сучаснай Літвы і Латвіі. Важна таксама адзначыць, што змяшэнне балтаў са славянамі адбывалася не толькі на тэрыторыі Беларусі, але ў нейкай ступені і на тэрыторыі Літвы і Латвіі. Аб гэтым сведчаць наступныя прыклады: у XII — ХПІ стст. на тэрыторыі Латвіі існавалі княствы Кукенойс і Герцыке, якія знаходзіліся ў залежнасці ад Полацка; старажытная частка г.Вільні была заснавана крывічамі ў XI — XII стст. Невыпадкова ў складзе аўкштайтаў выдзяляецца лакальная група дзукаў, у якой шмат агульнага з беларусамі.

У той жа час сярод славянскага насельніцтва працягвалі існаваць групы балтаў. Аб існаванні на заходняй частцы ўсходне-славянскай этнічнай тэрыторыі ўсходне-балцкіх груп літоўцаў сведчаць назвы населеных пунктаў — Літва, Літоўцы, Літоўка , якія і сёння сустракаюцца на Маладзечаншчыне, Слонімшчыне, Стаўбцоўшчыне і ў іншых мясцовасцях. Набегі нямецкіх рыцараў былі галоўнай прычынай перасялення невялікіх груп заходніх балтаў жамойтаў на ўсход. Гэта пацвярджаюць назвы населеных пунктаў: Жамойцішкі (Воранаўскі рн), Жамойдзі (Лідскі рн), Жамойск (Докшыцкі рн) і інш. Пад ціскам Лівонскага ордэна ў падзвінска-дняпроўскі рэгіён перасялілася і частка ўсходнебалцкага насельніцтва — латыголаў. На Віцебшчыне налічваецца каля 30 населеных пунктаў з назвай Латыголь, Латыголічы, Латыголава і інш. Наогул балцкіх назваў населеных пунктаў на тэрыторыі Беларусі сёння налічваецца болып за 200. Пераважная іх колькасць знаходзіцца ў заходніх раёнах.

Акрамя балцкага насельніцтва на фарміраванне беларускага этнасу аказалі пэўны ўплыў асобныя групы цюркскага насельніцтва (татары), якія пасяліліся на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIV — пачатку XV ст. Аднак гэты ўплыў быў нязначны.

Беларускі этнас - гэта ўстойлівая супольнасць людзей, якая гістарычна склалася на тэрыторыі сучаснай Беларусі, суседніх усходніх і паўночных землях і характарызуецца асаблівасцямі мовы, побыту, культуры, рысаў псіхікі і самасвядомасці, што перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Працэс фарміравання беларускага этнасу з'яўляецца доўгім па часе, складаным і шматгранным. Існуюць розныя погляды і адказы на пытанне аб вытоках,

каранях, продках беларусаў. Спрэчкі даследчыкаў выклікае час завяршэння працэсу складання (этнагенезу) беларускай этнічнай супольнасці. Адны сцвярджаюць, што беларусы, як этнас, ужо існавалі ў XIII ст., а працэс фарміравання беларускай народнасці пачаўся яшчэ ў VII—VIII стст. (Г. Штыхаў, М. Ермаловіч, М. Ткачоў і інш.). Паводле В. Сядова, беларуская этнічная супольнасць склалася ў XIII-XIV стст. М. Грынблат лічыць, што фарміраванне беларусаў адбывалася ў XIV-XVI стст. Ёсць і іншыя меркаванні.

Узнікла шмат канцэпцый, якія маюць як навуковы, так і ненавуковы характар, палітычную афарбоўку, часта ўзаемавыключаюць адна другую. Так, яшчэ ў XIX ст. з'явіліся польская і велікаруская канцэпцыі, якія адмаўлялі існаванне самастойнага беларускага этнасу на той падставе, што ў насельніцтва Беларусі быццам не было самастойнай славянскай мовы. Прыхільнікі польскай канцэпцыі (Л. Галембоўскі, А. Рыпінскі і інш.) лічылі беларускую мову дыялектам польскай мовы, а беларусаў - часткай польскага этнасу. Творцы велікарускай канцэпцыі (А. Сабалеўскі, І. Сразнеўскі і інш.) сцвярджалі, што Беларусь - частка велікарускай этнічнай тэрыторыі, а беларуская мова — дыялект рускай мовы. Памылковасць гэтых канцэпцый доказана даследваннямі па беларускай мове. У пачатку XX ст. выдатны славіст Я. Карскі ў фундаментальнай працы «Беларусы» пераканаўча даказаў, што беларуская мова з'яўляецца самастойнай славянскай мовай, якая паводле свайго лексічнага складу, сінтаксісу, фанетыкі і марфалогіі ўваходзіць у групу ўсходнеславянскіх моў нароўні з велікарускай і ўкраінскай. У той жа час М. Пагодзіным і В. Ластоўскім была прапанавана крывіцкая канцэпцыя. Яна грунтавалася на сцвярджэнні, што адзінымі і непасрэднымі продкамі беларусаў з'яўляюцца крывічы. Аўтары названай канцэпцыі атаясамлівалі беларусаў і крывічоў і нават уносілі прапанову называць беларусаў крывічамі, а Беларусь — Крывіяй. Памылковасць гэтай канцэпцыі заключаецца ў тым, што крывічы займалі толькі паўночную і цэнтральную частку тэрыторыі сучаснай Беларусі. Але на пытанне аб тым, як узнікла паўднёвабеларускае насельніцтва, крывіцкая канцэпцыя адказу не дае. Няма ў канцэпцыі тлумачэння і таго, чаму на частцы тэрыторыі, якую займалі крывічы, пазней сфарміравалася велікаруская народнасць. Аднак самая вялікая памылка крывіцкай канцэпцыі выяўляецца ў храналагічнай неадпаведнасці знікнення крывічоў і з'яўлення беларускага этнасу. Крывічы зніклі да сярэдзіны XII ст., а беларусы, як этнас, да гэтага часу яшчэ не сфарміраваліся.

Аўтары крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкай канцэпцыі (Я. Карскі, У. Пічэта, М. Грынблат, М. Доўнар-Запольскі) асноўнымі продкамі беларусаў лічылі этнічныя супольнасці крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў. Асноўная іх аргументацыя грунтуецца на вывучэнні распаўсюджвання традыцыйных земляробчых прылад і асаблівасцей гаворак у розных рэгіёнах Беларусі. Але і гэтая канцэпцыя мае спрэчныя моманты. Тыя элементы культуры і мовы беларусаў, якія лічацца састаўнымі элементамі культуры і мовы дрыгавічоў ці крывічоў, узніклі пазней, чым існавалі крывічы, дрыгавічы і радзімічы, не раней XII ст., і займалі болыл шырокія арэалы, чым тэрыторыі дрыгавічоў, крывічоў і радзімічаў.

Згодна з фінскай канцэпцыяй (яе аўтар І. Ласкоў), продкамі беларускага народа былі славяне і фіны. У якасці доказу ён спасылаецца на тое, што некаторыя назвы беларускіх рэчак (напрыклад, Дзвіна) фінскага паходжання. Але гэты факт не з'яўляецца аргументам фінскага субстрату ў беларускім этнагенезе. Ён сведчыць толькі аб тым, што ў Падзвінні, Панямонні калісьці жыло фінамоўнае насельніцтва. Гэта было ў глыбокай старажытнасці, у каменным веку. Яно было асімілявана балтамі яшчэ да рассялення славянаў на тэрыторыі Беларусі.

Паводле балцкай канцэпцыі продкамі беларусаў былі славяне і старажытныя балты. Прыхільнікі балцкай канцэпцыі (у прыватнасці В. Сядоў) сцвярджаюць, што на старажытных балтаў, як продкаў беларусаў, указваюць некаторыя элементы традыцыйнай беларускай культуры і мовы (культ вужа, жаночы галаўны ўбор намітка, цвёрды «р» і інш.). Аргументам гэтай канцэпцыі лічацца таксама назвы беларускіх рэчак (Сож, Рэста, Клёва, Арэса і інш.). Мяркуюць, што яны балцкага паходжання. У доказах балцкай канцэпцыі шмат спрэчнага. Многія факты, на якія спасылаюцца яе прыхільнікі, характэрны не толькі для балтаў і беларусаў. Цвёрды «р», напрыклад, апрача балтаў і беларусаў, уласцівы таксама мове ўкраінцаў, балгараў, сербаў, чэхаў, славакаў, на якіх балты не зрабілі культурнага ўплыву. Жаночы галаўны ўбор намітка быў пашыраны не толькі ў балтаў і беларусаў, але і ў другіх славянскіх народаў, у прыватнасці ўкраінцаў, балгараў, палякаў. А такая з'ява, як культ вужа, была распаўсюджана яшчэ шырэй. Яна ўласціва рэлігіі не толькі балтаў і славян, але і грэкаў, і албанцаў. Назвы беларускіх рэчак таксама не з'яўляюцца падставай для аргументацыі балцкага субстрату (падасновы) беларусаў. Падобна назвам беларускіх рэчак фінскага паходжання, яны паказваюць толькі тое, што ў мінулым на тэрыторыі Беларусі жылі балты. Але большасць іх была асімілявана раней, калі беларусы яшчэ не фарміраваліся.

У 50-я гады XX ст. савецкі этнограф С. Токараў абгрунтаваў так званую повую (або старажытнарускую) канцэпцыю. На яго думку, у канцы IX - пачатку X ст. узмацніліся працэсы нівеліроўкі этнакультурных асаблівасцей усходніх славян. Гэта было абмоўлена эканамічнай, палітычнай, культурнай і канфесійнай інтэграцыяй. Пачалося далейшае развіццё феадальных адносін, класаў і гарадоў, распаўсюджванне хрысціянства. Пачала фарміравацца агульная тэрыторыя ўсходніх славян. Цэнтрам збірання ўсходніх славян было Сярэдняе Падняпроўе, дзе знаходзіўся г. Кіеў, які стаў сталіцай новай дзяржавы - Кіеўскай Русі. У выніку змешвання розных супольнасцей (крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, драўлян, палян, вяцічаў і іншых) у Сярэднім Падняпроўі ў IX- X стст. сфарміравалася новая, усходнеславянская этнічная супольнасць - старажытнаруская народнасць. У другой палове X ст. зацвердзілася і агульная назва гэтай тэрыторыі — Русь. Сярэдняе Падняпроўе пачало звацца Рускай зямлёй, кіеўскія князі - рускімі князямі. Згодна з гэтай канцэпцыяй, моцная Старажытнаруская дзяржава абараняла ўсходнеславянскія землі ад нападаў іншаземных рабаўнікоў, вызваляла іх жыхароў ад выплаты даніны хазарам і варагам. У гэтай дзяржаве існавала адзіная культура і мова. Затым у выніку палітычнага раз'яднання, распаду Кіеўскай Русі раз'ядналася і

старажытнаруская народнасць. У выніку ўтварыліся тры роднасныя народы: рускі, беларускі і ўкраінскі.

Аднак у гэтай канцэпцый з'явілася шмат апанентаў (Г. Штыхаў, М. Ермаловіч, М. Ткачоў і інш.). Яны поўнасцю адмаўляюць сам факт існавання старажытнарускай народнасці і фарміравання на яе аснове беларусаў, украінцаў і рускіх. Згодна з канцэпцыяй М. Ермаловіча, ніякай стражытнарускай народнасці не існавала. А калі гэта так, дык і не магло быць ніякага падзелу неіснуючай агульнарускай народнасці на тры галіны - рускую, украінскую і беларускую. Гэтая выснова робіцца на той падставе, што Кіеўская Русь, куды ўваходзілі ўсходнеславянскія землі, не з'яўлялася такой дзяржавай, як яе апісваюць у нашай гістарычнай і вучэбнай літаратуры. Яна, на думку Ермаловіча, зусім не з'яўлялася збіральнікам славянскіх народаў. Пры гэтым ён спасылаецца на К. Маркса. Апошні назваў Кіеўскую Русь імперыяй, якая была недарэчнай, няскладнай, скараспелай, «шматковай». Гэта дзяржава, дапаўняе Ермаловіч, была штучным і таму нетрывалым ваенна-адміністрацыйным аб'яднаннем. У ёй паспешліва і насуперак волі і інтарэсам народаў аб'ядноўваліся племянныя землі, і таму яна не мела агульнай эканамічнай базы. Галоўная мэта дзяржавы — здзяйсняць ваенныя паходы на Візантыю. Для гэтага і збіралася з заваяваных тэрыторый шматлікае і рознапляменнае войска. А калі гэта так, дык, піша Ермаловіч, становіцца праблематычным узнікненне старажытнарускай народнасці ў такой дзяржаве, як Кіеўская Русь. Аб неіснаванні старажытнарускай народнасці сведчыць і той факт, што Кіеўская дзяржава ў XII ст. распалася на часткі, якія адпавядалі першапачатковым племянным тэрыторыям.

У сувязі з такімі развагамі ўзнікае і яшчэ адно пытанне: калі не было агульнарускай народнасці, як тады адбылося фарміраванне беларускага, рускага і ўкраінскага этнасаў, а потым і адпаведных народнасцей? Ермаловіч мяркуе, што справа ўся ў тым, на якой тэрыторыі пасяліліся славянскія плямёны і з якім карэнным насельніцтвам (субстратам) адбылося змяшэнне. Так, рускі этнас фарміраваўся на аснове фіна-угорскага субстрату, украінскі — цюркскага, беларускі — балцкага.

Ермаловіч лічыць, што доля балцкага субстрату ў фарміраванні беларусаў была значна меншая, чым угра-фінскага ў этнасе вялікарусаў. Тлумачыцца гэта тым, што Беларусь з прычыны яе геаграфічнага становішча была месцам, дзе асабліва інтэнсіўна канцэнтраваўся славянскі элемент, таму ён мог лёгка перамагаць балцкі. Асобныя рэгіёны Беларусі наогул не былі заселены балтамі (поўдзень Міншчыны, міжрэчча Віліі і Гайны, поўдзень Полаччыны). Ермаловіч адзначае яшчэ адну асаблівасць фарміравання беларускага этнасу. Гэта тое, што на тэрыторыі Беларусі адбываліся вельмі інтэнсіўныя працэсы змяшэння, зрошчвання славянскіх этнічных супольнасцей — крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў. Вынікам гэтага было ўзмацненне славянскага элемента, што спрыяла больш хуткай асіміляцыі балтаў. Канцэпцыя фарміравання беларускага этнасу, якую адстойваў М. Ермаловіч, знайшла значную колькасць прыхільнікаў.

На пачатку 90-х гадоў XX ст. яшчэ адну канцэпцыю (сучасную) ўзнікнення беларускага этнасу прапанаваў беларускі гісторык і этнолаг М Ф, Піліпенка. Ён адмаўляецца ад уяўлення аб беларускім этнагенезе як спрошчанай эвалюцыі, а таксама ад тлумачэння яго толькі вялікай міграцыяй. Даследчык лічыць, што ў фарміраванні беларускага этнасу мелі месца як эвалюцыя, так і дыфузія, якія цесна ўзаемадзейнічалі і дапаўнялі адна другую ў гэтым працяглым і складаным працэсе. Піліпенка па-новаму падышоў да пытання аб продках беларусаў. Ён лічыць, што ў выніку шырокага рассялення славян і змешвання іх з усходнімі балтамі ўтварыліся не беларусы, а першапачатковыя ўсходнеславянскія этнічныя супольнасці крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў. Гэта адбылося ў IX - X стст. Затым у канцы X - пачатку XI ст. разам з іншымі ўсходнеславянскімі супольнасцямі крывічы, дрыгавічы і радзімічы кансалідаваліся ў новую агульнаславянскую этнічную супольнасць. Для яе былі характэрны агульнаўсходнеславянская мова, агульныя матэрыяльная і духоўная культуры. З трансфармацыяй гэтых першапачатковых этнічных славянскіх супольнасцей у агульнаславянскую старажытную супольнасць іх тэрыторыі сталі агульнай этнічнай тэрыторыяй, якая атрымала назву Русь. Менавіта з гэтага часу ў дачыненні да тэрыторыі Беларусі, як і да суседніх усходнеславянскіх зямель, пачала ўжывацца назва Русь, а насельніцтва стала называцца русамі, русічамі, русінамі, рускімі.

З часу свайго фарміравання этнічная тэрыторыя Русі не была аднастайнай. Яна падзялялася на рэгіёны, якія не супадалі з ранейшымі этнічнымі тэрыторыямі першапачатковых усходнеславянскіх этнічных супольнасцей. Тэрыторыя сучаснай Беларусі па лакальных асаблівасцях мовы і культуры ўваходзіла ў дзве дыялектна-этнаграфічныя зоны агульнаўсходнеславянскай этнічнай супольнасці - палескую і падзвінска-дняпроўскую. Акрамя агульнай назвы Русь, за паўднёвай часткай тэрыторыі Беларусі замацавалася назва Палессе, за цэнтральнай і паўночнай - Белая Русь. У паўднёвай папрыпяцкай зоне на аснове трансфармацыі дрыгавічоў, драўлян і паўднёвай часткі радзімічаў ішоў працэс фарміравання новай этнічнай супольнасці - палешукоў, у паўночным (падзвінска-дняпроўскім) рэгіёне ў выніку трансфармацыі крывічоў, вяцічаў і паўночных радзімічаў - старажытных беларусаў. М. Піліпенка лічыць, што менавіта яны сталі непасрэднымі продкамі беларусаў.

З цягам часу, адзначае М. Піліпенка, у выніку інтэнсіўных этнічных працэсаў на аснове ўзаемадзеяння, згуртавання дзвюх значных груп (папрыпяцкай і падзвінска-дняпроўскай) усходнеславянскага насельніцтва, з аднаго боку, і кансалідацыі іх з асобнымі групамі неўсходнеславянскага насельніцтва - заходнеславянскага (польскага), балцкага і цюркскага (татарскага), з другога, на шырокай тэрыторыі, размешчанай паміж Прыпяццю на поўдні і Заходняй Дзвіной на поўначы, Нёманам на захадзе і Дняпром на ўсходзе, да сярэдзіны XVI ст. сфарміраваліся новы комплекс культуры і звязаная з ім сістэма мовы. Усё гэта сведчыла аб з'яўленні новай, усходнеславянскай этнічнай тэрыторыі, якая атрымала з таго часу сваю назву Белая Русь.

У розныя часы паходджанне гэтай назвы тлумачылі па-рознаму. Яе звязвалі з прыгажосцю зямлі (Макарый, XVI ст.), мноствам снегу (С. Герберштэйн, XVI ст.), вольнасцю (В. Тацішчаў, XVIII ст.), незалежнасцю ад татара-манголаў (М. Любаўскі, XIX ст.), са светлапігментаваным і светлавокім антрапалагічным тыпам жыхароў (М. Янчук, пачатак XX ст.). У наш час з'явіліся іншыя тлумачэнні: назва Белая Русь звязваецца з больш раннім прыняццем хрысціянства Ў параўнанні з Чорнай Руссю (Я. Юхо), з шырокім распаўсюджваннем у тапаніміцы назваў са словам «белая» (П. Крапівін), асацыяцыяй У аднаго з этнічных продкаў беларусаў (балтаў) захаду з чорным колерам, а ўсходу - з белым.

Далейшае фарміраванне беларускай народнасці адбывалася з канца XIII да сярэдзіны XVIII ст. Працэс гэты праходзіў пад уздзеяннем сацыяльна-эканамічных, палітычных, геаграфічных, царкоўна-рэлігійных і іншых фактараў. Аб'яднанне беларускіх земляў у складзе ВКЛ, падначаленне адзінай вярхоўнай уладзе прывяло да тэрытарыяльнай кансалідацыі і паслужыла штуршком да складання этнічнай тэрыторыі кампактнага рассялення народа, з якой звязаны яго фарміраванне і развіццё. Цэнтралізацыя дзяржавы (арганізацыя кіравання, ліквідацыя рэшткаў раздробленасці, уніфікацыя адміністрацыйнага падзелу, увядзенне адзінага заканадаўства, сімволікі) спрыяла больш шчыльнаму палітычнаму аб'яднанню беларускіх земляў і актыўнаму функцыянаванню сацыяльна-эканамічнага фактару. Прагрэс у вытворчасці і развіцці таварна-грашовых адносін, рост гарадоў спрыялі моўнай інтэграцыі, нівеліравалі мясцовыя асаблівасці і ўздзейнічалі на фарміраванне саслоўна-класавай структуры этнасу - ужо да сярэдзіны XVI ст. аформіліся шляхецкае, мяшчанскае, сялянскае саслоўі.

Яшчэ раз нагадаем, што этнічная тэрыторыя Беларусі ахапіла пераважна ўсходнеславянскія землі, на якіх жылі нашчадкі крывічоў (Віцебшчына, Смаленшчына, Віленшчына, Гарадзеншчына), дрыгавічоў (цэнтральная Беларусь, Палессе, Берасцейшчына), радзімічаў (Магілёўшчына, Гомельшчына, заходняя Браншчьша). У XIII-XVI стст. на гэтай тэрыторыі фарміруецца новая самастойная мова са сваімі спецыфічнымі фанетычнымі і сінтаксічнымі асаблівасцямі, сваім лексічным складам, Яна карэнным чынам адрозніваецца ад старажытнаўсходнеславянскай (царкоўнаславянскай), рускай і ўкраінскай моў. У фанетыцы яе асаблівасцямі сталі «дзеканне», «цеканне», «аканне», «яканне», цвёрды гук «р», фрыкатыўнае вымаўленне «г». У сінтаксісе — выкарыстанне слоў «каб», «калі», часціц «ці», «чы». Развіццю беларускай мовы спрыяла тое, што ў канцы XIV-XVII стст. яна была дзяржаўнай у ВКЛ. Ей карысталіся судовыя ўстановы, княжацкая канцылярыя, магістраты, на ёй пісаліся законы, летапісы, мемуары і публіцыстычныя творы. Такі статус мовы быў замацаваны ў Канстытуцьй таго часу - Статуце 1588 г. Ф. Скарына ўвёў родную мову ў Біблію і тым паказаў яе раўнапраўе з класічнымі кананічнымі мовамі — лацінскай, грэчаскай, старажытнаяўрэйскай. Выкарыстанню беларускай мовы ў канфесійнай літаратуры спрыяла Рэфармацыя. Уніяцкая царква выкарыстоўвала мову карэннага этнасу нароўні з лацінскай і царкоўнаславянскай, што садзейнічала ўнармаванню беларускай мовы.

Дасягнуўшы значнага развіцця, беларуская мова з другой паловы XVI ст. пачала здаваць свае пазіцыі пад націскам польскай.

Спецыфічныя рысы матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускай народнасці адлюстраваны ў тыпах пасяленняў (мястэчкі, фальваркі, засценкі, ваколіцы), жылля (хата і сенцы), прылад працы (саха, драўляная барана), у адзенні і народнай кухні.

Асноўным паказчыкам ступені кансалідавання народа выступае этнічная самасвядомасць - усведамленне людзьмі прыналежнасці да свайго народа, яго адметнасці. Яна ўзнікла найперш у асяроддзі прагрэсіўна настроеных слаёў гараджан, шляхты, духавенства і праявілася ў любові да роднага краю, народа, культуры, у зацікаўленасці іх мінулым, сучасным і будучым, у клопаце аб уратаванні нацыянальных формаў духоўнай культуры перад пагрозай дэнацыяналізацыі. Рэфармацыя садзейнічала абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці, цікавасці да нацыянальнай мовы. Рубеж XVI-XVII стст. нарадзіў новую форму нацыянальнай самасвядомасці, у якой дамінуючую ролю адыгрываў рэлігійны кампанент і ідэя рэлігійнай свабоды для праваслаўных. Уніяцкія дзеячы (С. Зізаній, М. Сматрыцкі, А. Філіповіч) абаранялі нацыянальна-культурныя каштоўнасці (мову, абраднасць, святы), імкнучыся спалучыць іх з заходнееўрапейскімі. У далейшым нацыянальная самасвядомасць падвяргалася дэфармацыі пад уздзеяннем спачатку паіанізатарскіх, а потым русіфікатарскіх тэндэнцый.

Знешняй формай праяўлення самасвядомасці з'яўляецца назва народа, этнонім. Ў XIII-XVI стст. у дачыненні да насельніцтва Беларусі ўжываліся розныя этнонімы. Да XVII ст. абагульняючай для праваслаўнага насельніцва Беларусі, Украіны, Масковіі і часткова Літвы, Польшчы, Латгаліі была назва «Русь», «рускія», «русіны». Нягледзячы на тое, што праваслаўная царква замацоўвала ў грамадскай свядомасці ўяўленне аб асаблівай блізкасці ўсходнеславянскіх народаў, насельніцтва Русі Літоўскай лічыла менавіта сябе «сапраўднай» Руссю, а сваіх суседзяў называла «маскавітамі». А насельніцтва Русі Маскоўскай, наадварот, лічыла сябе Руссю «сапраўднай», а суседзяў — Русь Літоўскую - Літвой. Аднак беларускія «русіны» ўжо ў XVXVI стст. адрознівалі сябе ад «маскавітаў» суседняй дзяржавы, называючы іх мову «маскоўскай», а сваю «рускай». Пры царскім двары ў Маскве трымалі «талмачоў» - перакладчыкаў, мелі слоўнікі для перакладу з «рускай» на «маскоўскую» мову. Этнонім «рускія людзі» меў больш стабільную распаўсюджанасць сярод жыхароў усходняй Беларусі і Смаленшчыны. У канцы XVI-XVII стст. ён трансфармаваўся ў назву «беларусцы». Украінцы, рускія, палякі і большасць еўрапейскіх народаў называла беларусаў «ліцвінамі». Так сябе называлі ў XIV-XV стст. пераважна жыхары захаду Беларусі і ўсходу Літвы. У XV ст. і асабліва ў XVII-XVIII стст., гэта назва распаўсюджваецца амаль на ўвесь беларускі этнас. Такая форма «нацыянальнага» самавызначэння насельніцтва Беларусі (асабліва шляхты) умацоўваецца пасля аб'яднання ў Рэч Паспалітую Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага. Палякі разглядалі Рэч Паспалітую як аб'яднанне дзвюх нацый у адну, а магнаты і шляхта ВКЛ упарта падкрэслівалі, што яны «ліцвіны», а не палякі. Першая

згадка пра Беларусь у дачыненні да ўласнабеларускіх зямель у іпацьеўскім летапісе датуецца 1305 г. Гэта назва спачатку замацавалася за Віцебшчынай, Смаленшчынай, Магілёўшчынай (усходам Беларусі) і толькі ў другой палове XIX ст, распаўсюдзілася на ўсю нашу Бацькаўшчыну. Згаданыя этнонімы ў залежнасці ад абставін маглі ўжывацца паасобку ці сумесна («ліцвінбеларусец», «ліцвін рускага роду»), але ўсе яны былі элементамі этнічнай самасвядомасці беларускага народа.

Паступова фарміраваўся і асобы беларускі менталітэт - склад розуму народа, лад яго мыслення, нацыянальны характар, псіхалогія. Да лепшых маральных і духоўных якасцяў беларусаў адносяцца: нацыянальная і рэлігійная талерантнасць (цярпімасць), памяркоўнасць, гасціннасць, мяккасардэчнасць, вынослівасць, шчодрасць, кемлівасць, няпомслівасць, сумленнасць, добразычлівасць, рахманасць, паэтычнасць душы, працавітасць. Да адмоўных бакоў беларускага менталітэту можна аднесці апатычнасць, нерашучасць, кансерватыўнасць, недаверлівасць, скрытнасць, пакорнасць. Агульнымі рысамі таксама з'яўляюцца ддя беларусаў маўклівасць, дамаседства, неагрэсіўнасць, схільнасць да згоды і пошукаў кампрамісаў. Ад яўрэяў беларусы адрозніваюцца меншай энергічнасцю, знаходлівасцю, настойлівасцю, менш развітым уменнем прыстасоўвацца да жыццёвых абставін, большым індывідуалізмам, меншай згуртаванасцю. Беларусы найчасцей не маюць таго лёгкадумства і самахвальства, што ўласцівы палякам. Ад украінцаў іх адрознівае неразвітае пачуццё помсты. Акрамя ўсходнеславянскага насельніцтва ў фарміраванні беларускай этнічнай супольнасці прымалі ўдзел заходнеславянскія (палякі), балцкія (прусы, борцы, яцвягі, літоўцы, жамойты, латгалы), цюркскія (татары) этнічныя группы. Акрамя таго, на Беларусі пражывалі невялікія групы яўрэяў, цыганаў, караімаў, шатландцаў, французаў, немцаў, рускіх і ўкраінцаў.

Пад уздзеяннем польскага этнакультурнага ўплыву пасля Люблінскай уніі ў 70-я гг. XVI ст. праз знаёмства нашых прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя з культурна-навуковымі дасягненнямі Заходняй Еўропы з дапамогай польскай мовы пачаўся працэс паступовай паланізацыі магнатаў і шляхты ВКЛ. Тады, у XVI ст., не бачылася ніякай небяспекі ад знаёмства перадавых, па-еўрапейску адукаваных беларусаў з лацінскай і польскай мовамі, на якіх яны пісалі свае творы. Такім чынам, перыяд канца XIII - сярэдзіны XVIII ст. стаў для беларускай народнасці часам станаўлення, развіцця і ўздыму. Яе паспяховае развіццё абарваў «крывавы патоп» (антыфеадальная казацка-сялянская вайна 1648-1651 гг. і руска-польская вайна 1654—1667 гг.), які стаў першай нацыянальнай катастрофай. У наступныя часы ідзе працэс размывання і заняпаду беларускага этнасу, які выявіўся спачатку ў яго масавай паланізацыі (адмена беларускай мовы ў якасці дзяржаўнай адбылася ўжо ў 1696 г.), а потым у русіфікацыі.

Крывічы, дрыгавічы і радзімічы адыгралі велізарную ролю ў айчыннай гісторыі. Многія вучоныя (Я.Ф.Карскі, У.І.Пічэта і інш.) нават лічылі, што яны былі непасрэднымі продкамі беларускай этнічнай супольнасці, беларускага народа. Ёсць і іншыя погляды на гэта пытанне.

Мы ўжо згадвалі ў гістарыяграфічным аглядзе пра існаванне розных канцэпцый паходжання беларусаў: фіна-славянскай, балта-славянскай, крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкай, агульнастаражытнарускай. Але каб вызначыць адносіны да іх, неабходна спачатку высветліць, якое месца ў этнічнай (культурнай) гісторыі края займаюць тыя факты, на якія абапіраюцца гэтыя канцэпцыі. Напрыклад, ці з'яўляюцца назвы некаторых беларускіх рэчак фінскага паходжання доказам таго, што продкамі беларусаў былі і фінамоўныя групы насельніцтва? Можна ўпэўнена сцвярджаць, што не з'яўляюцца. Фінамоўнае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі жыло ў глыбокай старажытнасці, у канцы каменнага веку, і было асімілявана туг не славянамі, а старажытнымі балтамі, якія рассяляліся у Панямонні, Падзвінні і Верхнім Падняпроўі ў бронзавым веку. Фіны на тэрыторыі Беларусі былі субстратам (падасновай) не беларусаў, а старажытных балтаў. Фінскія назвы рэчак і азёр у нашым краі спачатку былі ўспрыняты балтамі, а потым ад балтаў перайшлі у лексіку славянскага насельніцтва, якое з'явілася ў Панямонні, Падзвінні і Верхнім Падняпроўі пасля балтаў.

Шмат спрэчнага і ў доказах балцкай канцэпцыі. Факты, на якія спасылаюцца яе прыхільнікі, характэрныя не толькі для балтаў і беларусаў. Цвёрды "р", напрыклад, апрача балтаў і беларусаў уласцівы таксама мове ўкраінцаў, балгар, сербау, чэхаў, славакаў, на якіх балты не зрабілі культурнага ўплыву. Жаночы галаўны ўбор намітка быў пашыраны не толькі ў балтаў і беларусаў, але і ў іншых славянскіх народаў, у прыватнасці украінцаў, балгар, палякаў. А такая з'ява, як культ вужа, была распаусюджана яшчэ шырэй. Яна ўласцівая рзлігіі не толькі балтаў і славянаў, але і грэкаў, албанцаў. Назвы беларускіх рзчак і азёр балцкага паходжання таксама нельга лічыць доказам балцкага субстрату беларусаў. Яны сведчаць толькі аб тым, што ў мінулым пасля фінаў на тзрыторыі Беларусі жылі старажытныя балты. У выніку шырокага рассялення славян на тэрыторыі нашага края і змешвання іх з усходнімі балтамі ўтварыліся не беларусы, а першасныя ўсходнеславянскія зтнічныя супольнасці - крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Пашыраны да гэтага часу погляд, што яны з самага пачатку былі чыста славянскімі этнічнымі супольнасцямі, а не змешанага паходжання, не мае грунтоўных доказаў. Значна больш аріументаў у карысць погляду, што дрыгавічы, крывічы і радзімічы сфарміраваліся на тэрыторыі Беларусі як славяна-балцкая супольнасць. У параўнанні са старажытным фіна- і балта-моўным насельніцтвам яны гісгарычна бліжэй да беларусаў. Але і ў аргументацыі погляду, што непасрэднымі продкамі беларускага народа з'яўляюцца крывічы, дрыгавічы і радзімічы, ёсць спрзчныя моманты. Тыя элементы культуры і мовы беларусаў (розяыя тыпы сахі - палеская і з перакладной паліцай, асаблівасці гаворак асобных рэгіёнаў, "аканне", дыфтонгі ўо, іе, якія лічацца састаўнымі элементамі культуры і мовы дрыгавічоў ці крывічоў, узшклі пазней, чым ісаавалі крывічы, дрыгавічы і радзімічы (не раней XII ст.) і займалі больш шырокія арэалы, чым тэрыторыі дрыгавічоў, крывічоў і радзімічаў.

Шмат схематычнага ва ўяўленнях "старажытнарускай" канцэпцыі паходжання беларусаў. Спрэчна лічыць старажытную Русь агульнай калыскай

беларускай, украінскай і велікарускай супольнасцяў, таму што яна распалася, знікла раней, чым утварыліся беларускі, украінскі і велікарускі народы. Рэгіянальныя асаблівасці культуры і мовы ўсходніх славян, як ранняй, так і больш позняй пары, не адпавядаюць усходнеславянскім этнасам - беларусам, украінцам і велікарусам. Заходняя частка тэрыторыі усходніх славян, якая стала арэалам фарміравання беларускага этнасу, у час існавання старажытнай дзяржавы - Русі - не вылучалася ў асобную лінгвістычна-этнаграфічную зону. Уяўленне аб тым, што старажытная Русь з'яўляецца калыскай трох усходнеславянскіх этнічных супольнасцяў, у якой яны знаходзіліся як тры дзіцяці, а потым сталі дарослымі, самастойнымі этнасамі, дэманструе спрошчаны падыход да складанага гістарычнага працэсу.

Верагодна, асноўнымі продкамі сучасных беларусаў былі групы насельніцтва, якія жылі ў нашым краі пасля таго, як зніклі крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Імі сталі перш за ўсё насельнікі падзвінска-дняпроўскага рэгіёна, і старажытныя палешукі, што знаходзіліся ў Папрыпяцці. Першыя сфарміраваліся ў выніку трансфармацыі крывічоў, вяцічаў і паўночнай часткі радзімічаў, а другія - дрыгавічоў, драўлян і паўднёвых радзімічаў. Старажытныя палешукі і днепра-дзвіны мелі таксама агульную назву "русіны", "рускія" (у значэнні ўсходніх славян). Яны адрозніваліся ад крывічоу, дрыгавічоў і радзімічаў новымі рысамі культуры і мовы. У жыхароў падзвіна-дняпроўскага рэгіёна былі пашыраны саха з перакладной паліцай, гумны прамавугольнай формы, світа прамога крою, зачынальная вясельная песня (сгаўбавая), трансфармаваны валачобны абрад. У іх гаворцы ўзнікла "аканне" (вымаўленне галоснага гука "о" не пад націскам як "а"), а таксама "дзеканне" (зычны гук "д" сталі вымаўляць мякчэй).

Характэрнымі элементамі культуры старажытных палешукоў з'яўляліся палеская саха, многавугольныя гумны, развітая форма каравайнага абраду, зімовае навагодняе свята Каляды. У гаворцы старажытных палешукоў гукі "р" і "ч" пачалі вымаўляюцца цвёрда. У ёй узніклі дыфтонгі ўо, іе.

У фарміраванні культуры і мовы старажытнага насельніцтва беларускіх зямель пераважалі эвалюцыйныя працэсы. Важным бокам беларускага этнагенезу было пашырэнне культурных і моўных з'яў, што прыкметна паўплывала на ўтварэнне беларускай мовы, у прыватнасці яе фанетыкі. Фанетыка беларускай мовы ўзнікла шляхам злучэння некаторых рыс гутарковай мовы папрыпяцкага насельніцтва, з аднаго боку, і падзвінскага - з другога. Яно спачатку адбылося ў цэнтральным рэгіёне - панёманскіх і падняпроўскіх землях, а потым праз цзнтральны рэгіён пашырылася далей у паўднёвыя і паўночныя часткі края. З поўдня (Папрыпяцця) на поўнач (Падзвінне) шырока распаўсюджваліся цвёрдыя 'р" і "ч", а з поўначы на поудзень - мяккі "д" ("дзеканне"), а таксама "аканне". Дыфузіі культурных і моўных з'яў садзейнічалі перасяленні як усходнеславянскіх, так і неўсходнеславянскіх груп, змешванне іх з мясцовымі жыхарамі і асіміляцыя ўсходнеславянскім насельніцтвам неўсходнеславянскага - заходнеславянскага (польскага), балцкага, цюркскага (татарскага). Беларускі этнагенез цесна звязаны з палітычнай гісторыяй края. Ён адбываўся як у час існавання

старажытных княстваў - Полацкага, Тураўскага і інш., так і ў перыяд утварэння новай дзяржавы - Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

**Тэараэтычны матэрыял да лекцыі №4.**
**Гаспадарка і матэрыяльная культура беларусаў – 2 гадзіны**

1. Земляробства.
2. Традыцыйная ежа. З'яўленне новых прадуктаў харчавання.
3. Прамысловыя і рамесныя заняткі.
4. Здабываючыя промыслы і рамёствы .
5. Традыцыйнае адзенне. Этнічныя асаблівасці адзення.

Земляробства.

Гаспадарка – аснова народнай жыццядзейнасці. Нездарма ў народзе кажуць:"Гападарку весці – не лапці плесці". Кожны народ з цягам часу, у працэсе гістарычнай практыкі, выпрацоўвае свой свой гаспадарча-бытавы ўклад з уласцівымі яму ведамі, гаспадарчай спецыялізацыяй, вытворчымі заняткамі, працоўнымі навыкамі, прыладамі працы, культурнымі традыцыямі. "Якія мы гаспадры, такія нашы і двары" – кажуць у народзе. Аснову гаспадарчай дзейнасці ў беларусаў, як і суседніх славянскіх народаў, з даўніх часоў складала земляробства, якое арганічна спалучалася з развядзеннем свойскай жывелы і разнастайнымі промысламі.

У Беларусі земляробства вядома з часоў неаліту (3 тыс. гадоў да н.э.). Пра гэта сведчаць археалагічныя знаходкі каменных і рогавых матыг, крэмневых сярпоў, каменных зерняцерак, старажытнага рала ( вёска Капланавічы Клецкага раена).

Асноўныя пасяўныя плошчы беларусы адводзілі пад збожжавыя культуры –жыта, авес, ячмень, проса, пшаніца, грэчка, гарох. У агародах беларусы звычайна вырошчвалі капусту, моркву, рэпу, буракі, агуркі, цыбулю, часнок, мак, кмін. Старажытныя тэхнічныя культуры – лен і каноплі, таксама вырошчваліся на землях Беларусі.

Першае месца сярод збожжавых культур у старажытнасці (да XI ст.) займала пшаніца, уступіўшы яго пасля азімаму жыту.

Жыта да VIII – IX стст. наогул у Беларусі не высявалася. У XII – XIX стст. яно стала асноўнай збожжавай культурайі ў IXX ст. займала каля палавіны ўсіх пасяўных плошчаў. З жытняй мукі гатавалі хлеб, бліны, саладуху і разнастайныя мучныя стравы.

Другое месца (услед за жытам) на працягу шэрага стагоддзяў устойліва займаў авёс, складаючы ў XIX ст. каля 25 – 29 % усіх пасяўных плошчаў. Калісьці,як і жыта, ён быў пустазеллем, аднак людзі рана ацанілі яго кармавыя якасці.

Да самых старажытных культурных раслін адносіцца і ячмень. Сярод збожжавых культур ён займаў трэцяе месца. Ячмень шырока выкарыстоўваўся як для прыгатавання розных страў (каша, хлебныя вырабы, піва), так і на корм птушцы і свойскай ж ы в ё л е.

Вырошчвалі ў Беларусі і проса, радзімай якога з’яўляецца Кітай. Яно непатрабавальнае да клімату Беларусі і лёгка пераносіць засуху. Яго звычайна высявалі на лясных лядах.

На палях высейвалі грэчку, якая была добрым меданосам, што давала пчалярам магчымасць атрымаць душысты мёд. У XVIII стагоддзі ў Беларусі пачалі вырошчваць кукурузу. Зерне кукурузы выкарыстоўвалася як харчовы прадукт, а лісце і сцеблі ішлі на корм жывёле. Адзначым, што кукуруза, доўгі час вырошчвалася як агародная культура і толькі апошнім часам стала адыгрываць прыкметную ролю ў палявых севазваротах.

Толькі ў XVIII ст. у Беларусі пачала распаўсюджвацца бульба, якая сёння з’яўляецца візітнай карткай Беларусі. Першую бульбу вырошчвалі на Гродзеншчыне. Спачатку яна вельмі марудна ўваходзіла ў сельскагаспадарчую практыку. Аднак ужо ў канцы XIX ст. бульба стаўла “другім хлебам” для беларускага селяніна. Разам з тым бульбу ўжывалі на корм жывёле, яна выкарыстоўвалася як сыравіна для вінакурэння.У той жа час (XVIII – XIX стст.) распаўсюдзіліся такія паўдневаамерыканскія культуры, як фасоля, сланечнік, гарбузы, табака. Пачалі вырошчваць і буракі, якія ўжывалі ў ежу, выкарыстоўвалі на корм жывёле і для вырабу цукру.

Найбольш старажытнымі з агародных культур лічацца капуста, агуркі, цыбуля, морква. З с я р э д з і н ы XIX стагоддзя з’яўляюцца ў Беларусі памідоры і перац..

Беларусы разводзілі каля дому, на краю сядзібы фруктовыя дрэвы: яблыні, грушы, слівы, а таксама пладова-ягадныя: парэчкі, маліна, ажына, агрэст, шыпшына і інш. У шляхецкіх маентках, фальварках, засценках мелі месца дагледжаныя сады ў дзесяткі і сотні пладовых дрэў.

У другой палове XIX стагоддзя ў севазварот уваходзяць кармавыя травы, такія, як канюшына і цімафееўка, Якія і д у ц ь на корм жывёлам.

Ад глебава-кліматычных умоў, мясцовых аграрных традыцый, сацыяльнай катэгорыі гаспадарак (сялянская, дробнаўласніцкая, панская, мяшчанская і інш.) залежала спецыялізацыя на тых ці іншых культурах.

Так, на лесавых раўнінах Цэнтральнай Беларусі побач з жытам вялікія плошчы займала пшаніца, на паўночным усходзе (Падзвінне) – лён, ячмень, у Падняпроўі – каноплі, авёс, на Палессі – проса, грэчка.

Ураджайнасць тых ці іншых культур залежала не толькі ад глебава-кліматычных умоў, але і ад сістэмы земляробства (аграрных ведаў, спосабаў апрацоўкі зямлі, догляду пасеваў).

У Беларусі існавала некалькі сістэм земляробства: падсечна-агнявая (падсечная, лядная), абложная (лясная аблога, ялавіна), трохполле, шматполле.

Кожная сістэма мела мясцовыя асаблівасці, што было звязана з размеркаваннем пасяўных плошчаў, паслядоўным чаргаваннем пасеваў розных культур, тэхналогій апрацоўкі глебы, цыкламі эксплуатацыі зямлі, угнойваннем палёў.

Земляробчая тэхніка беларусаў была прыстасавана да асаблівасцей мясцовых грунтоў і умоў гаспадарання. Па сваіх канструкцыйных асаблівасцях вылучаюцца сохі: палеская (або літоўская), віцебская (руская, перакладка) і

падняпроўская (магілеўскай, беларуская), якія, у сваю чаргу, мелі ці мноства прыватных ці пераходных тыпалагічных варыянтаў.

У паўднева-заходняй частцы Беларусі выкарыстоўвалася палеская саха, якая складалася з корпуса (рагач), адзін канец якога служыў дышлам, другі (з развілкай) – утвараў ручкі, і рабочай часткі (расоха, плаха). Расоха мацавалася ў адтуліне рагача пад вуглом, ад якога залежала глыбіня ворыва. Яна мела раздвоены канец, на які набіваліся жалезныя сашнікі. Палеская саха вызначалася асіметрычнасцю – розная форма і пастаноўка сашнікоў і адвальных дошак (паліцы). У рабочым стане левы перавідны сашнік падразаў пласт зямлі збоку, а правы – звычайны ральнік – падымаў яго знізу, адвальваючы пры дапамозе паліц на правы бок. Канструкцыя сахі давала магчымасць акуратна пераварочваць ворыўны пласт і роўна араць па ўсім полі.

У Панямонні ўжывалася. больш легкая за палескую, саха, з дзвюма паліцамі і аднолькавымі сашнікамі. Замест дышла яна мела кароткі градыль, да якога прыстасоўваліся аглоблі для аднаконнай ці аднаваловай запрэжкі.

У Падзвінні ўжывалася саха віцебскага тыпу з перакладной паліцай для аднаконнай запрэжкі.

На тэрыторыі Падняпроўя – саха з больш доўгай нерухома замацаванай паліцай. Такая канструкцыя рабочай часткі давала магчымасць больш грунтоўнай апрацоўкі поля.

Да традыцыйных прылад рыхлення адносіліся бароны. якія ў многіх народаў вызначаліся простай канструкцыяй і значным падабенствам.

З падсечнай сістэмай земляробства было звязана ўжыванне найбольш старажытнай бараны – вершаліны, або астрогі, якая. ўяўляла сабой ствол елкі (часцей за ўсе верхавіну), сукі якой адсякаліся на адлегласці 50-60 см ад ствала, утвараючы завостраныя зубы. За больш тонкі канец мацавалі пастронкі, у якія запрагалі каня ці вала.

Барана-сукаватка, ці смык, рабілася з некалькіх расколатых яловых ствалоў, на якіх такім жа чынам, як і ў вершаліне, абсякалі сукі.

Найбольш распаўсюджанай у XIX ст. была плеценая, або вязаная, барана, якую рабілі з дубовых прутоў з заціснутымі паміж імі (з дапамогай плеценых вітак-кольцаў) дубовымі зубамі. Яна выкарыстоўвалася на стараворыўных землях і бытавала амаль паўсюдна, па ўсёй Беларусі.

У Падзвінні выкарыстоўваліся брусковыя, або рамныя, бароны , якія аднак можна было сустрэць па ўсёй  Беларусі.

Многія культуры сеялі ўручную з дапамогай спецыяльных прстасаванняў—“сявалак”(лукошка, сявенька, сельнік, сеўня, касец). Сявалкі ў асноўным былі саламяныя або лубяныя. Сеялкі сталі распаўсюджвацца толькі ў першай палове XIX стагоддзя.

Асноўныя традыцыйныя прылады ўборкі ўраджаю – сярпы, косы, вілы, граблі, цапы мелі мноства лакальна-варыятыўных асаблівасцей. Просты серп крыху адрозніваўся вуглом загібу, звостраным лязом, якое ў шэрагу выпадкаў мела зубчастую насечку. Жыта, зжатае сярпом, сушылі ў снапах, расстаўляючы іх на полі ў бабкі, або ў азяродах. На ўсходзе Беларусі для гэтай мэты служылі асеці і еўні. Высушанае жыта або пшаніцу захоўвалі неабмалочанымі ў

стажках-адонках (Усходняе Палессе) ці малацілі адразу на таку пры гумнах. Абмалочанае і правеянае збожжа сартавалі, засыпалі ў засекі (аруды) свірнаў і клецей. Караняплоды і бульбу ссыпалі ў скляпы, варыўні, частку захоўвалі ў ямах і капцах.

Лён і каноплі апрацоўвалі ўручную. Каб аддзяліць насенне ад сцебляў выкарыстоўвалі невялікі драўляны валік – “пранік”( прач, пральнік). Потым лён расцілалі на лузе, каноплю вымочвалі ў вадаёмах. Далей на мялцы лён і каноплі с у ш ы л і і мялі на мялцы, трапалі, расчэсвалі вялікімі шырокімі драўлянымі грабянямі і

ш ч от к а м і.

Абрады і звычаі, звязаныя з земляробствам

Да Благавешчання нельга было трывожыць зямлю. Да гэтага дня забаранялася араць сеяць. Першы выхад ў поле –заворванне было сапраўдным святам для селяніна. Гаспадыні выпякалі печыва ў форме земляробчых прылад. Гаспадар надзяваў новую кашулю. Гаспадыня збірала у поле свянцоную воду, хлеб, яйкі, соль. Свянцонай вадой акраплялі коней ц валоў. У першы дзень селянін араў няшмат, а дома ў г э т ы дзень быў накрыты святочны стол.

Перад заворванннем існаваў звычай агледзін нівы. Калі селянін ішоў у п е р ш ы н ю на поле, то ч ы с т ы м ручніку або абрусе ён нёс з сабой пірог, соль, яйкі, галінки вярбы. Гаспадар абыходзіў палеткі і ўтыкаў па краях поля галінкі вярбы, якія павінны былі аберагч ы яго ад стыхій. Пасля святочнага стала р э ш т к і ежы і шкарлупінне ад я е к закопвалі на полі.

Важную ролю для сяўбы адыгрывалі фазы месяца – поўны месяц , поўныя засекі з б а ж ы н ы. Найлепшымі днямі для сяўбы былі аўторак і субота. Календарныя святы Юр’я (6 мая) і Мікола (22 мая) лічыліся арыенцірамі для пасяўных работ.

А з і м ы я п а ч ы н а л і сеяць пасля Спаса ( 19 жніўня) і заканчвалі на Пакроў ( 14 кастрычніка). У час севу а з і м ы х важную функцыю адыгрывалі святы Прачыстай (28 жніўня) і Багача ( 21 верасня).

Разнастайнымі былі звычаі і абрады, якія звязаня з уборкай ураджаю і завярш э ннем палявых работ. Першы і апошні p;fns сноп «гаспадар» и «жытняя баба» символизавали сабой зажынки и дажынки.

Першы зажыначны сноп «гаспадар» ставілі ў хаце на покуці , д з е ён заставаўся да пачатку сяўбы, калі з яго выбіралі зерне і замешвалі да ўсяго насення.

Пры заканч э н ні жніва, на апошнім загоне пакідалі жменю нязжатага жыта , якое звязвалі стужкай або саломінкай. Паміж сцяблін начыста выпалвалі траву. Г э т ы прац э с называўся “ завіванне” ці “палонне барады”.

З культам хлеба і агню звязаны старажытны абрад “ Жаніцьба коміна”. Яго спраўлялі восенню, пасля палявых работ, сяляне першы раз вечарам запальвалі агніш ч а – светач. Жанчыны і дзяўчаты вадзілі вакол коміна карагоды.

Жывелагадоўля

Адным з найважнейшых традыцыйных заняткаў беларусаў. з’яўляецца жывёлагадоўля – галіна сельскай гаспадаркі па развядзенню свойскай

жывёлы. Жывелагадоўля ўключае гадоўлю буйной рагатай жывёлы, свіна-, авечка-, труса-, звера-, коне-, птушка-гадоўлю, рыбаводства. Жывелагадоўля забяспечвае насельніцтва прадуктамі харчавання (малако, мяса, масла, яйкі і інш.), лёгкую прамысловасць сыравінай (воўна, скура і інш.), служыць цяглавай сілай (коні, валы), дае арганічныя ўгнаенні (гной); з адходаў жывелагадоўлі атрымліваюць некаторыя кармы (касцяная мука, абястлушчанае малако), лекавыя прэпараты (сывараткі, гармоны) і інш.

На Беларусі здаўна разводзяць буйную рагатую жывёлу, свіней, коней, авечак, хатнюю птушку. Буйная рагатая жывёла займае асноўнае месца. З сярэднявечча, так званая літоўская, ці літоўска-беларуская мясцовая парода (яе продак еўрапейскі тур), была прыстасавана да суровых умоў утрымання. Яна непераборлівая ў кармах, пры добрым доглядзе хутка прыбаўляе ў вазе і дае тлустае малако. На Захадзе Беларусі парода была некалькі буйнейшай («зубровая парода») і часта выкарыстоўвалася і ў якасці рабочай жывёлы.

Асабліва многа буйной рагатай жывёлы («гаўяды») разводзілі на Поўдні, дзе ў 2-й палове XIX ст. кожны сялянскі двор (10—20 членаў сям'і) меў у сярэднім 6—10 галоў (без уліку маладняка).

На паўночным усходзе, была больш развіта конегадоўля, дзе здаўна конь быў асноўнай цяглавай сілай. Коні мясцовай пароды былі невысокага росту (120 — 130 см), аднак моцныя івынослівыя ў рабоце. У паўднева-заходняй і цэнтральнай частках Беларусі асноўнай цяглавай сілай былі валы; коней выкарыстоўвалі толькі пры баранаванні палеткаў і часткова пры транспартных перавозках.

У XVIII ст. сярэдняя норма рабочай жывёлы на сялянскі двор складала 1,6—1,7 запрэжкі (запрэжка — 2 валы ці 1 конь).

Па ўсёй Беларусіў сялянскай гаспадарцы разводзілі дробную свойскую жывёлу (свіней, авечак).Найбольшая колькасць авечак была ў Гродзенскай губ. Звычайна тут пакідалі на зіму 4—6 авечак. Разводзілі ў асноўным грубашэрсных, з канца XVIII ст. і танкарунных. Авечкі давалі сыравіну для сялянскіх промыслаў (воўна для світ, сярмяг, андаракоў, аўчына для кажухоў і шапак) і былі важнай крыніцай харчавання. Авечкагадоўля таксама была базай для развіцця суконна-шарсцяной прамысловасці. Развядзенне коз не адыгрывала прыкметнай ролі ў гаспадарцы.

Прыкметныя змены ў жывелагадоўлі адбыліся толькі пасля адмены прыгоннага права (1861). Побач з ростам прадукцыйнай жывёлы павялічылася і колькасць коней, якія ўсё часцей замянялі валоў. Аднак асноўнае месца ў структуры жывелагадоўлі па-ранейшаму займалі буйная рагатая жывёла і свінні. Буйной рагатай жывёлы на Беларусі ў разліку на душу насельніцтва было ў 1,5 раза болей, чым у сярэдняй паласе Расіі.

У памешчыцкіх гаспадарках з развіццём капіталізму жывелагадоўлянабыла таварны характар: паляпшаліся пародныя якасці жывёлы, кармавая база. Падукцыя прадавалася на мясцовых і расійскіх рынках, пастаўлялася на экспарт. У сялянскіх гаспадарках

жывелагадоўлябыла паўнатуральнай: у 1912 годзе  29,1 % сялянскіх двароў не мелі коней, 15 % — кароў.

Хатняй  птушкі трымалі няшмат – ад 3 да 10 курэй на гаспадарку. Гусей і качак з в ы ч а й н а  разводзілі там , дзе паблізу быў вадаём.

Сялянскую ж ы в ё л у пасвілі на працягу 6-7 месяцаў – з пачатку вясны і да позняй восені.

З ж ы в ё лагадоўлей звязана народнае свята Юр’я. Да Юр’я прымяркоўваўся першы выган статка на поле. Г э т ы д з ень лічыюся таксама святам пастухоў.

У сучаснай жывелагадоўлі скарацілася колькасць коней і авечак. У асабістых гаспадарках сельскіх жыхароў пэўную ролю адыгрывае вырошчванне свіней, буйной рагатай жывёлы, а таксама птушкагадоўля.

Прамысловыя і рамесныя заняткі.

Здабываючыя промыслы (збіральніцтва, рыбалоўства, паляўніцтва, пчалярства, лясныя і лесахімічныя промыслы)

Збіральніцтва

Збіральніцтва – самы старажытны занятак першабытнага насельніцтва, які паслужыў у свой час вытокам земляробства. Збіральніцтва займала прыкметнае месца ў народным жыцці і на працягу многіх стагоддзяў рэгулявалася звычаёвым правам. Паводле Статуту Вялікага княства Літоўскага (1588), сяляне захоўвалі права «ўступу» у дзяржаўныя і панскія лясы дзеля збору грыбоў, ягад, мёду дзікіх пчол і інш. Пазней яны паступова страчвалі такое права і павінны былі плаціць за яго чынш ці адрабляць на карысць землеўладальніка некалькі дзён у годзе.

Сяляне збіралі лясныя ягады плады, грыбы, лугавыя травы (кармавыя, лекавыя, дэкаратыўныя), караняплоды, мед дзікіх пчол: рабілі  падсочку дрэў і займаліся нарыхтоўкай раслінных сокаў. Кожны з гэтых відаў патрабаваў ведання мясцовай экалогіі, харчовых і лекавых якасцей тых ці іншых раслін, аптымальных тэрмінаў іх збору, спосабаў першаснай апрацоўкі, кансервацыі і ўжывання. Шчодрасць лясных дароў побач з жыллём рабіла іх даступнымі амаль для кожнага.

Ляснуюягаду – суніцы, чарніцы, брусніцы, буякі (дурніцы), маліны, парэчку, агрэст, ажыну – ужывалічасцейсвежымі. Яны выкарыстоўваліся асобна і ў якасці састаўных кампанентаў многіх кулінарных вырабаў – пірага, варэнікаў, кісялю, кулагі, розных він і напіткаў.

Ягады таксаманарыхтоўваліна зіму: брусніцыпарыліўгаршках, ссыпаліўкадушкіібочкі, дабаўляючыпрыправу; зіхрабілітаксамасокііпавідла (намедзе); чарніцысушылі; журавінызахоўвалізамарожанымі, дабаўляліўквашануюкапусту, выпрацоўвалізіхсокіінапіткі.

Ягадыкаліныірабінызбіралііпозняйвосенню, іхзахоўвалінагарышчах, сукведцікалінызакладвалітаксамаўстажкіразамзсенам, дзеянывылежваліпэўнытэрмін.

У лесе назапашвалі грушы, яблыкі, жалуды, арэхі. Грушы, як і жалуды, ссыпалі ў засекі свірнаў ці стопак, дзе яны даспявалі, сушылі ў печах. Яблыкі разразалі на скрылькі, нанізвалі на суровыя ніткі, вязанкамі сушылі на сонцы;

пад восень іх закладвалі ў стажкі сена, дзе яны захоўваліся нярэдка на працягу ўсей зімы.

У традыцыйнай сялянскай гаспадарцы прыкметнае месца мела збіранне розных відаў грыбоў. Перавагу аддавалі баравікам, таксама збіралі  падасінавікі (чырвонагаловікі), падбярозавікі (бабкі, абабкі), махавікі, маслякі (казлякі), лісічкі, апенькі, рыжыкі, зяленкі, ваўнянкі. У час пастоў грыбы былі адным з галоўных прадуктаў харчавання. З мухамораў рабілі атруту для насякомых. Грыбы ўжывалі свежымі смажанымі ці варанымі, закладвалі ў кадушкі на засол; баравікі падасінавікі, абабкі сушылі пра запас. Сушаныя грыбы і ягады беларускія сяляне збывалі на мясцовых кірмашах, прадавалі скупшчыкам, якія развозілі іх далека за межы Беларусі.

У Палессі і Паазер'і яшчэ ў XIX ст. сустракаўся своеасаблівы промысел — збор яек дзікіх птушак. Маладыя хлопцы вясною ў нядзелю і па святах гуртамі адпраўляліся ў Пінскія балоты збіраць яйкі дзікіх качак і гусей і «прыносілі іх столькі, колькі у стане данесці кожны. Ва осей вёсцы наладжвалася сапраўднае свята: у кожнай хаце была  дармавая яечня».

Збіральніцтва амаль не змянілася на працягу тысячагоддзяў і ў сваім архаічным выглядзе захавалася да нашага часу. Разам з тым прыкметна зменшыліся яго маштабы, што абумоўлена скарачэннем прыродных рэсурсаў, а таксама безгаспадарчым умяшаннем чалавека ў экалагічнае асяроддзе.

Рыбалоўства

У Беларусі шмат вялікіх рэк і маленькіх рачулак, азер і балот, якія багатых рыбая і вадаплаўнай птушкай. Менавіта таму рыбная лоўля ў беларусаў з’яўлялася вельмі распаўсюджаным заняткам. Рыбалоўства адыгрывала істотную ролю ў сістэме харчавання, было неад’емнай частнай паўсядзеннага народнага побыту. Як паказваюць археалагічныя знаходкі, у Беларусі вылаўлівалі мноства разнастайных і каштоўных парод рыб, сярод якіх – асятры, сцерлядзь, ліні, язі, вугры, ментузы, самы, шчупакі, акуні, ляшчы, судакі і шмат іншых. У вялікай колькасці вылаўлівалі і так званую мелкарыбіцу.

Спосабы лоўлі і рыбалоўныя прылады адпавядалі экалагічным умовам, характару водных басейнаў, сезону года, надвор’ю, а таксама вызначаліся разлікамі на пэўную пароду рыбы, рэгіянальнымі традыцыямі і г.д.

Пры багацці рыбнай фауны рыбу лавілі проста рукамі ці кошыкам у мутнай вадзе або заганялі на мелкаводдзе, білі палкай, прыціскалі шастом (ці вяслом) травяны зараснік, выбіралі і выкідвалі на бераг.

Да  рыбалоўных прылад адносілі плеценыя з лазы кош, кашолка, кошыца, зробленыя з сеткі броднік, волак, валачайка, лескавыя розныя тыпы вудаў і дарожак, а таксама разнастайныя восці-астрогі. Па прызначэнні снасці былі пастаўныя і валачыльныя, летнія, зімовыя і г.д.

Самымі старажытнымі былі ўдарныя прылады – коп’і, стрэлы, крыху пазней – гарпуны, восці, багры. Баграмі выцягвалі на бераг (ці ў лодку) загарпуненую вялікую рыбу. Яны ж выкарыстоўваліся і ў час начной лоўлі.. У зімовы час рыбу глушылі ўдарамі чакухі (драўлянай чуркі) па ледзе.

Да старажытных прылад таксама адносяцца і кручковыя снасці, у прыватнасці вуды з нажыўкай, а таксама блесны, дарожкі. Беларускія рыбаловы

карысталіся навяснымі, доннымі, напраўнымі і якарнымі вудамі, старожнямі, перамётамі і снасцямі для лоўлі саму (“клочаннем”).

Даволі шырока выкарыстоўвалі самалоўныя стаўныя пасткі: конусападобны буч, зроблены з лазовых прутоў; нерат, корпус якога ўяўляў сабой сетку, нацягнутую на абручы; венцер, ці жак, - той жа нерат, што меў у дадатак да сетчатага мяшка шырокія крылы; паплаў і мярэжку – сеткавыя мяшкі на шастах, якія ставілі звычайна ў адтулінах езаў (пляцень), якімі перагароджвалі рачулку. Усе пасткі-самаловы мелі шырокі ўваход, што паступова звужаўся гарлавінай, куды заходзіла рыба, не знаходзячы зваротнага шляху. Да самалоўных пастак адносяцца каробка (кош) і скрыпка (тыпу буча), што рабіліся з лазовых прутоў, лучыны, лубу; іх выкарыстоўвалі ўзімку (асабліва ў час адлігі) для лоўлі ўюноў, апускаючы ў палонку пад лед. Ад стаўных адрозніваюцца рухомыя пасткі – волах, блізкі да яго брадан (ці браднік), таптуха, кломля, крыга, сак. У параўнанні з першымі яны не мелі лейкападобнай перагародкі, што перашкаджала выхаду рыбы, і патрабавалі ад рыбакоў большага спрыту. Волак і брадан мелі сеткавыя мяшкі шырыней да 4 м, прывязаныя да двух доўгіх шастоў-“дзядкоў” (у брадана шасткі злучаліся ўнізе папярочкай); волакам лавілі два рыбакі, кожны ў сваей лодцы, браданам – адзін рыбак, паставіўшы свой човен папярок ракі, плывучы ўніз па цячэнні. Таптуха знешняй формай мала адрознівалася ад буча, рыбу сюды звычайна заганялі, шумна топаючы вакол па мелкаводдзі. Той жа прынцып лоўлі пры выкарыстанні кломлі і крыгі. Для лоўлі рыбы шырока прымяняліся звычайныя сеткі. Сярод іх вылучаліся простыя, аднасценныя і трохсценныя (трыгубіцы), што мелі тры рады сятчаткі розных памераў (рыба, што пападала сюды, заблытвалася ў сятчатых вочках). Сеткі, што мелі конусавідны мяшок пасярэдзіне (“матнік”), адносяцца да добра вядомых паўсюдна снасцей тыпу невадаў. Сярод іх – летні невад, або падвалока, брэдзень (браднік, волак; часцей за ўсе ўжываўся на мелкаводдзі), мутнік (донны невад) і самы вялікі (часам да 400 – 500 м у даўжыню) зімовы невад.

На Прыпяці, Цне, іншых вадаёмах існавалі арцелі рыбаловаў, якія выкарыстоўвалі розныя невады і буйныя прылады. Жыхары шматлікіх весак, хутароў, засценкаў, што размяшчаліся на берагах рэк і азер, разглядалі лоўлю рыбы ў суседнім вадаеме як свае спрадвечнае, натуральнае права і займаліся гэтым промыслам, на зважаючы на забароны мясцовых уладальнікаў і арандатараў. Трэба адзначыць, што ў звычайны час рыбнай лоўляй займаліся дзеці і падлеткі, а дарослыя лавілі толькі ў сезоны нерасту ці разліваў, а таксама выязджаючы далека на балотныя завадзі для зімовага лову ўюноў.

Шмат уюноў вадзілася у балотах і абмялеўшых рэках. Зімой ўюноў лавілі кашолкамі (сустракаюцца і назвы "кошака", "решемета"). Вясной, іх лавілі ў час, калі пачынае сыходзіць паводка. Для гэтага шматлікія пратокі, па якіх сыходзіць вада, перагароджвалі "гаткамі"-грэблямі, у якіх рабілі "езы"-разрывы, у якія клалі кашы, прыладу.

З уюноў рыхтавалі розныя стравы, асабліва ў пост, а часам прадавалі гандлярам-перакупшчыкам, і яны траплялі на рынкі Вільні і Варшавы. Уюноў лавілі так шмат, што дробязь высушвалі, клалі ў бочкі і потым кармілі свіней.

Калі зыходзіла з брадоў і заліўных азерцаў вада, з ёю ў раку імкнулася і больш буйная рыба, у першую чаргу шчупакі. Для іх лоўлі выкарыстоўваліся доўгія, больш за метр даўжынёй, лубяныя, пераплеценыя лазой "трубы", дыяметр якіх быў амаль роўны памерам шчупака. Іх таксама ставілі на пратоках у езах, часта некалькі, адзін каля аднаго. Адтуліну на плыні затыкалі сенам. Шчупак ішоў у снасціну, не маючы магчымасці вярнуцца назад, там і заставаўся. У адну снасціну часам траплялі 3 — 5 шчупакоў.

Наогул, метадаў рыбнай лоўлі было шмат, але мы звярнулі ўвагу толькі на самыя адметныя.

На пачатку XX ст. абазначылася скарачэнне рыбных рэсурсаў.

Сучасная рыбная гаспадарка патрабуе клапатлівай ўвагі, прававога рэгулявання, аховы і ўзнаўлення прыродных рэсурсаў.

Бортніцтва (Пчалярства)

Адным з самых старадаўніх заняткаў беларусаў было пчалярства, якое ўзнікла як адна з форм збіральніцтва. Пчалярства прайшло ў сваім развіцці тры асноўныя стадыі:бортніцтва, пчалярства калоднае і рамачнае.

Сяляне адшуквалі ў лесе пчаліныя дуплы-борці, выбіраючы мед, для чаго прыходзілася выкурваць пчол. Паводле старажытнага звычаю, чалавек, які знайшоў у лесе борць, атрымліваў права ўласнасці на яе, ставячы пры гэтым на дрэве сваю ўмоўную метку – “знамя”. Так узнікла культурнае пчалярства, або бортніцтва. Пры гэтым людзі не толькі выкарыстоўвалі прыродныя дуплы-борці, але і рабілі новыя, штучныя, выдзеўбваючы іх у ствалах дрэў на вышыні 4 – 15 м. Звычайна борць высякалі з сонечнага боку, прамавугольны ўваход у яе (даўжэнь) памерам 60 * 15 см зацiскалі адпаведнай формы бруском, пакідаючы невялікую лазейку (летку) для пчол. Каб прывабіць ў борць новы рой, уваход апрысквалі настоем пахучых траў, унутры клалі вільготны мох, змочаны ў духмяным, мятным растворы, а ў дадатак замацоўвалі да сценкі камеры акрайчык пчаліных сотаў. Калі борць прыходзілася да спадобы пчаліным разведчыкам, то тыя прыводзілі за сабой малады рой.

Пачынаючы ад XV – XVI стст. распаўсюджыліся калодныя вуллі, якія паранейшаму называлі борцямі, або калодамі. Першым калодным вуллем хутчэй за ўсе было тое ж самае борцевае дрэва, паваленае ветрам. Частку ствала, дзе знаходзілася борць, акуратна адпілоўвалі з двух бакоў і ставілі ў неабходным месцы. Калоды расстаўлялі на дрэвах на вышыні да 15 м пераважна ў ліпавых і бярозавых гаях, паблізу пойменных лугоў і верасовых балот, багатых меданосамі.

Для аховы калод і борцей ад лясных драпежнікаў – мядзведзяў і куніц, што спрытна лазілі па дрэвах і любілі ласавацца медам, доступ да борцей перагароджвалі шырокімі пляцоўкамі („падкур”, „адзер”), у якія знізу набівалі вострыя цвікі. Мядзведзь, лезучы ўгару, з любога боку натыкаецца на завостраную калоду, потым пачынае адштурхоўваць калючую перашкоду, якая ўсё больш балюча б'е ласуна, — нарэшце ён звальваецца...

У XIX ст. разам з лясным шырока распаўсюдзілася пасечнае пчалярства. Сяляне, шляхта заводзілі ў сябе на сядзібах пасекі на дзесяткі і сотні вулляў. У XIX і да сярэдзіны XX ст. пераважалі вуллі-калоды, так званыя стаякі і лежакі.

Пчол трымалі амаль у кожнай хаце: у сярэднім па 10 — 12 сем'яў, але былі пчаляры, якія трымалі да 60. Вуллі стаялі на сядзібах, але часцей за ўсё яны былі на дрэвах у навакольных лясах. Кожны бортнік меў пэўны набор інструментаў і спецыяльных прыстасаванняў, сярод іх – барта (сякера з шырокім лязом), пешня, долата, лопацень, цясла, скобля, свердзел, з дапамогай якіх выдзеўбвалі і ўладкоўвалі борці. Пчаляры забіраліся на дрэва, перакінуўшы цераз сук лезіва, або жэнь, - доўгую (25 – 30 м) вяроўку, сплеценую з трывалых рамянеў ці пяньковых вітак; лезіва мела на адным канцы папярэчыну (сядло, крэсла), на якую садзіўся бортнік, на другім – крук ці дзве пятлі. Пры пад’еме бортных калод на дрэва выкарыстоўвалі кадол – кола-лябедку з доўгай ступіцай, на якую накручвалася вяроўка. Пры доглядзе пчол неабходным быў дымакур і сітак (апошні надзяваўся на галаву, асцерагаючы твар і шыю ад укусу пчалы). пасля Спаса.

У канцы XIX – пачатку XX ст. распаўсюдзіліся больш сучасныя рамачныя вуллі. Адначасова сустракаліся саламяныя вуллі („саламянікі”) і плеценыя („лазавікі”). Летам, калі зацвіталі лугавыя травы, ліпа, грэчка, верас, некаторыя пчаляры грузілі вуллі на сані (звычайна гэта рабілі ў начны час) і адвозілі за 10 – 20 верст у месцы медазбору. Часам пчаляр зыходзіў да вулляў на некалькі дзён. Ён браў з сабой спецыяльную бандарную пасудзіну для мёду - дзежачку. Яна рабілася плоскай, каб лягчэй было пакласці ў варэньку. Мед таксама збіралі ў лазбень, берасцень, ліпаўку. Пры спрыяльным надвор’і пчаляры атрымлівалі па 2 – 3 пуды меду з кожнага вулля. Найлепшым лічыўся ліпавы мед („ліпавец”), „празрысты і чысты, як крынічны струмень”.

Яшчэ ў пачатку XX ст. на Палессі захоўваўся старажытны звычай бонды, калі бортнік, што сабраў мед у лесе, частаваў кожнага, хто выпадкова сустракаўся на яго шляху. Паводле народнага павер’я, нават вораг, які прыняў пачастунак медам, станавіўся лагодным і забываў пра варажнечу. Быў вядомы і звычай сябрыны, калі бортнік дарыў аднавяскоўцу рой пчол, а той аддаваў яму палову меду, атрыманага з гэтага рою, што, паводле звычаю, замацоўвала сяброўства і трывалую дружбу паміж імі.

Мед у беларусаў з’яўляецца адной з важнейшых абрадавых страў. Ён трывала ўвайшоў у святочна-рытуальны комплекс, у шматлікія народныя звычаі і абрады. Ім частавалі званых гасцей, родных, блізкіх сяброў. Ен быў абавязковым пры сватаўстве і вяселлі, нараджэнні і хрышчэнні дзіцяці. Без яго не абыходзіліся пахаванне і памінкі. Мядовыя стравы – святочная куцця, канун, пірог, пернікі, медавуха і інш. – былі звычайнымі ў побыце не толькі шляхецкага саслоўя, але і простага люду. Прадукты пчалярства – воск, праполіс, матачнае малачко, пылок, пярга – шырока выкарыстоўвалі ў народнай медыцыне.

Паляўнітва

Паляванне на дзічыну – такі ж старажытны занятак, як і рыбалоўства. У сярэднявечных дакументах неаднаразова згадваюцца паляўнічыя і звераловы, сярод іх – лясныя стральцы, палясоўшчыкі, асочнікі, лоўчыя, баброўнікі і інш. Жыхары лясоў і рачных урочышчаў былі патомнымі паляўнічымі і звераловамі, добра ведалі паводзіны звяроў і птушак. Нягледзячы на тое, што лясы належалі

ў асноўным памешчыкам ці дзяржаве і заканадаўства ў адносінах да палявання было даволі жорсткім, селянін умеў здабыць дзічыну без стрэльбы, выкарыстоўваючы розныя лоўчыя прыстасаванні і пасткі. У XVI ст. былі прыняты спецыяльныя артыкулы “Аб ловах, аб пушчах, аб бортным дрэве, аб бабровых гонах, аб сакаліных гнездах”, якія рэгламентавалі права “ловаў” і прадугледжвалі суровыя меры за браканьерства.

У сярэднявеччы шырока ўжываліся кап’е, рагаціна, сякера, нож; разам з тым выкарыстоўвалі і ваенную зброю блізкага бою – шаблю, меч, булаву, кісцень. У асобную групу можна вылучыць самаловы – розныя пасткі, так званыя жалезы, петлі (сілы), сеткі, ступіцы, ваўкоўні, лоўчыя ямы, загароды.

Здабывалі буйных траваядных (зубр, лось, кабан), драпежнікаў (мядзведзь, воўк, рысь), касуль, лісіц, куніц, барсукоў, зайцоў, ваверак.

Асабліва шмат лавілі вадаплаўнай птушкі: гусей і качак. На малых рэках палявалі на баброў і выдру. У лесе палявалі на глушцоў, рабчыкаў, цецерукоў, курапатак, Да лясных гігантаў-глушцоў падкрадваліся даволі блізка ў час току, прыкрыўшыся зяленым шалашыкам са звязаных галін. Пры паляванні на цецерукоў і качак выкарыстоўвалі і манькуту – чучала птушкі.

Агнястрэльная зброя пачала выкарыстоўвацца ў паляўніцтве ў канцы XV пачатку XVI стагоддзя і была даступна толькі буйной шляхце. У другой палове XIX стагоддзя атрымалі распаўсюджванне дубальтоўкі. Напрыканцы XIX стагоддзя паляванне са стрэльбай набыло сярод прывіяленаваных колаў насельніцтва спартыўна-аматарскі характар і толькі ў сялян, местачкоўцаў і некаторых прадстаўнікоў гарадскога насельніцтва яно захавала ролю дапаможнага занятку, які прыносіў прыбытак.

Лясныя і лесахімічныя промыслы

Багатая лясамі і рэчкамі Беларусь была прыдатная для нарыхтоўкі і сплаву лесу і дроў.Вялікія абшары лясоў знаходзяцца на Віцебшчыне, Магілёўшчыне, Мiншчыне, Палессі. Менш багата лесам Гродзеншчына, але там ёсць шмат пушчаў (Белавежская, Налібоцкая і інш.). Лясы мелі велізарнае значэнне для гаспадаркі беларускага этнасу, яго прамысловых і рамесных заняткаў. Уладальнікамі лясных угоддзяў з’яўляліся памешчыкі і казна.

Арцелі зімой нарыхтоўвалі драўніну і тралявалі яе да рэк і ўпадаючых у іх пракапаных сплаўных канаў. Для тралёўкі лесу выкарыстоўвалі сані двух тыпаў: спецыяльныя (лесавозы, кары) і звычайныя з жалезнымі палазамі. Ужывалі іх з падсанкамі, з насаджанымі на капылы бабкамі — бярвеннямі па шырыні саней, з высечанымі жалабкамі ўпоперак, на якія клалі бярвенні. Існаваў і спосаб тралёўкі без падсанкаў – цяглом, калі камель хлыста ляжаў на санях, а вяршаліна цягнулася па зямлі.

Працэс нарыхтоўкі драўніны меў пэўную паслядоўнасць. Спачатку дрэва валілі, потым абцярэбвалі сучча, адсякалі вяршаліну, акорвалі ствол і рассякалі яго на часткі. Нарыхтоўвалі два віды драўніны – будаўнічыя матэрыялы і дровы.

Іншы раз нарыхтоўвалі і дахавыя матэрыялы: драніцы і гонту. Драніцы – тонкія дошкі, якія дралі пры дапамозе драча (драніка) – масіўнага, шырокага нажа з доўгай перпендыкулярна замацаванай ручкай.

З сярэдзіны 19 ст. пачалі нарыхтоўваць запалкавую саломку-паўфабрыкат для вытворчасці запалак. Рабілі яе з асіны (радзей з вольхі і сасны). Таксама нарыхтоўвалі вялікую колькасць бачарнай клёпкі. Разнавіднасцю вырабаў з драўніны былі дэталі гужавога і воднага транспарту: дугі, палазы, аглоблі, абады для колаў, шпангоўты (какоры).

У залежнасці ад шырыні русла ракі і лесаматэрыялаў на Беларусі існавала некалькі відаў сплаву: моллю (шарошам), плытамі, суднамі (баржамі).

Тралёваны лес з паводкай збівалі ў плыты і сплаўлялі. Плыт складаўся з некалькіх звёнаў. Іх злучалі паміж сабой паклёсамі – бярвёнамі або жэрдкамі, перакінутымі з аднаго звяна на другое. Паклёсы прывязалі віцамі да жаросцяў. Іншы раз для трываласці звёны замацоўвалі двума паклёсамі накрыж. Звёны мелі розныя назвы. У басейне Дняпра іх называлі «грабёнкі», Прыпяці «клейны», «балі», «таркі», Нёмана «гонкі», «лаўкі». Найбольш пашыраным быў тэрмін «гонкі».

Існавала некалькі тыпаў плытоў. Звычайна плыт меў прамавугольную форму. У XX ст. з’явіліся новыя іх тыпы: качан, кашэль, пучок. Качаном называлі такі плыт, ў якім вакол аднаго звяна (клейны) вязалі астатнія. Кіравалі плытом сплаўшчыкі. Яны мелі розныя назвы. На Падзвінні былі пашыраны тэрміны «лаўнік», «сяк», «гоншчык», на Падняпроўі і ўсходняй Прыпяці – «плытагон», «плытнік», «сплаўшчык», на заходняй Прыпяці – «гоншчык», «плысак», «плавак», «пасаўнік», на Панямонні – «флісак», «плытнік». Караван плытоў суправаджала арцель , яе ўзначальваў атаман. На Заходняй Дзвіне яго называлі «корнік», на Нёмане – «ротман».Акрамя атамана і плытагонаў у склад арцелі ўваходзілі дубовік і некалькі грабцоў. Накіроўвалі плыты двума рулявымі вёсламі (абчэсанымі бярвёнамі з лопасцямі). Даўжыня іх складала 4 – 6 м. Вёслы ўмацоўвалі на папярэднім (галаве) і заднім (хвасце) звёнах плыта ва ўключаны (качаты, рачкі). На Дняпры рулявыя вёслы называлі бабайкамі, на Прыпяці – дрыгаўкамі, на Заходняй Дзвіне – брыгаўкамі, а рулявое вясло на першым звяне плыта на Нёмане і Сожы – апачынай. На невялікіх рэках сплаўшчыкі часам выкарыстоўвалі шасты (ляскі, бусакі, яліны). Тармазілі плыты завостраным колам (шрык, шарыга, шорц).

Лесахімічнымі прамысловымі заняткамі з’яўляліся смалакурэнне, гонка дзёгцю, шкіпінару, выпальванне вугалю, выварка паташу. Яны мелі важнае значэнне ў гаспадарцы. Асабліва пашырана было выкарыстанне смалы. Смала ўжывалася для прасмолкі рыбацкіх невадаў, лодак, суднаў, канатаў, у ваеннай справе. У значным аб’ёме смалу вывозілі за мяжу. Нашым продкам быў вядомы яшчэ адзін від сасновай смалы бурштлесхімічнай вытворчасці – здабыванне сырацечнай бурштынавага колеру – жывіцы. Жывіца выкарыстоўвалася ў фармацэўтыцы, з яе выраблялі белы вар для смалення лодак, дратвы, друкарскую фарбу.

Для вытворчасці смалы, паташу, вугалю, дзёгцю стваралі спецыяльныя прадпрыемствы, якія называліся будамі. Яны вядомы на Беларусі ўжо ў 15-16 ст.ст. Буды належалі князям Радзівілам, Друцкім-Любецкім, Любамірскім і інш. Праца прыгонных сялян на будах фіксавалася ў інвентарах маёнткаў. На

буйных будах было пашырана выкарыстанне вольнага найму за грашовую плату.

Адміністрацыйны апарат буды складалі атаман, пісар, казначэй (шафар) і наглядчык (дазорца). У XIX ст. буды, паташні часцей называліся заводамі. У 1877 г. у Мінскай губерні знаходзілася 96 смаляных заводаў.

Акрамя будаў здаўна былі пашыраны рассеяныя лесахімічныя промыслы. Сяляне гналі (курылі) смалу і дзёгаць, выпальвалі вугаль для ўласных патрэб і дробнага гандлю. У 2-й палове XIX ст. выраб смалы, дзёгцю, вугалю і паташу пачаў скарачацца ў сувязі з заменай сасновай смалы і дзёгцю змазачнымі маслами з нафты, паташу – содай, драўлянага вугалю – каменным.

Тэхналогія лесахімічных промыслаў патрабавала пэўных ведаў і навыкаў. Беларусам было вядома некалькі традыцыйных спосабаў, смалакурэнняў. Найбольш старажытны – ямны, ці майданны, спосаб. Смалу выкурвалі з хваёвага асмолу. Гонка смалы нярэдка суправаджалася рознымі магічнымі дзеяннямі, заклiканнямі, прымаўкамі. На Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. былі пашыраны майданы. У канцы XIXст. Зніклі іх замянілі наземныя цагляныя печы,. з’явіўся вялікі вертыкальны цыліндрычны кацёл (рэторта).

Дзёгаць атрымлівалі шляхам сухой перагонкі бяросты (чысты дзёгаць) у ямах-майданах і кучах (вогнішчах).

Выпальванне дрэўнага вугалю – найбольш старажытны з лесахімічных промыслаў. Вугаль палілі пераважна з цвёрдалісцевых парод дрэва. Выпальванне вугалю праводзілася як правіла, у лесе на спецыяльна падрыхтаваннай пляцоўцы (таку),г. зн., на сухім, роўным месцы.

Паташ – аналаг і папярэднік соды – гэта шчолачная соль, атрымліваецца з расліннага попелу і ўяўляе сабой парашок белага колеру, які лёгка раствараецца ў вадзе. Сыравіна для вырабу паташу была двух відаў: попел пячны і лясны. На Палессі вываркай паташу займаліся пераважна буднікі-мазуры.

Для здабывання жывіцы надразалі кару сасновых дрэў.

Рамёствы (ткацтва, вышыўка, кавальства, дрэваапрацоўка, ганчарства, пляценне, скураныя рамёствы і інш.). Іх роля і месца ў быце беларусаў

Ткацтва

Ткацтва – адзін з самых пашыраных відаў беларускага народнага мастацтва. Асноўную частку пасагу дзяўчыны, што выходзіла замуж, павінны былі складаць тканыя вырабы: адзенне, пасцель, ручнікі, абрусы іінш.

У Беларусі ткацтва вядома з глыбокай старажытнасці. Яно ўключае выраб тканін на гарызантальным ткацкім стане, а таксама ткацтва паясоў. Сыравінай для ткацтва здаўна служылі лён, воўна, радзей пянька. Усе працэсы, звязаныя з апрацоўкай сыравіны падрыхтоўкай яе да ткання, выконваліся ўручную. Звычайна гэтую работу выконвалі жанчыны. У кастрычніку мялі, трапалі, часалі, а у лістападзе пачыналі прасці. Пралі пры дапамозе верацяна або калаўрота на працягу ўсяго тыдня за выключэннем святочных дзён нядзелі. Затым пражу рыхтавалі для ткання, яе фарбавалі і снавалі. У сакавіку, калі дзень павялічваўся, у хату прыносілі ставы ўвесь панарад (ніты, бёрда, набіліцы, панажы інш.). Ткалі ручнікі, абрусы, палатно, д ы в а ны. Разнастайныя рэгіянальныя і лакальныя рысы ткацтва звязаны з асаблівасцямі

развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі ў розных яе рэгіёнах, культурнымі кантактамі з суседнімі народамі.

Вышыўка

Вышыўка – гэта арнамент або малюнак, выкананы ўручную або машынным спосабам на тканінах, карунках, скуры. Вышыўка зарадзілася ў эпоху першабытнай культуры і звязана з працэсам вырабу адзення. Матэрыялам для вышыўкі служылі льняныя, баваўняныя чырвоныя, чорныя (забалаць, горынь, блахва), белыя (белька), ваўняныя, зрэдку шаўковыя ніткі. Вышыўкай аздаблялі жаночае (кашулі, фартухі, галаўныя ўборы, гарсэты) мужчынскае (кашулі, шыйныя хусткі) аддзенне, суконную аўчынную вопратку, рэчы дэкаратыўна-абрадавага бытавога прызначэння (ручнікі, абрусы, навалачкі, посцілкі, інш.). Вышыўка мае самабытныя ўстойліввыя старажытныя мясцовыя традыцыі. Здаўна вышыўка лічылася адным з неабходных заняткаў жанчыны, асабліва дзяўчыны-нявесты. Тканіны, арнаментаваныя вышыўкай, узорным ткацтвам, былі абавязковым атрыбутам традыцыйных абрадаў сямейнага каляндарнага цыклаў. На Беларусі была распаўсюджана вышыўка крыжыкам, гладдзю (адна-, двухбаковая). Арнамент ўтваралі групы геаметрычных, раслінных, рамбічных матываў. Адным з найбольш старажытных спосабаў вышыўкі з'яўляецца двухбаковае шыццё.

Кавальства

Кавальства – першае з самастойных рамёстваў. У канцы першага тысячагоддзя нашай эры былі закладзены асновы кавальскай апрацоўкі жалеза. Да кавальства адносіцца вытворчасць вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з жалеза шляхам яго гарачага і халоднага кавання. Вядома з часоў жалезнага веку. З жалеза выкоўвалі рэчы гаспадарчага бытавога прызначэння: сякеры, долаты, нажы, нажніцы, свярдзёлкі, зубілы, шпоры, крэсівы, замкі, ключы, спражкі, фібулы інш.Тэрмін "каваль" – агульнаславянскі, ён абазначае занятак, звязаны з апрацоўкай нагрэтага металу шляхам кавання.

Пераважная большасць майстроў працавала ў сферы манументальнага будаўніцтва: агароджы, балконы, лесвіцы лесвічныя парэнчы, алтарныя перагародкі, крыжы, флюгеры інш.

Для кавальскіх работ будавалі асобае памяшканне – кузню, у якой былі горан неабходныя кавальскія інструменты. Кузню ставілі ў канцы сядзібы, пажадана каля вады.

Усе кавальскія вырабы можна падзяліць на некалькі груп, у адпаведнасці с працэсамі, якія аб'ядноўваюць выраб прадметаў: падкоўванне коней, кавальства у народным дойлідстве, акоўка транспартных сродкаў, кавальскія вырабы ў народным побыце.

Дрэваапрацоўка

Асноўнымі дрэваапрацоўчымі рамёствамі лічацца; цяслярства, сталярства, бондарства, стальмашнае рамяство, разьба па дрэве.

Цяслярства было вельмі распаўсюджана у феадальную эпоху. Яно было звязана з вырабам і устаноўкай драўляных канструкцый і дэталей вялікіх памераў і ахплівала самыя разнастайныя работы па дрэве. Цяслярскае

рамяство спалучала ў сабе мноства тэхнічных прыемаў – счэсванне, струганне, расколванне, распілоўку, выдзеўбванне, свідраванне, вымярэнне, дакладнае валоданне якімі і іх вар'іраванне ў канкрэтнай рабоце вызначалі не толькі індывідуальнае майстэрства, але і агульны ўзровень, мясцовы стыль і нават школу народнага дойлідства.

Асноўныя інструменты, якія прымяняліся пры гэтым, - розныя віды сякер, што былі прыстасаваны для тых ці іншых работ, у прыватнасці сякера цяслярская (звычайная), калун (служыў для расколу кароткіх бярвен на плахі), шклюд (меў шырокае лязо, заточанае з аднаго боку, і служыў для счэсвання бярвенняў, пілы, долаты, свярдзёлкі, рубанкі.

Цяслярскае майстэрства перадавалася па спадчыне, пераходзячы з пакалення ў пакаленне. Асноўная маса цесляроў пражывала ў вёсках і выконвала ўсе будаўнічыя работы ў маёнтках і прыватнаўласніцкіх мястэчках. Гэтая катэгорыя майстроў была носьбітам традыцыі, захоўвала архаічную, хоць часам вельмі высокую тэхніку. Удасканаленне тэхналогіі драўлянага будаўніцтва, выпрацоўку новых архітэктурных формаў ажыццяўлялі прафесійныя арцелі цесляроў, якія часткова адарваліся ад земляробства, ператварыліся ў рамеснікаў і карысталіся цэхавымі прывілеямі. Яны працавалі на замову, страціўшы пры гэтым першапачатковую непарыўнасць з нарыхтоўкай лясных матэрыялаў. Такому прафесійнаму падзелу цесляроў адпавядалі пэўныя спосабы арганізацыі будаўнічых работ: гаспадарчы (ўключаў дадаткова земляныя работы і нарыхтоўку матэрыялаў), падрадныя і змяшаны, што адлюстравана ўжо ў будаўнічых кантрактах XVII ст.

Асноўная парода, што часцей за ўсе ўжывалася ў будаўніцтве, - хвоя, ці сасна. З іншых парод істотнае значэнне мелі елка і дуб. З дубу рабілі аснову фундамента (штандары, палі), ніжні вянок зруба (падруба), прамежкавыя шулы сцен, апорныя слупы-сохі ў гумнах, павецях, паграбах, а таксама асобныя элементы жылля – парог, вушакі, падаконнікі і інш. Трываласць і даўгавечнасць дубовай драўніны павышалі попыт на будаўнічы матэрыял з яе, разам з тым цвердасць і масіўнасць патрабавалі больш намаганняў пры яе апрацоўцы. Жылле, цалкам пабудаванае з дубу, сустракалася ва Усходнім Палессі.

На тэрыторыі Беларусі здаўна былі вядомы дзве асноўныя будаўнічыя канструкцыі – слупавая і зрубная, якія мелі шэраг тыпалагічных варыянтаў і пераходных форм і часта спалучаліся ў адной і той жа пабудове. У больш архаічным варыянце сцены слупавых пабудоў уяўлялі сабой каркас з жэрдак, які заплятаўся гнуткімі галінамі івы, уцяпляўся саломай, трыснягом, чаротам. Часам плецены каркас абмазвалі глінай. Звычайна такая канструкцыя ўжывалася ў будаўніцтве гаспадарчых і падсобных памяшканняў: павеці, адрыны, хлява, сенцаў.

Зрубная канструкцыя ўяўляе сабой зруб з круглых ці брусковых бярвенняў, злучаных паміж сабой у просты (з астаткам) або гладкі (чысты) вугал. Гэтая канструкцыя асабліва шырока ўжывалася ў жыллі, клецях, свірнах, а таксама ў культавых пабудовах.

Пераходным варыянтам ад каркасна-слупавай да зрубнай тэхнікі драўлянага дойлідства з'яўлялася зрубна-слупавая канструкцыя, якую яшчэ

называюць закладной, ці “ў закідку”. Слупы ў выглядзе памежкавых шулаў былі неабходным элементам доўгіх сцен зруба. Амаль на ўсей тэрыторыі Беларусі шульную канструкцыю выкарыстоўвалі ў будаўніцтве гумен, хлявоў, сенцаў. Яна шырока бытавала ў сярэдняй паласе Расіі і на Украіне.

Зруб хаты ніжнім, больш тоўстым, звычайна дубовым, вянцом (падруба) ставілі на падрыхтаваную пляцоўку. Часта пад яго падкладвалі папярочныя дубовыя бярвены – лігары або закопвалі па вуглах дубовыя калоды – штандары. Аснову зруба ў большасці абкопвалі па перыметры зямлей, утвараючы прызбу.

У спосабах завяршэння жылля можна вылучыць некалькі канструкцыйных рашэнняў, цесна звязаных з апорнай асновай і формай страхі. На тэрыторыі Беларусі вядомы дзве старажытныя канструкцыі стрэх – зрубная і каркасная, якія былі распаўсюджаны на вялікай тэрыторыі славянскага рассялення. Зрубная канструкцыя страхі, у сваю чаргу, падзяляецца на два раней упамянутыя варыянты – двухсхільную закотавую (на сволаках, на лемягах, на гадунах) і пірамідальную, ці стажковую (“чубам”, “гаршком”). Больш распаўсюджанай была закотавая страха, уласцівая як жылым, так і гаспадарчым пабудовам. Яна мела зрубны шчыт (закот, франтон), што складаўся з паступова ўкарочаных кверху бернаў, на якія клаліся падоўжныя бярвенні-сволакі, утвараючы апорную аснову страхі.

Даволі распаўсюджанымі ў беларускім народным дойлідстве былі і каркасныя дахавыя канструкцыі. Сярод іх вылучаюць тры асноўныя варыянты: сошную, паўсошную (дзядковую) і кроквенную. Сошная, або слупавая, канструкцыя з’яўлялася найбольш старажытнай і даўжэй за ўсе захоўвалася ў гаспадарчых пабудовах тыпу гумнаў і адрын.

Будаўніцтва жылля ў народнай традыцыі было абстаўлена разнастайнымі звычаямі, абрадамі, абярэгамі, якія адзначалі яго важныя ідэйна значымыя этапы: выбар месца для жылля, нарыхтоўку і першасную апрацоўку драўніны, закладку фундамента, узвядзенне страхі, улазіны, або былі звязаны з выбарам будаўнічых матэрыялаў, рэгламентацыяй колькасці вокнаў, іх арыентацыяй, размяшчэннем печы, покуці і інш.

Сталярства спалучалася з цяслярствам, іх аб’ядноўвала адзіная мэта— арганізацыя жылога асяроддзя і стварэнне адпаведных жыллёва-бытавых умоў. Сталярства мела прыкладны характар і было сканцэнтравана на завяршальнай стадыі будаўніцтва – аздабленні і вырабе неабходных атрыбутаў аконных рам, лаў, хатняга начыння і г.д. Яшчэ ў пачатку XX ст. на палескіх кірмашах можна было купіць усе “запчасткі” і сабраць з іх цэлую хату. Тут прадаваліся ў розніцу брусы, кроквы для стрэх, вушакі для асады дзвярэй і вокнаў, дошкі, дахавыя матэрыялы (гонта, дранка), дзверы, аконныя рамы і інш. мноства будаўнічых матэрыялаў . Часцей за ўсё сталяры спецыялізаваліся на вырабе прадметаў інтэр’ера і хатняй мэблі.

Бондарства – вырабы драўлянага посуду з клёпак. Клёпкі апрацоўвалі на варштаце з дапамогай струга, гэбля і гэбліка. Бондарства як народны промысел, вядомае яшчэ ў Старажытнай Грэцыі. Гэта старадаўняе рамяство вырабу з драўніны розных ёмістасцей для захоўвання і дастаўкі вадкіх і паўвадкіх прадуктаў — ад маленькіх пасудзін да вялізных бочак, рэшткі якіх былі

знойдзены археалагамі ў пластах грунту XI—XIV стагоддзяў. У кожным рэгіёне Беларусі існавала мноства тэрмінаў, назваў прадметаў хатняга ўжытку, звязаных з бондарствам. Да прыкладу, на Брэстчыне драўляная ёмістасць для напояў называецца барыла, а маленькая — барыльца. Цеста замешваюць у кадках. Гэтак жа называюць посуд для засолкі і для захоўвання мёду. Квас і піва трымаюць у кумгане або кухлі — бочачцы з носікам і горлачкам. Для захоўвання бутэлек з віном прызначаны бар-кумган, свайго роду драўляны халадзільнік. Балея, хеўра — гэта лазневы посуд. На Гродзеншчыне цеста раней мясілі ў дзежках, а масла збівалі ў бойках ці маслабойках.

У Беларусі першыя бондары з'явіліся ў Х—ХІ стагоддзях і былі практычна ў кожнай вёсцы. Гэтае старажытнае рамяство атрымала развіццё і доўгі час было ў пашане ў вёсцы Рылавічы, якая знаходзіцца ў 14 км ад г. Іванава, амаль на мяжы з Пінскім раёнам. Бондары з Рылавічаў яшчэ шмат стагоддзяў назад пастаўлялі посуд для польскага каралеўскага двара і парыжскіх кірмашоў. У кожнай вёсцы гаспадыні ссыпалі збожжа ў вялікія драўляныя бочкі, захоўвалі квас у драўляным посудзе, салілі грыбы і агуркі ў кадушках і хадзілі даіць кароў з драўлянымі даёнкамі.

Любая новая рэч спачатку матэматычна пралічваецца на паперы, каб строга вытрымаць усе параметры будучага вырабу. З такой жа дакладнасцю, каб не парушыць структуру драўніны, нарыхтоўваюцца і калодкі, якія затым сякуцца на дранкі для клёпак.

На клёпкі для бочак бондары не выкарыстоўваюць гатовыя дошкі. Аказваецца, калі рэжуць дошкі, парушаецца тэкстура драўніны. Унутр трапляюць гніласныя мікробы, і бочка з такога дрэва доўга не праслужыць. Таму трэба карыстацца выключна сякерай, стругам і яшчэ дзесяткамі прылад.

А пачынаецца ўсё, зразумела, з нарыхтоўкі драўніны, прычым самай рознай — ад цвёрдапароднай да найбольш мяккай — асіны. І кожнай пародзе ў бондара — сваё прызначэнне. Скажам, для салення агуркоў і грыбоў, бочка, як правіла, павінна быць з дубу, бо прадукты ў ёй доўга захоўваюцца і маюць выдатныя смакавыя якасці. Для квашанай капусты падыдзе бочка з асіны. Таксама з асіны альбо дубу вырабляецца так званая двухдонка — бочачка з двайным донцам для квасу. Затое для захоўвання мёду найлепш падыхо-дзіць бочачка-кадушачка з ліпы (ліпа паху не мае). А вось сыравіна з клёну, якая даволі "капрызлівая" да вільгаці, добра паслужыць для ёмістасці для цукру, мукі ці круп. Так, як рабілі нашы прашчуры.

Сувеніры накшталт лыжак зараз робяць з таполі. Піць квас лепш з ліпавага збана, чым з дубовага. Для сыпкіх прадуктаў і збожжа спатрэбіцца хвоя. Дубовыя клёпкі ў кадках для цеста чаргуюць з хваёвымі… Дуб падыходзіць як для лазневага посуду, так і для вінных бочак, хрысцільняў.

Зрабіць бочку — справа тэхнікі, аднак правільна высушаная драўніна вызначае якасць бочкі. Па традыцыі клёпкі для бочак павінны на працягу трох гадоў захоўвацца пад адкрытым небам. Сонца высушвае драўніну, дождж вымывае цвёрдыя таніны, полісахарыды і глюкозу. Сёння вялікая частка драўніны для бочак высушваецца штучна ў адмысловых печах-сушылках, так што ўся працэдура вырабу бочак займае ад 3 да 12 месяцаў.

Пасля таго як бондар уставіць днішча, рабочыя абручы здымаюцца і на клёпкі набіваюць пастаянныя металічныя абручы. Яны змацоўваюць клёпкі і не даюць бочцы распаўзацца пад цяжарам прадуктаў. І, нарэшце, у адной з клёпак выпілоўваюць адтуліну пад кран.

Пра якасць вырабу меркавалі не толькі па тым, будзе ці не будзе ён цячы, а пільна ўзіраліся, наколькі шчыльна падагнаныя адзін да аднаго клёпкі і донца. Надавалі значэнне і знешняму выгляду — вырабу.

Сталмашнае рамяство – гэта выраб транспартных' гужавых сродкаў: колаў, брычак, саней, вазкоў і інш. Усе гужавыя транспартныя сродкі падзяляюцца напалазныя(зімнія) і колавыя(летнія). Для працы стальмахоў патрабаваліся бяроза, дуб, вяз, клён. У пачатку ХХ ст. гэта рамяство было ў нас вельмі пашырана. Брукаванае пакрыццё шашы патрабавала не толькі добра падкаванага каня, але і добрых калёс і палазоў. Калёсы купляліся ў стальмахоў, бо для іх вырабу патрэбны былі спецыяльныя інструменты: такарны станок, гбала, колесня. Гэтае рамяство патрабавала і кавальскіх навыкаў.

Ганчарства

На тэрыторыі Беларусі, як і на землях суседніх усходнеславянскіх народаў, ганчарства вядома з эпохі неаліту (IV—III тысячагоддзі да н. э.), калі з'явіліся першыя вылепленыя ўручную сасуды для гатавання ежы — гаршкі, міскі, кубкі, амфары з ручкамі-вушкамі і інш. Амаль ўсе яны аздоблены штампаваным ці прадрапаным арнаментам з простых матываў — ямак, наколаў, рысак[1].

Значная разнастайнасць формаў і асартыменту керамікі адзначаецца ў бронзавым веку (мяжа III—IIтысячагоддзяў — VII—VI стст. да н. э.). Вастрадонныя гаршкі саступаюць месца акруглым і пласкадонным, пашырэнне набываюць міскі, кубкі розных формаў і памераў. Ускладняецца арнамент, посуд укрываюць шырокія паясы з трохвугольнікаў, квадратаў, ромбаў, крыжыкаў, дужак, што чаргуюцца з вузкімі паясамі з насечак і наколаў.

Стылістыка глінянай дробнай пластыкі (фігуркі кароў, коней, сабак), што з'явілася ў Падняпроўі ў эпоху жалеза (I тысячагоддзе да н. э.)[2] , заўважаецца ў традыцыйнай народнай пластыцы і нашага часу.

Значны крок наперад зрабіла ганчарства ў часы Кіеўскай Русі. У Х ст. на заходнерускіх землях уваходзіць ва ўжытак ганчарны круг, што даў магчымасць наладзіць масавую вытворчасць бытавога посуду, аказаў значны ўплыў на мастацкі бок вырабаў і іх формы, якія набылі больш зграбны выгляд, а паверхня іх часам даводзілася да бляску. З узнікненнем гарадоў ганчарства набывае рамесніцкі характар іцалкам пераходзіць у рукі рамеснікаў-мужчын. Адбываецца яго размежаванне на гарадское і сельскае, што ярка праяўляецца і ў наступныя стагоддзі.

Свайго росквіту гарадское ганчарнае рамяства дасягае ў XVI—XVIIстст., што звязана з ажыўленнем эканамічнага і сацыяльна-

---

[1]Очерки по археологии Белоруссии. Мн., 1970. Ч. 1. С. 87.
[2]Мельниковская О. Н. Племена южной Белоруссии в раннем железном веке. М., 1967. С. 36.

палітычнага жыцця, арганізацыяй першых прафесійных рамесніцкіх аб'яднанняў— цэхаў.

Складаныя, супярэчлівыя працэсы характэрны для ганчарства XIX ст. Асабліва ўзмацніліся яны пасля рэформы 1861 г. Гарадское рамяство, не ў стане канкурыраваць з капіталістычнай прамысловасцю, паступова прыходзіць у заняпад.

Шматвяковыя адрозненні паміж архаічным сельскім і высокаразвітым гарадскім рамяством у канцы XIX ст. паступова згладжваюцца. І тое, і другое арыентуюцца галоўным чынам на небагатых сельскіх і местачковых спажыўцоў, а прадукцыя адлюстроўвае мясцовыя густы і традыцыі. Таму практычна пра ўсё ганчарства канца XIX — пачатку XXст. можна гаварыць як пра народнае.

Асартымент ганчарных вырабаў канца XIX—1-й паловы XX ст. вызначаўся значнай шырынёй — ад посуду простых формаў гаспадарчага прызначэння да складаных адмысловых твораў скульптурнага характару. Зразумела, што не ва ўсіх ганчарных цэнтрах ён быў аднолькавы. У невялікіх сельскіх асяродках, дзе бытавала архаічная фармоўка на ручным крузе, выраблялі толькі самы неабходны гаспадарчы посуд, у развітых гарадскіх і местачковых цэнтрах многія майстры не абмяжоўваліся традыцыйным асартыментам, імкнучыся паўтарыць у гліне ўзоры прамысловай прадукцыі.

У наш час аб’яднаць розныя формы традыцыйнай народнай вытворчасці, адрадзіць рэдкія і забытыя рамествы і промыслы, дапамагчы народным майстрам матэрыяламі, інструментамі, абсталяваннем, наладзіць пераемнасць традыцый ставіць сваей мэтай створаны ў 1992 г. Саюз майстрой народнай творчасці Беларусі.

Беларускя ганчары ў асноўным выраблялі збаны (збан), міскі, макотры (макацер - пасудзіна для расцірання маку), слоікі (цыліндрычны ці злёгку выпуклы сасуд для мёду, варэння, саленняў). Навыкі рамяства перадаваліся ад бацькоў да дзяцей, што забяспечвала пераемнасць традыцыі.

Гліну нарыхтоўвалі ў бліжэйшым наваколлі, як правіла, восенню, калі заканчваліся сельскагаспадарчыя работы. Найлепшымі лічыліся радовішчы з поверхневым заляганнем сыравіны, паколькі яе нарыхтоўка была лягчэйшай і бяспечнай. На Прьшяцкім Палессі гліна залягала глыбока, для яе здабычы капалі ямы да 7 м з бакавымі падкопамі (Гарадная Столінскага р-на). Для падземных распрацовак карысталіся кіркамі і капаніцамі, паверхневую здабычу вялі металічнымі ці акаванымі драўлянымі рыдлёўкамі. У некаторых асяродках Верхняга Падняпроўя паверхневыя пласты гліны выломвалі вострым дубовым калом.

Шматвяковы народны вопыт вьшрацаваў навыкі вызначэння патрэбнай для работы сыравіны, якая дзялілася на дзве асноўныя групы: высокапластычная (тлустая, жырная) і малапластычная (посная, худая). Якасць вызначалі звычайна навобмацак: расціралі ў пальцах, бралі «на зуб»— тлустая на зубах не трашчыць. Адзін са спосабаў быў і такі: тонкую гліняную качалку гарызантальна трымалі ў руцэ. Калі качалка плаўна згіналася — гліна тлустая, калі ламалася — посная.

Аднак ніводзін з гэтых гатункаў у чыстым выглядзе не прыдатны для работы. Выкарыстоўвалася ці сярэднепластычная гліна, якая ў дастатковай ступені спалучала вогнеўстойлівасць і пластычнасць, ці рыхтавалася фармовачная маса з тлустай гліны, у якую дадавалі непластычныя дамешкі, часцей за ўсё жарству — перапалены і дробна растоўчаны ці змолаты і прасеяны камень. Гэты спосаб, у старажытнасці вядомы ўсім славянскім народам, на тэрыторыі Беларусі скарыстоўваўся з эпохі неаліту.

Нарыхтаваную гліну звычайна вытрымлівалі зіму на марозе, пасля чаго яна лічылася больш прыдатнай для работы. Падрыхтоўка фармовачнай масы рабілася нагамі ці доўбняй, прычым першы спосаб пераважаў на паўночным захадзе Беларусі, г. зн. там, дзе ў гліну дадавалі непластычныя дамешкі. Яе залівалі вадой у драўляным карыце, добра перамешвалі рыдлёўкай, затым на падлозе, пасьшанай жарствой ці пяском, мясілі нагамі да набыцця аднароднай кансістэнцыі. Часам канчатковую даводку рабілі яшчэ і рукамі.

Фармовачную масу без дамешкаў не толькі мясілі нагамі, але і стругалі кавалкам дроту з дзвюма ручкамі па канцах (зрэзка, дрот, струнка). Пры гэтым сыравіна ачышчалася ад смецця, буйных непластычных украпленняў, шкодных прымесяў і інш.

Драўляная доўбня (даўбешка, кука, чакуха, кукешка) для апрацоўкі гліны ўжывалася на паўднёвым усходзе Беларусі, у зоне выкарыстання гліны без дамешкаў ці нарыхтоўкі фармовачнай масы з некалькіх гатункаў гліны. Пласты тлустай і поснай гліны збівалі доўбняй у аднародную масу, затым стругалі бандарным ці зробленым з касы стругам, выбіраючы пры гэтым смецце, каменьчыкі і інш.

З падрыхтаванай рознымі спосабамі сыравіны фармаваліся невялікія, разлічаныя на выраб адной пасудзіны кавалкі (камы, галушкі, клёцы, сыскі). Традыцыйнай прыладай для фармоўкі посуду ў беларусаў, як і ў іншых народаў Еўропы, з'яўляецца ганчарны круг.

Ганчарныя кругі вызначаюцца вялікай разнастайнасцю канструкцыі і формаў, тьшалогія іх вельмі шырокая: ад простай, з выдзяленнем ручных і нажных, да вельмі падрабязнай, з дыферэнцыяцыяй па класах, тьшах, відах і падвідах[3]. Аднак найбольш выразна вылучаюцца ўсё ж два асноўныя тыпы: ручны і нажны.

Старажытныя ручныя кругі, на тэрыторыі Беларусі вядомыя з X ст.[4], складаліся з драўлянага дыска, надзетага на вось, умацаваную ў плашцы, калодзе, услоне. Больш дасканалыя мелі два дыскі ці дыск і крыжавіну, злучаныя спіцамі, што павышала ўстойлівасць канструкцыі пры фармоўцы посуду. Адначасова ўжо ў часы сярэднявечча на Беларусі вядомыя больш дасканалыя нажныя ганчарныя кругі, якія выразна падзяляюца на два розныя тьшы: з нерухомай і рухомай воссю. Першы ўяўляе сабой наступны этап развіцця ручнога круга і складаецца з двух аднолькавых ці рознавялікіх дыскаў, злучаных чатырма — шасцю вертыкальна ці нахільна ўстаўленымі

---

[3] Милюченков С. Белорусское народное гончарство. Мн., 1984. С. 50.
[4]Очерки по археологии Белоруссии. Мн., 1972. Ч. 2. С. 71.

спіцамі. Канструкцыю надзявалі на вось, вертыкальна ўбітую ў зямлю, калодку ці плашку. Ніжні дыск-махавік служыў для раскручвання яго нагамі, рукі ж ганчара цалкам вызваляліся для фармоўкі посуду на верхнім дыску.

Найбольш дасканалай канструкцыяй з'яўляецца быстраходны нажны круг з рухомай воссю (круг, варштат, станок, пагон). Невялікі верхні драўляны дыск (верх, верхнік, галоўка) і разы ў два большы ніжні махавік (кружэлка, сподак, кацёлка) мацаваліся на металічнай восі (шпень, прэнт, верацяно). Седзячы на лаве, ганчар раскручваў нагамі махавік, які праз рухома замацаваную вось перадаваў вярчэнне на верхні дыск.

У XIX—XX стст. беларускія ганчары прымянялі розныя спосабы фармоўкі посуду, непасрэдна звязаныя з канструкцыяй ганчарнага круга. Усе яны могуць быць зведзены да двух асноўных відаў: ручной лепкі і тачэння.

У найбольш чыстым выглядзе ручная лепка вядома ад часоў каменнага веку і да нашых дзён пры вырабе гліняных цацак. Невялікія пасудзінкі выціскалі пальцамі з камяка гліны, затым з большага прыгладжвалі і падпраўлялі на ручным крузе. Сценкі пасудзін большага памеру нарошчвалі кальцавым налепам. Гліняныя качалкі прымазвалі да сценак, паволі паварочваючы круг і разгладжваючы швы. Такім чынам нарошчвалі патрэбную вышыню сценак, затым паверхню прыгладжвалі і надавалі пасудзіне патрэбны выгляд. Тэхніка кальцавога налепу, вядомая з часоў палеаліту[5], яшчэ ў 1-й палове XX ст. бытавала на паўночным захадзе Беларусі. там, дзе ўжывалі архаічныя ручныя ці нажныя кругі з нерухомай воссю.

Адначасова ў канцы XIX—1-й палове XX ст. было вядома выцягванне посуду з камяка гліны на быстраходных кругах з рухомай воссю. Паверхню сфармаванай пры хуткім вярчэнні на крузе глінянай пасудзіны апрацоўвалі спецыяльным драўляным нажом (шналь, ножык, падчыстка), затым адразалі выраб ад круга драцяной зрэзкай і ставілі яго на прасушку.

Падсушаную партыю ганчарных вырабаў абпальвалі ў хатняй печы ці ў спецыяльна збудаваным горне. Па даных археалогіі, хатнія печы выкарыстоўваліся для абпалу керамікі яшчэ ў старажытнарускі перыяд[6], а ў XIX—XX стст.— у тых рэгіёнах, дзе ганчарства бытавала ў нязначных маштабах.

Для масавай вытворчасці посуду ўзводзілі спецыяльнае збудаванне — горан (гарон, гарно) круглай ці чатырохвугольнай формы. Узводзілі іх наводдаль ад жылля, у яме, сценкі абвалоўвалі ці абносілі зрубам. Топка перакрывалася скляпеннем (под, рашотка, чарэнь) з дзіркамі для агню (люхты, слёсы), камера абпальвання звычайна мела адкрыты верх, куды і загружалі посуд.

Чатырохвугольныя горны, на Беларусі пашырыліся ў XVI— XVII стст., . Па тыпу чатырохвугольныя горны дзяліліся на аднакамерныя I двухкамерныя. Першыя, больш простыя, мала чым розніліся ад

---

[5] Митрофанов А. Г. Железный век средней Белорусснн. Мн., 1978. С. 30.
[6] История культуры Древней Руси. М., Л., 1948. С. 103.

звычайных печаў, працэс абпалу ў іх быў працаёмкім і малакіруемым, паколькі посуд загружаўся на памост з дроў і пры іх згаранні асядаў, часта трэскаўся. Таму ўжо ў XIX ст. аднакамерныя горны прымяняліся рэдка, уяўляючы сабой пераходны этап да больш дасканалых і прадукцыйных двухкамерных, у якіх топка аддзялялася ад камеры абпальвання перакрыццем з адтулінамі. Двухкамерныя чатырохвугольныя закрытыя горны будаваліся ў майстэрні, адкрытыя — наводдаль ад жылля, часткова заглыбляліся ў зямлю. Посуд загружалі ў іх зверху, укладваючы радамі на перакрыцце: уніз — больш, зверху — менш. Загружаную партыю (200—300 шт.) закрывалі чарапкамі бракаванага посуду, часам яшчэ і жалезным лістом. Працэс абпалу ў хатніх печах доўжыўся 5—6, у горнах усіх тыпаў — 10—14 гадзін.

У залежнасці ад характару абпалу і спосабу апрацоўкі вырабаў посуд набываў розныя утылітарнамастацкія якасці. Беларускія ганчары прымянялі абварванне (гартаванне), задымліванне і паліванне (глазураванне).

Абварванне посуду рабілі ў водным растворы жытняй мукі (на Падняпроўі — з дабаўкай ільняной ці канаплянай трасты, драўніннага вугалю, сажы), куды апускалі распаленыя ў горне ці печы пасудзіны. Ад такой апрацоўкі посуд станавіўся моцным («звінеў, як жалеза») і пры гэтым пакрываўся маляўнічымі чорнакарычневымі плямамі, таму ў народзе яго звалі рабым.

Такой жа старажытнасцю і пашыранасцю вызначаецца і задымліванне. На Беларусі яно вядома з часоў сярэднявечча, у XIX — 1-й палове XXст. было пашырана па ўсёй яе тэрыторыі і прымянялася пераважна для вытворчасці пячнога посуду. Сутнасць задымлівання заключаецца ў тым, што пры абпальванні посуду без доступу паветра ў выніку пэўных хімічных рэакцый паміж вокісам вугляроду (чадным газам) і солямі жалеза, якія ёсць у гліне, чарапок афарбоўваецца ў матавачорны ці сіняваты колер. Пры гэтым, як і ў працэсе абварвання, зніжаецца порыстасць чарапка, посуд становіцца мацнейшым. Задымліванне рабілі ў тых жа горнах ці печах, якія перад заканчэннем абпалу наглуха закрывалі, папярэдне падкінуўшы туды смалякоў.

У некаторых ганчарных цэнтрах паўднёвазаходняй часткі Беларусі (Пружаны, Ружаны, Пагост-Загародскі Брэсцкай вобл., Поразава, Мір Гродзенскай вобл.) задымліванне спалучалася з глянцаваннем — механічнай арнаментальнай ці суцэльнай апрацоўкай паверхні посуду перад яго абпалам. Ужывалі для гэтага гладкі крэмень (крамушку), якім на падсушанай пасудзіне наводзілі разнастайныя ўзоры ў выглядзе вертыкальных палос, косай сеткі, завіткоў і інш. Пасля абпалу яны станавіліся бліскучыя, нібы металічныя, эфектна выдзяляючыся на матавачорнай ці сіняватай паверхні посуду. У Пагосце-Загародскім рабілі суцэльнае глянцаванне, посуд нагадваў металічнае ліццё.

Посуд, не прызначаны для печы, часцей за ўсё глазуравалі (палівалі) — пакрывалі яго паверхню тонкім шклопадобным слоем. Асновай палівы быў перапалены ў парашок свінец, якім пасыпалі змазаны дзёгцем посуд (Падняпроўе) ці аблівалі яго сценкі растворам парашку ў вадзе. Пры абпале ён

плавіўся, укрываючы паверхню бліскучым воданепранікальным слоем. Дабаўка ў паліву вокісу медзі (зялёнкі) ці жалезнага перагару (дзындры) надавала ёй зялёны ці карычневы колер.

У сельскім жа ганчарстве паўночнага захаду Беларусі, дзе прымянялася архаічная ручная фармоўка ў спалучэнні *з* гартаваннем, глазураванне ўвогуле не ўжывалася.

Асартымент ганчарных вырабаў канца XIX—1-й паловы XX ст. вызначаўся значнай шырынёй — ад посуду простых формаў гаспадарчага прызначэння да складаных адмысловых твораў скульптурнага характару.

У беларускай этнаграфічнай навуцы ганчарныя вырабы паводле іх функцыянальнага прызначэння прынята дзяліць на сем асноўных груп: кухонны посуд (гаршкі, латкі, патэльні, бабачнікі, цёрлы, бойкі, цадзілкі, адстойнікі); посуд для захоўвання і транспарціроўкі прадуктаў (гладышы, збанкі, карчагі, глякі, спарышы); сталовы посуд (міскі, паўміскі, чашкі, кубкі); дэкаратыўная кераміка (букетнікі, фігурныя сасуды, попельніцы, дэкаратыўныя талеркі); цацкі; вырабы align рознага гаспадарчага прызначэння (рукамыйнікі, паілкі для куранят, дымакуры, коміны)[7]. У некаторых гарадскіх і местачковых ганчарных цэнтрах (Івянец, Ракаў, Мір, Віцебск Мінск) выраблялася таксама кафля, але ў Беларусі ў XIX—1-й палове XXст. яна ўжо страціла нацыянальную спецыфіку, часта капіруючы заходнееўрапейскія ўзоры ў стылі мадэрн.

Найбольшае пашырэнне меў гаспадарчы посуд — кухонны, сталовы, для захавання і транспарціроўкі прадуктаў, які можна аб'яднаць у агульную групу вырабаў гаспадарчага прызначэння. Тым не менш заўважаецца розніца ў формах, прызначэнні, назвах, мастацкіх асаблівасцях гаспадарчага посуду нават у суседніх ганчарных цэнтрах. У многіх вышадках гэтыя адрозненні аб'ядноўваюць некалькі ганчарных цэнтраў, якія адносяцца да пэўнага рэгіёна, і ў асноўным супадаюць з прынятым у беларускай этнаграфіі раяніраванем: Паазер'е, Падняпроўе, Панямонне, Цэнтральная Беларусь, Усходняе і Заходняе Палессе.

Агульная характэрная асаблівасць заходнепалескай керамікі — акруглабокасць, шарападобнасць вырабаў, адточанасць, своеасаблівая чаканенасць формаў, паколькі тут карысталіся нажнымі быстраходнымі кругамі і высакаякаснымі пластычнымі глінамі. Гаршкі амаль шарападобныя (у Гарадной Столінскага р-на назва гаршка — «кругляк»), маюць адзіндва вушкі, што адрознівае іх ад аналагічных вырабаў іншых рэгіёнаў. Ярка выяўлена шарападобнасць і ў глякоў (агляк, бунька). Збанкі (збан, глечык) вызначаюцца выразным чляненнем формаў. Амаль цыліндрычная шыйка са злёгку адагнутым венчыкам нібыта насаджана на шарападобнае, крыху звужанае да дна тулава.

[7]Мілючэнкаў С. Ганчарства // Промыслы і рамёствы Беларусі. Мн., 1984. С. 144.

Найбольшае распаўсюджанне ў XIX—XX стст. мелі два віды заходнепалескай керамікі — чорнаглянцаваная і белагліняная. Абодва яны прадстаўляюць характэрную адметнасць гэтага рэгіёна.

Чорнаглянцаваная кераміка вызначаецца характэрным дэкорам у выглядзе рамбічнай сеткі, завіткоў, вертыкальных палос. Найбольш выразныя такія вырабы ў Пружанах. Прымыкаюць да іх і суседнія Ружаны, а таксама Мір, які тэрытарыяльна хоць і адносіцца да Панямоння, але характарам дэкарыроўкі чорнаглянцаваных вырабаў бліжэй знаходзіцца да заходнепалескага рэгіёна. У гэтых адносінах вылучаецца Пагост-Загародскі, дзе лаканічныя, чаканеныя, нават крыху суровыя формы глянцавалі суцэльна.

Заходнепалеская кераміка, перш за ўсё пружанская, выяўляе амаль поўныя аналогіі з дэкорам і формамі вырабаў паўночных раёнаў Валыні (Ракіта, Камень-Кашырскі), а на захадзе — ганчарных цэнтраў Падляшша (Польшча). Хоць на Заходнім Палессі пераважала чорнаглянцаваная кераміка, для зоны залягання светлых каалінавых глін характэрна і белагліняная. Буйным і адзіным цэнтрам яе вытворчасці ў межах Беларускага Палесся была в. Гарадная. Акруглабокія гаршкі, глякі, збанкі распісваліся чырвонай жалезістай глінай (апіскай) у выглядзе прамых і хвалістых паясоў і косых рысак (шнурочкаў, рубежыкаў). Сістэма дэкору строгая, але вельмі выразная, пабудаваная ў адпаведнасці з законамі графічнай культуры. Амаль поўныя аналогіі выяўляе белагліняная кераміка шэрагу ганчарных цэнтраў Валыні, блізкія рысы прасочваюцца ў кераміцы Сярэдняга Падняпроўя. Як відаць, белагліняная кераміка займала тэрыторыю ў басейне Прьшяці, прадстаўляючы значны арэал распаўсюд з самых яркіх з'яў, распраўсюджання адной здаўна тыповых для паўднёвага захаду Цэнтральнай Еўропы.

Характэрныя асаблівасці керамікі паўночнага захаду Беларусі (Панямоння) вызначаюцца спецыфікай яе вытворчасці ў невялікіх сельскіх ганчарных цэнтрах (Заблоцце, Крэва, Курнікі Смаргонскага, Заборцы, Міхалішкі Астравецкага, Ладзенікі, Брацянка, Малыя Карнышы Навагрудскага р-наў), дзе да сярэдзіны ХХст. захоўваліся навыкі архаічнага кальцавога налепу з наступнай даводкай на ручным ганчарным крузе. Асартымент посуду нешырокі, формы простыя, суровыя, злёгку асіметрычныя, часам падкрэсленыя двуматрыма выціснутымі хвалістымі паяскамі— старажытным сімвалам вады. Толькі тут была вядома характэрная прадаўгаватая пасудзіна — ваза ці доўгая латушка, звязаная з вытворчасцю посуду ручной лепкай. У цэлым і асартымент, і формы посуду гэтага рэгіёна вельмі падобныя на вырабы тых тэрыторый, дзе бытавалі сходныя прынцыпы вытворчасці,— на Рускай Поўначы, у літоўцаў, паўднёвых славян.

Блізкая па сваім характары і кераміка Паазер'я, асабліва яго заходняй часткі. Масіўнасць, слабапрафіляванасць, «стаўбунаватасць» формаў вырабаў дакладна падкрэслівае тутэйшая назва гладыша — «стаўбун». Яшчэ адна, паралельная назва — «берасцень» — адлюстроўвае тшова мясцовую

(вядомую і на суседніх тэрыторыях Літвы) традыцыю аплятаць гліняную пасудзіну берасцянымі стужкамі (для моцнасці і цеплаізаляцыі).

Разам з тым у гэтым рэгіёне акрамя невялікіх сельскіх ганчарных цэнтраў з іх архаічным спосабам вытворчасці дзейнічалі і буйныя гарадскія і местачковыя асяродкі (Дзісна, Глыбокае Віцебскай вобл.) з фармоўкай посуду на быстраходных ганчарных кругах, частковым ці суцэльным глазураваннем, падглазурным ангобным роспісам расліннага характару (Дзісна). Аднак характэрна, што ў формах гэтага посуду заўважаецца прыкметны ўплыў архаічнай ляпной керамікі. Вырабы грузныя, масіўныя, шыракагорлыя, некаторыя з іх традыцыйна апляталіся бяростай.

На Падняпроўі керамічны промысел быў распаўсюджаны больш чым у 70 ганчарных цэнтрах — як невялікіх сельскіх, так і буйных гарадскіх (Дуброўна, Гарадок, Крычаў, Магілёў, Мсціслаў). І ў тых, і ў другіх, за рэдкім выключэннем (Стары і Новы Дзедзін Клімавіцкага р-на), карысталіся нажнымі быстраходнымі кругамі і пластычнымі глінамі, што дазваляла фармаваць танкасценныя зграбныя вырабы разнастайнага асартыменту. Тут паралельна бытавалі ўсе віды утылітарнамастацкай апрацоўкі: глазураванне, дымленне, гартаванне. Аднак пры ўсёй гэтай разнастайнасці формам падняпроўскай керамікі ўласціва агульная стройнасць, зграбнасць еілуэта мяккай мадэліроўкі, падкрэсленага маляўнічымі пацёкамі палівы, сціплым лінейнахвалістым прачэрчаным дэкорам ці нескладаным ангоб ным роспісам белага колеру (Бабінавічы Лёзненскага р-на).

Кераміка Цэнтральнай Беларусі сінтэзуе ў сабе асноўныя асаблівасці яе ў іншых рэгіёнах. Дзейнічалі тут і невялікія сельскія ганчарныя цэнтры з некалькімі ганчарамі, што выраблялі гартаваную кераміку нешырокага асартыменту, і досыць значныя іх канцэнтрацыі з сотнямі ганчароў (Сіняўка, Ганевічы, Масцілавічы, Забалотнікі Клецкага р-на, Лыжычы, Сяроды Мядзельскага р-на), і буйныя гарадскія і местачковыя асяродкі з высокаразвітым узроўнем рамяства: Ракаў, Івянец (Валожынскі р-н), Смілавічы (Чэрвеньскі р-н), Барысаў, Смалявічы.

Сярод іх асабліва вызначаліся Івянец і Ракаў, прадукцыя якіх славілася за сотні кіламетраў ад гэтых мястэчак. Тут склаліся цэлыя дынастыі патомных ганчароў, якія прадаўжалі і развівалі лепшыя традыцыі ганчарства, закладзеныя яшчэ ў сярэднявеччы. Арыентацыя галоўным чынам на заможных пакупнікоў садзейнічала вьшрацоўцы надзвычай шырокага асартыменту вырабаў. Акрамя бытавога посуду івянецкія і ракаўскія майстры выраблялі таксама рэчы утылітарнадэкаратыўнага і мастацкага характару, дробную пластыку, кафлю і інш. Практычна ўся прадукцыя глазуравалася, чорнаглянцаваны посуд перасталі вырабляць яшчэ ў канцы XIX ст.

Івянецкаму і ракаўскаму посуду ўласцівы дасканалыя, адточаныя формы. Сталовыя збаны (млечнікі) маюць ярка выяўлены 8падобны профіль, невялікую зграбную ручку (вуха) са своеасаблівым адросткамупорам зверху, носік (дзюбку), прафіляваны па ўсёй шыйцы, завершанай двайным валікам. Збаньшадойнікі (дайніцы) прафіляваны значна слабей, формы іх

прысадзістыя, манументальныя. Разнастайныя талеркі, міскі, паўміскі вызначаюцца рэзкім чляненнем на два аб'ёмы: ніжні, конусападобны, і верхні, амаль цыліндрычны. Шырокае распаўсюджанне мелі шарападобныя глякі, цыліндрычныя слоікі, спарышы, рукамыі, цадзілкі, кубкі, патэльні, вазоны.

Дасканаласць формаў падкрэслівалася сціплым, але выразным ангобным роспісам. Досыць характэрны івянецкі дэкор 1920—30-х гадоў расліннага характару ў выглядзе мякка мадэляванай хваёвай лапкі. Ракаўскі посуд таго ж часу аздоблены сакавітым эмалевым' роспісам у выглядзе яблыневай квецені.

Дэкаратыўная кераміка ў народным побыце беларусаў займала параўнальна сціплае месца. Яе практычна не выраблялі ў невялікіх сельскіх асяродках з архаічным спосабам вытворчасці. Толькі ў высокаразвітых гарадскіх і местачковых цэнтрах поруч з гаспадарчым посудам выраблялiся таксама рэчы хоць і не пазбаўленыя цалкам утылітарнасці, але з яўнай перавагай мастацкіх функцый. Так, напрыклад, арыгінальна выглядаюць дэкаратыўныя талеркі з ангобным ці рэльефным дэкорам, рознымі пажадальнымі надпісамі з Івянца Ракава, Барысава, Копысі. У будзённыя дні яны стаялі навідавоку ў пасудніку, у розных урачыстых вьшадках займалі сваё месца на стале. У шэрагу цэнтраў (Бабінавічы, Чашнікі, Ракаў, Івянец, Дзісна, Глыбокае) выраблялі вазы для кветак (кветнікі, букетнікі), вырашаныя звычайна на аснове збанкападобнай формы на паддоне, з дзвюма фігурнымі ручкамі. Надзвычай арыгінальныя букетнікі з Івянца, што нагадваюць ствол дрэва з галінамі I каранямі, каля якога стаіць фігурка мядзведзя.

Найбольш умелыя майстры з мастацкімі здольнасцямі ляпілі фігурныя попельніцы, чарнільныя прыборы і іншыя арыгінальныя рэчы. Асаблівую цікавасць уяўляюць фігурныя сасуды ў выглядзе бараноў, мядзведзяў, ільвоў з іх тьшова народным наіўнарэалістычным вырашэннем зааморфных формаў.

Найбольш ярка эстэтыка рукатворнасці выявілася ў ляпной дробнай пластыцы. Гэта цікавейшая галіна беларускага народнага мастацтва, якая мае глыбокія карані і багатыя традыцыі. Яшчэ параўнальна нядаўна дзіцячыя цацкісвістулькі ў выглядзе конікаў, пеўнікаў, козлікаў, баранчыкаў, фігурак людзей можна было бачыць на кожным рынку, дзе ганчары прадавалі свой тавар.

Разам з тым беларуская народная цацка вызначаецца і сваёй спецыфікай. У Беларусі яе выраб не меў характару самастойнага промыслу, як, напрыклад, у Расіі, а спадарожнічаў ганчарству. Таму, як правіла, яна не распісвалася, а глазуравалася, як і посуд, аднатоннай палівай. У традыцыйных цэнтрах задымленай керамікі чорны колер мела і цацка, якая абпальвалася разам з посудам[8].

У наш час становішча народнага ганчарнага промыслу досыць складанае. Маштабы яго мінімальныя, толькі ў асобных ганчарных цэнтрах

[8]Сахута Я. М. Беларуская народная глінянаяцацка. Мн., 1982. С. 27.

(Гарадная Столінскага, Дарасіно Любанскага, Ляды Дубровенскага, Поразава Свіслацкага рнаў, Гарадок, Браслаў) працуюць адзіндва майстры. Асартымент посуду звузіўся, формы здрабнелі і спрасціліся. Разам з тым з 2-й паловы 80-х гадоў у сувязі з ростам цікавасці да традыцыйнай спадчыны і больш спрыяльнай дзяржаўнай палітыкай у адносінах да майстроўсаматужнікаў назіраецца стабілізацыя працэсаў заняпаду промыслу, а ў некаторых вьшадках — нават яго адраджэнне.

Спробы адрадзіць ганчарны промысел на дзяржаўным узроўні аказаліся досыць спрэчнымі. Ганчарныя цэхі, створаныя ў некаторых асяродках пры мясцовых прамкамбінатах (Гарадок, Крэва, Бабруйск), вьшускаюць нешырокі асартымент гаспадарчага посуду, нярэдка спосабам штампоўкі на паўаўтаматах. Мастацкія якасці традыцыйных вырабаў набылі сваё развіццё на Івянецкай фабрыцы мастацкай керамікі і вышыўкі, арганізаванай у 1960 г. на базе ганчарнага цэха. Разнастайныя вырабы івянецкіх майстроў, аздобленыя характэрным мясцовым дэкорам (івянецкая фляндроўка), у 1960—70-х гадах набылі шырокую папулярнасць далёка за межамі Беларусі.

Такі ж прамысловы характар вызначае прадукцыю і Радашковіцкага завода мастацкай керамікі — галаўнога прадпрыемства арганізаванага ў 1979 г. вытворчага аб'яднання «Беларуская мастацкая кераміка», куды ўвайшлі таксама заюды ў Івянцы і Рэчыцы. Механізацыя працэсу нарыхтоўкі сыравіны, фармоўкі вырабаў, іх абпалу дазваляе значна павысіць прадукцыйнасць працы, дабіцца высокай якасці вырабаў, але вядзе да іх нівеліроўкі, страты мясцовай своеасаблівасці.

Як паказала практыка, найбольш рэальны шлях — падтрыманне промыслу ў яго натуральным выглядзе з традыцыйнымі формамі вытворчасці, арганізацыяй вучнёўства і г. д. Магчыма стварэнне невялікіх арцеляў ці майстэрань, дзе дапускаецца механізацыя нятворчай працы, але захоўваюцца традыцыйныя працэсы, якія ўплываюць на характар і мясцовую самабытнасць вырабаў.

Лозапляценне

Лозапляценне -- разнавіднасць пляцення, народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Пляценне з такога даступнага матэрыялу, амаль не патрабуе апрацоўкі, матэрыялу з’яўляецца адным са старажытных заняткаў чалавека, што папярэднічалі ткацтву апрацоўцы металу не патрабавалі спецыяльнага абсталявання. Гэтае пляценне вядомае паўсюль, дзе расце лаза. У Беларусі расце да 20 відаў лазы, таму лазапляценне было не толькіпаўсядзённым хатнім заняткам, але і шырокаразвітым промыслам, асабліва ў канцы XIX – першай палове XX стагоддзя. Асабліва буйнымі асяродкамі лозапляцення былі Норыца, Тумілавичы, Богіна, Верхняе на Віцебшчыне, Куцавічы, Ходараўцы на Гродзеншчыне і гэтак далей. Лозапляценне цалкам засноўвалася на задавальненні бытавых патрэбаў. Плялі з лазы формы ад буйных (сцены пабудоў, агароджы) да дробных, часта выплеценых з ювелірнай дакладнасцю прызначаных для утылітарна-дэкаратыўных мэтаў у народным побыце. Найбольш пашыраныя народным побыце, у тым ліку у наш час, разнастайныя кошыкі для пераноскі садавіны,

гароднiны, збору ягад, грыбоў; вазы, сухарнiцы, хлебнiцы, канфетнiцы, газетнiцы, падстаўкi для свечак шмат iншага.У лозапляценнi вызначаюцца разнастайнасцю тэхнiчныя прыёмы пляцення. Найбольш пашыранае, вiдаць самае старажытнае простае – крыжовае пляценне (рад раўнамерна размешчаных дубцоў пачаргова пераплятаецца танчэйшымi дубчыкамi). Традыцыi лозапляцення, практычна не перапыняюцца, працягваюцца наш час. Сёння гэта занятак асобных майстроў, носьбiтаў традыцый калiсьцi пашыранага промыслу.

Саломапляценне

Саломапляценне – гэта разнавiднасць пляцення, народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яно атрымала шырокае распаўсюджанне атрымала на Беларусi. Для пляцення выкарыстоўвалi пераважна жытнюю салому з тонкiм роўным сцяблом (падыходзiла салома толькi ўручную зжатага абмалочанага жыта – выкалатка). Традыцыйным саломкапляценнем займалiся паўсюдна. Саламяныя ўпрыгожваннi, дробную пластыку, павукi плялi пераважна жанчыны, дзецi. Пляценне утылiтарных рэчаў (начыння, капелюшоў) звычайна было хатнiм промыслам, а ў пачатку 20 стагоддзя пачалi ўзнiкаць майстэрнi па вырабу шкатулак, карзiнак, фруктоўнiц iншых рэчаў пераважна для гарадскога спажыўца. З сярэдзiны 1960-х гадоў саломкапляценне развiваецца ў форме арганiзаванага мастацкага промыслу, характарызуецца нацыянальнай мастацкай асаблiвасцю, вобразнай сюжэтна-тэматычнай разнастайнасцю, своеасаблiвымi сродкамi тэхнiкамi пляцення. Выдзяляюць наступныя тыпы саломапляцення: спiральнае прамое пляценне, пляценне з плоскiх аб’ёмных пляцёнак. Найбольш пашыранай была тэхнiка спiральнага пляцення жгутоў саломы, пруткоў лазы, льняных нiтак. Такiм спосабам выраблялi саламяныя карабы, шыяны з векам для захавання збожжа, мукi, меншыя па памерах кублы карабы для круп, аддзення, гарцы, якiя служылi мерай збожжа. З саломкi таксама плялi павука – падвесную або насценную дэкаратыўную канструкцыю для ўпрыгожвання iнтэр’ера жылля. Саломапляценне ў 2022 годзе ўнесена ў спiс кульурных каштоўнасцей ЮНЕСКА.

Вырабы з бярости.

Берасцяныя рэчы, нават i без дэкоры, вызначаюцца прыгожым натуральным колерам i малюнкам. Свежая бяроста – прыемнага зеленавата-ружовага колеру. З часам яна цямнее, набывае цёмна-жоўтае адценне i нагадвае старажытную косць. Бяроста лёгка рэжацца нажом у любым напрамку, на ёй можна выцiскаць прыгожыя ўзоры простымi штампамi: цвiком, трубачкай, металiчнай пласцiнкай iiнш.

Выцiнанкi.

Слова, наўрад цi вядомае шырокай грамадкасцi. А мiж тым гэта ўзоры, якiя выразалi з паперы.

Вырабы з цеста

Сярод разнастайных узораў беларускага народнага мастацтва ёсць творы, якiя можна… есцi. Гэта розныя фiгурныя вырабы з цеста, якiя здаўна выпякалi да навагоднiх i веснавых святаў, на вяселлi, днi нараджэння, памiнкi. Пашыраны гэты звычай ва усiх усходнiх славян, у старажытнасцi такая

пластыка з цеста выконвала магічныя функцыі: пажаданне здароу’я, багатага ураджаю, шчасця у сям’і і інш.

Традыцыйнае адзенне

Традыцыйнае народнае адзенне з’яўляецца важным этнічным і сацыяльным паказчыкам. Яно параўнальна з іншымі відамі матэрыяльнай культуры. Традыцыйнае народнае адзенне выконвае не толькі практычныя, але і этнакультурныя, эстэтычныя, абрадавыя, магічныя функцыі. Менавіта адзенне адлюстроўвае дух эпохі, індывідуальны густ, псіхалогію чалавека, яго фізічны стан, узрост, сямейнае становішча, сацыяльную і прафесійную прыналежнасць.

Традыцыйнае адзенне беларусаў амаль цалкам выраблялася з сваёй сыравіны:з ільну, валокан канапель, жывёльнай скуры, воўны. Шлях да гатовага вырабу быў досыць працяглы і ўключаў шэраг паслядоўных аперацый. Так, сцябліны льну ці канаплі спачатку мачылі, потым мялі на спецыяльнай мялцы, трапалі, часалі грэбнямі і шчоткамі, потым  пралі — на адмысловай дошцы ці на калаўроце з колам. Пражу намотвалі на матавіла, сушылі, кал трэба было бялілі, снавалі і нарэшце ткалі. Фарбавалі тканіну самі. У якасці фарбавальнікаў выкарыстоўвалі настоі розных кветак і траў, лісце і кару, балотную руду, гліну.

Асноўныя фарбы, што складалі каляровую гаму традыцыйнага  народнага адзення, - чырвоная, сіняя (васільковая), чорная, бурая (альховая). Варта адзначыць, што да з'яўлення фабрычных тэхналогій у летнім адзенні беларусаў пераважалі натуральныя белыя колеры; тое ж тычылася і зімовай вопраткі.

У шырокім сэнсе адзенне – гэта не толькі вопратка, але і галаўныя ўборы, абутак, упрыгожванні. У залежнасці ад тыпалагічных асаблівасцей (канструкцыі, спалучэння асобных частак у агульным комплексе, канкрэтных функцый) яно падзяляецца на мужчынскае і жаночае (па сваіх асаблівасцях тут можна вылучыць яшчэ і дзіцячае і юнацкае), летняе і зімняе або верхняе (прамежкавы варыянт – дэмісезоннае), паўсядзеннае і святочнае. Дарослы член сям'і меў некалькі камплектаў вопраткі: святочную, а таксама будзённую для кожнай пары году. Гэта тычылася і такіх складаных для вырабу рэчаў, як кажух і світка, якія таксама прызначаліся для працы і свят.

Традыцыйнае мужчынскае адзенне беларусаў вызначалася меншай разнастайнасцю, чым жаночае.

Кашуля (сарочка) – самы  старажытны і ўстойлівы элемент у традыцыйным народным касцюме. У найбольш старажытным варыянце яна мела тунікападобны крой, доўгія, нярэдка ніжэй кісці, рукавы і прамы разрэз вората. Параўнальна з жаночай, мужчынскія кашулі ўпрыгожваліся сціпла.

Мужчынскія порткі (нагавіцы, ганавіцы) рабіліся з палатна (на лета), сукна (каб насіць узімку) не надта добрага гатунку. Беларускія нагавіцы былі параўнальна не шырокімі, яны мелі вузкія калашыны (“штаны з вузкім шагам”). Іх адрознівала рамбавідная форма ўстаўкі паміж штанінамі, хаця мелі месца і ўстаўкі іншай формы — трохвугольнай, круглай, трапецыявіднай, і трымаліся на шнурку, ўсованым праз абшыўку ў верхняй частцы. Суконныя нагавіцы маглі зашпіляцца на адзін ці два гузікі з косці, скуры, кавалачка дрэва і не мелі кішэняў. а неабходныя ў паўсядзенным ужытку рэчы (крэсіва, люлька, нож і

інш.) насілі ў скураной сумцы (шабета, каліта) або падвешвалі непасрэдна да пояса.

Абавязковай прыналежнасцю мужчынскага строю быў пояс — старажытны плецены ці тканы. На поясе вісела невялічкая торбачка — каліта, у якой захоўваліся грошы, тытунь, люлька, крэсіва, нож (мог вісець і асобна). З'яўляючыся неабходным элементам беларускага адзення, паясы адыгрывалі важную ролю ў звычаях і абрадах. Іх даравала нявеста свайму выбранніку напярэдадні і ў час вяселля, іх бралі з сабой, ідучы ў адведкі да парадзіхі, імі спавівалі нованароджаных і гадавалых дзяцей, іх ахвяравалі царкве, яны выкарыстоўваліся як рытуальныя атрыбуты ў час гаданняў, замоў, заклінанняў. Паясы вызначаліся вялікай разнастайнасцю, адрозніваючыся сваімі памерамі, наяўнасцю дадатковых дэталяў, узорным арнаментам, спосабам вырабу.

Сяляне таксама насілі скураныя рамяні, якімі падпаясвалі світкі (здаўна згадваюцца ў актах XVI—XVII стст.).

Беларускія мужчыны насілі безрукаўкі (камізэлькі, жупіцы).

Найбольш распаўсюджаным і характэрным верхнім адзеннем былі суконная світа (сярмяга, латуха, сукмана, катанка) і аўчынны кажух (футра, шуба). Мужчынскія світа і кажух па сваіх відавых асаблівасцях мала адрозніваліся ад жаночых. Па свайму крою і колеру світы былі неаднолькавыя, утвараючы на тэрыторыі Беларусі некалькі варыянтаў. Кожны селянін меў звычайна дзве світы, адну – паўсядзенную, другую – выхадную. Колер світы вар'іраваў у залежнасці ад яе функцыянальнага прызначэння, сацыяльнага адрасата і раёна бытавання. У шырокім ужыванні былі і ўкарочаныя світы – світкі, або курткі, каптанікі, латушкі, сярмяжкі, казачынкі, як іх называлі ў розных мясцовасцях. Зімой ужываліся аўчынныя кажухі і футравыя шубы. Па свайму крою кажухі нязначна адрозніваліся ад світ. Іх насілі і мужчыны і жанчыны.

Да шляхецкага мужчынскага адзення адносяцца капот, жупан, кунтуш, дэлія. Капот уяўляў сабой прыталены кафтан на гузіках, які шыўся з тонкага шэрага сукна. Жупан – больш доўгі кафтан, крыху прыталены, са стаячым каўняром; яго шылі са светлага ці шэрага сукна, радзей – атласу ці аксаміту. Жупан падпаясваўся поясам, які надаваў яму святочную ўрачыстасць і нацыянальную вызначанасць. З гэтай мэтай ужываліся знакамітыя слуцкія паясы.

Мужчынскія галаўныя уборы вырабляліся з воўны, футра, сукна, саломы. Традыцыйны летні галаўны ўбор — плецены з саломы (радзей — з лазы, чароту) шырокапольны капялюш з тулляй (брыль). Са старажытных актаў вядомы магеркі — валяныя шапкі з палямі, што прылягалі да туллі, а таксама валяныя брылі ды інш. Старадаўнія зімовыя шапкі шыліся з футра вавёркі, лісы, зайца, а таксама з аўчыны футрам навонкі. Найбольш старажытныя, з аўчыны, былі высокімі, цыліндрычнай, конусападобнай формы — кучмы. Зімовая шапка падкрэслена вялікіх памераў называлася капузай. Скарыстоўвалася і футравая шапка, абшытая зверху сукном, з вушамі — малахай. Досыць старадаўняя, пашытая, зазвычай — з аўчыны, аблавуха — шапка з вушамі па баках спераду і ззаду (яны падвязваліся зверху).

Мужчынскі абутак складалі лапці (такія ж, як і ў жанчын), боты, валёнкі.

Такім чынам, у тыповым варыянце традыцыйны комплекс мужчынскага адзення складалі доўгая, амаль да каленяў, кашуля і штаны з даматканага палатна натуральнага (белага) колеру; галаўны ўбор – валеная з воўны або пашытая з сукна шапка (магерка), у зімовую сцюжу – вушанка (аблавуха) з аўчыны; асноўны абутак – лапці, часцей лыкавыя, больш заможныя па святах насілі скураныя боты. Кашуля мела некаторыя лакальныя асаблівасці ў крої, форме каўняра і рукавоў; яе насілі навыпуск паверх штаноў, пад пояс.

Традыцыйнае жаночае беларускае адзенне вызначаецца багаццем свайго этнакультурнага зместу.

Жаночае адзенне ўвасобіла ў сабе найбольш ярка і выразна багацце творчай фантазіі народа, яго этнічныя традыцыі, духоўныя памкненні і густы. У тыповым варыянце традыцыйны жаночы комплекс складалі доўгая палатняная кашуля (сарочка), спадніца, фартух, безрукаўка. Найбольш устойлівай часткай (кампанентам) у гэтым комплексе была кашуля. Яна мела просты свабодны крой, што нярэдка ўскладняўся плечавымі ўстаўкамі-полікамі. Яе шылі з кужалю (тонкага палатна); часам у паўсядзенных сарочках кужаль складаў толькі верхнюю частку (чэхлік), а ніжнюю (постаўку) –зрэбная тканіна. Такая сарочка мела нешырокі стаячы або адкладны каўнерык.

Даволі распаўсюджаным тыпам жаночай кашулі з’яўляецца кашуля з гесткай. У ёй асноўны матэрыл ( станіна)  прышываўся ўверсе да нешырокай какеткі – гесткі. Палотнішчы “станіны” пры сшыванні с гесткай збіраліся ў зборку спераду і ззаду. Гестка мела плечавыя швы, але часта іх не рабілі, тады матэрыял на плячах проста перагінаўся.

Святочныя кашулі ўпрыгожваліся багатым вышываным ці тканым арнаментам на плячах, манжэтах рукавоў, каўнерыку, радзей – па ворату і падолу.

Спадніца адносіцца да паяснога жаночага адзення. Яна шылася з даматканага палатна, сукна ці паўсукна. Спадніца рабілася з некалькіх (да шасці) полак (падоўжаных кавалкаў палатна), сшытых і прызбораных ля поясу. Зрэдку спадніцу шылі з папярэчнага кавалку тканіны — папярэчкі. Спадніца завязвалася спераду ці крыху збоку тасёмкамі ці пояском. Вылучаюцца спадніцы, якія шыліся з ваўнянай ці паўваўнянай тканіны — андаракі (слова паходзіць з нямецкай мовы). У старажытнасці андаракі ў якасці верхняй спадніцы насілі прадстаўніцы паноўных класаў. Андарак багата ўпрыгожвалі, і асаблівасцю ягонай з’яўляецца клеткавы арнамент.

Андарак, сшыты з безрукаўкай (ліфам), утвараў новы тып адзення – саян. Апошні быў найбольш пашыраным у Падняпроўі. Ліф-гарсэт пры гэтым шылі з больш тонкай самаробнай (шарсцяной ці льняной) тканіны або з пакупных аксаміту, саціну, шоўку і інш.

Адной з самых старажытных форм паяснога адзення была панева. Часцей за ўсе яна ўяўляла сабой тры сшытыя полкі ўзорнай шарсцяной тканіны, што ахіналіся вакол таліі на пояску ці матузку. Панева адносілася, такім чынам, да расхіннага тыпу паяснога адзення. Магчыма, на нашых землях яна папярэднічала андараку.

Неабходным кампанентам традыцыйнага жаночага ўбору быў фартух (хвартух, пярэднік, запаска). Яго шылі з 1 – 2 полак ільняной тканіны і багата ўпрыгожвалі ў ніжняй частцы вышыўкай, аплікацыяй, карункавым арнаментам, мярэжкай. Як і паневы, фартухі-запаскі рабіліся нярэдка з шарсцяной тканіны. У больш ранні перыяд жанчыны насілі дзве шырокія запаскі – спераду і заду, сшытыя ў верхняй частцы, яны амаль нічым не адрозніваліся ад паневы-плахты. Даўжыня фартуха ў беларусак амаль супадала з даўжынёю спадніц. Такія даўгія — роўныя са спадніцамі хвартухі апрануты на пакаёўках на абразе “Нараджэнне Маці Боскай” Маларыцкага майстра (1648—1650 гг.). Паказальна, што на згаданай выяве фартухі не арнаментаваны — адзін натуральна белага колеру, другі, хутчэй за ўсё, пафарбаваны, хаця ў пазнейшы час іх зазвычай аздаблялі, найчасцей — гарызантальнай арнаментыкай — па ніжнім краі, альбо і троху вышэй. У верхняй частцы фартух дробна прызборваўся. Беларускія фартухі тыпалагічна блізкія да пярэднікаў прыбалтаў, палякаў, што робіць гэты від адзення часткай поліэтнічнай культуры.

Безрукаўка (камізэлька, шнуроўка, кабат, гарсэт, кітлік) рабілася з тонкага палатна, пакупнога атласу, аксаміту, парчы, багата аздаблялася вышыўкай, аплікацыяй, рознакаляровымі тасеткамі. Гэта было досыць каштоўнае адзенне, і, зыходна з пазнейшых этнаграфічных дадзеных, магло перадавацца ў спадчыну. Найбольш просты крой — з простай спінкай, калі задняя частка рабілася з суцэльнага кавалку матэрыялу. Безрукаўкі на Беларусі мелі даўжыню да стану і ніжэй — заходзілі за верхнюю частку спадніцы. Доўгія безрукаўкі знізу разрэзваліся і абшываліся. Зазвычай суцэльны разрэз рабілі спераду, і ён зашнуроўваўся ці зашпіляўся на саматробныя гузікі, на грудзях утваралі выраз — круглы ці геаметрычна-вуглавой формы. Безрукаўка ўпрыгожвалася вышыўкамі, нашыўкамі з найлепшых нітак. Яна шчыльна аблягала жаночы стан..

Верхняе (зімовае) адзенне жанчын нязначна адрознівалася ад мужчынскага. Світы, буркі, кажухі, шубы, насовы, кажушкі, сярмяжкі – усе гэтыя віды верхняга адзння ў аднолькавай ступені былі ўласцівы як мужчынам, так і жанчынам. Больш кароткія кажухі – кажушкі, паўшубкі – мелі свабодны пакрой; у жанчын яны былі апушаныя знізу і па ворату і дэкараваліся вышыўкай і аплікацыяй.

Сярмяга і кажух, якія ўзгадваюцца ў актах XVII—XVIII ст.ст., рабіліся з хатніх матэрыялаў — сукна, палатна, аўчыны, адмыслова апрацаваных і пашытых краўцамі. Гэтая вопратка не мела падкладкі, магла зашпіляцца на драўляныя гузікі, гаплікі, альбо проста падпаясвацца.

Найбольш пашыраным відам адзення была світа (сярмяга) — зробленая зазвычай з сукна доўгае расхінастае адзенне з рукавамі, разрэзам спераду і адкладным каўняром. Найбольш былі пашыраны світы простага халатападобнага крою, хаця існавалі і іншыя: прыстаненая з бакавымі клінамі — “вусамі”, у зборкі, з фалдамі. Світа мела белы ці шэры, рэдка — чорны колер (больш уласцівы для шляхты), упрыгожвалі яе сціпла.

Кажух рабіўся ў старажытнасці з нядубленых белых аўчын. Найбольш пашыраны быў на Беларусі кажух простага крою, адрозна ад пазнейшых часоў, старажытны кажух быў даўгім.

Менш распаўсюджана было верхняе палатнянае адзенне — насоў, балахон, якое апранаў на кашулю ўлетку ці ўвосень.

Наогул традыцыйнае беларускае жаночае адзенне характарызавалася арнаментальнай стрыманасцю, натуральным колерам.

Галаўныя ўборы складалі самую каларытную і маляўнічую частку беларускай жаночай вопраткі, якая прыдавала ўсяму народнаму касцюму завершанасць і святочнасць. Галаўны ўбор падкрэсліваў рысы твару жанчыны, упрыгожваў яе. Таму з даўніх часоў галаўным уборам жанчыны надавалі вялікае значэнне. Кожны галаўны ўбор формай і спосабам нашэння строга адпавядаў прынятаму ў дадзенай мясцовасці стандарту, а матэрыял, з якога ён рабіўся, яго ўпрыгожанні залежалі ад фантазіі, густу і ступені заможнасці жанчыны.

Для традыцыйных галаўных убораў выкарыстоўвалася заўсёды самае тонкае палатно і тыя куплёныя фабрычныя тканіны, якія толькі былі даступны вясковай жанчыне. Разам з тым галаўныя ўборы, як ні адна іншая частка жаночай вопраткі, заўсёды строга адпавядалі ўзросту жанчыны. Так, галаўныя ўборы пажылых жанчын, хаця і захоўвалі заўсёды традыцыйную форму і колер, былі вельмі сціплымі, без упрыгожанняў.

Галаўныя ўборы беларускіх жанчын заўсёды адпавядалі іх сямейнаму становішчу. "Як вянок быў прыкметай дзявоцтва і мог насіцца толькі дзяўчынай, так і чапец быў прыкметай замужжа".

У цёплую пару года і ў хаце дзяўчаты не насілі ніякіх галаўных убораў. Непакрытыя валасы лічыліся ў беларусаў, як і ва ўсіх усходніх славян, адзнакай дзявоцтва. Таму такія старажытныя дзявочыя галаўныя ўборы, як вянкі, не мелі верху, а галаўныя павязкі ("шырынкі", "ручнікі", "скіндачкі") у выглядзе вузкага ручніка з арнаментаванымі канцамі або налобнікам павязваліся такім чынам, што не закрывалі валасоў на макушцы. Шырыня дзявочых галаўных павязак была каля 30 см, даўжыня - 1-1,2 м. Пры павязванні яны заўжды складваліся ўдвая і завязваліся вузлом на патыліцы. У сярэдзіне XIX ст. дзявочыя галаўныя павязкі былі шырока распаўсюджаны на ўсёй Беларусі, аднак к канцу XIX ст. амаль поўнасцю былі выцеснены хусткамі.

У Гомельскім павеце Магілёўскай губерні ў канцы XIX ст. паверх заплеценых у косы валасоў дзяўчаты насілі складзеную па дыяганалі палоскай хустку, якую завязвалі ў выглядзе вянка з вісячымі ззаду канцамі . Такім жа чынам павязвалі дзяўчаты хусткі ў канцы XIX - пачатку XX ст. і ў Клімавіцкім павеце Магілёўскай губерні. Толькі ў некаторых вёсках гэтага павета дзяўчаты ў складзеную палоскай па дыяганалі хустку ўкладалі яшчэ кавалкі кардона або лубу шырышёй 10-15 см. і памерам па аб'ёму галавы. Канцы хусткі завязвалі ззаду на вузел .

У пачатку XX ст. дзявочыя галаўныя павязкі (па даных экспедыцый ІМЭФ АН БССР) былі распаўсюджаны толькі ў Клімавіцкім павеце Магілёўскай губерні і Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У вёсцы Узлогі

Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні (на мяжы з Расіяй) на святы дзяўчаты павязвалі "бахмару" (відаць, ад слова "бахрама") - нешырокую павязку з тонкага адбеленага палатна. "Бахмара" ўпрыгожвалася кругом невялічкімі кутасікамі ("пуклямі") з чырвоных і чорных бумажных нітак і моцна крухмалілася. Яна складвалася па даўжыні ў два разы і завязвалася вакол галавы вузлом на патыліцы .

У канцы XIX - пачатку XX ст. у летнюю пару дзяўчаты хадзілі звычайна з непакрытай галавой. Хусткі завязвалі толькі ў час палявых работ, каб прыкрыць галаву ад сонца, на святы і ў дарогу. У такіх выпадках складзеныя па дыяганалі хусткі павязвалі пад падбародак або вакол галавы, завязваючы канцы зверху задняга касячка хусткі. У святы яркія каляровыя хусткі павязвалі пад падбародак, пакідаючы спераду частку валасоў адкрытай. У Гродзенскай губерні да павязаных святочных хустак дзяўчаты прымацоўвалі па 2 букеты жывых або штучных кветак

Адзін з найбольш старажытных жаночых галаўных убораў беларусак, а таксама рускіх, украінак, прыбалтак — намітка: ручніковы галаўны ўбор з тонкага палатна значнай даўжыні (2—3 метры), што павязваўся на чапец (яшчэ таксама — на цвёрдую аснову) так, каб адзін альбо абодва ягоныя даўгія канцы спускаліся на спіну. На Палессі маладой пасля вянчання ў царкве надзявалі намітку, і яна насіла яе цэлы дзень. Па прыездзе нявесты ў хату жаніха свёкар здымаў намітку і сяброўкі расчэсвалі нявесце валасы, закручвалі іх на тканку і надзявалі чапец і хустку.

Намітка - ручніковы галаўны ўбор замужніх жанчын, шырока вядомы усім славянам , балтам і некаторым іншым народам . У старажытнасці яе насілі ўсе жанчыны незалежна ад саслоўнай прыналежнасці. У Беларусі ўпершыню мы сустракаем намітку на партрэце княгіні Кацярыны Алелькавіч-Слуцкай (першая палавіна XVI ст.) . Наміткі і чапцы часта ўпамінаюцца ў матэрыялах Гродзенскага земскага суда сярэдзіны XVI ст. Намітка ("намётка", "павівала", "плат") уяўляла сабою доўгі (2,5-3,5 м) ручнік з тонкага палатна шырынёй 40-60 см з затканымі звычайна чырвонымі баваўнянымі ніткамі канцамі. Ткалі намітку з самых тонкіх кужэльных нітак, стараючыся, каб яна была як мага танчэйшай. Каб зрабіць намітку больш тонкай, у Пінскім павеце Мінскай губерні яе мачылі ў вадзе, клалі на камень, а другім цёрлі зверху да таго часу, пакуль палатно не станавілася падобным на марлю. Затым намітку мылі, жлукцілі і крухмалілі. Такая намітка была вельмі тонкай і ў той жа час добра трымала форму.

Намітку звычайна павязвалі на чапец. "Завіванне" наміткі было даволі складаным і патрабавала значнага часу і пэўнага ўмення. Таму ў некаторых вёсках Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў на чапец пад намітку падкладвалі шырокі цвёрды абруч - "лубачку", "каробачку". Гэта давала магчымасць замацаваную такім чынам намітку здымаць і надзяваць, як шапку, не трацячы часу на яе павязванне .

На Беларусі існавалі самыя разнастайныя спосабы павязвання намітак. Кожны спосаб адпавядаў пэўнай мясцовасці . Але нярэдка і ў адной вёсцы завівалі яе рознымі спосабамі. Самым пашыраным быў спосаб павязвання, пры

якім сярэдзіна наміткі накладвалася на галаву, затым адзін канец яе складваўся ў 4-6 разоў, агінаў галаву ў выглядзе круглай шапачкі, прапускаўся пад падбародкам і ўмацоўваўся справа або ззаду на макушцы. Другі шырокі канец свабодна звісаў ззаду да паясніцы .

Часам намітка павязвалася такім чынам, што абодва складзеныя ў 4-6 разоў канцы праходзілі пад падбародкам і замацаваныя тырчалі па баках главы ў выглядзе рагоў, а затым

Часам намітка павязвалася такім чынам, што адзін яе вельмі доўгі спушчаны па спіне канец краем прымацоўваўся на патыліцы, ствараючы такім чынам ззаду доўгую, ніжэй пояса пятлю . У канцы XIX ст. намітка бытавала на асноўнай тэрыторыі Беларусі толькі як святочны галаўны ўбор некаторых старых жанчын і абрадавы галаўны ўбор на вяселлі і пры пачатку ўборкі зернявых.

Акрамя намітак, беларускія жанчыны насілі ў старажытнасці чапцы — згаданыя вышэй з круглым верхам, аколышкам і завязкамі ззаду, і глыбокія, з завязкай пад падбародак (“каптур”).

У сярэдзіне XIX ст. на Палессі бытаваў складаны рагаты жаночы галаўны ўбор - "галава", які па форме нагадваў ківер улан. Зверху "галава" абвязвалася наміткай - "сарпанкай" .

Да ліку рагатых галаўных убораў трэба аднесці і "пушанку", якую яшчэ і зараз носяць некаторыя старыя жанчыны на тэрыторыі былога Пінскага павета Мінскай губерні .

Закручванне валасоў на тканку або на жмут кудзелі ў канцы XIX - пачатку XX ст. ужо не лічылася абавязковым на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У некаторых паветах Магілёўскай і Віцебскай губерняў жанчыны заплятали валасы ў дзве касы, а на болыпай частцы цэнтральнай і заходняй Беларусі заплятанне валасоў у косы было адзінай жаночай прычоскай.

Як ужо адзначалася, абавязковым элементам складанага жаночага галаўнога ўбору канца XIX - пачатку XX ст. быў чапец. Шылі чапцы звычайна з тонкай, мяккай, часцей фабрычнай матэрыі.

У залежнасці ад крою чапцы можна падзяліць на два асноўныя тыпы: шытыя або вязаныя з нітак з круглым або авальным верхам і вузкім аколышам з прышытымі ззаду завязкамі і глыбокія чапцы з завязкамі пад падбародкам.

Чапцы першага тыпу былі распаўсюджаны на болыпай частцы тэрыторыі сучаснай Беларусі і вядомы пад тэрмінам "чапец" у розных фанетычных варыянтах, а ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні - пад тэрмінамі "павойнік", "зборнік". Такі чапец меў выгляд неглыбокай круглай шапачкі, якая, не закрываючы вушэй, шчыльна аблягала галаву. Круглае або авальнае донца такіх чапцоў спераду і ззаду звычайна дробна прызборвалася каля аколыша. Нешырокі аколыш браўся ззаду на рызінку або не сшываўся, і тады да яго канцоў прышываліся завязкі. Часам шнурок прапускаўся праз ніжні край усяго аколыша, і канцы яго завязваліся ззаду .

Святочныя чапцы шылі звычайна з яркіх, тонкіх фабрычных тканін: паркалю, шоўку, атласу, кумачу, тонкага сукна, кашаміру. Найбольш пашыранымі былі чапцы чырвонага колеру. Налобная частка такіх чапцоў

упрыгожвалася самым разнастайным чынам: фальбоначкамі, "грыбочкамі" са стужак, карункаў або з той жа матэрыі, што і чапец, каляровай тасьмой, шнуркамі, вышыўкай, пацеркамі.

На тэрыторыі сучаснай Брэсцкай вобласці у канцы XIX - пачатку XX ст па аколышу павязвалася суконная стужка часцей за ўсе чырвонага колеру ("падбічка", "гічка", "куснак") Некаторыя старыя жанчыны рабілі яе чорнай

У паўднёвых паветах Гродзенскай губерні над шытымі чапцамі пераважалі вязаныя з баваўняных белых або чырвоных нітак. Радзей іх вязалі з адбеленых суровых нітак. Вязаліся чапцы сеткай і па форме нагадвалі шытыя . Вязаныя з нітак чапцы сустракаліся побач з шытымі на поўдні Мінскай і Магілёўскай губерняў, але не мелі там шырокага распаўсюджання. Чапец жанчына надзявала ў першы дзень замужжа і не здымала яго да самай смерці.

Глыбокія жаночыя чапцы з завязкамі пад падбародкам бытавалі ў Беларусі звычайна пад тэрмінам "каптур". Каптур шчыльна аблягаў галаву і закрываў вушы, нагадваючы па форме дзіцячы чэпчык. Завязваўся ен пад падбародкам доўгшi, даволі шырокші завязкамі .

Каптуры былі пераважна чырвонага або чорнага колеру і шыліся з тонкага сукна часта ў спалучэнні з шшымі фабрычнымі тканшамі. У адрозненне ад чапцоў, якія насілі толькі разам: з наміткай або хусткай, каптуры ў штодзеннай носцы звычайна з'яўляліся самастойным галаўным уборам Таму яны ўпрыгожваліся не толькі па налобнай частцы, як чапцы, а цалкам Упрыгожваліся яны тымі ж матэрыяламі, што і чапцы. Часта каптуры шыліся з матэрый некалькіх колераў і яшчэ аздабляліся стужкамі або бліскучай тасьмой, пазументам, брыжыкамі.

Выходзячы з дому "на людзі", жанчыны надзявалі на каптур хустку і завязвалі яе пад падбародкам або вакол галавы такім чынам, што з-пад яе былі відаць толькі канцы каптура і яго завязкі ("вушкі"). У канцы XIX - пачатку XX ст. у Віленскім і Вілейскім паветах Віленскай губерні поруч з каптурамі насілі і круглыя чапцы. У гэтай мясцовасці каптуры былі прыналежнасцю толькі пажылых жанчын, а больш маладыя насілі ўжо чапцы. А ў вёсцы Бабровічы Ашмянскага павета Віленскай губерні каптурамі звалі па традыцыі круглыя чапцы з завязкамі ззаду.

Разнавіднасцю каптуроў былі "шапкі" - чапцы з меншымі, чым у каптуроў, вушамі. Шапка не закрывала вушэй і завязвалася шырокімі завязкамі пад падбародкам. Разам з каптурамі і чапцамі шапкі бытавалі ў Слуцкім павеце Мінскай губерні. Насілі іх звычайна ў спалучэнні з хусткай або наміткай.

Гаворачы аб спосабах нашэння чапцоў і шапак, трэба адзначыць яшчэ адну асаблівасць. Пад чапец тканка рабілася па аб'ёму галавы, накручаныя на яе валасы ўкладваліся валікам вакол галавы крыху вышэй вушэй, а пад шапку тканка рабілася значна меншай, і накручаныя на яе валасы ўкладваліся венчыкам ужо толькі на цемені.У пачатку XX ст. многія маладыя жанчыны ўжо не насілі чапцоў і тканак, а шчыльна завязвалі вакол галавы невялікую хустачку, паверх якой павязвалі другую.

Існавалі і арыгінальныя, рагатыя, галаўныя ўборы, зробленыя на цвёрдай аснове і абвязаныя палатном (старажытны тып — “пушанка”).

У другой палавіне XIX ст. на тэрыторыі Беларусі шырока распаўсюджваецца хустка, якая замяняе намітку ў штодзенным нашэнні. Хусткі былі самага разнастайнага памеру і якасці, квадратнай формы. Летнія дамотканыя або фабрычнага вырабу хусткі на ўсёй тэрыторыі Беларусі бытавалі пад тэрмінамі "хустка", "хусцінка", "хуста", а ва ўсходніх раёнах гэтыя тэрміны існавалі разам з рускай назвай "платок".

Фабрычныя хусткі атрымалі розныя назвы. Так, паркалёвыя хусткі ў кветкі называлі "парыськавымі", "парысьскімі" (ад "парыжскі паркаль"); хусткі з шоўку і атласу - "шаляноўкамі", "атласкамі"; кашаміравыя з махрамі хусткі - "тараноўкамі", "кашміроўкамі"; цёплыя суконныя хусткі - "вянгрэнамі".

Вялікія святочныя суконныя хусткі, якія насілі зімой паверх звычайных хустак, а ідучы ў царкву, госці або на кірмаш, накідвалі на плечы, называліся ў Віцебскай і Магілёўскай губернях "накрыўнымі" або "накіднымі" хусткамі, а на Палессі - "апіналкамі", "апынкамі". Такая хустка насілася толькі ўнакідку, замяняючы жанчыне верхнюю вопратку, прычым канцы яе, перакінутыя на грудзях крыжападобна, падтрымліваліся свабодна рукой . Жанчыны з бедных сямей насілі зімой вялікія паўсуконныя саматканыя хусткі "абвязкі".

Павязванне хустак, таксама як і павязванне намітак, было вельмі разнастайным. Аднак амаль заўсёды для павязвання хусткі складалі па дыяганалі.

У канцы XIX - пачатку XX ст. распаўсюджаным быў спосаб павязвання хусткі вакол галавы "ў рогі". Пры гэтым хустка складвалася па дыяганалі і павязвалася вакол галавы, а па баках з канцоў хусткі рабіліся "рогі". "У рогі" завязвалі звычайна шаўковыя, кашаміравыя або паркалёвыя хусткі з махрамі - "атласкі", "тарноўкі", "парыськавыя хусткі". Часам на такім чынам павязаную хустку павязвалі яшчэ адну дадатковую. Для гэтага дадатковая хустка ("падвязка") складалася па дыяганалі вузкай палоскай, прапускалася пад падбародак і завязвалася на цемені.

Распаўсюджаным на Беларусі быў і такі спосаб павязвання, калі канцы хусткі, перакрыжаваныя пад падбародкам, завязваліся вузлом на цемені. Па азначэнню балгарскай даследчыцы адзення М. Г. Велевай, гэты спосаб павязвання хусткі з'яўляецца для ўсходніх славян найбольш старажытным.

Павязванне хусткі вузлом пад падбародкам - найбольш позні спосаб, таму што ў канпы XIX ст. ён лічыўся дзявоцкім.

Падобным да мужчынскага быў і жаночы абутак. Асноўным відам яго былі плецёныя з лыка ліпы, лазы, бяросты, пянькі ці скураныя лапці. Вылучаюць лапці прамога і касога пляцення, з закрытым наском і запяткам (глухія, сляпыя, кавярзні) і адкрытыя (шчарбакі, зрачыя). Для падаўжэння тэрміну службы падэшвы лапцей дадаткова падпляталіся лыкам, пянькой ці падшываліся скурай. Існуе меркаванне, што найбольш старажытнымі былі лапці простага пляцення. Лапці абуваліся на анучы — летнія ці зімовыя, мацаваліся вяроўкамі-аборамі. Найбольш просты тып лапцей — без галовак і запятак, дзе іх замянялі лыкавыя петлі і прыстасаванні для мацавання абораў. Вядомы і скураныя лапці (пасталы), але шырокага распаўсюду яны не набылі. Акрамя лапцей, насілі скураныя паўбоцікі на абцасах (чаравікі), але гэта быў

дарагі абутак. Маладыя жанчыны і дзяўчаты насілі чаравікі з халяўкамі рознай вышыні, што шнураваліся спераду (радзей – збоку) шнуркамі ці тонкімі раменьчыкамі. Пажылыя жанчыны замест чаравікоў надзявалі часцей легкія боты.

Таксама заможныя сяляне маглі здабыць валёнкі. Падэшвы валенак падшываліся тоўстым лямцам або скурай. Пазней на валенкі сталі надзяваць галошы.

Драўляны абутак – выразаныя з калодкі чуні (дзеравянікі, кандалы) мелі нязначнае распаўсюджанне ў беларусаў. Крыху часцей ужываліся скураныя чуні на тоўстай драўлянай падэшве. Абутак адлюстроўваў мясцовую традыцыю, сезон года, пол, узрост, сацыяльны статус і гарманіраваў са стылем, тыпам і колерам вопраткі, разам з якой ен выкарыстоўваўся.

Абутак з’яўляўся састаўной часткай традыцыйнага народнага строя і арганічна дапаўняў яго, выконваючы ў агульным тыя ж функцыі ў адзіным комплексе.

**Тэараэтычны матэрыял да лекцыі №5.**
**Беларускае народнае жыллё – 2 гадзіны**

1. Асноўныя функцыянальныя і архітэктурна-будаўнічыя адметнасці беларускага традыцыйнага жылля.
2. Інтэр’ер жылля. Інтэр’ер як унутраная прастора, функцыянальна і эстэтычна арганізаваная.
3. Народнае дойлідства. Звычаі і абрады.
4. Будаўнічыя звычаі, абрады, павер'і.

Для Беларусі здаўна былі ўласцівы разнастайныя, існуючыя з глыбіні стагоддзяў і стаўшыя традыцыйнымі тыпы паселішчаў.

Да аднаго з тыпаў сельскіх паселішчаў IX-XI стагоддзя адносіцца пагост. Першпачаткова пагостам называлі тэрыторыю, якая абкладвалася данінай. Паселішчы гэтай тэрыторыі ўтваралі пагост—акругу. Да тыпалагічных прымет пагостаў адносіліся: наяўнасць царквы з абшч ы ннымі могілкамі і сядзібай святара, сельскай забудовы вакол ц э н т ра, сельскага прыхода, некалькіх вёсак, што ўтваралі акругу. Знікненне пагоста адносяць да XIII – XIV стагоддзя.

У XI-XII стагоддзі ўзнікае прыналежнае ўладальніку сяло. Галоўная прыкмета сяла – наяўнсць панскага маёнтка. Звычайна сяло было адміністрацыйным цэнтрам воласці ці прыхода, да якога цягнуліся суседнія вескі, хутары, засценкі. Асноўная прыкмета сяла – наяўнасць тут царквы, валаснол управы, карчмы, крамы і іншых грамадскіх устаноў. У святочныя дні сюды сцякаўся народ з сельскай правінцыі на богаслужэнне, кірмашы і таргі. Сяло адрознівалася ад вескі сваімі памерамі. Часам яго называлі пагостам. Некаторыя селы вырасталі ў мястэчкі, некаторыя страчвалі свае значэнне, паступова прыходзілі ў заняпад, нівеліравалася розніца паміж імі і вескай.

Веска (ад старажытнаславянскага “весь”) – асноўны тып паселішчаў. Вядома з глыбокай старажытнасці, утваралася ў выніку рассялення земляробаў,

якія асядалі ў пэўнай мясцовасці, зручнай для пражывання; будавалі тут сядзібы, уладкоўвалі і пашыралі аграрную гаспадарку. Жыхары вескі – гэта ў асноўным сяляне, асноўны занятак іх – сельская гаспадарка – земляробства, жывелагадоўля і разнастайныя промыслы. На працягу многіх стагоддзяў веска з'яўлялася асяродкам самабытнай культуры, захавальніцай багатых духоўных традыцый і вытворчага вопыту.

Група суседніх весак утварала сельскую акругу (воласць), якая вызначалася народным адзінствам, значным падабенствам духоўнага і эканамічнага жыцця. Абсалютная большасць шлюбаў заключалася ў межах гэтых акруг. Веска за 5 – 10 верст лічылася ўжо "чужой старанoй", і дзяўчаты неахвотна ішлі туды замуж. Гісторыя ўзнікнення весак, мясцовы рэльеф, памеры, сацыяльны склад аказвалі ўплыў на іх забудову і планіроўку. На Беларусі былі распаўсюджаны некалькі планіровачных форм паселішчаў: свабодная (бессістэмная, скучаная), радковая (лінейная), вулічная, гнездавая. Свабодная (скучаная) планіроўка вядома са старажытных часоў. Яна характарызуецца хаатычным размяшчэннем сядзіб у залежнасці ад зручнаг месца і рэльефу. Да пераходнага тыпу адносіцца гнездавая планіроўка, калі груп сем'яў, звязаных кроўнай роднасцю, сялілася вакол цэнтральнай (прадзедаўскай) сядзібы ўве далей і далей да перыферыі, утвараючы з цягам часу вялікае родавае "гняздо" аднафамільцаў. Такая планіроўка часцей за ўсе сустракалася на Палессі, дзе існавала шмат вялікіх весак, што складаліся з некалькіх родавых груп сем'яў, сядзібы якіх цесна прымыкалі адна да адной. Радковая планіроўка ў значнай ступені была абумоўлена характарам рэльефу і часта сустракалася ў прырэчных весках, дзе жылле і іншыя памяшканні будаваліся ў адзін рад, выходзячы фасадам да ракі. Пры гэтым вуліца, што праходзіла каля сядзіб, абмяжоўвалася з другога боку берагам ракі ці возера.

Старажытным тыпам паселішчаў з'яўляюцца хутары. Хутар – адабосленая сялянская гаспадарка з сядзібай, якая знаходзілася непасрэдна на зямельным надзеле селяніна. Узнікалі пасля рэформы 1861 г., аднак да гэтага часу на Беларусі былі вядомы аднадворныя паселішчы:дворышчы, двары, аднадворкі. Масавы характар працэс хутарызацыі набыў у канцы XIX – пачатку XX ст. у сувязі са сталыпінскай аграрнай рэформай. Рост хутароў прадаўжаўся і ў 20-ых гадах і быў перапынены прымусовай калектывізацыяй і ліквідацыяй "кулацтва" як класа. У Заходняй Беларусі хутары захаваліся ад 50 – 60-ых гадоў, калі не лічыць асобных выпадкаў адасобленых пасяленняў, якія сустракаюцца і ў наш час. У наш час прадпрымаюцца небеспаспяховыя спробы адраджэння хутароў як фермерскіх гаспадарак.

На Беларусі існавалі таксама пасяленні жыхароў, вызваленых на пэўны час ад феадальнай павіннасці. Кожны раз пасля чарговай вайны сяляне аднаўлялі разбураныя раены, распрацоўвалі пусткі, уладкоўвалі жылле, адраджалі не толькі сваю, але і панскую гаспадарку. Так утвараліся новыя паселішчы, аб паходжанні якіх сведчаць шматлікія тапонімы, што захаваліся на геаграфічнай карце, - слабада, слабодка, слабуды, воля, волька, вулька і т.п. Пасля вызначанага тэрміну слабада набывала статус звычайнай вёскі, хаця яе

ўклад і культура вызначаліся некаторымі своеасаблівымі рысамі ў адрозненне ад мясцовых весак.

Пасля рэформы 1557 г. разам з так званымі ўстаўнымі вескамі узнікае засценак – паселішча дробнай шляхты, ў 1 – 3 сядзібы. У адпаведнасці з “ Уставай на валокі” уся зямля дзялілася на тры часткі, тры полі; аднак шмат зямельных астраўкоў і ўрочышчаў заставаліся за межамі ("за сценкамі") асноўнага масіву, яны здаваліся ў арэнду дробнай шляхце. Так узнікалі засценкі, якія адрозніваліся ад хутароў сацыяльным паходжаннем жыхароў. З цягам часу (у выніку сямейных падзелаў) засценкі маглі павялічвацца да 5 – 10 і болей сядзіб. У савецкі час засценкі зніклі як у выніку ссялення жыхароў з хутароў, так і перайменавання іх у вескі.

Другім тыпам паселішча дробнай шляхты, якая сялілася асобна ад сялян-вяскоўцаў з’яўляецца аколіца. Яна была агароджана з усіх бакоў, вызначалася сваей забудовай, бессістэмнай планіроўкай, наяўнасцю тупіковых завулкаў і сцежак. Найбольш пашырана была ў XVII – пачатку XX ст. Утваралася са шляхты, што служыла ў магнатаў, пазней – і аднадворцаў; у значнай ступені складалася з далекіх і блізкіх сваякоў.

Пасля аграрнай рэформы 1557 г. асновай арганізацыі феадальнай (фальварачна-паншчыннай) гаспадаркі стаў фальварак. Фальварак (ад нямецкага Vorwerk – хутар) – невялікае пасяленне ў некалькі двароў, першапачаткова абазначаў феадальную гаспадарку, маентак, дзе жыў феадал. Вялікія маенткі мелі некалькі феадальных сядзіб – фальваркаў. У цэнтры сядзібы стаяў панскі дом, разнастайныя гаспадарчыя і прамысловыя пабудовы, у прыватнасці свірны, скляпы, гумны, адрыны для сена, канюшня, вазоўня, рамесныя майстэрні, кузня, млын, бровар, карчма, пякарня, вяндлярня, сырніцы, размяшчаліся сажалкі, дзе вырошчвалі рыбу, побач – пладовы сад, пасека. Фальварак, такім чынам, быў свайго роду аграрна-прамысловым комплексам. У некаторых фальварках ствараліся мануфактуры па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, апрацоўцы лесу, вырабу шкла, ткацкія і інш.

У XV- XVI ст. сфарміраваўся такі тып паселішча, як мястэчка. Мястэчка – гістарычны тып паселішча, які ўвасабляў у сабе пераходныя рысы сяла і горада, аб чым сведчыць і паходжанне самой назвы: “miasteczko” (польск.) – гарадок. Мястэчкі з’яўляліся гандлева-рамеснымі цэнтрамі, пэўную ролю тут адыгрывала і сельская гаспадарка. Узнікалі з XV – XVI стст. на гандлевых шляхах пры княжацкіх маентках, феадальных замках, манастырах, выраслі з магнацкіх сел і весак, часам – сярод лясоў “на сырым корані”, - у гэтым выпадку магнаты вызвалялі мігрантаў на пэўны тэрмін ад падаткаў.

Сацыяльны і этнічны склад местачкоўцаў быў даволі стракатым, у большаці мястэчак пераважала яўрэйскае насельніцтва. У XVI – XVII стст. на Беларусі налічвалася больш за 300 мястэчак, большасць з іх – у заходняй частцы краіны. Многія карысталіся магдэбургскім правам – правам на самакіраванне. Мястэчка мела централььны гандлёвы пляц, які ажываў у час кірмашоў; вакол яго размяшчаліся храмы, будынкі местачковай управы, пастаялы двор, корчмы, гандлевыя лаўкі. У савецкі час большасць мястэчак

страціла свае значэнне гандлевых цэнтраў і была пераведзена ў разрад звычайных весак, меншая частка – атрымала статус гарадоў і гарадскіх паселкаў.

Асноўнай структурнай адзінкай вёскі была сядзіба (двор), якая складалася з жылля і цэлага комплексу падсобных і гаспадарчых пабудоў. Амаль кожны сялянскі двор на працягу стагоддзяў уяўляў самой універсальную гаспадарку, якая сама амаль цалкам забяспечвала ўсе патрэбы: вырошчвала збожжа і розныя сельскагаспадарчыя культуры, выпякала хлеб, гатавала розныя прадукты і кулінарныя вырабы, апрацоўвала лен, пяньку, футру, скуры, ткала тканіны, вырабляла адзенне і абутак, будавала жылле, майстравала розныя прылады, транспартныя сродкі, вырабляла начынне, прадметы паўсядзеннага ўжытку.

Сядзібная забудова складаецца з цэлага комплексу жылых, падсобных, гаспадарчых і прамысловых пабудоў, кожная з якіх выконвала свае, уласцівыя ей функцыі і разам з тым цесна дапасавалася адна да адной, утвараючы гарманічнае цэлае – адзіны жыллева-бытавы комплекс.

Сядзібны компекс складаўся ўласна з жылля (хата), клеці, свірна, варыўні (стопка), склепа (пограб), павеці, адрыны для сена, абарога, гумна, сушні, лазні, хлявоў, студні, вяндлярні, рамеснай майстэрні і інш. Большасць з гэтых пабудоў вядомы паўсюдна ў Беларусі, некаторыя былі распаўсюджаны ў асобных рэгіенах. Кожная са згаданых сядзібных пабудоў адрознівалася сваімі функцыямі, памерамі, планіроўкай, канструкцыйнымі асаблівасцямі, займаючы пэўнае месца ў сістэме ўсей забудовы.

Жылле характаразавалася той ці іншай планіроўкай, стасункамі з падсобнымі памяшканнямі. Найбольш часта сустракалася двухкамернае жылле тыпу хата + сенцы. Такая планіроўка вядома са старажытных часоў. Часам у сенцах агароджвалася невялікая камора (ці кладоўка).

Даволі распаўсюджаным было і трохкамернае жылле тыпу хата + сенцы + клець або хата + сенцы + хата.

На поўначы Беларусі і на Палессі часта сустракалася трохкамернае жылле хата + сенцы + варыўня (стопка).

Планіроўка жылога памяшкання нярэдка ўскладнялася вылучэннем святліцы і кухні (хата + хата + сенцы; хата + кухня + сенцы). Часам пры ўваходзе ў сенцы звонку ўладкоўвалася паўадкрытыя галерэя – падсені (падчэні) альбо ганак.

Клець (камора, кладоўка, спіжарня, свіран) служыла для захоўвання збожжа, прадуктаў, бытавых рэчаў, адзення. Сустракалася як у комплексе з жыллем (хата + сенцы + клець), так і асобнай пабудовай, якая звычайна размяшчалася насупраць хаты. Зруб клеці ставіўся на высокія штандары, падлогу ўтвараў насціл шчыльна падагнаных дошак. У клеці каля сцяны адгароджваліся засекі для збожжа. Побач стаялі бочкі, кадоўбы ці саламяныя карабы з зернем, крупамі, мукой, макам, ільносемем, канаплямі і нш. Тут захоўвалі кубельцы з салам, бачонкі з квасам і іншым пітвом; на бэльках падвешваліся кумпякі, шынкі, каўбасы, кашы з паляндвіцай і іншымі мяснымі прыпасамі. Тут жа стаялі куфар ці кубел з тканінамі, адзеннем, ложак, дзе летам

спалі маладыя члены сям'і. Клецей у гаспадарцы мясцовага селяніна бывае некалькі – па колькасці жанатых мужчын. Загадзя, напярэдадні вяселля, жаніх і яго бацька рупяцца аб уладкаванні асобнай клеці для будучых маладажонаў.

Свіран (паўклець, клець, імбар, шпіхлер, лямус) – пабудова, блізкая да клеці па сваім функцыянальным прызначэнні. Свіран служыў для захавання адборнага збожжа і будаваўся, як правіла, асобна. Небагатыя гаспадаркі абыходзіліся адным памяшканнем – свірнам ці клеццю, якія часта фігуруюць як ідэнтычныя паняцці. У больш заможных сялян мы знаходзім адначасова клець (адну або некалькі) і свіран. Апошні прыкметна адрозніваўся ў Беларусі знешняй формай і канструкцыйнымі асаблівасцямі. Як і клець, ен будаваўся на высокіх штандарах ці палях (да 1 м над зямлей), меў, як і клець, грунтоўна ўладкаваную страху, а нярэдка і гарбатую столь, і шчыльную падлогу з засекамі для збожжа.

Варыўня (стопка, ісцепка, прыізбіца) – паўназемнае памяшканне, упушчанае на паўметра ў зямлю; служыла для захоўвання гародніны, садавіны, бульбы, малочных прадуктаў. Тут адгароджваліся адсекі, куды ссыпалі буракі, бульбу, моркву, рэпу. Бліжэй да ўвахода размяшчаліся кадушкі і бочкі з квашанай капустай, буракамі, агуркамі, хлебным квасам, сокам, півам, стаялі гладышы з малаком і інш. у сярэдзіне памяшкання размяшчаўся невялікі ачаг-жароўня, куды ўзімку насыпалі гарачае вуголле (ці ставілі ганчарную або металічную пасудзіну з жарам). Варыўня бытавала ў сістэме сядзібных пабудоў не паўсюдна ў беларусі, а пераважна там, дзе блізка да паверхні падыходзілі грунтовыя воды, - на Палессі, у Паазер'і, часткова ў басейне Бярэзіны і Немана.

Склеп (пограб, лех, байрак) – заглыбленае ў зямлю памяшканне тыпу зямлянкі, прызначанае для захавання гародніны, бульбы, напіткаў і інш. Склеп і пограб не заўседы выяўляюць поўную ідэнтычнасць. Склеп, або лех, часцей рабіўся ў сістэме жылля (пад сенцамі ці клеццю) і меў мураваныя, радзей драўляныя сцены. Паграбы рыліся асобна ад жылля, звычайна мелі наземнае збудаванне – паграбню ў выглядзе стрэшкі на сохах або зрубнай пабудовы. Да паграбоў вельмі блізкія ямы-сховішчы. Іх капалі звычайна воддаль ад сядзібы або ў лесе. Сустракаліся і паграбы-сховішчы, што ўладкоўваліся ў тоўстых полых пнях, пакрытых плашкамі і карой, або ў кадаўбах, зарытых у зямлю. Прататыпам паграбоў маглі служыць як звычайныя ямы, так і старажытныя жытлы-землянкі.

Гумно (клуня, стадола, рыга) – гаспадарчая пабудова для захавання і абмалоту збожжа. У цэнтры гумна быў выбіты ток для малацьбы, па баках – застаронкі, куды складвалі снапы. Мела высокую страху, якая падтрымлівалася на некалькіх сохах (слупы з сукаватай развілкай уверсе), пастаўленых у адзін ці два рады. Гумны прыкметна адрозніваліся на Беларусі сваімі памерамі, канструкцыйнымі асаблівасцямі, унутранымі прапорцыямі, колькасцю варот, формай стрэх, наяўнасцю пры іх паўжылога памяшкання, адрыны і агнявой сушні для збожжа.

Сушня (асець, еўня) была прызначана для сушкі збожжа ў снапах; будавалася непасрэдна ў гумне або побач з ім. Звычайна асець (ці восець) мела два паверхі (ярусы): на ніжнім – размяшчалася печ-каменка, на верхнім –

расстаўляліся неабмалочаныя снапы. Еўня (це ёўня) уяўляла сабой больш простую пабудову тыпу лазні (дарэчы, яна нярэдка і выкарыстоўвалася як лазня).

Адрына (пуня, сянніца) служыла для захавання сена, саломы, рознага сельскагаспадарчага інвентару, нярэдка – і транспартных сродкаў. Уяўляла сабой прасторнае зрубна-каркаснае памяшканне з шырокімі варотамі.

Лазня (баня) будавалася на краі сядзібы або выносілася за яе межы да ракі, возера, крыніцы. Па сваіх канструкцыйных асаблівасцях у Беларусі вядомы лазні двух асноўных тыпаў – зрубныя і зямлянкі. Апошнія рабілі ў пясчаных схілах па берагах рэк, яроў, балак, пагоркаў, дзе зручна было іх будаваць. Апрача асноўных функцый лазні выкарыстоўвалі для сушкі льну. Часам сельская грамада будавала адну агульную (“кагальную”) лазню.

Фальварковая шляхта, а пазней і заможныя сяляне ўзводзілі ў межах сваіх сядзіб млыны, сырніцы, вяндлярні (капцільні). У залежнасці ад рухаючай сілы млыны падзяляюцца на вадзяныя, ветраныя (ветракі) і механічныя (конныя і валовыя), якія адрозніваліся паміж сабой канструкцыяй. Вадзяныя млыны вядомы з часоў Старажытнай Русі. Яны будаваліся на невялікіх рэках, дзе зручна было рабіць плціны-запруды, устанаўліваючы тут вадзяное кола. Тэрмін іх дзеяння складаў 200-250 дзен у год (перапынкі ў рабоце былі звязаны з суровымі зімовымі ўмовамі і летнім абмяленнем рэк). Ветракі асабліва шырока распаўсюдзіліся ў XIX – пачатку XX ст. Напрыклад, толькі ў адной Чырвонабудскай вобласці Гомельскага павета ў 1873 г. працавала 30 сялянскіх ветракоў. Па сваей канструкцыі ветракі падзяляліся на шатровыя (яны мелі вялікія памеры і ў залежнасці ад напрамку ветру паварочваліся толькі верхняй часткай) і казловыя, так званыя казлоўкі невялікіх памераў на асявым слупе, што паварочваліся ўсім корпусам. У Паазер’і казлоўкі мініяцюрных памераў уладкоўваліся на колах; іх можна было перамяшчаць, запрэгшы коней. Многія ж сяляне ўладкоўвалі дома (у хаце, сенцах, клеці) невялічкія млынкі-жорны.

Разнастайныя пабудовы размяшчаліся на сядзібе ў пэўнай паслядоўнасці і ўзаемазалежнасці, утвараючы той ці іншы кампазіцыйны і архітэктурна-планіровачны малюнак.

На тэрыторыі Беларусі былі распаўсюджаны наступныя асноўныя тыпы дваровай пабудовы: замкнутая (вяночная), аднарадная (пагонная), двух- і трохрадная, Г-падобная (сцяжковая) і свабодная (рассеяная, з незвязанымі пабудовамі). Кожны з гэтых тыпаў меў, акрамя таго, прыватныя ці пераходныя варыянты, што выяўлялі пэўныя лакальныя і сацыяльныя рысы.

На поўначы і паўночным усходзе прыкметна пераважала замкнутая сістэма забудовы, што была шырока распаўсюджана і ў суседніх рускіх губернях. Жылле і гаспадарчыя пабудовы размяшчаліся па перыметры двара. Да жылля (з боку сенцаў) прымыкалі хлявы, якія ў глыбіні двара заканчваліся адрынай. Насупраць хаты ставілі клець, да яе стасаваліся павець (для дроў і сельскагаспадарчых прылад), свіран, вазоўня. Нярэдка хлявы для буйной рагатай жывелы і свіней будавалі па адзін бок двара, а канюшню і аўчарню -–па другі, побач з адрынай – сянніцай.

Жылы комплекс хата + сенцы + варыўня, што быў распаўсюджаны ў Паўночнай Беларусі, утвараў разам з другімі пабудовамі трохрадную забудову, з'яўляючыся сярэднім звяном, якая падзяляла ўсю дваровую тэрыторыю на дзве часткі – чысты двор, або панадворак, і скотны двор, або дзяннік. На панадворку, як правіла, размяшчаліся клець і павець. Па другі бок ад жылля размяшчаліся хлявы. Пры гэтым сенцы мелі двое ўваходных дзвярэй: адны – на чысты двор, другія – на дзяннік. Незабудаваную прастору, што заставалася паміж памяшканнямі, па перыметры двара абносілі парканам. Крыху ўбаку ад двара (у межах сядзібы) будавалі гумно, лазню, часам адрыну (пуню).

Адным з варыянтаў замкнутай сістэмы забудовы быў двор з кампактным размяшчэннем жылых і гаспадарчых памяшканняў, якія будаваліся ў адзіным комплексе. У адным выпадку гаспадарчыя памяшканні будаваліся побач з жыллем пад высокай страхой-паветкай. У другім – хлявы прымыкалі да падоўжанага тыльнага боку жылля, маючы з ім агульную сцяну. Агульным сувязным памяшканнем для іх з'яўляліся сенцы, якія мелі выхад на ўсе чатыры бакі: у хату, варыўню, на двор і ў хлявы.

Не менш распаўсюджанай у XIX – першай палове XX ст. была аднарадная (пагонная) сістэма забудовы. Пабудовы ў гэтым выпадку ўтвараюць адзіную аднарадную сувязь: следам за хатай і сенцамі размяшчаліся клець або варыўня, павець, хлявы, адрына.

У другой палове XIX ст. разам з ростам сацыяльнай дыферэнцыяцыі і абеззямеленнем часткі сялянства аднарадныя забудовы атрымалі больш шырокае бытаванне. Размешчаныя на даволі вузкіх сядзібных палосках, яны цясніліся адна каля адной, утвараючы вузкія выцягнутыя двары, што абмяжоўваліся з другога боку сцяною суседняга пагону.

У Панямонні, а таксама ў заходніх раенах Палесся сустракаўся своеасаблівы варыянт аднараднай забудовы з двума дваровымі комплексамі, што належалі розным гаспадарам і размяшчаліся на адным сядзібным участку, выцягнуўшыся ў адзін доўгі пагон.

У Беларусі быў вядомы і двухрадны тып забудовы, які ўяўляў сабой прамежкавы варыянт паміж замкнутым і аднарадным тыпамі. У Падняпроўі і Усходнім Палессі нярэдка сустракалася і Г-падобная (сцяжковая) забудова; звычайна тут услед за жыллем ставілі клець, адрыну, хлявы.

У асобную групу можна выдзяліць сядзібы з незвязанымі пабудовамі, калі жылыя і гаспадарчыя будынкі ставіліся на пэўнай адлегласці адзін ад аднаго. Этнаграфічная літаратура канца XIX пачатку XX стагоддзя дае вельмі мала звестак аб дварах з гэ тым тыпам планіроўкі. Размяшчэнне гаспадарчых пабудоў з нязначнымі прамежкамі паміж будынкамі было абумоўлена мерамі супрацьпажарнай бяспекі і паляпшэннем санітарна-гігіенічнага стану вёскі.

Як паказваюць этнаграфічныя матэрыялы, на тэрыторыі Беларусі сустракаліся амаль усе асноўныя тыпы сядзібных забудоў, што былі ўласцівы шырокай зоне славянскага рассялення. Кожны з гэтых тыпаў адрозніваўся прыватнымі асаблівасцямі і меў свае варыянты. У самой планіроўцы сядзібных забудоў не было строга вызначаных, цвердых канонаў. Кожны гаспадар улічваў функцыянальную мэтазгоднасць, узаемасувязь і лагічную завершанасць

асобных пабудоў і ўсяго архітэктурнага ансамбля, узгадняючы іх з канкрэтнымі патрабаваннямі.

Інтэр'ер жылля – гэта ўнутраная прастора, функцыянальна і эстэтычна арганізаваная. Ен уключае канструкцыю і аб'емныя формы ўнутранга памяшкання, яго структуру, узаемныя прапорцыі, мэбліроўку, асвятленне, убранства, мэтазгодную расстаноўку розных прадметаў, што служаць свайго роду сямейным антыкварыятам. Разнастайныя рэчы хатняга ўжытку, начынне, падсобны інвентар, мэбня, тканіны, харчовыя прыпасы займалі ў сістэме інтэр'ера свае звыклае, уласцівае ім месца, размяшчаліся ў пэўнай паслядоўнасці і парадку, утвараючы пэўную функцыянальную і кампазіцыйную ўзаемасувязь.

Да 60 – 70-ых гадоў XIX ст. вясковыя хаты ў большасці сваей былі яшчэ курнымі. Яны мелі глінабітныя курныя печы без коміна; печ размяшчалася справа, радзей злева каля ўвахода. Калі яе палілі, дым ішоў на хату і выходзіў праз верхнік (вяршок, дымнік, душнік) – адтуліну ў столі ці верхніх вянцах зруба за печкай. Пасля палення верхнік закрываўся накрыўкай ці мяшком з сенам.

Хата мела высокі парог і нізкія дзверы (у сярэднім 100 * 145 см), што спрыяла захаванню цяпла ў зімовы час. Дарэчы, у курнай хаце дасягалася максімальная эканомія цяпла, каэфіцыент карыснага дзеяння якога складаў 80-90%, у той час як у больш позніх хатах, што мелі "белыя" печы з дымаходам, гэты паказчык складаў каля 20-30%. Дзверы рабіліся з тоўстых колатых дошак і паварочваліся ў драўляных гнездах – на бегунах. Тры невялікія валакавыя акенцы зачыняліся ("завалакваліся") на ноч драўлянай засаўкай. Падлога ўяўляла сабой глінабітны ці земляны ток, на які летам у святочныя дні слалі аер. У вуглу каля печы знаходзіўся качарэжнік (камешнік) – месца, дзе стаялі вілкі для каршкоў (ухваты), драўляная качарка (кавеня), чапяла, памяло, мяцелка і інш. над вусцем печы, пад столлю, замацоўвалася жэрдка (перасоўка), на якой сушылі адзенне, тканіну.

Супраць печы каля ўвахода размяшчаўся гаспадарчы кут ("бабін кут"), дзе каля дзвярэй стаяла кадушка для вады з конаўкай, далей на лаве – драўляныя ведры, даенка, карцы, апалушкі, сальніца, бельчык і інш. Над лавай на сцяне вісела кухоная паліца з посудам, побач – лыжачнік (драўляная планка з гнездамі для лыжак). Каля самых дзвярэй на круку вісела паўсядзенная верхняя вопратка (світка, бурнос, кажух, курта). Каля вугла печы, звернутага ўнутр памяшкання, знаходзіўся каневы стоўб (конь), што служыў апорай для спальнага памоста і меў пэўнае сімволіка-абрадавае значэнне. Частку памяшкання ад тарцовай (кутняй) сцяны займаў спальны памост – пол, тут ляжалі матрац (сяннік), пуховыя падушкі, посцілкі; часам памост падзяляўся на дзве часткі ўзорным тканым дываном, ці полагам. Вышэй, на ўзроўні лежака печы, быў уладкаваны больш вузкі пол, або палаці. Пад столлю ўздоўж сцен мацавалі па дзве паралельныя жэрдкі – грады, на якіх сушылі лучыну, складвалі прылады ткацтва, кудзелі льну, маткі нітак, лыка для лапцей, аўчыны і інш. Ніжэй вокнаў уздоўж сцен (амаль па ўсей даўжыні іх) уладкоўвалі шырокія лавы, якія сходзіліся на покуці. Яны служылі за сто гадоў і былі для беларусаў

свайго роду сямейнай рэліквіяй. У час наваселля лавы ўрачыста пераносіліся са старой хаты ў новую. Покуць (красны кут) – найбольш шаноўнае месца ў хаце, асвечанае ўстойлівай традыцыяй духоўнага жыцця. Яна выконвала важную ролю ў паўсядзенных звычаях і абрадах. На покуці развешвалі абразы, убраныя ўзорнымі ручнікамі (набожнікамі), пучкі асвечаных у царкве жытневых каласоў і траў. Нярэдка абразы памяшчалі ў бажніцу, зробленую ў выглядзе драўлянай шафкі. Найбольш устойлівая сувязь у структуры інтэр’ера – размяшчэнне покуці па дыяганалі ад печы. Гэты звычай быў уласцівы ўсім усходнеславянскім народам і адпавядаў народным уяўленням пра структуру сусвету. Покуць сімвалічна атаясамлівалася з усходам і поўднем, у той час як процілеглы кут (дзе стаяла печ) – з захадам і поўначчу. На покуці стаяў засланы абрусам стол, на ім звычайна пакідалі хлеб, прыкрыты ручніком ці абрусам. За абедам у будні дзень абрус здымалі, і ўся сям’я садзілася за стол, займаючы месца ў пэўнай паслядоўнасці: на покуці – гаспадар дома, за ім – па старшынстве іншыя члены сям’і. Сярод мэблі, апрача лаў, палічак, кутняга стала, шырока ўжываліся ўслоны, зэдлікі, архаічныя табурэты (у форме куба), дзіцячыя стойкі, хадуны, уласцівыя той ці іншай мясцовасці формы калысак.

У зімовы час сялянская хата ператваралася ў рамесную майстэрню. Тут у кароткія дні і па вечарах пры святле лучніка ці каганца рабілі ложкі і посуд, плялі лапці і розныя емістасці, майстравалі прылады, пралі, ткалі, шылі адзенне, вышывалі, вязалі.

Курная хата ў больш раннім варыянце характарызавалася слабай функцыянальнай размежаванасцю ўнутранай прасторы, дамініраваннем стацыянарных прадметаў, якія выконвалі функцыі мэблі, - нары для адпачынку, лавы, паліцы, нерухома замацаваны ў вуглу стол, зарытая насупраць печы калода, дзе шчапалі лучыну і інш. Такая хата мела высокую скляпеністую (гарбатую) столь і архаічную глінабітную ці каменную печ або нават адкрыты ачаг – вогнішча, над якім шырокім вусцем звешвалася труба (дымнік, каптур, кузуб).

Акрэслены інтэр’ер у агульных рысах адлюстроўвае найбольш тыповыя рысы, уласцівыя беларускаму жыллю, што, аднак, не вычэрпвае яго разнастайнасці, лакальных, этнаграфічных асаблівасцей.

У доўгія зімовыя вечары сялянскія хаты асвятляліся лучынай, якую замацоўвалі ў спецыяльным прыстасаванні – лучніку. Лучнікі (лучыннік, стаячок, светач, дзед, паніч) адрозніваліся паміж сабой знешняй формай і канструкцыйнымі асаблівасцямі. Яны падзяляліся на пераносныя (рухомыя) і стацыянарныя.

Пасля адмены прыгоннага права адбываліся яканыя змены ў народным побыце і культуры, што не магло не адбіцца і на арганізацыі сялянскага жылля. Курныя печы паўсюдна замяняліся на “чыстыя”, ці “белыя”, з дымаходам, нярэдка яны мелі збоку, на краю прыпечка, камінак, што замяняў сабой светач: тут па вечарах палілі асмол ці лучыну. У канцы XIX ст. у сялянскім жыллі ўсе часцей з’яўляліся цагляныя печы. Павялічыліся памеры вокнаў, што мелі зашкленыя шыбы. Падлога масцілася цесам ці дошкамі (незалежна ад характару мясцовых грунтоў), часам рабілі падлогу на адной палавіне хаты – ад

покуці да печы, а прастора каля ўвахода (дзе размяшчаўся "бабін кут") мела глінабітны ток. Гарбатая столь саступіла месца сучаснай.

Прыкметна мянялася і мэбліроўка сялянскіх хат. Замест спальных нар (пола і палацяў) ці паралельна з імі сталі выкарыстоўваць драўляныя ложкі. У шырокі ўжытак пачалі ўваходзіць канапы, крэслы, больш сучасныя сталы, табурэты, услоны, якія паступовы выцяснялі нерухомыя лавы, сталы, услончыкі на плоскай аснове (больш зручныя для земляной падлогі).

Сцены хат нярэдка счэсвалі (склютавалі) знутры, што давала магчымасць больш поўна выявіць натуральную фактуру дрэва і яго дэкаратыўныя ўласцівасці.

Мэбліроўка і размяшчэнне разнастайных бытавых рэчаў у хаце ў многім залежалі ад памераў і структуры жылля і яго сувязі з падсобнымі памяшканнямі – сенцамі, клеццю, варыўней. У трохкамерным жыллі тыпу хата + хата + сенцы, хата + кухня + сенцы печ і гаспадарчы кут (разам з кухонным посудам і адпаведным інвентаром) адчлянялі ад параднага памяшкання (святліцы), дзе заставаліся традыцыйная покуць, шафа, куфар з чыстым адзеннем і бялізнай, стаялі ложкі, крэслы, услоны.

Як азначалася, амаль усе пабудовы ў беларускай весцы рабіліся з дрэва. Драўлянае дойлідства беларусаў мае глыбокія і трывалыя традыцыі, якія фарміраваліся ва ўласцівым Беларусі экалагічным і гісторыка-культурным асяроддзі.

Драўлянае дойлідства было адным з самых распаўсюджаных і прыярытэтных раместваў у Беларусі са старажытных часоў. Яшчэ ў пачатку XX ст. на палескіх кірмашах можна было купіць усе "запчасткі" і сабраць з іх цэлую хату. Тут прадаваліся ў розніцу брусы, кроквы для стрэх, вушакі для асады дзвярэй і вокнаў, дошкі, дахавыя матэрыялы (гонта, дранка), дзверы, аконныя рабы і інш.

Асноўная парода, што часцей за ўсе ўжывалася ў будаўніцтве, - хвоя, ці сасна. З іншых парод істотнае значэнне мелі елка і дуб. З дубу рабілі аснову фундамента (штандары, палі), ніжні вянок зруба (падруба), прамежкавыя шулы сцен, апорныя слупы-сохі ў гумнах, павецях, паграбах, а таксама асобныя элементы жылля – парог, вушакі, падаконнікі і інш. Трываласць і даўгавечнасць дубовай драўніны павышалі попыт на будаўнічы матэрыял з яе, разам з тым цвердасць і масіўнасць патрабавалі больш намаганняў пры яе апрацоўцы. Жылле, цалкам пабудаванае з дубу, сустракалася ва Усходнім Палессі.

На тэрыторыі Беларусі здаўна былі вядомы дзве асноўныя будаўнічыя канструкцыі – слупавая і зрубная, якія мелі шэраг тыпалагічных варыянтаў і пераходных форм і часта спалучаліся ў адной і той жа пабудове. У больш архаічным варыянце сцены слупавых пабудоў уяўлялі сабой каркас з жэрдак, які заплятаўся гнуткімі галінамі івы, уцяпляўся саломай, трысьнягом, чаротам. Часам плецены каркас абмазвалі глінай. Звычайна такая канструкцыя ўжывалася ў будаўніцтве гаспадарчых і падсобных памяшканняў: павеці, адрыны, хлява, сенцаў.

Зрубная канструкцыя ўяўляе сабой зруб з круглых ці брусковых бярвенняў, злучаных паміж сабой у просты (з астаткам) або гладкі (чысты)

вугал. Гэтая канструкцыя асабліва шырока ўжывалася ў жыллі, клецях, свірнах, а таксама ў культавых пабудовах.

Пераходным варыянтам ад каркасна-слупавай да зрубнай тэхнікі драўлянага дойлідства з’яўлялася зрубна-слупавая канструкцыя, якую яшчэ называюць закладной, ці “ў закідку”. Слупы ў выглядзе памежкавых шулаў былі неабходным элементам доўгіх сцен зруба. Амаль на ўсей тэрыторыі Беларусі шульную канструкцыю выкарыстоўвалі ў будаўніцтве гумен, хлявоў, сенцаў.

Зруб хаты ніжнім, больш тоўстым, звычайна дубовым, вянцом (падруба) ставілі на падрыхтаваную пляцоўку. Часта пад яго падкладвалі папярочныя дубовыя бярвены – лігары або закопвалі па вуглах дубовыя калоды – штандары. Аснову зруба ў большасці абкопвалі па перыметры зямлей, утвараючы прызбу.

У спосабах завяршэння жылля можна вылучыць некалькі канструкцыйных рашэнняў, цесна звязаных з апорнай асновай і формай страхі. На тэрыторыі Беларусі вядомы дзве старажытныя канструкцыі стрэх – зрубная і каркасная, якія былі распаўсюджаны на вялікай тэрыторыі славянскага рассялення. Зрубная канструкцыя страхі, у сваю чаргу, падзяляецца на два раней упамянутыя варыянты – двухсхільную закотавую (на сволаках, на лемягах, на гадунах) і пірамідальную, ці стажковую (“чубам”, “гаршком”). Больш распаўсюджанай была закотавая страха, уласцівая як жылым, так і гаспадарчым пабудовам. Яна мела зрубны шчыт (закот, франтон), што складаўся з паступова ўкарочаных кверху бернаў, на якія клаліся падоўжныя бярвенні-сволакі, утвараючы апорную аснову страхі.

Даволі распаўсюджанымі ў беларускім народным дойлідстве былі і каркасныя дахавыя канструкцыі. Сярод іх вылучаюць тры асноўныя варыянты: сошную, паўсошную (дзядковую) і кроквенную. Сошная, або слупавая, канструкцыя з’яўлялася найбольш старажытнай і даўжэй за ўсе захоўвалася ў гаспадарчых пабудовах тыпу гумнаў і адрын.

Будаўніцтва жылля ў народнай традыцыі было абстаўлена разнастайнымі звычаямі, абрадамі, абярэгамі, якія адзначалі яго важныя ідэйна значымыя этапы: выбар месца для жылля, нарыхтоўку і першасную апрацоўку драўніны, закладку фундамента, узвядзенне страхі, улазіны, або былі звязаны з выбарам будаўнічых матэрыялаў, рэгламентацыяй колькасці вокнаў, іх арыентацыяй, размяшчэннем печы, покуці і інш.

Асаблівая ўвага надавалася выбару месца для жылля. Не дазвалялася будаваць хаты на скрыжаванні дарог і на закінутых шляхах,там, д з е раней стаяла лазня і на тым месцы, д з е былі знойд з е н ы чалавечыя косці. Перавага аддавалася абжытым мясцінам, ц і тым, д з е падабалася адпачываць буйной рагатай жывёле. Пачатак будаўніцтва прымяркоўваўся да пэўнай календарнай даты –канец Вялікага посту, маладзіковая фаза месяца, бабіна лета. Найбольш спрыяльнымі днямі лічылі аўторак і чацвер.

Хата лічылася закончанай, калі ў ёй была зроблена печ. Наваселле (улазіны, уваходзіны) у народнай традыцыі расцэньвалася як вялікае, сямейнае свята.

**Тэараэтычны матэрыял да лекцыі № 6.**
**Беларуская кухня – 2 гадзіны**

1. Класіфікацыя страў: раслінныя і мясныя, посныя і скаромныя, паўсядзённыя, святочныя, абрадавыя.
2. Хлеб у традыцыйна-бытавой культуры беларусаў. Віды і сарты хлеба.
3. Аўсяныя мучныя стравы. Крупяныя стравы.
4. Бульба і гародніна.
5. Малако і малочныя прадукты.
6. Мясная ежа.
7. Рыба і рыбныя стравы.
8. Пітво. Класіфікацыя напіткаў.
9. З’яўленне новых прадуктаў харчавання.

З далёкага мінулага да нашых дзён дайшло вельмі шмат звестак аб беларускай нацыянальнай кухні. Традыцыйная культура харчавання ўяўляе сабой сукупнасць наступных кампанентаў: набор прадуктаў і стравы, якія з іх гатуюць;спосабы і прыёмы прыгатавання; трапезы, час і парадак іх выканання, застольны

э т ы кет , прадметы хатняга начыння.

Асобныя матэрыялы па беларускай народнай кулінарыі мы знаходзім у гісторыкаў і этнографаў XVIII стагоддзя (В. Севергин і інш.)

Больш падрабязна аб ёй напісана ў працах рускіх і беларускіх навукоўцаў XIX стагоддзя-А. К. Кіркора, П. В. Шэйна, М. Я. Нікіфароўскага, А. С. Дэмбавецкага , Е. Р. Раманава і інш .

А. К. Кіркор у сваіх працах, дакладна паказвае харчаванне жыхароў беларускай і літоўскай вёскі. Асабліва цяжкім быў для беднякоў вясновы час, калі яны елі толькі бульбу, крапіву і шчаўе. Сустракаюцца ў літаратуры і апісанні традыцыйных кулінарных вырабаў, напояў, страў.

А ў працах вядомага беларускага этнографа Б. Р. Раманава расказваецца аб захоўванні асноўных харчовых культур. Вядома, напрыклад, што да сярэдзіны XVIII стагоддзя беларусы захоўвалі іх у ямах або буртах.

Адметнымі асаблівасцямі беларускай народнай кухні з'яўляліся эканамічнасць у ж ы в а н ня прадуктаў, высокая патрабавальнасць членаў сям'і да чысціні і акуратнасці. Асаблівая ўвага заўсёды надавалася хлебу. Па наяўнасці хлеба судзілі аб дастатку ў сям'і. У народзе пра хлеб склалася шмат прыказак і прымавак: «Хлеб у хаце - гаспадар, "Хлеб над усім пануе», «Хлеб - усяму галава". У беларускіх вёсках з дзяцінства выхоўвалася пачуццё павагі, беражлівасці да хлеба. З хлебам ішлі на «радзіны», у сваты, на вяселле і іншыя ўрачыстыя падзеі. Хлебам-соллю сустракалі дарагіх гасцей. Але селяніну-бедняку сапраўдны хлеб рэдка даводзілася ўжываць у паўсядзённым харчаванні Калі ж хлеб пяклі з чыстай жытняй прасенай мукі, то яго ў бедных сем'ях называлі "пірагом". Хлеб змяняўся па сваім выглядзе і якасці па меры таго як аддаляўся час жніва і скарачаліся запасы жыта, Самае нізкая якасць хлеба была

ўвесну. Градовы хлеб пяклі з непрасеянай мукі. Пра гэты хлеб казалі, што не паспявалі яго спячы, як ён станавіўся чэрствым. Найбольш распаўсюджаным хлебам ў бедных сем'яў, асабліва ў неўрадлівыя гады, быў хлеб з мякіны, для падрыхтоўкі якога бралі прасеяную грачаную, аўсяную або жытнюю мякіну і дадавалі трохі мукі. "З мякінаю лёгка хадзіць, ды цяжка ногі валачыць», - казалі пра такі хлеб. У галодныя гады хлеб пяклі з жалудоў, кары, шчаўя, лебяды. «Не бяда яшчэ, што ў хлебе лебяда - тады бяда, калі хлеба няма ».

З жытнімі і бульбянымі блінамі часта ўжывалі насенне лёну і канопляў, смажанае сала (скваркі), а таксама агурочны і капусны расол.

Мучныя вырабы ў выглядзе кольцаў, якія гатаваліся з заваранага цеста, называлі абаранкамі

У 20-30-я XX ст. гады распаўсюджанымі былі такія стравы, як талакно, жур (аўсяны кісель), крупнік, пячона (каша з прасяных круп, запраўленая унутраным тлушчам і запечаная), калатуха, поліўка (поліўка), верашчака (мясная страва). Гэтыя традыцыйныя стравы папулярныя і зараз. Вось як апісвае вядомы беларускі паэт Якуб Колас беларускае застолле:

І елі дружна, не драмалі,
Нарэшце ўсе па скварцы бралі.
Як верашчака ў дно спадала,
То маці есці пакідала
Ды йшла у каморку па другое,

Яшчэ болыш смачнае, ядкое
І тарабаніла сюды
Для заканчэння ужо яды
Тварог, запраўлены смятанай
(Нясла з вялікаю пашанай)...

Шырокае распаўсюджванне ў беларускай кулінарыі да 50-х гадоў XX стагоддзя мелі заменнікі хлеба: "сачні", "драчоны", скавароднікі". Іх рыхтавалі з жытняй, ячменнай і зрэдку пшанічнай мукі. Скавароднікі звычайна пяклі з кіслага цеста. "Сачні" рабілі танчэй "скавароднікаў", але таўшчэй, за бліны. Для падрыхтоўкі сачней (тоўстых мучных бліноў) часта выкарыстоўвалі начынне: бульба, яблыкі, вішні, слівы і г. д. Для драчон бралі сыроватку або свежае малако, а таксама хлебны, кляновы або бярозавы квас. Цеста рабілі больш вадкім, чым для выпечкі хлеба. Часта драчоны і каржы пяклі прэснымі. Сяляне бралі іх з сабой на лясныя працы, на касьбу, у дарогу.

З лепшых гатункаў пшанічнай мукі пяклі каржы, пернікі, з квашанага тэсту рабілі пірагі з грыбамі, капустай, яйкамі, ягадамі і т. п., пампушкі. З мучных страў найбольш папулярныя былі клёцкі, зацірка, кулеш, локшына, наліснікі, ламанцы, з крупяных - крупнік, панцак, гушча і інш. Іх рыхтавалі з мясам, смажаным салам, малаком, алеем. Крупяныя стравы мелі шырокае абрадавае прызнач э нне. Груцу гатавалі на Каляды, бабіну кашу – на радзіны, гушчу – на Іллю, куццю посную – на каляды і г.д.

У народнай кулінарыі шырока выкарыстоўваліся прадукты агародніцтва. Найбольш ужывальнай стравай была капуста. Прычым капустай называлі

любую першую страву, у якой яна прысутнічала.” Без капусты жываты пусты”. На Віцебшчыре гатавалі  поліўку або юшку. Супы варылі з морквы і бручкі. Гатавалі таксама буракі, а са свежых бураковых лісцеў – бацвінне. З зяляніны рабілі халаднік.

Елі тушаную капусту, моркву, бручку. З маку гатавалі макоўнікі. Бульбу ўжывалі ў вараным, печаным, тушаным, смажаным выглядзе. Гатавлі галушкі, клёцкі, бульбяныя камы, дранікі, бабку, бульбішнікі, каржы.

Вясной і ў пачатку лета ўжывалі ў ежу лугавыя шчаўе і цыбулю, хрэн, крапіву, лебяду, кісліцу, аер, кветкі ліпы і інш. Лісце шчаўя, крапівы, лебяды збіралі да іх цвіцення, складвалі ў фаскі і макітры, перасыпалі па слаях соллю, дадавалі кмену і іншых араматных зелак, квасілі пра запас.

Шырока выкарыстоўваліся ў ежы грыбы. Іх елі адваранымі, смажанымі, тушанамі, салёнымі, марынаванымію.Сушаныя грыбы дадавалі ў супы, юшку, капусту, тушаную бульбу, выкарыстоўвалі ў мясных стравах.

Сярод мясных страў асноўнае месца займае свініна. Найбольш каштоўным лічылася свіное сала. Мяса салілі і захоўвалі да палявых работ. Асабліва смачнымі былі венджанае мяса, свіныя каўбасы. З ачышчанага прамытага страўніка гатавалі коўбік (каўбух, сальцісон, кіндзюк, трыбух). Са свіных ног і галавы рабілі студзень(халадзец, халодна, квашаніна, застудзіна, дрыгва, юц). З мясных страў для беларускай кухні характэрна пячыста – вялікія кавалкі мяса жывёлы і п т у ш кі , прыгатаваныя цалкам.

Мясны рацыён беларусаў дапаўняўся  прадуктамі паляўніцтва: дзікія качкі,гусі, курапаткі, цецерукі, рабчыкі, зайцы, казулі, дзікі.

Акрамя мясных беларусы ў ж ы валі ў е ж у малочныя прадукты: малако ( каровіна, казінае, авечае). Часцей з хлебам, кашай і бульбай елі кіслае малако. З малака рабілі – тварог. З тварага рабілі – сыры. Сыроватку пілі замест вады, замешвалі на ёй бліны. З кіслага малака здымалі смятану. З смятаны рабілі масла, якое збывалі ў драўляных бойках.

Рыба таксама уваходзіла ў традыцыйную беларускую кухню.

Найбольшае распаўсюджванне атрымалі рыбныя стравы  на Палессі і паўночна-заходнім Паазер’і. Рыбу ўжывалі вараную, печаную на агні, вяленую, марынаваную і салёную. У памінальныя дні і ў час посту гатавалі рыбны студзень. З дробнай рыбы рабілі галкі –  рыбныя клёцкі.

Беларуская кухня вызначаецца сваімі напоямі. Вясной збіралі і пілі берку(бярозавы квас) і кляновік. З мёду рабілі мядок, медуху, медавуху, сыта.. З ягад варылі адвары, напоі, кампоты. Гатавалі і пілі хлебны квас , бураковы квас. З іван-чаю (скрыпеню), чабору, мацярдушкі, зверабою, кветак ліпы, маладых пабегаў сасны , з сушанай садавіны рыхтавалі адвары. Стравы і напоі, прыгатаваныя з даданнем дзікарослых раслін, пладоў, разнастаілі і ўзбагачалі асартымент штодзённага меню. У якасці лекаў выкарыстоўвалі і адвары з галінак маліны, парэчкі, вішні, кары дуба, крушыны, каліны.

На Вмцебш ч ы н е  з рэдзькі, мёду, хрэну і солі рыхтавалі хрэсьбінны збіцень.

Да старажытных напояў належыць піва. Па спосабу гатавання і смаку вядома было карчажнае,аўсянае, кляштарпнае, шляхетскае, марцыпанавае  ды

іншыя сарты піва. Ад месца вырабу вызначалі гродзенскае,койданаўскае,нясвіжскае, аршанскае, манастырскае піва. Піва, гатаванне якога было прысвечана да свята, называлі мікольскае, пкроўскае, дзмітраўскае. Піва варылі пераважна з ячменю або з цукровых буракоў.

Гарэлка ў старажытнасці сустракаецца падназвай vita (аквавіта), што азначае "вада жыцця". Вытворчасць гарэлкі ў нашай краіне пачалося ў канцы XVпачатку XVI стагоддзя. Спачатку яе рабілі ў хатніх умовах ( самагонаварэнне). Яе рабілі з жытняй мукі, бульбы (бульбянка), буракоў (бурачанка).

Гарэлка, настоеная на травах, атрымала назву настойкі.Адрозніваліся такія настойкуі, як малінаўка, аераўка, мятная, кменаўка,кававая,кардамонавая, крываўнікавая.

З гарэлкі рабілі і наліўку.У састаў уваходзіў сок ягад , альбо садавіны і гарэлка.

Адны напоі спажывалі кожны дзень, а другія пілі толькі ў час святаў.

Асноўныя і найбольш вядомыя спосабы прыгатавання ежы:варка, пячэнне, тушэнне, парэнне. Адметную асаблівасць беларускай народнай кухні састаўлялі прыварkі, закалоты, іволагі, закрасы і прысмакі.

Прыварkі складалі аснову стравы па колькасці і па сваёй смакавай ролі ў ёй. Ролю прыварkаў выконвалі розныя віды круп, а таксама некаторыя віды агародніны: капуста, буракі, морква, бручка.

Закалоты ўжываліся для загушчэння стравы. У якасці закалоты выкарыстоўвалі розныя віды мукі, бульбу.

Волагі паляпшалі якасць прыгатаваных страў. Для волагі выкарыстоўваліся смятана, масла, алей, канаплянае і льняное масла, малако( свежае і кіслае).

Закрасы мянялі выгляд стравы, уплывалі на смакавыя характарыстыкі. У якасці закрас ужывалі соль і малако ў супах, муку ў капусце, бульбяную масу ў крупені.

У нязначнай колькасці выкарыстоўвалі прадукты-прысмакі:мяса, сала, рыба, цыбуля, перац.

Для беларускай кухні характэрна квашанне капусты, буракоў, яблыкаў.На зіму салілі агуркі, кроп, пятрушку, ш ч а ў е, грыбы. Распаўсюджаным было саленне, сушэнне, венджанне мяса і рыбы.

Ядро усёй сістэты харачавання беларусаў утвараюць трапезы.

У залежнасці ад часу прыёму ежы вылучаюць ранішнія, дзённыя, вячэрнія трапезы; ад месца прыё1му ежы – хатнія, палявыя, грамадскія, трапезы ў гасцях. У залежнасці ад часу прыёму ежы выдзяляю.ць снеданне (сняданак), абед, полудзень (падвячорак) і вячэра. Час і ход трапезы мяняліся ў перыяд палявых работ і адрозніваліся ўлетку і ўзімку. Арганізацыяй трапезы за сталорм звычайна займаўся гаспадар. Ён сядаў за стол на покуці, ч ы т а ў малітву, кроіў хлеб, дзяліў мяса, у святочны дні разліваў гарэлку, сачыў за агульным парадкам. Гаспадыня ў пэўнай паслядоўнасці падавала стравы, напоі, раскладвала лыжкі. У XIX стагоддзі беларусі елі з адной міскі і толькі ў вялікіх сем'ях дзяцей садзілі асобна.

За сталом елі ўсе моўчкі, у некаторых мясцовасцях нават нельга было усміхацца. Калі хто з дзяцей парушаў “правілы людскасці”, то атрымліваў лыжкай па лбе і павінен быў тут жа пакінуць стол. За сталом забаранялася гучна жаваць, разліваць страву на стол. З-за стала з неператжаванай або непраглынутай ежай выходзіць было нельга.

Да святочна-абрадавых трапез можна аднесці трапезы, звязаныя са святамі каляндарнага цыклу (калядныя, велікодныя і г.д.) і з абрадамі сямейнага цыклу ( радзінныя, вясельныя, памінальныя). Асноўная функцыя святочных трапез – камунікатыўная, накіраваная на аб’яднанне людзей.

У беларускай народнай кулінарыі выдзяляюць трапезы, якія звязаны з выкананнем разнастайных гаспадарчых работ – талочныя, зажыначныя, засевачныя і г.д. Акрамя таго больш разнастайнымі стравамі ад звычайных трапез адроніваліся трапезы ў нядзелю, выхадныя дні. Нядзельная трапеза была больш працяглай, акрамя членаў сям’і, на ёй маглі прысутнічаць запрошаныя госці.

**Тэараэтычны матэрыял да лекцыі №7**
**Сям’я - 2гадзіны**

1.Формы сям’і.
2.Асноўныя функцыі сям’і.
3.Шлюб.
4. Вясельная абраднасць.
5.Радзіны. Радзіныя звычаі і абрады.
6. Пахавальна-памінальная абраднасць.
7.Сучасная сітуацыйная абраднасць у Беларусі.

Спрадвеку сям’я была галоўным сацыяльна-грамадскім інстытутам фарміравання кожнай асобы і людской супольнасці ўвогуле. Сямейны побыт беларусаў у XIV—XVIII ст. характарызаваўся надзвычай шырокай разнастайнасцю, шматварыянтнасцю яго арганізацыі. На беларускіх землях працягвалі ўдасканальвацца практычна ўсе формы сямейных адносін, што бяруць пачатак яшчэ ў глыбокай старажытнасці, і паступова зараджаліся новыя рысы сям’і, якія адпавядалі асобным тэндэнцыям узнікаючай капіталістычнай арганізацыі грамадства.

Асноўнай ячэйкай большай часткі дэмаграфічнага масіву беларускай народнасці была сялянская сям’я. Менавіта яна вызначальна адлюстроўвала стан сямейнага побыту і многіх сацыяльна-педагагічных працэсаў тагачаснага грамадства. На беларускіх землях яшчэ ў ранні феадальны перыяд з распаўсюджваннем ворыўнага земляробства з вялікіх патрыярхальных сем’яў выдзяляюцца малыя сем’і. Паступова кроўна-сваяцкія сувязі ўступаюць месца тэрытарыяльна-абшчынным, хаця яшчэ працяглы час рэшткі першых захоўваліся ў многіх жыццёвых сферах, асабліва ў сямейна-бытавой.

Такім чынам, у разглядаемы перыяд існавалі два тыпы сем’яў:малая (нуклеарная) сям’я, якая складалася са шлюбнай пары і яе дзяцей, і вялікая, што

уключала непасрэдных родзічаў двух-трох пакаленняў. У сваю чаргу вялікія сем'і былі таксама двух тыпаў: бацькоўская сям'я, куды ўваходзілі бацькі, дзеці і ўнукі, і брацкая сям'я, якую ўтваралі сем'і братоў, а часам і сясцёр. Такія сем'і мелі агульную гаспадарку, непадзеленую маёмасць і ўяўлялі сабой адну падаткавую адзінку, якая называлася дымам. Кааперавалiся паміж сабой і малыя сем'і. Часта, асабліва на Палессі, вялікія і малыя сем'і, асобныя дымы аб'ядноўваліся ў дворышчы для выканання сумеснай гаспадарчай працы. Падобным чынам сваяцкія (бацькоўскія, брацкія) і несваяцкія сем'і аб'ядноўваліся ў асобную адзінку падаткаабкладання — службу.Вось чаму само паняцце «сям'я», ці «сем'іца», азначала аб'яднанне, агульнае ўладанне, саўладанне.

Такое сумяшчэнне сямейна-радавых і суседска-таварыскіх адносін наклала істотны адбітак на фарміраванне абшчынных, калектывісцкіх пачаткаў у педагагічных поглядах народа. Выхаваўчыя мэты зыходзіліся на фарміраванні прыстойнай асобы, узровень дасканаласці якой у многім вызначаўся яе карыснасцю для грамадства. Гэтаму ж падпарадкоўваўся і змест адукацыйна-выхаваўчых працэсаў, якія спантанна або арганізавана ажыццяўляліся ў народзе.

На аснове супольнасці будаваліся многія метады і сродкі народнай педагогікі. У XVI ст., з правядзеннем аграрнай рэформы і інтэнсіўным развіццём фальварачнага вядзення гаспадаркі, набіраюць сілу працэсы індывідуалізацыі сялянскай сям'і, якія суправаджаліся карэннай ломкай сацыяльна-бытавых устояў сярэднявечча і сцвярджэннем ідэй індывідуалізму.

Сям'я гараджан была вельмі падобнай да сялянскай, і толькі розны характар вытворчасці і грамадскага жыцця абумоўліваў некаторую яе спецыфічнасць, асабліва ў сферы сямейнага побыту, хоць ён, як і самі сем'і, быў шматварыянтным, што з'яўлялася характэрным і для іншых саслоўяў беларускага грамадства.

Большую своеасаблівасць мелі сем'і беларускай шляхты, якія ў залежнасці ад маёмаснага дастатку больш або менш адрозніваліся ад сялянскіх ці гарадскіх сем'яў. Сістэма выхавання дзяцей тут была падпарадкавана фарміраванню сацыяльна-культурнай каставасці. Шляхецкія дзеці часта атрымлівалі вышэйшую адукацыю, у тым ліку за мяжой. Гэта быў адзін з дзейсных каналаў распаўсюджвання агульнаеўрапейскай культуры на беларускіх землях. Шляхецкае саслоўе дало свету цэлую плеяду выдатных дзеячаў (Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, браты Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі, Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі і многія іншыя), якія ўзняліся вышэй ад каставых, а падчас і канфесійных уяўленняў і сталі сапраўднымі выразнікамі інтарэсаў усяго беларускага народа.

Сям'я была першаснай сацыяльна-эканамічнай ячэйкай феадальнага грамадства, і да таго ж на ёй у якасці адной з асноўных ляжала задача выхавання падрастаючых пакаленняў, перадачы ім назапашанага вопыту, этнічных і сацыяльных норм, традыцый, стэрэатыпаў светаўспрымання. У народзе заўсёды лічылі, што неабходнай умовай для гэтага з'яўляюцца згода і лад у сям'і, паколькі, як падкрэсліваў Ф. Скарына, «незгода бо и найболшие

царства разрушаеть». Вось чаму стварэнне сям'і было адной з самых значных з'яў у грамадскім жыцці і ёй надавалася выключна важнае значэнне. З ранняга дзяцінства выхаванне хлопчыкаў і дзяўчынак было падпарадкавана падрыхтоўцы іх да будучага сямейнага жыцця. Першых рыхтавалі да вядучай ролі мужа, руплівага і дбайнага гаспадара, а другіх — да ролі паслухмянай, працавітай жонкі.

У выбары нявесты вядучую ролю адыгрывалі бацькі. Але шлюбны саюз неабавязкова заключаўся па прымусу. Часцей за ўсё ў аснове ляжалі ўгаворы, растлумачэнне. Так, словамі песні бацькі павучалі:

...Ні бяры, сынок, ты саяніцы,
Ні саяніцы, ні бушмашніцы,

А бяры, сынок, андарашніцу.
А саяніца — горка п'яніца,
А бушмашніца — падугольніца,
Андарашніца — то работніца [1, 83].

Больш за тое, у народзе разумелі, што сапраўдная сям'я, якая з поспехам будзе выхоўваць дзяцей, не можа быць пабудавана без кахання. Вось чаму Ф. Скарына, абапіраючыся на такія ўяўленні, пісаў: «...Мужи с своими женами имають во любви жити».

Фальклорная скарбонка нашага народа сведчыць аб тым, што твораў на любоўную тэматыку ў той час было вельмі многа. Ужо тады назіраюцца спробы паставіць каханне на адно з вядучых месцаў пры стварэнні сям'і. Часта чуліся скаргі маладой, «што звянчалі мяне, да з тым чужапанцам, да з тым незнаёмым, невядомым» .

М. В. Доўнар-Запольскіпісаў, што «на заключение брака оказывает немалое влияние достаток родителей… В особенности это сильно отражается на бедных семействах». Там жазазначаецца: «...бедные и большие семьи стараются отдавать своих сыновей в дом богатых мужиков. Это называется «ісці ў прыймы». Гэты прыклад яскрава сведчыць аб усведамленні самімі сялянамі сваёй сацыяльнай няроўнасці, размежавання ў сваім асяродку, абіснаванні на вѐсцымаѐмаснайдыферэнцыяцыі, якая ўплывала на розныя сферы жыцця. У «прыймы» звычайнаішлі «отставные солдаты, бобыли». Таму можна зрабіць вывад аб нізкім сацыяльным становішчы прадстаўнікоў гэтых груп. Грамадскіяадносіны да іхбыліадпаведныя. Сведчаннемпавагі, аўтарытэту было запрашэнне ў сваты. Звычайна сватам быўхросныбацька «или кто-либо из соседей побогаче и поважнее». Утакіхзвычаяхпрасочваеццапрамаязалежнасцьсацыяльнайпавагі ад маѐмаснага стану. Тут жаадлюстравана і асабліваестаўленне да хросныхбацькоў. Хроснаямаціпавінна была ісці ў даведкі ў дом жаніха .Гэтасведчылаабяеаўтарытэце для сям'інявесты, боѐйдаручалі такую адказную справу, як «агляд» жаніха. Калі ў час заручынсем'імаладыхабменьвалісяпадарункамі, то абавязкова сват павіненбыўпрывесціжытніпірог для хросныхбацькоў .

Сам шлюбны абрад меў на мэце надаць грамадскую значнасць стварэнню сям'і, закласці падмурак трывалай, дружнай ячэйкі грамадства. Ён змяшчаў мноства яркіх, эмацыянальна насычаных, па-мастацку аздобленых рытуалаў, якія неслі ў сабе непаўторны нацыянальны каларыт і значныя выхаваўчыя магчымасці. Шлюб уключаў у сябе шэраг этапаў: сватанне і агледзіны, заручыны, вянчанне і само вяселле. Урачыстасць, пышнасць вясельнага рытуалу, які працягваўся некалькі дзён, як бы сімвалізавалі пачатак будучага сямейнага шчасця, трываласці сямейных сувязей.

У традыцыйнымвясельнымрытуалебеларусаўзначнаемесцаадводзілася такому атрыбуту, як каравай. Усе рэчы, людзі, прадметы, штомелідачыненне да прыгатавання каравая, набываліасабліваезначэнне. Па гэтайпрычынебыць «каравайнымізапрашалі ... хросныхмаці, тыхжанчын, якіямелі добрую славу сярод аднавяскоўцаў», што сведчыць пра ўплыў асабістага аўтарытэту на адносіны грамады да асобы, пра ўплыў грамадскай думкі на фарміраванне сацыяльнага статуса асобы — больш адказныя абавязкі давяралі выконваць найбольш паважаным, аўтарытэтным сярод вяскоўцаў людзям. У працэсепрыгатавання каравая адлюстроўваўся і маёмасны стан сям'і. Бяднейшыясяляневыпякалікараваі з жытняймукі, а багацейшыя — з пшанічнай. Жыта, прызначанае для прыгатавання каравая, «заможнейшыясялянеадвявалі, бяднейшыя — малолі зерне з «пушком» і абрадавае цеста выпякалі з мукі, напалову змешанай з мякінай»; колькасць караваяў таксама залежала ад заможнасці.

У вясельнай абраднасці адлюстраваны і сацыяльныя адносіны да дзяўчат. Становішча той дзяўчыны лічылася больш высокім, да якой ездзіла больш сватоў. Наадварот, дзяўчына была не вельмі паважанай, калі да яе не жадалі сватацца. Трэба зазначыць акалічнасці, якія ўплывалі на колькасць сватоў да дзяўчыны, а тым самым і на яе стан. Вось як аб гэтым пісаў М. В. Доўнар-Запольскі: «При выборе невесты опять-таки руководствуются, во-первых, тем соображением, чтобы девушка была хорошей работницей, не имела за собой худой славы, отличалась здоровьем, хорошим телосложением и при том была из такой семьи, которая вполне соответствовала семье сына по достатку». Калі ў назначанытэрміндзяўчына не выходзіла замуж, то бацькіпавінныбылі «выплаціць штраф». У гэтым звычаі праяўлялася маёмасная дыферэнцыяцыя, бо памер выплат залежаў ад прыбытку гаспадара: «...з сярэдняга дома — 25 рублёў, з багатага — 50 рублёў, бедных жа — караць, як палічыць начальства». Пасля выплаты штрафу «начальнік, запрасіўшы выбарных асоб і лепшых прадстаўнікоў старэйшага пакалення, падшукваў гэтым дзеўкам жаніхоў на свой густ». Бачна, што ў сялянскімасяроддзівельмівялікаезначэнне мела добрая рэпутацыя, ад якой шмат штозалежала ў далейшымжыцці. Акрамятаго, у звычаі выплаты штрафу прасочваецца і стан кіруючых асоб, якія мелі значны ўплыў на розныябакіжыццявяскоўцаў, а значыць, і пэўныаўтарытэт і павагу.

Калі хлопцу і дзяўчыне прыйшоў час жаніцца і яны незнаёмы паміж сабой, іх родзічы наймаюць сваху ці сваццю для знаёмства маладых. Сваха звычайна бывае жанчына, якая умее ўгаварыць маладых аб заключэнні паміж імі шлюбу. Пасля згоды маладых бацькі маладога пасылаюць да маладой сватоў

(бывае і так, што маладая не дае згоды на шлюб з гэтым хлопцам, а бацькі хлопца і дзяўчыны згодны на іх шлюб па ранейшай дагаворанасці паміж сабой).

Для сватаўства бацькі жаніха разам з сваім сынам пасылаюць да бацькоў нявесты свата (сваццю). Сватам з'яўляецца мужчына, які добра ведае жаніха 1 можа яго добра расхваліць нявесце, каб яна дала згоду на шлюб.

Сваты, зайшоўшы ў хату да бацькоў нявесты, звычайна не гавораць прама аб іх мэце прыходу. Яны прадстаўляюць сябе гандлярамі або паляўнічамі, або яшчэ кім- небудзь, што прывяло да хаты нявесты знянацку. Напрыклад за пакупкай чаго- небудзь, або заблукалі па дарозе ці хочуць купіць у іх што-небудзь.

Калі бацькі нявесты даюць згоду ім дапамагчы ў іх просьбе, тады сваты ставяць на стол тое, што яны прынеслі з сабою: гарэлку і закуску. Абавязкова хлеб і соль для ўдачы. Сват запрашае паглядзець нявесту і расказвае ёй пра ўсе дадатныя рысы жаніха. Калі нявеста дае згоду на шлюб, бацькі жаніха і нявесты дагаворваюцца паміж сабой аб парадку правядзення вяселля: дзень правядзення вяселля, аб прыданным нявесты і г.д.

Паколькі гутарка праходзіць з выпіўкай і закускай гэта інакш называецца запасны.

Збоку нявесты яе бацькі пасылаюць да жаніха сваіх людзей, каб даведацца якая гаспадарка ў жаніха, яго багацце, яго паводзіны сярод сваіх суседзяў, яго працавітасць. Гэта называецца выгляды. Але выгляды праводзяцца не заўсёды, бо могуць даведаюцца ўсё пра жаніха праз яго суседзяў ці іншых людзей, якія добра ведаюць жаніха.

Падрыхтоўка да дня вяселля праводзяцца бацькамі жаніха і нявесты паасобку. Абмяркоўваюць каго запрасіць на вяселле, колькі патрэбна ежы і спірту, хто будзе шаферам у маладога і што будзе шаферкамі ў маладой.

У дзень вяселля госці жаніха і нявесты збіраюцца асобна ў жаніха і нявесты. Шаферкі апранаюць нявесту ў вясельнае адзенне (вянок на галову, фату і г. д.). Шафер жаніха прымацоўвае да грудзей квенікі.

У царкве поп вянчае жаніха і нявесту. Аб'яўляе іх мужам і жонкай, адзявае на іх пальцы пярсцёнкі, жадае жыць доўга ў каханні і згодзе. Пасля вянчання пра развод паміж мужам і жонкай нельга было і думаць, так як гэты абрад паходзіў ад бога, і каб развесціся трэба было зноў звярнуцца да яго.

Калі жаніх разам са сваім сватам, абвязаным ручнікам, шаферамі і родзічамі забіралі з сабой нявесту, то трэба было ім плаціць выкуп за падушкі для нявесты на таргах брату або сястрэ нявесты.

Нявесту садзілі разам з жаніхом на ўпрыгожаныя калёсы - у каней на шыі былі звонкія бубянцы, якія далёка былі чутны, калі ехала вяселле. На шляху язды вяселлю перагароджвалі дарогу, каб лепш разглядзець нявесту і патрабаваць выкуп ад жаніха. Звычайна жаніх адкупліваўся гарэлкай і закускай. Нявесту бацькі жаніха сустракалі перад сваім домам з хлебам і соллю. Пасля чаго запрашалі ўсіх гасцей збоку нявесты і жаніха за стол, дзе працягвалася вяселле з песняміі гульнямі.

За сталом на куцце садзіцца нявеста каля яе шаферкі, кросныя бацька і маці і ўсе родзічы, каб замужам быў дастатак нявесту садзяць на кажух,

перавернуты ўверх поўсцю. Бацькі нявесты ставяць на стол перад ёй посуд з падарункамі, пасля чаго ўсе госці кладуць падарункі ад сябе. Госці п'юць, закусваюць, пяюць вясельныя песні. Гасцей збоку жаніха абавязкова абвязвалі вышытымі ручнікамі бацькі нявесты, а збоку нявесты - бацькамі жаніха.

Галоўнай дзеючай асобай і павагай карыстаўся ў час вяселля сват, які быў тамадой яе.

У канцы вяселля музыкант іграў марш кожнаму прысутнаму на вяселлі, за што яго адорвалі грашмі, хто колькі мог.

У хаце нявесты пасля яе ад'езду да жаніха рыхтавалі адпраўку прыданага. Звычайна гэта быў сундук з падрыхтаванымі раней трубкамі саматканага палатна або адзенне. Прыданае таксама давалі зямлёй, жывёлай і іншым. Для дастаўкі прыданага намячалася па згодзе паміж бацькамі сватоў колькасць чалавек і падвод.

Звычайна вяселле праходзіла тры дні. Нельга было гуляць вяселле ў пасты і посныя дні згодна закона Божага.

Гасцям раздавалі вясельны каравай. Абрадавае печыва сімвалізавала дабрабыт будучай сям'і, атаясамлівалася з маладымі, іх доляй і шчасцем. У старажытныя часы ў прыгатаванні караваю ўдзельнічалі ўсе члены родавай абшчыны, пазней - усе члены сельскай абшчыны. Каравай з'яўляецца абавязковым атрыбутам усіх этапаў вяселля. З вельмі даўніх часоў вяселле суправаджалася карагодам - відам мастацкай творчасці, у якім сінтэзаваліся танец, песня, гульнёвае драматызаванае дзеянне, часам у музычным суправаджэнні.

На другі дзень вяселля жаніх прыходзіў да бацькоў нявесты з бутэлькай гарэлкі абвязанай чырвонай стужкай і запрашаў іх да сябе ў госці.

Каб дапамагчы гаспадару правесці вяселле з меньшай стратай для гаспадаркі, бо людзі жылі бедна, некаторыя блізкія родзічы сваёй вёскі запрашалі гасцей з вяселля да сябе ў госці ў канцы вяселля. Гэтая дзея называлася перазоўкамі.

Уступленне ў шлюб лічылася надзвычай важнай падзеяй у жыцці маладых людзей. Шлюб паміж родзічамі забараняўся, бо лічыўся шкодным, У старажытныя часы зарадзіліся такія віды шлюбу, як "умыканне" (выкраданне) і купля-продаж нявесты. Малады мужчына адпраўляўся здабываць сабе жонку з іншага роду. Пазней гэты звычай быў заменены шлюбам па дамоўленасці, паводле якой за нявесту плаціўся выкуп. Пасланцы маладога (сваты) дамаўляліся з бацькам маладой аб шлюбе і памеры выкупу. Калі дасягалася згода, то праз некаторы час адбывалася вяселле.

Моц сямейна-шлюбнага саюзу падтрымлівалася і вельмі адмоўнымі адносінамі грамадства да нявенчанага шлюбу, да пазашлюбных сувязей і разводаў. Дзеці ад нявенчанага шлюбу былі пазбаўлены многіх грамадзянскіх правоў і звычайна папаўнялі катэгорыі ніжэйшых сацыяльных слаёў.

У вясельных абрадах найбольшае месца займалі песні. Песні суправаджалі ўсе асноўныя этапы вяселля: сватанне, заручыны, падрыхтоўку і пячэнне караваю, пасад нявесты, вясельную бяседу, ад'езд да маладога, урачыстае застолле ў хаце жаніха, пярэзвы і інш. Акрамя песень, якія

адлюстроўвалі падзеі, звязаныя з уступленнем у шлюб, на вяселлі спявалася і шмат песень, што мелі толькі ўскоснае дачыненне да абраду або зусім не мелі ніякіх адносін да яго. У мастацкіх вобразах гэтых песень своеасабліва паэтызавалася паўсядзённае жыццё народа, яго быт, духоўны свет чалавека.

У вясельных песнях паэтызуюцца і велічаюцца жаніх і нявеста — галоўныя вобразы значнай часткі гэтых народных твораў. Жаніх часам паўстае ў вобразе князя, які едзе з дружынай, баярамі, нявеста ж называецца княгіняй. Гэта — імкненне паэтычна ўславіць, узвялічыць і ідэалізаваць у вясельных песнях галоўных дзеючых асоб шлюбнай урачыстасці. З дапамогай маляўнічых параўнанняў і іншых мастацкіх сродкаў песня стварае ідэальныя вобразы маладога і маладой, паказвае іх незвычайную прыгажосць. Часта для паэтызацыі маладых выкарыстоўваюцца вобразы сонца, месяца, зорак. У выніку шматвяковай традыцыі выпрацавалася багатая сімволіка, якая ярка характарызуе герояў вяселля. Вясельным песням, як і ўсяму абраду, раней надавалася ўтылітарна-магічная роля — з дапамогаю слова і адпаведных дзеянняў спрыяць шчасліваму жыццю маладых, Але песня і многія яе сімвалы з цягам часу адарваліся ад абраду і пачалі ўспрымацца па-іншаму, з гумарам. Гумар вясельнай паэзіі ў сваей аснове мяккі, добразычлівы, праз яго тонка раскрываюцца вобразы герояў шлюбнай урачыстасці. На вяселлі больш, чым на іншых сямейных урачыстасцях, спявалася фрывольных песень і прыпевак, пераважна эратычнага зместу, што генетычна звязана з сямейнай магіяй, традыцыйныя рэшткі якой захоўваліся ў перыяд панавання рэлігійнага светапогляду ў свядомасці селяніна і якія пачалі інтэнсіўна знікаць з развіццём культуры, навукі, перамогай матэрыялістычнага разумення прыроды. Нельга ўявіць беларускае вяселле без жартоўных і сатырычных песень і прыпевак, у якіх асабліва даставалася свату і свацці, дружкам, каравайніцам, а часам нават жаніху і нявесце. У абмалёўцы вобразаў свата і свацці шырока ўжываліся гратэск і гіпербала. У адной з песень, напрыклад, іранічна малюецца такі партрэт свата: «Сват наш вельмі харош, а ў свата доўгі буслаў нос, а ў свата лыса галава, да казіна рыжа барада»; сват «плавае па хаце, як таран, лыпае вачыма, як баран». У другой песні сват — гарбаты, у яго «на гарбу вярба, а ў той вярбе сава, лапамі перабірае, свахам вочы выдзірае».

Беларускія шлюбныя абрады і вясельная паэзія мелі шмат агульнага з адпаведнымі рускімі і ўкраінскімі абрадамі і паэзіяй, што сведчыць аб блізкасці поглядаў, эстэтычных патрабаванняў і аб цесных культурных узаемасувязях усходнеславянскіх народаў. Спецыфічныя нацыянальныя рысы беларускага вяселля ярка выяўляліся ў народным гумары, у драматызаваных жартоўных сцэнках, якія ўваходзілі ў вялікую вясельную «гульню».

Самай значнай падзеяй у жыцці сям'і было нараджэнне дзіцяці. Дайшоўшыя да нас багацці вуснай народнай творчасці Сярэднявечча ўтрымліваюць шмат матэрыялу, які сведчыць аб выключнай увазе народа да гэтай падзеі. Бацькі, асабліва маці, і само немаўлятка акружаліся павагай і пашанай. З першых дзён праяўляўся клопат аб выхаванні прыстойнага чалавека. Каб дапамагаць бацькам гадаваць і выхоўваць дзяцей, у іх з'яўляюцца такія названыя суродзічы, як бабка-пупарэзніца, кум і кума.

Наогул факт з'яўлення на свет новага жыцця быў абстаўлены мноствам арыгінальных абрадаў і рытуалаў. Яны настолькі глыбока ўвайшлі ў сямейны побыт беларускага народа, што ён, практычна адзіны са славян, захаваў па сённяшні дзень уласцівую толькі яму багатую хрэсьбінную паэзію. Хрэсьбінныя песні феадальнай эпохі ў запісах XIX ст. зычаць нованароджанаму дзіцяці шчаслівы лёс, матэрыяльны дастатак:

...Кумочак ходзіць, дзіцятка носіць,
А у бога долі просіць:
— А дай жа, божа, етый дзіцяці
Усякую долю узяці:
І хлебавую, і салявую,
Трэцюю — здаровейкую [1, 78—79].

Пры набліжэнні родаў жанчына імкнулася, каб пра гэта ведалі як мага менш людзей. Калі ў гаспадарцы мелася іншая будына, то жанчына ішла туды. Калі свабоднай будыны не было, то роды праходзілі ў хаце. На гэты час муж выправаджваў усіх з хаты. Даваў ім работу і наказваў хутка не вяртацца дадому. Рабіліся захады, каб пра наступленне родаў не даведаліся дзяўчаты. Калі ж здаралася такая неспадзёўка дзяўчына ўваходзіла ў хату ў час родаў, яна павінна была расплясці касу, набраць у рот вады і даць парадзісе выпіць са свайго роту - інакш роды пройдуць вельмі цяжка і ўсе абвінавацяць у гэтым дзяўчыну.

Роды адбываліся ўзімку ў хаце, улетку - у выраўнях, хлявах, гумнах. Бывала, што ў час родаў радзініца вярталася ў хату сваіх бацькоў і там жыла пасля родаў шэсць-восем дзён. Да парадзіхі звалі бабку-павітуху, па якую ішоў муж або замужная жанчына. Адпраўляючыся да павітухі, адразалі акрайчык хлеба, пасыпалі яго соллю і бралі з сабой. Па прыходзе да бабкі-павітухі гаварылі: "Хадзі, бабулічка, к нам. Нешта нашай маладусі ня дужа ладна дзелаецца." Накіроўваючыся да парадзіхі, бабка брала з сабой пірог або кавалачак хлеба. Бабка выконвала як рацыянальныя заходы да парадзіхі так выкарыстоўвала і розныя магічныя прыёмы. Нарадзіўшаеся дзіця бабка ніколі не брала голымі рукамі, а замотвала ў старое адзенне, каб яно пасля жыло ў багацці. Потым бабка перавязвала пупавіну пасмачкай чыстага лёну ці суравай ніткай. Пупавіну пераразалі хлопчыку на сякеры, нажы, дубовай кары ці кавалачку хлеба, малатку. Дзяўчынцы пераразалі на грэбне, верацяне, нітках, кружках, на нажніцах. Усе гэтыя прадметы вызначалі будучыю працу дзяцей. Пупавіна адвальвалася на чацверты-пяты дзень, і маці хавала яе ў куфар ці запіхвала ў дзірку, якая была прасвідравана для гэтай мэты ў сцяне хаты. Калі дзіцяці спаўнялася сем гадоў, яму давалі вузельчык з пупавінай развязаць, каб "развязаць свой розум".

Першае купанне таксама было абрадам. Пры першым купанні дзіця ляжала тварам на захад ці поўнач, а ў ваду клалі якія-небудзь прадметы. Існавала павер'е: калі дзіця пасля першага купання пакласці на правы бок, то яно ў далейшым жыцці будзе ўсё рабіць правай рукой і наадварот. Існавала сістэма варожбаў аб будучым лёсе дзіцяці ў залежнасці ад яго дня нараджэння: панядзелак - родзіцца няўмека, аўторак - нараджаюцца працавітыя людзі,

серада - неакрэслены лёс, чацверг - будзе шанцаваць, але хуткая смерць, пятніца - лайдак, злодзей, субота - шчаслівымі, удачлівамі, нядзеля - самыя шчаслівыя людзі, якіх чакае шанцаванне і поспех.

Бабка пры купанні давала імя, а святар як правіла пагаджаўся. Светару неслі падарунак, каб ён назваў дзіця. Звычайна святар даваў імя дзіця па каляндару.

Пасля нараджэння дзіцяці ўсе жанчыны павіны былі наведаць роджаніцу, акрамя цяжарных, а тая што ішла ў адведку абавязкова павінна былі паляжаць у ложку.

Хрэсбіны імкнуліся адсвяткаваць ў дзень царкоўнага хрышчэння. Без запрашення на гэтую ўрачыстасць ніхто не прыходзіў. Хрэсбіны ўключалі ў сябе агульнае частаванне. Усе жанчыны, што ішлі на хрэсбіны неслі з сабой прадукты.

Спецыяльнай абрадавай стравай на хрэсбінах з'яўлялася бабіна каша, якую гатавала павітуха, або хросная бабка. Для гэтай стравы куплялі навы гаршок, які потым разбівалі. У час падзелу кашы, якая амаль заўсёды заставалася за кумам, прыходзіў бусел, які віншаваў бацькоў і прыносіў ляльку (калыску). На хрэсбінах заўсёды прысутнічалі песні, якія былі пранізаны малітвамі за лепшую долю дзіця. Бабіну кашу хутка з'ядалі, каб дзіця пачало хутчэй гаварыць і хадзіць. Вялікае значэнне меў абмен падарункамі паміж парадзіхай і кумамі і бабкай-павітухай. Як правіла парадзісе даравалі ручнік, абрус, хустку. Для бабкі і кумоў наміткі. Затым бабка рабіла магічныя дзеянні, каб лёс дзіцяці быў шчаслівы, пасля якіх быў рытуальны танец.

Да найбольш важных падзей, што суправаджаліся абрадавымі дзеяннямі і завяршалі сімвалічнае далученне наваролжанага да сям'і і грамады адносіліся: ачышчэнне дзіцяці пасля царкоўнага памазання, з'яўленне першага зуба, першыя крокі і першае пастрыжэнне. Пакуль збіраліся госці дзіцяці купалі. Так адбывалася ачышчэнне. Для гэтага абрада існавала асабістая сумесь з вады, аўса і хмелю. Пры ачышчэнні дзіця ставілі на ножкі, а на яго галаву клалі абаранкі. Купала дзіця бабка-павітуха, прычым дзіця было ў начоўках. Гэтай сумяссю мылі твар усіх, хто быў у гасцях і выцяралі ручнікам. Пасля ачышчэння ваду вылівалі у месца дзе ніхто не хадзіў і куды не заглядала сонца і месяц. Увесь гэты абрад адбываўся на трэці дзень пасля хрышчэння. Звячаі і абрады ачышчэння наваролжанага завяршалі хрэсбінныя ўрачыстасці.

У час хрэсьбін выконваліся песні, прыпеўкі, прыгаворы. Найбольп пашыранымі былі песні, у якіх выказваліся пажаданні шчаслівай долі нованараджанаму, славілася парадзіха-маці, велічаўся бацька дзіцяці, ушаноўвалася бабка-павітуха, ухваляліся ці высмейваліся ўзаемаадносіны кума і кумы і інш. Песні пра кума і куму мелі нярэдка жартоўна-эратычны характар. Шмат выконвалася застольных і бяседных песень, звязаных і не звязаных з абрадам. Абрады і звязаныя з імі песні, на думку выканаўцаў, павінны былі садзейнічаць лепшай долі нованароджанага. Пазней жа магічная функцыя ў гэтых абрадах і песнях адышла на другі план, галоўную ролю набыла эстэтычна-мастацкая функцыя.

Колькасць дзяцей у сялянскіх сем'ях была вельмі рознай. Як мяркуюць многія даследчыкі, тыповай была сям'я, дзе мелася 3—5 дзяцей. Многія сем'і мелі і больш. Вядома, што ўвогуле нараджалася дзяцей многа, але высокі ўзровень смяротнасці значна зніжаў сярэднія лічбы. У народзе лічылі, што калі дзяцей багата, то хоць клопату хапае, але ж і радасці шмат. Як суровае папярэджанне гучыць прымаўка: «Без дзяцей ціха, ды на старасці ліха» .

Побыт сярэдневяковай беларускай сям'і быў пабудаваны на арганічным спалучэнні абшчыннасці, супольнасці і строгага падпарадкавання аўтарытэту адной асобы. У кожнай сям'і, згодна са звычаёвым правам, якое ўскосна падмацоўвалася і юрыдычнымі законамі, галавой сям'і быў, як правіла, старэйшы з мужчын. Слова гаспадара было законам для ўсіх яе членаў. Павага да галоўнага, старэйшага падтрымлівалася і эканамічна-заканадаўчымі, і звычаёвымі правамі. Напрыклад, у многіх беларускіх сем'ях існавалі рысы так званага марыяту, калі асноўная частка сямейнай маёмасці пераходзіла ў спадчыну да старэйшага сына, а астатняя яе частка дзялілася паміж іншымі членамі сям'і. У той жа час у самой сям'і многія віды дзейнасці патрабавалі сумеснай працы, дзе кожны набываў свой статус у залежнасці ад яго ведаў і ўменняў у практычнай дзейнасці, што стымулявала рост індывідуальнай варыятыўнасці яго паводзін і вяло да развіцця пачуцця ўласнай годнасці.

Разам з тым міжсямейныя адносіны ў кожным пасяленні характарызаваліся своеасаблівай гамагеннасцю і ў многім будаваліся на абшчынных прынцыпах («гвалт», «дворышчы», «талака», «службы» ў вёсцы, арцель у горадзе).

Усё сказанае цалкам мае дачыненне і да гарадской сям'і. І толькі ў сем'ях шляхты, асабліва заможнай, перавагу мелі індывідуалістычныя падыходы, хаця і ў іх з павагай і адабрэннем ставіліся да абшчыннасці, супольнасці ў многіх сферах арганізацыі грамадскага жыцця. Падобны дуалізм гаспадарча-бытавога ўладкавання сям'і надаваў адчувальную дынаміку развіццю многіх працэсаў, у тым ліку прагматычна-выхаваўчых.

Сінкрэтызм арганізацыі сямейнага быту выразна праявіўся і ў становішчы жанчыны ў феадальным грамадстве Беларусі. Нягледзячы на больш высокае сацыяльнае становішча мужчыны, беларуская жанчына не знаходзілася ў дэспатычна-прыгнечаных сямейных умовах, як гэта было ў многіх іншых народаў. Наадварот, як слушна адзначаюць многія даследчыкі, жорсткае абыходжанне мужа з жонкай нават давала апошняй права разрываць шлюбныя вузы. Афіцыйнае заканадаўства ўмацоўвала пэўную незалежнасць жанчыны і ў эканамічных адносінах.

Існавала так званае права вена, згодна з якім жонка валодала 1/3 часткай маёмасці сям'і пасля смерці мужа. Такое высокае грамадскае і сацыяльна-эканамічнае становішча жанчыны было характэрным для беларускага народа і заўсёды захоўвалася ў сямейных традыцыях. Так, член Паўночна-Заходняга аддзела рускага таварыства І. А. Сербаў пасля адной з экспедыцый на пачатку XX ст. у самую глухамань Беларускага Палесся, дзе жылі беларусы-сакуны, якія беражліва захоўвалі традыцыі сівой мінуўшчыны, пісаў: «Жанчына ў сакуноў карыстаецца аднолькавымі правамі з мужчынамі».

Беларускі мысліцель XVI ст., аўтар трактата «Аб норавах татар, літоўцаў і маскавіцян», Міхалон Ліцвін адзначаў, што жанчына ў Вялікім княстве Літоўскім мае намнога болей свабоды, чым жанчына суседніх краін .

Усё гэта дае падставы многім навукоўцам сцвярджаць, што беларуская жанчына не толькі прымала актыўны ўдзел у гаспадарчых справах сям'і, у арганізацыі быту, але і ў выхаванні дзяцей падчас адыгрывала дамінуючую ролю. Пачынаючы з калыханак, маці фарміравала ў дзяцей існаваўшыя тады стэрэатыпы светаўспрымання і грамадскага ўладкавання. Праз маці закладваліся асновы культуры і самасвядомасці. Невыпадкова, што менавіта Сімяон Полацкі, знакаміты айчынны педагог, які значную частку свайго жыцця пражыў у Маскве, быў першым на Русі, хто ўслых загаварыў аб ролі маці ў выхаванні дзяцей.

Даволі высокае становішча жанчыны ў беларускім грамадстве, актыўны і дзейсны яе ўдзел у выхаванні падрастаючых пакаленняў спрыялі таму, што ўвогуле для беларусаў характэрнымі і вызначальнымі рысамі характару станавіліся чалавечнасць, добразычлівасць, стрыманасць, цярплівасць, шчырасць, міралюбнасць. Менавіта тут бачацца вытокі таго, што для нашага народа зусім не характэрныя жорсткасць, помслівасць, ваяўнічасць. Гэтай прычынай у многім тлумачыцца і высокі лірызм душы беларусаў.

Звычайна да сістэматычнага выхавання бацька падключаўся пастулова, з ростам дзіцяці. Працэс далучэння дзяцей да гаспадарчых спраў пад непасрэдным кіраўніцтвам бацькі адбываўся значна раней — з 5—6 гадоў. Вядома, галава сям'і больш увагі ўдзяляў сынам як будучым гаспадарам. З 12—14 гадоў падлеткі ў той час станавіліся амаль што паўнацэннымі дарослымі членамі сям'і. Нездарма ж у выпадку смерці бацькі сыны ўступалі ў спадчыннае права з 12 гадоў. Іншы раз у шлюб дзяўчаты ўступалі нават у 12—13 гадоў, а хлопцы — у 14—16 гадоў.

З глыбокай старажытнасці трывалым падмуркам этнапедагагічнай культуры нашага народа былі звычаі, традыцыі і абрады. Фарміраванне асобы ў старажытным грамадстве працякала ў строга акрэсленых межах яе дзейнасці і ўчынкаў.

З дзяцінства чалавек у імператыўна-катэгарычнай форме ўспрымаў шэраг прадпісанняў і забарон наконт правілаў паводзін, спосабаў дзейнасці і нават напрамку думак. З пакалення ў пакаленне без абмеркавання, а часта і без абгрунтавання перадаваліся выпрацаваныя і адшліфаваныя сацыяльна-грамадскім і духоўна-выхаваўчым вопытам тыя звычаі, традыцыі і абрады, якія стваралі аптымальныя ўмовы для арганізацыі выхавання дзяцей.

Дзякуючы звычаям сям'я мела даволі дзейсныя «педагагічныя» рычагі ўздзеяння на дзіця. Звычаі не проста выпрацоўвалі спосабы паводзін чалавека, а ўсталёўвалі ў ім веру ў існаванне вышэйшых законаў грамадскай уладкаванасці, спасціжэнне і выкананне якіх, як уяўлялася, павінна забяспечыць найлепшыя ўмовы зямнога быцця. Многія сямейныя звычаі стваралі трывалы падмурак для распрацоўкі метадалагічных асноў выхавання дзяцей. Так, рускі этнограф XIX ст. Д. Г. Булгакаўскі адзначаў, што ў

палешукоў існавала павер'е, што калі немаўлятка абазваць жабай, то ў дзіцяці вырасце горб.

І вось на падставе гэтага ў сем'ях існаваў звычай не абзываць дзяцей. Як бачна, гэта спантанна ўсталёўвала ў сямейным выхаванні прынцыпы гуманнага, добразычлівага абыходжання з дзецьмі і апоры на станоўчыя якасці выхаванцаў.

Традыцыі ў галіне этнапедагагічнай культуры спрыялі перадачы кожнаму наступнаму пакаленню такіх кампанентаў грамадскай свядомасці, як ідэі, погляды, густы, ідэалы, перакананні, веды і інш.

Агульнавядома высокая выхаваўчая роля традыцый у радавітых шляхецкіх сем'ях, якія беражліва захоўвалі стэрэатыпы рыцарскай культуры. Але ж і простыя сялянскія сем'і ў імкненні набыць лепшую грамадскую ацэнку падтрымлівалі і прымнажалі спадчынныя якасці, якія былі характэрнымі для многіх пакаленняў іх роду.

С. Пашкевіч пры даследаванні ў XIX ст. жыцця і быту беларускіх сялян пісаў: «...Маладыя заўсёды трымаюцца паводзін і абыходжання старых, а тыя старадаўнасці» .

Невыпадкова ў народзе лічылі, што дзеці амаль заўсёды падобныя на сваіх бацькоў. Таму, напрыклад, пры выбары жонкі раілі: «Пазірай на матку, а жаніся на дзіцятку». Пачуццё гонару за свой род і павага да продкаў праявіліся і ў тым, што к канцу XVI ст. нават простыя сяляне атрымлівалі ў спадчыну трохкампанентныя найменні-прозвішчы (прозвішча, імя, імя па бацьку).

Пэўныя адрозненні ў выхаванні дзяцей існавалі ў сем'ях розных слаёў беларускага грамадства. Сялянскія і гарадскія сем'і перш за ўсё мелі на мэце падрыхтоўку дзяцей да будучай працоўнай дзейнасці. Іх з 5—6 гадоў ужо непасрэдна ўключалі ў гаспадарчую дзейнасць у якасці памочнікаў. У сем'ях гараджан-рамеснікаў дзеці таксама з малых гадоў прымалі ўдзел у прадукцыйнай працы, паступова набывалі прафесійныя навыкі, часам станавіліся вучнямі, каб атрымаць спецыяльнасць. Дзяўчынкі пад непасрэдным наглядам маці ўдзельнічалі ў абслугоўванні сям'і, набывалі навыкі шыцця, ткацтва, гатавання ежы і г. д. Сямейнае выхаванне ў заможных гараджан і багатай шляхты было скіравана на набыццё нашчадкамі якасцей, што давалі магчымасць у будучым захоўваць і павялічваць набыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры сваіх бацькоў.

Характэрна, што, нягледзячы на маёмасна-саслоўныя адрозненні, існаваў шэраг рыс, характэрных для ўсіх беларускіх сем'яў Сярэднявечча. Акрамя любві да працы вялікая ўвага ўдзялялася прывіццю любві і павагі да сваіх бацькоў, дзядоў, продкаў. Значнае месца ў змесце сямейнага выхавання адводзілася фарміраванню патрыятычных пачуццяў, адданасці і вернасці свайму народу, свайму краю. Выкананне хрысціянскіх запаветаў часта вымяралася адносінамі асобы да іншых людзей. «Хто людзей не саромеецца — той Бога не баіцца» , — сцвярджалася ў адной з прымавак, запісаных у XVII ст.

З павагай ставіліся ў беларускіх сем'ях да ведаў, адукаванасці, кнігі. З сівой мінуўшчыны захаваліся ў вуснай народнай творчасці творы, якія сведчаць аб гэтым.

Пэўную цікавасць выклікаюць народныя погляды на імкненне людзей да матэрыяльнага багацця. У многіх сем'ях такое імкненне не толькі не асуджалася, а, наадварот, уяўлялася адной з мэт чалавечага жыцця. Праўда, заўсёды падкрэслівалася неабходнасць набыцця матэрыяльных даброт сумленным шляхам, а таксама што ўласнае шчасце не можа будавацца на няшчасці іншых. Нават падарункі лёсу (знойдзеныя скарбы, дары чараўнікоў і інш.) мелі станоўчую маральную ацэнку, калі яны даставаліся прыстойным асобам. Аднак у той жа час падкрэслівалася і дэфармуючае ўздзеянне багацця на маральна-духоўную прыроду чалавека. Гучалі нават і такія перасцярогі: «...Гдзе багатства, там шчасця немаш»..

Многія іншаземцы, што вандравалі ў той час па беларускіх землях, пакінулі ўспаміны, у якіх давалі вельмі высокую ацэнку вынікам выхавання ў простанародных сем'ях. Адбывалася гэта таму, што выхаванне не вычлянялася з жыцця, а арганічна ўпляталася ва ўсе сямейныя адносіны. Дзяцей не рыхтавалі да будучага жыцця, азначанага пэўнымі ўзроставымі ці іншымі межамі, а паступова ўключалі ва ўсе сферы чалавечага існавання.

Прызнаннем выхаваўчых заслуг простай беларускай сям'і з'яўляўся, напрыклад, звычай дзядзькавання, які ўкараніўся ў грамадскае жыццё к канцу XVI ст. і быў распаўсюджаны аж да канца XIX ст. Сутнасць яго заключалася ў тым, што дзеці заможнай шляхты аддаваліся на выхаванне ў звычайную сялянскую сям'ю з мэтай фарміравання ў маладых шляхціцаў лепшых фізічных і духоўных якасцей простага народа.

Адрозненні ў сацыяльным статусе паміжсялянаміадлюстраваны і ў пахавальна-памінальнай абраднасці. Не ўсе мелі магчымасць аднолькава праводзіць сваіх блізкіх у «апошні шлях». У больш заможных сем'ях у хату запрашалі святара: «...если семья достаточная, приглашают священника». Ён спавядаў і прычашчаў паміраючага і чытаў над ім «отходную молитву». У адным з аповедаў селянін просіць пахаваць памерлую жонку адразу, не чакаючы трох дзён, боён «очень бедный, и нет денег на водку, а «на сухое» никто не захочет с покойницей ночь сидеть». У І. У. Рубаноўскага прыводзяцца звесткі, што звычайна зверху нябожчыка пакрывалі белым палатном, наміткаю ці іншымі белымі тканінамі, у больш заможных сем'ях — прынесеным з царквы парчовым пакрывалам.. Такія дадзеныя адлюстроўваюць дыферэнцыяцыю паміж сялянамі, заснаваную на іх маёмасных магчымасцях.

У традыцыйным абрадзе пахавання ў сярэднія вякі цесна перапляліся язычніцкія і хрысціянскія элементы, у якіх выразна выявіўся культ продкаў. Пахаванне (хаўтуры) уяўляла цыкл сямейных звычаяў і абрадаў, якія былі звязаны з ушанаваннем памяці нябожчыка і праводзінамі яго ў апошні шлях.. Усе этапы пахавання суправаджаліся галашэннямі, вядомымі з глыбокай старажытнасці. Яны грунтаваліся на веры ў бессмяротнасць душы, на ўяўленнях аб тым, што чалавек і пасля смерці можа дапамагаць ці шкодзіць жывым. Гэта былі імправізаваныя творы, у якіх гучалі смутак і гора, глыбокі жаль з выпадку смерці роднага ці блізкага чалавека. Для гэтых твораў характэрна эпічнасць апавядання: у адных расказваецца пра цяжкі жыццёвы шлях селяніна, у другіх малюецца карціна горкага існавання беднай удавы з

дробнымі дзеткамі-сіротамі і інш. Паэтыка беларускіх хаўтурных галашэнняў багатая на разнастайныя выяўленчыя сродкі. Яны эмацыянальна насычаныя. Укладваючы ў словы ўсю ласку і выказваючы гора і глыбокі смутак, маці называе свае памершае дзіця «лісточкам зялёненькім», «цвяточкам чырвоненькім», «яблычкам недаспелым», «салавейкам шэранькім».У галашэннях шырока ўжываліся пяшчотна-ласкавыя звароты, словы-эпітэты:" А мой раднюсенькі, а мой мілюсенькі", "А мая матулечка, шэрая зязюлечка! Навошта нас пакінула, горкіх сіротачак?". У дакастрычніцкі час шмат беларускіх сямейна-абрадавых песень запісалі З. Даленга-Хадакоўскі, П. Шэйн, І. Насовіч, Е. Раманаў, У. Дабравольскі, М. Федароўскі і іншыя фалькларысты.

Мяняецца жыццё, а разам з ім мяняюцца сямейныя традыцыі і формы сямейнага ўзаемадзеяння. Тым не менш сям’я як асноўны элемент грамадства заўсёды была і застаецца захавальніцай чалавечых каштоўнасцей, культуры і гістарычнай пераемнасці пакаленняў, фактарам стабільнасці і развіцця. З сям’і пачынаецца жыццё чалавека, тут адбываецца фарміраванне яго як грамадзяніна. Сям’я – крыніца любові, павагі, салідарнасці і прыхільнасці, тое, на чым будуецца любое цывілізаванае грамадства, без чаго не можа існаваць чалавек. Сям’я робіць наша жыццё шчаслівейшым, ярчэйшым і багацейшым. Трывалыя і шчаслівыя сем’і – гэта залог прагрэсу і працвітання любога грамадства. Асноўнай мэтай сямейнай палітыкі любой дзяржавы з’яўляецца забеспячэнне неабходных умоў для рэалізацыі сям’ёй яе эканамічнай, узнаўленчай, выхаваўчай і культурна-псіхалагічнай функцый.

Падтрымка сям’і ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляецца важным дзяржаўным прыярытэтам.

Асноўнымі напрамкамі сямейнай палітыкі нашай дзяржавы з’яўляюцца: паляпшэнне матэрыяльных умоў жыццядзейнасці сем’яў, умацаванне маральных асноў сям’і і павышэнне яе прэстыжу, аказанне ўсебаковай дапамогі сям’і ў выхаванні дзяцей, падтрымка адораных дзяцей, забеспячэнне аховы здароўя маці і дзіцяці, абарона праў непаўналетніх, прафілактыка сацыяльнага сіроцтва, узмоцненая ўвага да няпоўных і малазабяспечаных сем’яў з мэтай стварэння спрыяльных умоў для іх жыццядзейнасці, усебаковая падрыхтоўка моладзі да шлюбу і сямейнага жыцця, а таксама планавання сям’і, прафілактыка сямейнай занядбанасці і інш.

З вельмі старажытных часоў сямейная абраднасць развівалася вакол трох галоўных момантаў у жыцці чалавека: нараджэння, уступлення ў шлюб, смерці. Ва ўсе часы людзям хацелася, каб будучы чалавек нарадзіўся здаровым, моцным, прыгожым, добрым, сумленным, разумным, таму ў старажытнасці зярталіся да магіі, імкнучыся запраграміраваць гэтыя якасці у дзіцяці. Па народных павер'ях, вельмі многае залежала ад удзельнікаў абраду, асаблінаад бабкі-павітухі. Яна давала цяжарнай жанчыне рэкамендацыі, якіх норм паводзін прытрымлівацца ў такі адказны перыяд жыцця. Бабкай звычайна выбіралі вопытную пажылую знахарку, якая валодала прыёмамі аблягчэння родаў, ведала замовы, мела "лёгкую руку". Верагодна, прыродаплемяннымладзегэта была старэйшаяпрадстаўніца роду. Яна прымала роды і рабіла найпрасцейшыя магічныя засцерагальныя дзеянні, каб

уберагчы маці і дзіця ад уздзеяння злых сіл. Бабка рабіла рытуальнае купанне дзіцяці, першая прымала яго з рук хросных бацькоў пасля хрышчэння. Праз некалькі дзён пасля нараджэнця дзіцяці бацькі павінны былі выбіраць хросных. Пры родавым ладзе ўсе абавязкі хроснага выконваў брат маці, бсваяцтвавялося па мацярынскайлініі і дзіця належала яе роду. Пры абмеркаванлі пытання аб шлюбе сваіх падапечных менавіта брат маці быў сватам жаніха і вёў перамовы з бацькамі нявесты. У "мацярынскагадзядзькі"зувядзеннемхрысціянстваз'явіўся новы абавязак — ёнстаўхроснымбацькампрыпрыняцццідзіцяці з лона царквы. Хроснаямацівыконвалатыя ж функцыі,што і хросныбацька.

Як каляндарныя, так і сямейныяабрадыўзніклі ў часы, калі славяне былі язычнікамі. Усе ўрачыстыя рытуалы тады былі накіраваны на ўміласціўленне багоў, засцераганне ад злых сіл, заклінанне прыроды.

**Тэараэтычны матэрыял да лекцыі № 8**
**Традыцыйная духоўная культура - 2 гадзіны , 4 гадзіны СКРС**

1. Вераванні народаў Беларусі.
2. Вусная народнасць творчасць. Фальклор як сродак выхавання нацыянальнай свядомасці беларусаў.
3. Народная музыка. Характэрныя рысы народнай вакальнай творчасці. Народная інструментальная музыка. Народныя інструментальныя ансамблі.
4. Народнае харэаграфічнае майстэрства.
5. Народны тэатр. Батлейка.

Для абазначэння старадаўніх вераванняў і культаў, што існавалі да пашырэння так званых "вышэйшых" рэлігій (хрысціянства, іслам, будызм), у багаслоўі і гістарычнай літаратуры прыняты тэрмін язычніцтва, альбо паганства. Назва паходзіць ад царкоўнаславянскага слова "языцы", што азначае народы, чужаземцы.

Слова "паганства" ўтворана ад лацінскага слова "паганус" у значэнні селянін і таксама язычнік. Справа ў тым, што хрысціянства ў Рымскай імперыі, распаўсюджвалася спачатку ў гарадах. Вёска і яе жыхары (сяляне-паганцы) яшчэ доўга заставаліся язычнікамі.

Першымі формамі паганскіх вераванняў былі фетышызм, анімізм, татэмізм, магія і інш.

Анімізм (паходзіць ад лацінскага слова anima ў значэнні дух, душа) - сістэма ўяўленняў і вераванняў аб духах і душы як вызначальных пачатках свету і чалавечага жыцця. Анімістычныя вобразы (душы, духі, дэманы, чэрці і інш.) узніклі як увасабленне незразумелых стыхій, што пагражалі чалавеку; з'яў і працэсаў, непасрэдна звязаных з яго існаваннем. Пры гэтым духі надзяляліся чалавечымі рысамі і якасцямі.

Абрады, дзеянні або слоўныя формулы-заклінанні, звязаныя з верай у звышнатуральныя здольнасці чалавека, ўздзейнічаюць на сілы прыроды, лёс,

істоты і прадметы, называюцца магіяй, або чарадзействам. У аснове магіі ляжала ўяўленне, што пэўнае дзеянне выклікае адпаведную жаданую з'яву. Магія была белай, што заклікала да бога, і чорнай, што звярталася да "нячыстай" сілы. Найбольш пашырана была магія лячэбна-засцерагальная (знахарства, замовы), гаспадарчая, любоўная, шкоданосная і інш. Рэшткі магічных вераванняў існуюць і ў наш час.

Культ неадушаўлёных прадметаў - фетышаў, якія, паводле ўяўленняў вернікаў, надзелены звышнатуральнымі ўласцівасцямі, называецца фетышызмам. Амулеты ў выглядзе мядзведжых іклаў з прасвідраванымі дзеля падвешвання адтулінамі знойдзены, напрыклад, у Ваўкавыску ў культурным пласце Х ст.

Пад татэмамі звычайна разумеюць комплекс вераванняў і абрадаў, звязаных з уяўленнем пра роднасць паміж групай людзей і татэмам - пэўным відам жывёл, раслін, радзей - з'яў прыроды ці неадушаўлёнымі прадметамі. Татэма паважалі, часам абагаўлялі, не прычынялі яму шкоды. Дзеля задобрывання татэма-жывёлы выконвалі спецыяльныя магічныя абрады, песні-заклінанні, татэмныя танцы, у якіх звычайна імітаваліся паводзіны татэмаў.

Зямлю, ваду і неба балты і славяне засялілі багамі і духамі і кожнага надзялілі сваімі функцыямі - кожны "адказваў" за нейкае асяроддзе ці сферу жыцця. У лесе жыў лесавік, у балоце - лешы, у полі - палявік, у вадзе - русалкі, у хаце - дамавік і г. д.

Славяне ўяўлялі сваіх багоў у выглядзе людзей з чалавечымі звычаямі і паводзінамі. Яны маглі быць добрымі і злымі, прыносіць людзям карысць або шкоду. Каб богі былі міласцівымі да людзей, іх стараліся задобрыць, наладжвалі ў іх гонар розныя ўшанаванні: пакланяліся ім, прыносілі ахвяры, часцей у выглядзе пачастункаў, ежы.

Язычнікі выраблялі з дрэва, каменю, косці, гліны вялікія і маленькія фігуркі багоў, якіх называлі ідаламі ("каменнымі бабамі").

Важнейшай асаблівасцю язычніцтва з'яўляецца шматбожжа. У язычніцкі пантэон славян уваходзілі багі: Пярун (бог грому і маланкі), Сварог (бог неба) і яго сын Дажбог (бог сонечнага святла), Ярыла (бог веснавой урадлівасці і плоднасці жывёлы), Жыжаль (бог агню), Зніч (бог паграбальнага агню), Стрыбог (бог ветроў), Вялес (апякун жывёлагадоўлі), Лёля (багіня вясны, дзявочай прыгажосці і кахання) і інш.

Месца, дзе язычнікі ўшаноўвалі сваіх багоў, прыносілі ім ахвяры, называлася капішчам, або свяцілішчам. Яны размяшчаліся на ўзвышшах, астравах, на берагах рэк і азёр, сярод балот. Звычайна капішча ўяўляла сабой пляцоўку круглай формы, у цэнтры якой стаяў ідал - вобразнае адлюстраванне бога. Па краях пляцоўка была акрэслена ровам, камянямі або ямамі. Найчасцей капішчы прысвячаліся галоўнаму богу - Пяруну. Паводле падання, каля Полацка на беразе Валовага возера знаходзілася капішча Пяруна. Рэшткі свяцілішча Х ст. адкрыты каля вёскі Ходасавічы Рагачоўскага раёна. Тут стаяў драўляны ідал, вакол якога ў час святкаванняў распальваліся вогнішчы.

Паганства выступала як вынік жыццёвай дзейнасці і светапогляду людзей, адлюстраванне іх патрэб. Увядзенне хрысціянства не скасавала цалкам

язычніцкіх уяўленняў і культуры. Хрысціянская царква вымушана была дапасоўваць свае святы і абрады да язычніцкага святочнага календара.

Напрыклад, сляды культу Перуна захаваліся ў некаторых павер'ях і праклёнах ("Каб цябе Пярун трэснуў"). Многае з таго, што ў язычніцкія часы насіла культавы характар, захоўваецца і сёння як мастацкая з'ява

У беларускім фальклоры можна знайсці легенды і паданні, верагодна,дахрысціянскага паходжання. Так, сярод паданняў, сабраных М.Федароўскім,ёсць некалькі, якія прыпісваюць стварэнне Сусвету істоце без імені, аленазванага "Бог багоў". Іншыя легенды, магчыма, нават больш старажытныя,расказваюць пра роэныя дзеянні гэтага бажаства, якое абходзіць увесь свет,прыняўшы аблічча старога. Заслугоўвае ўвагі тое, што гэтыя паданні негавораць нічога пра ўласнае імя Бога за выключэннем асобных выпадкаў, каліяго наэываюць Белбогам. Усе тэта магло навесці на думку, што старажытныябеларусы мелі у асноўным монатэістычныя погляды, і, гаворачы пра ВярхоўнагаБога, яны не адчувалі асаблівай патрэбы у тым, каб аддзяліць яго ад іншыхміфічных істот. Нават у больш познія часы, калі іншыя міфалагічныя істотыўвайшлі у народную рэлігію, ідэя Вярхоўнага Бажаства захавалася.

Як ужо адзначалася, доўгі час лічылася, што галоўным богам беларускіх плямён у той перыяд,калі развівалася міфалогія, быўПярун. Цяпер гэта палажэнне абвяргаецца. На самай справе беларускіяплямёны ўшаноўвалі як вышэйшае бажаство Белбога, якога яшчэ называлі Бялун,або Бог неба. Паколькі ён лічыўся прабацькам усіх іншых багоў, дык быўбольш вядомы як Дзед.

Некаторыя аўтары, такія як В.Нерынг, абвяргалі вялікую значнасць Белбогау славянскай міфалогіі, а А.Брукнер сумняваўся не толькі ў існаванніБелбога, але і Чарнабога. Але іх погляды маюць адзін вельмі істотны слабыбок. У сваіх працах ніякіх дадатковых звестак па беларускай міфалогіі яныне прыводэяць. Сапраўды, думку аб тым, што Белбог быў вядомы толькі ў беларускайміфалогіі, выказваў А.Кіркор. Апісваючы багатыя фальклорныя крыніцы, ёнсцвярджаў, што, паводле беларускіх народных павер'яў, Белбог ушаноўваўся як"прабог" – бог, які даў чароўны молат Перуну для барацьбы з богам зла –Чарнабогам (чортам), каб знішчыць апошняга. Паколькі Пярун, паводлебеларускай народнай міфалогіі, быў сынам Белбога, братам Зюзі і Чарнабога,галоўная іерархія беларускіх міфалагічных істот паходзіць ад Белбога.

Пакланенне Перуну як богу вайны і грому было шырока распаўсюджана ваўсходнеславянскім свеце і было асабліва папулярнае сярод князёў і іхдружыннікаў, якія звярталіся да яго як да сілы, якая забяспечвае перамогу ўбітве. Папулярнасць не была, аднак, прыкметай вяршэнства нейкага бажаства:культ Дажбога-Хорса, бога сонца, усяго толькі сына магутнага Перуна,карыстаўся намнога большай пашанай у старажытнабеларускай міфалогіі, чымяго бацька.

Апісанне Белбога, або Белуна, даецца павярхоўна, мімаходзь. Ён быў"прабогам" – гэта значыць першасным бажаством, персаніфікацыяй сіл

неба.Паводле сцвярджэння А. Кіркора, які спасылаецца на беларускія павер'і,"Бялун часта абходзіць свет і з'яўляецца ў выглядзе старога э доўгай белайбарадой, у белым плашчы, з кіем у руцэ". Ён заўсёды спачувае людзям інічога не робіць, акрамя дабра. Бялун можа э'явіцца толькі днём, калісвеціць сонца. Калі ён сустрэне спадарожніка, які заблудзіўся ў лесе, ёнпакажа яму правільную дарогу.

Афанасьеў лічыў, што з гэтай легендыпаходзіць беларуская прымаўка: "Цёмна у лесе без Белуна".Цікавая легенда пра тое, як Бялун стварыў сусвет. Аднойчы Бог багоўубачыў шар, які плыў міма яго. Адтуль чулася жалобнее мяўканне.

Пацікавіўшыся, хто там, ён даведаўся, што у шары знаходзіцца таксама бог,толькі рангам меншы. Вязень прасіў вызваліць яго. Бог багоў, заўсёдыдобразычлівы, выканаў яго просьбу, шар разарваўся на кавалкі, і адтульвылез дэман (магчыма, Чарнабог). Бялун расказаў дэману пра свае імкненнестварыць сусвет і загадаў яму спусціцца на дно мора, каб узяць там жменюзямлі. Дэман падпарадкаваўся. Але пакуль ён спускаўся, яму ў галавупрыйшла думка, што ён сам мог бы стварыць сусвет. Таму ён узяў у прыгаршчы зямлі з дна мора, а яшчэ крыху схаваў у роце, каб выканаць свой план.Вярнуўшыся да Белуна, дэман аддаў зямлю Богу багоў. Тады Бялун скамандаваў:"Зямля, расці!" Жменька зямлі начала расці і расці і ператварацца ў сушу.Але у гэты час зямля, якую дэман схаваў у роце, таксама пачала расці, шчокіяго раздзьмуліся, і зямля пачала выпіраць з рота. Спалоханы дэман кінуўсянаўцёкі, пакідаючы за сабой дарожку зямлі, якая сфарміравала горы іпагоркі. Беларускія сяляне на Палессі расказваюць, што калі дэман дасягнуўіх краіны, дык яго запасы у роце скончыліся, а таму іх зямля эасталасянізіннай і ўтварыліся балоты вакол Прыпяці.

Некаторыя народныя паданні расказваюць аб дабраце Белуна. У час жніва ёнлюбіў з'яўляцца на нівах і дапамагаць жнеям. Іншы раз ён мог і пажартаваць,але эаўсёды незласліва. Ён мог падысці з кашальком, прывязаным да носа, дадобрага работніка або работніцы і папрасіць выцерці яму нос. Калі той гэтарабіў, кашалёк раскрываўся, з яго сыпалася золата, а Бялун знікаў. НаБеларусі людзі і цяпер гавораць аб удачлівым чалавеку: "Мусіць, ёнпасябраваў з Белуном".

Выказваюцца меркаванні, што Белбог-Бялун меў трох сыноў: Перуна, Зюэю іЧарнабога. Аб Чарнабогу, богу зла, ужо ўпаміналася. Ён быў мужам Мараны,багіні смерці. Аб атрыбутах і справах Чарнабога вядома мала, за выключэннемтаго, што ён уступіў у барацьбу з богам Перуном, які перамог Чарнабога прыдапамоэе магічнага молата, што падарыў яму бацька, Белбог-Бялун. Памяць абім захавалася у народнай песні: "Быў на Русі Чорны бог".

Зюзя быў жахлівым богам зімы. У народных творах расказваецца аб ім якпачварным старым з доўгай сівой барадой. Ён ходзіць, апрануты у белы доўгікажух, босы і без шапкі, трымаючы у руцэ жалезны посах або жазло.Разгневаны, ён стукаў па ствалах дрэў сваім посахам, збіваючы снег і лёд,прымушаў зіму накрыць халоднай посцілкай зямлю.

Пярун - бог грому, вайны і мужчынскай доблесці, быў вядомым богам сяродваяўнічых славянскіх плямён. Тым, да каго Пярун ставіўся добразычліва, ёндараваў перамогу ў баі. Сам жа ён перамог свайго злога брата Чарнабога.Беларускі фальклор апісвае Перуна як істоту вялікага росту, з чорныміваласамі і залатой барадой, якая трымае ў руках два вялікія камяні аджорнаў, б'е імі адзін аб адзін – магчыма, для таго, каб выклікаць гром.Калі ён разгневаецца, можа параніць і забіць кожнага, хто асмеліццазняважыць яго.

Жонка Перуна насіла імя Жыва. Вядома яна таксама як Цёця, Грамавіца,Каляда. Яе ўшаноўвалі як багіню вясны і ўрадлівасці і ўяўлялі як прыгожуюжанчыну з вянком са спелых каласоў пшаніцы на галаве і з садавіной у руках.

Яна вельмі добразычлівая і спачувае людзям. У адным міфе расказваецда аб яедабраце і спагадзе. Зірнула неяк аднойчы Жыва-Грамавіца з неба на зямлю іўбачыла, як людзі пакутуюць пад жорсткім і суровым кіраваннем Зюзі. Жывазлітавалася над людзьмі і спусцілася з неба на зямлю, каб нарадзіць сынаПеруну – Дажбога-Хорса, бога сонца, які ўступіць у барацьбу з Зюэяй іперраможа яго. Калі Зюзя даведаўся пра задуму Жывы-Грамавіцы, ён перакінуўсяу мядзведзя і сабраў злых духаў-вягроў (завеяў), якія ператварыліся у зграюваўкоў. Са сваімі драпежнымі памочнікамі Зюзя кінуўся праз гурбы снегу, каабзлавіць Грамавіцу і знішчыць яе дзіця. Каб уцячы ад пагоні, Жыва-Грамавіцаперакінулася ў белую казу і схавалася ў кусце вярбы. Там яна нарадзіласвайго сына Дажбога. Юны Дажбог-Хорс, бог сонца, вырас смелым і мудрым і стаў вядомы як бог,які дарue дастатак і багацце. Разам са сваім бацькам Перуном ён быў адным зсамых папулярных багоў сярод усяго ўсходнеславянскага свету. Яго імяўпамінаецца ў летапісах. Ён ажаніўся з багіняй вясны Ладай-Лёляй.

Лада была дачкой марскога бога, Цара-Мора. Яна была белая з твару, здоўгай залатой касой. Яна плавала па моры у залатой лодцы, грэбласярэбраным вяслом. Аднойчы, калі Дажбог нахіліўся з неба, каб паназіраць заей, яна жартаўліва пырснула на яго вадой. Дажбог закахаўся ў Ладу іспусціўся на зямлю, каб папрасіць у Цара-Мора рукі яго дачкі. Але бог морараазгневаўся на Дажбога і біў яго да таго часу, пакуль той не страціўпрытомнасць. Аднак Дажбог ачуняў, уцёк ад Цара-Мора і вырашыў заваявацьЛаду, нягледзячы на супраціўленне яе бацькі. Яго надзейны слуга, які добраведаў усе жаночыя слабасці, прыдумаў план дзеяння. Ён раскідаў уздоўжузбярэжжа дарагое ўбранне і прывабныя зялёныя чаравічкі, якія такпрыцягнулі ўвагу юнай багіні, што яна падплыла да берага, каб узяць іх. Яктолькі яе лодка дакранулася да пяску, слуга Дажбога схапіў яе і адвёз дасвайго гаспадара. Закаханыя пажаніліся, і Ладу з-за яе прыгажосці сталіназываць Ляля, або Леля .

Дажбог і Лада мелі сына, Ярылу, які стаў богам палёў, урадлівасці,доблесці і кахання. Яго нашы продкі ўяўлялі як прыгожага юнака ў белымплашчы і з вянком кветак на галаве. Ён ездзіў вярхом на белым кані зкалоссем у руках.

Па загаду сваей маці ён адчыняў нябесныя вароты і спускаўся на зямлю.Яго прыход азначаў пачатак вясны. Яго жонкай была Вясна, багіня вясны,цеплыні і грацыі.

У сувязі з яго роляй прадвесніка вясны ў гонар Ярылы на Беларусідзяўчаты на Ляльнік або на Юр'е ці у нядзелю ў канцы красавіка апраналісамую прыгожую дэяўчыну як Ярылу ў доўгі белы плашч і накладвалі на галавувянок з кветак. Яна сядзела набелым кані, а дзяўчаты ішлі карагодам ваколяе і спявалі:

А дзе ён нагою,
Там жыга капою.
А дзе ён зірне,
Там колас зацвіце.

Сярод багоў стыхіі можа быць упамянуты бог месяца Волас-Вялес, аб якімзгадваецца ў летапісах як пра апекуна пастухоў і абаронцу кароў і авечак.Малявалі яго звычайна як мужчыну, які трымае у руках тузін валынак, а тамуўзнікла павер'е, што ён апекаваў спевакоў і паэтаў. Яго жонка была вядоманад іменем Дзянніца.

Сварог быў богам неба і агню. Яго часта атаясамлівалі з Дажбогам,лічылі, што гэта імя – адзін з эпітэтаў Сварога. Яго сын, Сварожыч, богсонца.

Купала быў другім богам сонца, магчыма, богам летняга сонцазвароту. Ёнбыў блізка звязаны з бажаством меней вядомым - з Янам, чыё імя шматкратнапаўтараецца ў народных песнях, напрыклад, такой, як "Сёння – Купала, азаўтра – Ян" .

У супрацьлегласць Сварогу, Карачун быў богам падземнага свету, носьбітамсмерці, хоць яго часта блытаюць з богам зімы, Зюзяй. Жыжаль ушаноўваўся якбог падземнага агню.

Багіня Пагода распараджалася надвор'ем, хоць яна была, як нам здаецца,багіняй яснага надвор'я. З другога боку, Пасвіст быў богам кепскага,хмурнага надвор'я.

Існуе некаторая палеміка ў адносінах да атрыбутаў Стрыбога. У "Слове абпалку Ігаравым" ён апісаны як бог вятроў, хоць у беларускай міфалогіі ёнз'яўляецца богам вады.

Сярод багоў, якія аказваюць добры ўплыў, знаходэіцца Лад, бог вясны,кахання, шлюбу і грацыі, які ў некаторай ступені быў звязаны з Ярылам. БогТур, магчыма, быў звяэаны з Ярылам і Ладам, але па прычыне малавядомасціатаясамліваўся з богам Аўсенем, аднак яго ўшаноўвалі як бога сілы іўрадлівасці. Другім богам ўрадлівасці, плену і дастатку быў Спарыш. Ягояшчэ называлі Багач, або Рой, хоць гэтыя назвы маглі быць і сінонімамінейкага яшчэ аднаго бога ўрадлівасці. Рада была багіняй мудрасці і добрайпарады.

Назавём некалькі багоў, якія шкодэяць чалавеку. Сярод іх найбольш вядомыЯшчур, які быў богам хвароб і эпідэмій. Яго імя да гэтага часу ўжываецца ўбеларускай мове для абаэначэння інфекцыйнага захворвання жывёлы.

Паландра  была багіняй усялякай шкоды, гніення і заразнай трасцы.

Да нас дайшлі імёны некалькіх багоў-апекуноў. Ужо ўпамінаўся богпастухоў, Волас-Вялес. Багіня Макоша называецца ў летапісах, але пра яевядома няшмат. Думаюць, што яна была апякункай стрыжкі авечак і прадзеннянітак.

Ахоўнікам палёў быў бог Жыцень - бажаство восені, якога ўяўлялі увобразе худога маленькага старога з суровым тварам, трыма вачыма і валасаміз кудзелі.

Пасля багоў міфічнай іерархіі некалькі слоў трэба сказаць пра ніжэйшыхдухаў, дэманаў і фей, чые імёны да гэтага часу сустракаюцца ў беларускімфальклоры. Шматлікія духі па-рознаму ставяцца да людзей: адны з іхпрыхільныя да чалавека, другія – бясшкодныя, трэція – злыя. Яны традыцыйнажывуць у беларускіх сялібах.

Хатнік быў дамашнім духам. Яго ўяўлялі як барадатага і доўгавалосагачалавечка у каптане, падпаясаным поясам. Ён уставаў рана і пужаў пеўня датаго часу, пакуль ён не пачынаў кукарэкаць і будзіць гаспадара, каб тойішоў на работу. Хатнік жыў на печы або пад печчу.

Хлеўнік быў злосным духам, які мучыў ноччу жывёлу ў хлеве, асабліваконей, ездзячы на іх вярхом да знямогі. Ён баяўся сарок.

Чур, або Шчур, быў хатнім сямейным добразычлівым духам, які ахоўваўкапцы і межы родавых зямельных уладанняў. Беларускае закліканне "Чур мяне?"– гэта зварот да Чура, каб ён абараніў ад нячыстай сілы. Назва Шчурпаходзіць ад слова "прашчур" – далёкі продак. Ёсць падстава думаць, штоПрашчур, або Чур – родавае бажаство, пачынальнік роду, які і пасля смерціахоўвае свой род, сваю сям'ю. Яшчэ адзін дамашні добраэычлівы дух – Дамаст.

Дзедзя-Дзедка, дух агню, быў подобны на маленькага старэнькага чалавечкапамерам з ногаць вялікага пальца. З ім звязана старая прымаўка: "Чырвоныдзедзя па жэрдачцы едзе". Дух Кон быў магутнай істотай, якая нагадвалафатаў у рымлян. Ён прадказваў будучыню ўсіх, нават багоў, а таму займаўганаровае месца сярод міфічных істот. Лясун быў лясным духам, а Палясся

Іншыя духі былі настроены менш добраэычліва да чалавека. Так, Кадук –злосны дух, які прыносіць няшчасці. Копса была магільным духам. Мара былазлоснай істотай, яна заблытвала падарожнікаў і турбавала сонных. Начніцы –злосныя начныя чарцяняты. Злыдні – карлікі, якія прыносяуь усе няшчасці.

Чорт Перапалох – дух сполаху. Пра яго этнографы сабралі шмат замоў ізаклінанняў. Трасца-Чухна – дух гарачкі (хваробы), тады як Змора -- дэман,які насылае на сонных людзей кашмары.

Вывучаючы беларускую міфалагічную спадчыну, можна з упэўненасцю сказаць,што яна далека не бедная. Больш таго, усе бажаствы, за выключэннем Перуна,былі ў асноўным мірнымі, а таму беларускі Алімп толькі адлюстроўваўхарактар беларускага народа. Аднак у продкаў беларусаў не было уніфікаванайміфалагічнай сістэмы, блізкай да той, якую мы знаходзім у

скандынаўскай“Эддзе”, нямецкай “Песні аб Нібелунгах” або фінскай “Калевале”. Беларускаяміфалогія захавалася фрагментарна, яе пазнейшае развіцце пазбаўленасістэмнасці. Такое здарылася таму, што адбылася эвалюцыя рэлігійныхвераванняў людзей ад монатэізму да адной з форм політэізму і пазней сталасявынікам моцнага ўпадку язычніцтва пасля прыняцця хрысціянства.

Замовы (ці як іх у народзе яшчэ называюць — загаворы, нагаворы, шэпты) — гэта славесныя формулы, якім надавалася магічнае значэнне. Замовы — від народнай творчасці, які у сучасны момант у жывым бытаванні амаль не сустракаецца.У мінулым, замовы былі шырока распаўсюджаны ў быце і мелі чыста ўтылітарнае значэнне: з дапамогай слова, магічнага дзеяння ператварыць жаданне ў рэальнасць — падобным выклікаць падобнае.Нягледзячы на пашыранасць сярод сялянства, замовы больш за ўсё знаходзіліся на ўзбраенні вузкай групы людзей — «прафесіяналаў», так званых шаптуноў, чараўнікоў, ведзьмароў, якія з мэтай замацавання ў насельніцтва веры ў магічную сілу слова нярэдка выкарыстоўвалі рацыянальныя сродкі народнай медыцыны, чым забяспечвалі больш устойлівае месца гэтаму віду творчасці ў народзе.

Прынята дзяліць замовы на некалькі тэматычных груп:

- першая група — замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (паляванне, рыбацтва, пчалярства, збор ягад, грыбоў, захаванне жывёлы, ураджаю);
- другая група — замовы супраць хвароб (ліхаманка, зубны боль, укус змяі, шал і г. д.);
- трэцяя група — замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі і прыватным бытам (сюды адносяцца і прысушкі і адсушкі — любоўныя замовы);
- чацвёртая група — замовы, звязаныя з грамадскімі адносінамі, і г. д.

Замовы каштоўныя тым, што ў іх знайшлі адлюстраванне многія бакі гаспадарчага, грамадскага і духоўнага жыцця чалавека. Яны з'яўляюцца помнікамі мастацкага слова народа. Па эстэтычна-эмацыянальных вартасцях, паэтычнаму майстэрству, вобразнасці мовы замовы стаяць побач з іншымі фальклорнымі жанрамі і складаюць цікавую частку вуснай спадчыны народа.

Вусная народнасць творчасць, фальклор увогуле выконваюць вялікую ролю ў выхаванні нацыянальнай свядомасці беларусаў.

Дзіцячы фальклор уключае самыя розныя вуснапаэтычныя жанры славеснай і музычнай народнай творчасці — казкі, песні, прыпеўкі, загадкі, калыханкі, забаўлянкі, лічылкі, скорагаворкі, заклічкі, гульні і іншае, складзеныя самімі дзецьмі або дарослымі для дзяцей. У дзіцячы рэпертуар перайшлі і некаторыя творы, складзеныя дарослымі для дарослых. Жанравая разнастайнасць і асаблівасці дзіцячага фальклору абумоўлены функцыяй, якую ён выконвае як сродак разумовага і фізічнага выхавання дзіцяці ў розныя перыяды яго жыцця. Творы дзіцячага фальклору вельмі простыя па форме і зместу, і ў іх звычайна прысутнічае элемент займальнасці.

Прынята дзіцячы фальклор дзяліць на некалькі груп: 1) калыханкі; 2) творы, звязаныя з гульнёй; 3) творы, не звязаныя з гульнямі і рухам.

Калыханкі — адзін з самых старадаўніх відаў творчасці; вядомы ўсім народам. Галоўная функцыя калыханак — супакойванне дзіцяці, каб яно хутчэй засынала, таму іх мелодыя плаўная, спакойная, рытм найболей адпавядае рытму гушканняў калыскі, змест песенек часта аблямаваны характэрнымі запевамі і прыпевамі «а-а-а», «люлі-люлі», «лялі-лялі», «баю-баю» і інш.

Будучы старадаўняй творчасцю, калыханкі багата захавалі элементаў язычніцтва, магіі. Прырода ў іх адухоўлена, птушкі, звяры і жывёлы надзелены чалавечымі якасцямі. Часцей за ўсё ў калыханках сустракаюцца вобразы ката, мышкі, куркі, голуба, сарокі, зайкі. Характэрнай рысай калыханак з'яўляецца пачуццё пяшчоты, у іх багата матчынай ласкі і любві, цеплыні і замілавання дзіцем. Калыханкі хаця і манатонныя, але светлыя песні. У іх адбілася душа маці, цэлая карціна чалавечага жыцця. Гэта песні і аб сне, які малюецца жывой істотай, што ў выглядзе зморанага спадарожніка блукае па хатах, шукаючы прытулку.

У гульнёвым дзіцячым фальклоры адпаведна ўзросту дзіцяці можна вылучыць розныя творы. Тыповую групу складаюць забаўлянкі, якімі маці ці бабулькі, перабіраючы пальчыкі ручак і ножак маленькіх, супакойвалі ці пацяшалі іх. Функцыя забаўлянак процілеглая калыханкам: яны павінны весяліць, забаўляць дзіця, узбуджаць яго, рабіць бадзёрым. Пацешкі выконвалі і вялікую педагагічна-выхаваўчую ролю, прывучалі дзяцей разумець дабро, быць праўдзівымі, добрасумленнымі, працавітшы. Праз забаўлянкі дзеці атрымлівалі першыя ўрокі маральнаэтычных паводзін чалавека ў грамадстве, засвойвалі мараль, выпрацаваную народам на працягу стагоддзяў.

Найболей народная педагогіка выявілася ў гульнях-песнях з прыпеукамі, жараб ёўкамі, лічылкамі, скорагаворкамі. Песні-гульні развівалі ў дзяцей сілу, спрыт, трапнасць, прывучалі да кемлівасці, увагі, разважлівасці, назіральнасці; яны аб'ядноўвалі дзяцей, выпрацоўваючы ў іх пачуццё сяброўства, таварыскасці, калектывізму і справядлівасці. Песні-гульні мелі велізарнае значэнне ў мастацка-спартыўным выхаванні дзяцей.

Дзіцячыя песні тэматычна вельмі разнастайныя, што абумоўлена іх функцыяй і паходжаннем. Асабліва вылучаюцца жартоўныя песні і песні-небыліцы, якія ў сваіх вытоках узыходзяць да фальклору дарослых — песень сацыяльных, сямейна-бытавых, хрэсьбінных, гумарыстычных і сатырычных твораў. Дзівосны свет птушак, жывёл, звяроў, якімі населена жартоўна-сатырычная песнятворчасць, захапляў дзяцей неверагоднасцю падзей, незвычайнасцю паводзін персанажаў. Параўноўваючы, супастаўляючы незвычайнасць ці недарэчнасць паводзін фальклорных персанажаў з акаляючай рэчаіснасцю, дзеці, такім чынам, уцягваюцца ў працэс актыўнага мыслення: самастойна адкрываюць, устанаўліваюць заканамернасці, лагічную сувязь рэчаў, іх рэальны стан.

Творы, не звязаныя з гульнёй, уласна, таксама гульнёвыя творы. Іншая справа, што ў іх увага накіравана не на рухі і дзеянні, а на выяўленне сэнсу, зместу. Характэрнымі для пазагульнёвага фальклору з'яўляюцца заклічкі, кароценькія вершыкі, песенькі, прыгаворкі, з якімі дзеці звяртаюцца да сонца,

дажджу, вясёлкі, ветра, раслін, жывёл і г. д. У іх, як і ў калыханках, прыкметна захаваліся элементы магіі, сляды язычніцтва.

Скорагаворкі і лічылкі — гэта чыста славесныя гульні. Характэрнай рысай уласна гульняў з'яўляецца тое, што яны цесна звязаны з вытворчай дзейнасцю чалавека і асабліва з яго земляробчай дзейнасцю. Класіфікацыя гульняў яшчэ канчаткова не выпрацавана, бо іх можна дзяліць у залежнасці і ад зместу, і ад формы, і ад колькасці ўдзельнікаў.

У апошніх працах беларускіх даследчыкаў прапануецца дзяліць дзіцячы фальклор на два раздзелы: гульні як мастацка-драматычнае дзеянне і гульні як сродак фізічнага выхавання.

Дзіцячыя гульні — жывая фальклорная з'ява. І раней і зараз яны перажываюць пастаянныя змены (пад уплывам часу, грамадскага і сямейна-бытавога ўкладу), якія адбіваюцца на іх бытаванні, функцыі і змесце.

Прыказкі і прымаўкі — адзін з самых пашыраных у беларускім фальклоры жанраў. У іх трапна і ярка адлюстравана мудрасць народа, яго багаты жыццёвы і працоўны вопыт, псіхалогія і светапогляд.Прыказкай называецца створанае народам лаканічнае, часцей за ўсё вобразнае, выказванне з павучальным зместам, якое мае прамы і пераносны сэнс. У прыказцы выказваецца закончаная думка, якая можа характарызаваць разнастайныя аналагічныя з'явы.

Прымаўка характарызуецца незавершанасцю думкі, не мае такога абагульняючага значэння, як прыказка, і ўжываецца толькі ў канкрэтных выпадках, каб адцяніць, напрыклад, пэўную рысу чалавека, яго ўчынак, раскрыць сутнасць грамадскай або прыроднай з явы і інш.

Змест вуснай творчасці беларускага народа вельмі багаты. У ей, як у фокусе, сканцэнтравана адлюстроўваецца жыццё, быт, культура, думкі і пачуцці народа. «З бездані часоў дайшлі да нас у гэтых згустках розуму і ведаў жыцця радасць і пакуты людскія, смех і слёзы, каханне і гнеў, вера і бязвер'е, праўда і крыўда, сумленнасць і ашуканства, працавітасць і гультайства, прыгажосць ісцін і недарэчнасць забабонаў»,— пісаў М. Шолахаў аб прыказках у прадмове да зборніка У. Даля.

Беларускія народныя прыказкі і прымаукі дакастрычніцкага часу крытыкуюць сацыяльную несправядлівасць, якая панавала ў класавым антаганістычным грамадстве, выкрываюць эксплуататарскую сутнасць царызму, царквы і рэлігіі, паказваюць невыносна цяжкае становішча працоўных, паразітычнае існаванне паноў, папоў, купцоў і капіталістаў. «Адзін з сошкаю, а сямёра з ложкаю», «Адзін сыцее — дзесяць пацее»,— трапна гаворыцца ў прыказках аб сацыяльнай няроўнасці ў дакастрычніцкай Расіі. Народ бязлітасна ганьбуе жорсткасць, скупасць, дэспатызм багацеяў: «Багаты — рагаты: усе глядзіць, каб каго збіць», «Багаты і вока аддасць свае за золата», «Бедны пот лье, а багаты яго кроў п'е»; выкрывае хабарніцтва і несправядлівасць царскіх суддзяў: «Калі на табе кажушок ліхі, то суддзя глухі», «Пан і тады праў, як сведак чорт маў»; крытыкуе прагнасць, ілжывасць, амаральнасць і крывадушша папоў і ксяндзоў: «У папа, кажуць, дзве рукі: адна

— што хрысціць, другая — што бярэць, а той, што дае,— няма», «У папа пуза таўсцее, а ў мужыка спіна млее», «У цябе праўды, як у ксяндза з папом» і інш.

Шматлікія прыказкі і прымаўкі адлюстроўваюць пэўныя гістарычныя падзеі: «Наша Бяроза чужых і генералаў тапіць можа», «Пякуцца французы, бы бульба ў прыску».

Тэматыка прыказак і прымавак разнастайная, у іх адлюстраваны адносіны паміж людзьмі ў грамадстве, стыхійна-матэрыялістычны светапогляд народа, яго мараль, любоў да Радзімы, нянавісць да ворагаў, сямейны быт, працоўны каляндар, прыродныя з'явы і прыкметы і г. д.

Нягледзячы на лаканічную форму, прыказкі заключаюць у сабе багаты асацыятыўны змест, адлюстроўваюць мудрасць народа.

Глыбокія і мудрыя думкі адлюстроўваюцца ў прыказках у высока-мастацкай форме. Прыказка вызначаецца дасканалай будовай: яна часцей за ўсе рытмічна стройная, рыфмаваная, кампазіцыйна двухчленная.

Стварэнню яркага ёмістага вобраза садзейнічаюць розныя паэтычныя мастацкія сродкі. Шырока ўжываюцца ў прыказках сінтаксічны паралелізм, антытэза: «Аднаму аж з горла прэ, а другі з голаду мрэ», «Адным кірмаш, а другім жыцця нямаш», «Адны гаруюць, другія пануюць»; разгорнутыя і простыя параўнанні: «Свая хатка, як родная матка», «Крамар, як камар: дзе сядзе, там і п'е»; сінекдаха, метанімія, метафара і г. д.

Асабліва пашырана ў прыказках іронія (напрыклад, «Поп «праведна» жыве: з беднага дзярэ да ў свой карман кладзе»). Сацыяльныя тыпы ствараюцца з дапамогай гіпербалы, алегорыі і іншых мастацкіх сродкаў («У пана горла — прорва: тысяча працуе, а ён адзін прагарцуе», «У папоўскай кішэні з галавой схаваешся»). Часта, каб падкрэсліць сацыяльную няроўнасць у антаганістычным грамадстве, у прыказках карыстаюцца прыемам кантрасту: «Пакуль з багатага пух, дык з беднага дух».

Разнастайныя мастацкія сродкі, рытміка і рыфма звязваюць прыказку ў адзінае цэлае. Дасканала і мудра збудаваная, яна жыве сотні год. Напрыклад, у прыказцы «Багатаму і ў полі родзіць, і ў хляве плодзіць, а беднаму дзе ні кінь, то клін» усе элементы выказвання цесна звязаны не толькі антытэзай, але і рыфмай, якая перш за ўсё знітоўвае прыказку і дапамагае лепшаму яе запамінанню.

Шырока ўжываюцца прыказкі і прымаўкі ў творах пісьменнікаў і паэтаў, якія, у сваю чаргу, папаўняюць скарбніцу народнай мудрасці.

Яркім сведчаннем таго, як выкарыстоўваліся беларускія прыказкі ў старажытныя часы ў перапісцы, з'яўляюцца лісты аршанскага старасты Філона Кміты-Чарнабыльскага, напісаныя ім у 1573—1574 гг. Прыказкі, прыведзеныя ў лістах,— гэта па сутнасці адны з першых фальклорных твораў, якія дайшлі да нас у запісах.

Сістэматычныя запісы беларускіх прыказак і прымавак пачаліся ў XIX ст. Асабліва каштоўныя зборнікі афарыстычных твораў апублікавалі ў дакастрычніцкі час І. І. Насовіч, Я. А. Ляцкі, М. Я. Нікіфароўскі. Багатая калекцыя народных прыказак і выслоўяў была падрыхтавана таксама А. К. Сержпутоўскім. Але найбольш значны па аб'ёму зборнік беларускіх прыказак і

прымавак быў надрукаваны ў 1935 г. у Варшаве (запісы М. Федароускага, каля 10 тысяч). У савецкі час найбольш поўныя. зборы прыказак апублікавалі Ф. Янкоўскі і Я. Рапановіч.

Загадка — кароткае паэтычна-вобразнае апісанне прадмета або з'явы, якое даецца, як правіла, у форме пытання і адгадваецца па другарадных адзнаках, па прыкметах падабенства.

Загадка, як і прыказка, прымаўка і частушка, адносіцца да фальклорных жанраў малых форм. Лічыцца, што галоўная функцыя загадкі — развіваць у чалавека мастацка-вобразнае мысленне, паэтычны погляд на рэчаіснасць. У мінулым загадка служыла сродкам выпрабавання разумовых здольнасцей, іншасказальная, загадкавая форма з поспехам выкарыстоўвалася ў ваенных і пасольскіх справах. Загадкі, песні-загадкі надзвычай шырокл ўжываліся ў вясельных абрадах, напрыклад, з мэтай «праверкі» разумовай сталасці жаніха.

У побыце дарэвалюцыйнага сялянства загадка займала важнае месца. Доўгімі зімовымі вечарамі моладзь і старэйшыя людзі, сабраўшыся ў якой-небудзь хаце, арганізоўвалі займальныя спаборніцтвы загадчнікаў. Яна пашырала кругагляд чалавека, развівала яго фантазію, кемлівасць, назіральнасць, трэніравала памяць, прывучала да развагі, аналізу. Раскрышчё затоенага сэнсу загадкі было працэсам, які нёс вялікую выхаваўчую ролю: у чалавека складваліся, замацоўваліся і паглыбляліся пэўныя веды аб навакольным свеце. Загадка перадае змест праз высокі мастацкі вобраз, поўны часам нечаканых параўнанняў, супастаўленняў, збліжэнняў і паваротаў.

Цяпер гэты старажытны жанр страціў сваю сур'ёзную актыўна-грамадскую функцыю і стаў сродкам забавы і пацехі — творчасцю дзяцей і для дзяцей.

Каштоўнасць традышыйнай загадкі ў тым, што яна ў высокапаэтычнай форме адлюстравала гаспадарчую і працоўную дзейнасць чалавека, яго жыццёвы вопыт, быт, працу, фауну, флору, будову сусвету і да нашых дзён мае вялікае эстэтычна-мастацкае значэнне для выхавання дзяцей.

У кожнага народа спрадвеку вёўся каляндар. 3 пакалення ў пакаленне ў імперадаваліся веды, мудрасць, вопыт жыццёвых назіранняў, Такі каляндар меліі продкі беларусаў. Абапіраючыся на бацькоўскія традыцыі і веру, людзітрымалі ў памяці шматлікія парады і забароны. Сяляне ведалі, калі можнабыло брацца за тую ці іншую працу, а калі, наадварот, адкласці яе, каліможна весяліцца, а калі ўстрымлівацца ад забаў.

Старажытныя славяне карысталіся язычніцкімі мерамі часу, у тым ліку ісонечна-месяцавым календаром. Земляробчыя святкаванні Новага года настаражытных беларускіх землях вядомы вясной, летам, восенню і зімой. Гэтыдзень прыстасоўваўся звычайна да адпаведнага становішча свяціл на небе –сонца, месяца, асобных зорак. Такі дзень вызначалі "пасля поўні", якгаварылі у народзе, у першы маладзік пасля веснавога раўнадзенства (20 - 21сакавіка), летняга сонцастаяння (21-22 чэрвеня), асенняга раўнадзенства (22-23 верасня) і зімовага сонцастаяння (21 -22 снежня).

Гісторыя змен у календары, асабліва тых, якія звязаны а перанясеннемсвяткавання Новага года, няпростая. 3 прыняццем

хрысціянства славянепрынялі юліянскае летазлічэнне па візантыйскім ўзоры. Аднак Новы год пачыналі не з 1 верасня, як у Візантыі, і не з 1 студзеня, як у Рыме, авясной – 1 сакавіка. У беларускім народным календары адлюстраваліся светапогляд селяніна, ягоглыбокае веданне прыроды і любоў да яе, цягавітасць да працы.

Каляндарна-абрадавая паэзія, або паэзія земляробчага календара, належыць да самых старажытных пластоў народна-паэтычнай культуры. Вытокі каляндарна-абрадавай паэзіі ў родавым грамадстве. Наглядаючы змены пор года, біялагічныя цыклы ў развіцці раслін і жывёл, старажытны чалавек, моцна залежны ад прыроды, імкнуўся ўплываць на яе: запабегнуць злым сілам, выклікаць урадлівасць нівы, спор і прыплод у гаспадарцы. Жаданага спадзяваўся дасягнуць праз абрадавыя дзеянні і словы, у магічную, цудадзейную моц якіх шчыра верыў. І хоць вера ў магчымасць словам і адпаведнымі абрадамі ўздзейнічаць на навакольны свет складае значны момант народна-паэтычных уяўленняў, не яна вызначае змест і сэнс аднаго з найбольшых, прынамсі ў беларусаў, раздзелаў народна-паэтычнай творчасці. Практычная гаспадарчая дзейнасць земляроба на працягу працоўнага года, грамадскі быт ляжаць у аснове песень гадавога круга. Гэта паэзія зямлі ў самым непасрэдным сэнсе слова. Назіранні над кругаваротам у прыродзе і земляробчай працай, залежнай ад пор года, склаліся ў цэлую сістэму поглядаў, своеасаблівы гаспадарчы каляндар. Ён уключыў у сябе рад святкаванняў аграрнага характеру, уласцівыя ім абрады, багатае песеннае суправаджэнне, прыкметы і інш. Пазней хрысціянства ў барацьбе з язычніцтвам імкнулася прыстасаваць свае святкаванні да старажытнага земляробчага календара. Залежнасць жыцця і працы селяніна ад прыродных стыхій вымушала яговыконваць разнастайныя абрады, прымеркаваныя да пэўных надзей, строгарэгламентаваныя часам. Адпаведна чатыром парам года існавалі чатыры вялікіясвяты, вакол якіх групаваліся іншыя. У сваю чаргу асноўныя святы прыблізнанакладваліся на астранамічныя перыяды, якія былі звязаны з сонцастаяннем ціраўнадзенствам. Увесь земляробчы каляндар трымаецца на цыклах: зімой —Каляды, вясной – Вялікдзень, летам — Купалле, некаторыя іншыя святы,восенню — Дзяды, Пакровы.

Такім чынам, беларускі народны каляндар з'яўляецца адной з формдухоўнага жыцця беларусаў. Доўгія стагоддзі паэтычная творчасць народабытавала толькі ў вуснай форме, перадаючыся з пакаленняўу пакаленне.Сістэма свят, абрадаў, гульняў, што замацаваны у побыце і народнайтворчасці беларусаў, была арыенцірам пры выкананні сельскагаспадарчых работі адпачынкаў у гадавым, сезонным, мясцовым цыклах.

Важнае месца ў фальклорнай спадчыне беларускага народа належыць апавядальным жанрам — казкам, легендам, паданням, вусным сказам, анекдотам. Гэты разнастайны ў жанравых адносінах мастацкі матэрыял па характеру мастацкай выдумкі, адносінах да рэчаіснасці і асаблівасцях яго адлюстравання ў розных творах можна падзяляць на тры групы.

Да першай адносяцца казкі і анекдоты, да другой — легенды і паданні і да трэцяй — розныя віды вуснага народнага апавядання: вусныя сказы, успаміны і г. д.

Сярод апавядальных жанраў беларускай вуснапаэтычнай творчасці шырынёй ахопу жыццёвых з'яў, глыбінёй абагульнення, яркасцю створаных вобразаў вылучаюцца казкі. Тэрмін «казка» аб'ядноўвае розныя па форме і зместу апавядальныя творы: пра жывёл і птушак, пра фантастычных пачвар і непераможных асілкаў, пра кемлівага сялянскага сына Несцерку і ненажэрных крывасмокаў-паноў, пра хітруна-злодзея і служкаў культу, пра мудрую дзяўчыну і языкатую жонку і інш. Такая разнастайнасць матэрыялу вельмі ўскладняе задачу фалькларыстаў даць гранічна акрэсленае азначэнне гэтага жанру. Сярод розных, але ў асноўным блізкіх паміж сабой азначэнняў казкі, якія прыводзяцца у навуковай літаратуры, найбольш прыдатным можна лічышь наступнае: казка — гэта мастацкае вуснае апавяданне сацыяльна-бытавога, фантастычнага або авантурна-навелістычнага зместу, якое адлюстроўвае рэчаіснасць пры дапамозе мастацкай выдумкі і заключае ў сабе дыдактычна-павучальны сэнс.

Казкі ўзніклі ў глыбокай старажытнасці і заўсёды былі непарыўна звязаны з шматгранным жыццём народа, яго барацьбой з сіламі прыроды, а ў класавым грамадстве — за роўнасць, сацыяльную справядлівасць. Казкі як творы сапраўднага мастацтва задавальнялі эстэтычныя запатрабаванні народа і ў той жа час былі важным сродкам пазнання навакольнага свету і абагульнення працоўнага вопыту многіх пакаленняў, а таксама сродкам выхавання.

Класіфікацыя казак даволі ўмоўная. Звычайна іх падзяляюць на казкі аб жывёлах, чарадзейныя або міфічныя і сацыяльна-бытавыя. Кожная з груп беларускіх казак вылучаецца сваімі асаблівасцямі зместу, сістэмай вобразаў, характэрнымі прыёмамі мастацкага адлюстравання рэчаіснасці. Усім ім уласціва высокае паэтычнае майстэрства. Беларускія казкі маюць шмат агульнага з казкамі іншых народаў, асабліва славян, але ў той жа час узбагачаюць казачны эпас славянскіх народаў новымі сюжэтамі, ідэямі, вобразамі.

Казкі аб жывёлах адрозніваюцца ад астатніх груп казачнага эпасу тым, што галоўнымі персанажамі ў іх з'яўляюцца жывёлы, птушкі і нават расліны: ліса, воўк, мядзведзь, заяц, дзік, кот, баран, певень і інш, Частка гэтых твораў узнікла вельмі даўно, калі чалавек быў амаль у поўнай залежнасці ад сіл прыроды і ў сваім уяўленні надзяляў жывёл, расліны, з'явы прыроды рознымі незвычайнымі якасцямі, а таксама некаторымі якасцямі людзей. У гэтых першых казках мы чуем, па словах М. Горкага, водгукі працы над прыручэннем жывёл, над адкрыццём лекавых траў, вынаходніцтвам прылад працы. Пазней, у класавым грамадстве, казкі аб жывёлах набылі новы змест. Разам з трапнымі назіраннямі над навакольнай прыродай у гэтых казках у алегарычнай форме правільна перададзены адносіны паміж людзьмі, асобныя рысы чалавечых характараў, выкрываюцца заганы грамадства, заснаванага на прыгнечанні чалавека чалавекам.

Чарадзейныя казкі таксама вельмі старажытныя па свайму паходжанню. За доўгі час бытавання ў народзе яны значка змяніліся, але захавалі вобразы міфічных асілкаў (Вярнідуб, Гарыня) і варожых сіл (шматгаловы змей — «Паганы цмок»). Разам з жывымі істотамі ў казках дзейнічаюць сонца, вецер, месяц, мароз, гром. Героям дапамагаюць цудадзейныя прадметы: тапор-самасек, дыван-самалёт, жывая вада, цудоўны збанок. У аснове многіх чарадзейных казак ляжыць сацыяльны канфлікт, які адлюстраваў спрадвечнае жаданне працоўных пазбавіцца ад эксплуатацыі. Характарам асноўнага канфлікта ў такіх творах абумоўлены некаторыя змены ў сістэме вобразаў: тут галоўнымі дзеючымі асобамі з'яўляюцца працоўныя сяляне і іх ворагі — паны.

Да сацыяльна-бытавых казак адносяцца ўласна бытавыя казкі, а таксама антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя творы. Уласна бытавыя казкі малююць селяніна ў яго паўсядзённым жыцці, услаўляюць працавітасць, глыбокі розум, дасціпнасць і сціпласць простата чалавека, асуджаюць гультайства, прагнасць, зайздрасць і іншыя заганы. Многія бытавыя казкі — гумарыстычныя, жартоўныя творы.

Антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя казкі адлюстроўваюць барацьбу сялянства супраць сацыяльнага і рэлігійнага ўціску, рост іх класавай свядомасці. Працягваючы лепшыя традыцыі пераічнага эпасу, народ стварыў у іх каларытны вобраз народнага заступніка. Многія антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя казкі — сатырычныя творы, яны выкрываюць сапраўдны твар прыгнятальнікаў-паноў і служкаў культу.

Па асаблівасцях адлюстравання рэчаіснасці, па характеру мастацкай выдумкі да сацыяльна-бытавых казак набліжаюцца авантурна-навелістычкыя. У шматлікіх варыянтах запісана на Беларусі вядомая многім народам свету авантурная казка. «Клімко» пра знаходлівага, кемлівага селяніна, які ўдала перамагае сваіх праціўнікаў і кпіць над імі, а таксама казкі аб верных і няверных жонках і іншыя падобныя творы.

У наш час казачная традыцыя паступова затухае, але многія казкі трывала захоўваюцца ў народным рэпертуары і па-ранейшаму выконваюць значнуго ролю ў выхаванні падрастаючага пакалення. У апошнія гады ў розных раёнах Беларусі было запісана шмат гэтых твораў, у асноўным казкі пра жывёл і чарадзейныя, якія карыстаюцца асаблівай увагай дзіцячай аўдыторыі. Сучасныя запісы казак не толькі характарызуюць ступень распаўсюджання і захаванасці традыцыйных твораў, але, зробленыя з дапамогай гуказапісваючай апаратуры, даюць магчымасць данесці да чытача казку ў яе натуральным выглядзе, з усімі асаблівасцямі творчай манеры і паэтычнай мовы казачніка. Параўнанне класічных тэкстаў, запісаных у мінулым стагоддзі, з сучаснымі запісамі дапамагае вызначыць характар змен, што адбыліся ў змесце і мастацкіх асаблівасцях народных казак.

Да легенд звычайна адносяць трывала замацаваныя ў фальклорнай традыцыі вусныя апавядальныя творы, у аснове якіх ляжыць фантастычны вобраз або ўяўленне, звязаныя з гісторыяй працоўных або тлумачэннем розных прыродных і грамадскіх з'яў. Легенды — мастацкія творы, але дамінантнай у іх з'яўляецца не эстэтычная, як у казках, а пазнавальная функцыя.

Беларускія легенды разнастайныя па тэматыцы. У апублікаваных запісах прадстаўлены легенды касмаганічныя, этнагенічныя, гістарычныя, апакрыфічныя і інш. У іх адлюстраваны розныя ўяўленні народа, спробы растлумачыць паходжанне сусвету і зямлі, чалавека і жывёл, сутнасць розных з'яў прыроды і грамадскага жыцця. Часам у легендах адчуваецца рэлігійны ўплыў, але ў той жа час многім легендам уласцівы элементы стыхійнага матэрыялізму, у іх асуджаецца эксплуатацыя чалавека чалавекам, сацыяльная няроўнасць, выказваюцца крытычныя адносіны да рэлігійнага вучэння. Асабліва выразны крытычны пачатак у апакрыфічных легендах, якія апавядаюць, як бог і святыя нібыта некалі хадзілі па зямлі. Гэтыя творы поўныя іроніі, у іх персанажы пазбаўлены арэолу святасці, бог і святыя паказваюцца несправядлівымі, помслівымі, амаральнымі («Ілья і Пятро», «Бог і ўгоднікі», «Як п'яніца ў рай папаў» і інш.). Па сваей ідэйнай накіраванасці яны вельмі блізкія да сатырычных антырэлігійных казак і анекдотаў. Ідэйным зместам і высокім мастацкім майстэрствам прыцягвае ўвагу легенда «Вялікі грэшнік», у якой забойства грэшнікам лютага ворага сялян — войта расцэньваецца як справядлівы, гуманны ўчынак, як неабходная і нават святая справа.

У некаторых беларускіх легендах распрацоўваюцца розныя маральнаэтычныя праблемы, сцвярджаецца неабходнасць добрасумленных адносін да працы, справядлівых і добразычлівых адносін паміж людзьмі, але часам гэтыя станоўчыя ідэі атрымліваюць рэлігійную афарбоўку.

Нягледзячы на агульную тэндэнцыю затухання гэтага жанра, у часы Вялікай Айчыннай вайны ўзніклі легенды пра нужных абаронцаў нашай Радзімы, пра партызанскіх камандзіраў Герояў Савецкага Саюза К. С. Заслонава, А. С. Каўпака і іншых.

Па сваей асноўнай функцыі — перадачы выпрацаваных папярэднімі пакаленнямі пэўных ведаў або ўяўленняў — да легенд набліжаюцца паданні. Але калі легенды заўсёды фантастычныя па зместу І ў сувязі з гэтым маюць адпаведную паэтыку, паданні даюць звесткі аб рэальных асобах і сапраўдных падзеях, хаця, натуральна, пры перадачы з вуснаў у вусны аддаляюцца ад першаасновы, жыццёвы матэрыял набывае ў іх паэтычную інтэрпрэтацыю.

Найбольш распаўсюджаныя ў беларускім фальклоры паданні гістарычныя і тапанімічныя, многія з якіх маюць гістарычную афарбоўку. З вуснаў у вусны перадаваліся паданні аб асілках, якія нібыта некалі жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі і пакінулі пасля сябе старажытныя гарадзішчы ды велізарныя каменні з адбіткамі сваіх пальцаў ці рук. Тэма многіх паданняў — барацьба беларускага народа з іншаземнымі захопнікамі. Вядомы таксама шматлікія паданні аб заснаванні розных населеных пунктаў, паданні аб рэках, азёрах, урочышчах і нават асобных збудаваннях. Гістарычныя паданні складаюць важную частку беларускага гераічнага і гістарычнага эпаса.

Анекдот — невялікае вуснае апавяданне з нечаканай дасціпнай развязкай. Да сярэдзіны XIX ст. анекдотам называлі апавяданне аб цікавым здарэнні з вядомай гістарычнай асобай, пазней і ў цяперашні час да анекдота адносяць любое кароткае вуснае апавяданне жартоўнага характару з нечаканай камічнай развязкай.

Анекдот — адзін з тых папулярных у народзе жанраў, які бытуе і цяпер. Як і многія іншыя фальклорныя творы, анекдоты характарызуюцца разнастайнасцю адлюстравання сацыяльных з'яў. Сваім зместам, а часам і структурам анекдоты вельмі блізкія да сатырычных казак і не заўсёды іх легка адрозніць. Важнейшымі спецыфічнымі рысамі анекдота з'яўляюцца яго аднаэпізадычнасць і нечаканасць развязкі, якая заўсёды бывае камічнай і дасціпнай. У сатыры і гумары анекдотаў выяўляецца непрымірымасць народа да ўсяго адмоўнага ў грамадстве і побыце людзей. У дакастрычніцкі час у творах гэтага жанру выкрываўся дэспатызм і жорсткасць, крывадушша і прагнасць паноў, папоў і іншых прыгнятальнікаў працоўных.

Дасціпным гумарам напоўнены шматлікія анекдоты пра палешукоў і маркаўцаў. Па форме і змесце яны нагадваюць рускія анекдоты пра пашахонцаў. Героі гэтых твораў няздатны да самай звычайнай працы, не разумеюць элементарных жыццёвых і бытавых ісцін. Насмешка з герояў носіць мяккі добразычлівы характар. У цяперашні час анекдоты гэтай тэматычнай групы амаль не бытуюць.

Гратэск, карыкатура, эксцэнтрызм («алагізм звычайнага») шырока ўжываюцца ў анекдотах як сродак высмейвання эксплуатататараў (напрыклад, у анекдотах тыпу «Ці была ў папа галава»).

Важнейшай зброяй анекдота з'яўляецца смех, роля якога залежыць ад аб'екта асмяяння: бязлітасна-з'едлівы, калі крытыкуюцца класавыя ворагі, дабрадушна-мяккі, калі крытыкуюцца недахопы саміх працоўных. У анекдоце яскрава адлюстравана мудрасць, дасціпнасць, удаласць беларускага працаўніка, які валодае пачуццём гумару і трапным сатырычным словам змагаецца супраць прыгнёту і амаральнасці.

У дакастрычніцкі час быў апублікаваны невялікі зборнік беларускіх анекдотаў і жартаў «Беларускія жарты» (Мінск, 1915). Шмат беларускіх анекдотаў было змешчана ў зборніках П. В. Шэйна, Е. Р. Раманава, У. М. Дабравольскага, М. А. Федароўскага, А. К. Сержпутоўскага і іншых фалькларыстаў. У савецкі час асобнай кніжкай выдаў анекдоты З. Бяспалы (1970г.).

Гераічны і гістарычны эпас розных народаў свету мае свае асаблівасці. У адных народаў эпас прадстаўлены такімі класічнымі жанрамі, як руны, быліны, думы, гайдуцкія і юнацкія песні, для іншых — такія жанры не характэрны. У беларускім фальклоры няма адзінай, толькі яму ўласцівай формы эпасу. Беларускі гераічны і гістарычны эпас аб ядноўвае творы розных жанраў: казкі і паданні аб асілках і былінных героях, гістарычныя паданні, песні, у якіх адлюстраваны ўяўленні нашага народа аб мінулым, дадзена народная ацэнка розных гістарычных падзей.

13. Народы и культуры: Белорусы / Российская Академия наук; редкол. В.К. Бондарчик [и др.]. – М.: Наука, 1998. – 588 с.

14. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1997. – 287 с.

15. Титов, В.С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов / В.С. Титов. - Мн.: Наука и техника, 1983. – 226 с.

16. Этнография восточных славян. Очерки традиционной культуры / Ю.В. Бромлей [и др.]; под ред. К.В. Чистова. - М.: Наука, 1987. – 558 с.

17. Этнокультурные процессы Восточного Полесья в прошлом и настоящем / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы ; редкол.: А.Вл. Гурко [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2010. – 466 с.

**Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў**
**па вучэбнай дысцыпліне «Этналогія Беларусі»**

| № п/п | Назва тэмы | Кол-ць гадзін для СРС | Заданне | Формы выканання |
|---|---|---|---|---|
| . | | | | |
| 1 | Уводзіны | 4 | Прадмет і задачы этналогіі.<br>Метады і асноўныя праблемы этналагічных даследаванняў.<br>Віды крыніц этналогіі.<br>Класіфікацыя народаў свету (геаграфічная, антрапалагічная, моўная, гаспадарча-культурная).<br>Фарміраванне этнаграфіі як самастойнай навукі ў сярэдзіне XIX ст. | Аналіз літаратуры: складанне плана тэксту, графічнага малюнка структуры тэксту, канспектаванне тэксту, выпіскі з тэксту і г .д.; Праца з даведачнай літаратурай; азнаямленне з нарматыўнымі і прававымі дакументамі. |
| 2 | Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі | 6 | Першапачатковае назапашванне этнаграфічных звестак аб Беларусі.<br>Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст.<br>Развіццё беларускай этнаграфіі ў канцы XIX — пачатку XX ст.<br>Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў савецкі час.<br>Пачатак сістэматычнага вывучэння беларускай этнаграфіі з сярэдзіны 1950-х гг.<br>Абагульняючыя працы па этналогіі другой паловы XX ст. – пачатку XXI ст. | Аналіз літаратуры: складанне плана тэксту, графічнага малюнка структуры тэксту, канспектаванне тэксту, выпіскі з тэксту і г .д.; Праца з даведачнай літаратурай; азнаямленне з нарматыўнымі і прававымі дакументамі. . |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3. | Этнічная гісторыя Беларусі | 4 | Старажытнейшае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў эпоху старажытнакаменнага веку.<br>Перадумовы фарміравання беларускага этнасу ў раннім сярэднявеччы.<br>Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў<br>Фарміраванне беларускай нацыі. Беларуская нацыя ў 20—90-я гг. XX ст.<br>Міжэтнічныя адносіны на сучасным этапе. Ментальнасць і нацыянальны характар беларусаў. | Аналіз літаратуры: складанне плана тэксту, графічнага малюнка структуры тэксту, канспектаванне тэксту, выпіскі з тэксту і г .д.; Праца з даведачнай літаратурай; азнаямленне з нарматыўнымі і прававымі дакументамі. |
| 4 | Гаспадарка і матэрыяльная культура беларусаў | 10 | Уплыў прыродна-кліматычных і сацыяльна-эканамічных фактараў на развіццё земляробства. Прамысловыя і рамесныя заняткі.<br>Здабываючыя промыслы.<br>Традыцыйнае адзенне. | Аналіз літаратуры: складанне плана тэксту, графічнага малюнка структуры тэксту, канспектаванне тэксту, выпіскі з тэксту і г .д.; Праца з даведачнай літаратурай. |
| 5 | Беларускае народнае жыллё | 10 | Эвалюцыя жылля, яго сацыяльныя і культурна-бытавыя асаблівасці. Асноўныя функцыянальныя і архітэктурна-будаўнічыя адметнасці беларускага традыцыйнага жылля.<br>Інтэр’ер гарадскога і шляхецкага жылля. Змены ў інтэр’еры народнага жылля ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Традыцыйныя элементы ў інтэр’еры сучаснага жылля.<br>Народнае дойлідства. Звычаі і абрады.<br>Будаўнічыя звычаі, абрады, павер'і.. | Аналіз літаратуры: складанне плана тэксту, графічнага малюнка структуры тэксту, канспектаванне тэксту, выпіскі з тэксту і г .д.; Праца з даведачнай літаратурай.. |
| 6 | Беларуская кухня | 6 | Класіфікацыя страў: раслінныя і мясныя, посныя і скаромныя, паўсядзённыя, святочныя, абрадавыя. | Аналіз літаратуры: складанне плана тэксту, графічнага малюнка структуры тэксту, канспектаванне тэксту, выпіскі з тэксту і г .д.; Праца з даведачнай літаратурай. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7 | Сям'я | 8 | Формы сям'і. Асноўныя функцыі сям'і. Рэгламентацыя ўнутрысямейных адносін. Вясельная абраднасць.<br>Радзіны. Радзіныя звычаі і абрады. Пахавальна-памінальная абраднасць. Семантыка і сімволіка пахавальнай абраднасці. Этнаканфесійныя і рэлігійныя асаблівасці пахаванняў. Культ продкаў.<br>Сучасная сітуацыйная абраднасць у Беларусі. Міжэтнічныя шлюбы Германія в X – XIII вв. | Аналіз літаратуры: складанне плана тэксту, графічнага малюнка структуры тэксту, канспектаванне тэксту, выпіскі з тэксту і г .д.; Праца з даведачнай літаратурай.<br>. |
| 8 | Традыцыйная духоўная культура | 4 | Вераванні народаў Беларусі. Магічныя абрады. Гаспадарчая, лячэбная, любоўная і шкоданосная магія. Замовы.Вусная народная творчасць.<br>Беларускі народны каляндар. Анекдоты, жарты, досціпы.<br>Народная музыка. Народнае харэаграфічнае майстэрства.<br>Народны тэатр. Батлейка. | Аналіз літаратуры: складанне плана тэксту, графічнага малюнка структуры тэксту, канспектаванне тэксту, выпіскі з тэксту і г .д.; Праца з даведачнай літаратурай. |
| | **Усяго** | **52** | | |

-

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне**

Час, адведзены на самастойную работу, можа выкарыстоўвацца на: падрыхтоўку да лекцый, семінарскіх заняткаў; падрыхтоўку да залікаў і экзаменаў па вучэбнай дысцыпліне; афармленне інфармацыйных і дэманстрацыйных матэрыялаў; збіранне этнаграфічных матэрыялаў.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя метады арганізацыі кіруемай самастойнай работы: тэсціраванне; індывідуальныя практычныя заданні з кансультацыямі выкладчыка; падрыхтоўка дыдактычных матэрыялаў; падрыхтоўка кампутарных прэзентацый; рэфэраты па індывідуальных тэмах.

Кантроль кіруемай самастойнай работы ажыццяўляецца ў выглядзе: кантрольнай работы; пісьмовай работы, тэсціравання; абмеркавання рэфератаў; індывідуальных гутарак; прадстаўлення этнаграфічных матэрыялаў.

**Патрабаванні да выканання кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Этналогія Беларусі»**

| № п/п | Назва тэмы | Кол-ць гадзін для КСР | Заданне | Формы выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Традыцыйная духоўная культура** | 4л. | **Заданні, якія фарміруюць дастатковыя веды па вывучэнни вучэбнага матэрыялу на ўзроўні пазнавання:** складанне бібліяграфічнага спісу літаратуры па праблеме развіцця традыйнай духоўнай культуры беларусаў. | Праца з падручнікам, першакрыніцамі, відэазапісамі.<br>Складанне бібліяграфічнага спісу літаратуры па праблеме развіцця традыйнай духоўнай культуры беларусаў. |
| | | | **Заданні, якія фарміруюць дастатковыя веды па вывучэнни вучэбнага матэрыялу на ўзроўні ўзнаўлення: а**налітычная апрацоўка навуковай літаратуай і даведачнай літаратуры па вывучэнні накірункаў традыцыйнай, духоўнай культуры беларусаў. | Праца з навуковай літаратуай і даведачнай літаратурай.<br>Падрыхтоўка рэферата. |
| | | | **Заданні, якія фарміруюць дастатковыя веды па вывучэнни вучэбнага матэрыялу на ўзроўні ўжывання атрыманых ведаў знаний:** творчая апрацоўка матэрыялу па вывучэнні накірункаў традыцыйнай, духоўнай культуры беларусаў, састаўленне плана-канспекта аднаго з народных святаў. | Праектаванне і мадэляванне плана-канспекта народнага свята<br>для правядзення з навучэнцамі ў школе. |
| | **Усяго** | **4** | | |

## РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

### Пытанні да экзамену па этналогіі Беларусі

1. Аб’ект і прадмет этналогіі Беларусі, яе месца ў сістэме навук.
2. Метады і асноўныя праблемы этналагічных даследаванняў.
3. Віды крыніц этналогіі. Палявое этнаграфічнае даследаванне.
4. Першапачатковае назапашванне этнаграфічных звестак аб Беларусі.
5. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст.
6. Развіццё беларускай этнаграфіі ў канцы Х1Х –пачатку ХХ ст.
7. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў 1917 – пачатку 30–х г.г. ХХ ст.
8. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі щ другой палове 30–х г.г. ХХ ст.–1941 г.
9. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў 1944–1991 г.г.
10. Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў 1991–2004 г.г.
11. Этналагічныя даследаванні Беларусі на сучасным этапе (пачатак XXI ст.).
12. Беларусы: моўная і антрапалагічная характарыстыка. Рэлігійная прыналежнасць.
13. Этнагенэз і этнічная гісторыя беларусаў.
14. Этнічныя групы на Беларусі: гісторыя фарміравання, традыцыйная культура.
15. Гістарычныя формы міжэтнічных адносін на Беларусі.
16. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі. Рэгіянальныя асаблівасці матэрыяльнай культуры беларусаў.
17. Традыцыйныя заняткі беларусаў: земляробства і жывёлагадоўля.
18. Сельскагаспадарчыя заняткі беларусаў. Эвалюцыя прыладаў працы.
19. Традыцыйныя заняткі беларусаў: жывёлагадоўля.
20. Прамысловыя заняткі беларусаў.
21. Рамествы беларусаў.
22. Тыпы паселішчаў, забудова сядзібы.
23. Хата селяніна. Планіроўка і інтэр’ер беларускай хаты.
24. Гаспадарчыя і вытворчыя пабудовы ў сядзібе беларускага селяніна.
25. Традыцыйнае жаночае адзенне беларусаў.
26. Мужчынскі касцюм беларусаў.
27. Беларуская народная кулінарыя.
28. Грамадскія традыцыі беларусаў у XIX – пачатку XX ст. Каляндарная абраднасць беларусаў.
29. Зімовыя і веснавыя беларускія святы.

30. Летнія і восеньскія святы народнага календара.
31. Сям'я, яе функцыі і структура. Традыцыйныя тыпы сямейных адносін беларусаў.
32. Сям'я, сямейны побыт беларусаў у XIX – пачатку XX ст.
33. Пахавальная і памінальная абраднасць беларусаў.
34. Асаблівасці беларускага вяселля і тыпы вясельнай абраднасці.
35. Вясельная абраднасць беларусаў: давясельны этап.
36. Вясельная абраднасць беларусаў: вяселле і паслявясельны этапы.
37. Радзінная абраднасць і традыцыі беларусаў.
38. Сістэма выхавання дзяцей.
39. Беларуская народная кулінарыя.
40. Народныя вераванні беларусаў.
41. Светапогляд беларусаў, народная мараль і этыкет.
42. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: агульная характарыстыка.
43. Міфалагічныя вобразы традыцыйнай народнай рэлігіі.
44. Беларускія народныя казкі.
45. Прыказкі і прымаўкі. Ідэйны змест.
46. Тэматыка і ідэйны змест частушак.
47. Анекдоты, жарты, досціпы, загадкі.
48. Народная музыка і народныя музычныя інструменты.
49. Народная медыцына беларусаў.
50. Магічныя абрады. Замовы.
51. Народны тэатр.
52. Народныя гульні беларусаў.
53. Народная харэаграфія, танцы беларусаў.
54. Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва беларусаў.

## Кампетэнтнастна--арыентаваныя заданні.

1. Прааналізуйце працу У. Сыракомлі "Вандроўкі па маіх былых ваколіцах" як этнаграфічную крыніцу.
2. Прааналізуйце працу П.М. Шпілеўскага "Путешествие по Полесью и Белорусскому краю" як этнаграфічную крыніцу.
3. Прааналізуйце працу М.Я. Нікіфароўскага "Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности" як этнаграфічную крыніцу.
4. Прааналізуйце працу А.К. Сержпутоўскага "Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў" як этнаграфічную крыніцу.
5. Прааналізуйце працу І.А. Сербава "Белорусы-сакуны. Краткий этнографический очерк" як этнаграфічную крыніцу.
6. Прааналізуйце працу А.Е. Багдановіча "Пережитки древнего миросозерцания у белорусов" як этнаграфічную крыніцу.

7. Параўнайце народныя строі беларусаў (Калінкавіцкі і Неглюбскі строі).

8. Параўнайце народныя строі беларусаў (Турава-Мазырскі і Давыд-Гарадоцка-Тураўскі строі).

9. Параўнайце народныя строі беларусаў (Магілёўскі і Буда-Кашалёўскі строі).

10. Дакажыце, што Усходняе Палессе з’яўляецца гісторыка-этнаграфічным рэгіёнам.

11. Дакажыце, што Падняпроўе з’яўляецца гісторыка-этнаграфічным рэгіёнам.

12. Ахарактарызуйце прылады працы беларусаў, якія выкарыстоўваліся ў земляробстве і жывёлагадоўлі.

13. Ахарактарызуйце рамесныя прылады працы беларусаў.

14. Ахарактарызуйце траспартныя сродкі беларусаў.

15. Вызначыце ролю народных музычных інструментаў ў жыцці беларусаў.

16. Прааналізуйце этнаграфічныя экспазіцыі ў сучасных музеях Беларусі (Веткаўскі музей народнай творчасці).

17. Прааналізуйце этнаграфічныя экспазіцыі ў сучасных музеях Беларусі (Музей старажытнабеларускай культуры).

18. Прааналізуйце этнаграфічныя экспазіцыі ў сучасных музеях Беларусі (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту).

19. Прааналізуйце вясельны фальклор беларусаў (на прыкладзе факльклорных тэкстаў).

20. Прааналізуйце беларускія народныя загадкі, прымаўкі і прыказкі (на прыкладзе фальклорных тэкстаў).

21. Прааналізуйце каляндарна-абрадавы фальклор беларусаў (на прыкладзе фальклорных тэкстаў).

22. Абгрунтаваць ужыванне скіндачкі, наміткі, хусткі ў традыцыйным адзенні беларускіх жанчын.

## Тэсты па этналогіі Беларусі

1. Для збору палявых этнаграфічных матэрыялаў прымяняюць:

1) стацыянарны метад; 3) правільны адказ “1”;

2) экспедыцыйны метад; 4) правільны адказ “1” і “2”.

2. Доўгатэрміновае вывучэнне быта і культуры населеннага пункта -- гэта ______________________________ метад.

3. Кароткачасовае знаходжанне даследчыка у адным або некалькіх населеных пунктах -- гэта ____________________метад.

4. Назва метада, калі адводзіцца аднолькавы час на вывучэнне кожнага населенага пункта:

1) маршрутны; 3) стацыянарны;
2) куставы; 4) экспедыцыйны.

5. Назва метада, калі выдзяляюцца населеныя пункты, якія вывучаюцца больш доўгі час, чым астатнія:

1) маршрутны; 3) стацыянарны;
2) куставы; 4) экспедыцыйны.

6. Навуковая дысцыпліна, якая вывучае народы-этнасы, іх паходжанне і заканамернасці развіцця, характар жыццядзейнасці, культурныя традыцыі і міжэтнічныя ўзаемастасункі – гэта:

1) этнаграфія; 3) эпіграфіка;
2) этналогія; 4) этнапедагогіка.

7. Этнічная супольнасць людзей, якіх аб'ядноўваюць агульнае паходжанне і гістарычны лёс, адзіныя этнічная тэрыторыя, мова, самасвядомасць, ментальнасць, культура гэта -- :

1) дзяржава; 3) сям'я;
2) род; 4) этнас

8. Тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа, з якой цесна звязаны яго этнагенез, жыццёвы ўклад і гістарычны лёс, гэта -- :

1) вобласць; 3) этнічная тэрыторыя;
2)дзяржава; 4) раён

9. Суаднясіце аўтараў і іх працы.

1. А.Кіркор “Падарожжа на Палессі і беларускім краі”,
2. П.Шпілеўскі “Беларусь у характарыстычных апісаннях і
3. У.Сыракомля фантастычных яе казках”;
4. Я.Чачот “Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню”;

"Вясковыя песні";

г) "Вандроўкі па маіх былых ваколіцах".

10. Суаднясіце аўтараў і іх працы.

1. Я.Тышкевіч а) "Успаміны з Палесся, Валыні і Літвы";

2. Ю.Крашэўскі б) "Апісанне Барысаўскага павета";

3. Я.Баршчэўскі в) "Беларусь! Некалькі слоў аб паэзіі простых людзей гэтай нашай польскай правінцыі...";

4. А.Рыпінскі г) "Курганы і русалкі"

11. Суаднясіце аўтараў і іх працы.

1. П.Баброўскі а) "Беларуская Смаленшчына з суседзямі";

2. С.Максімаў б) "Гродзенская губерня";

3. І.Насовіч в) "Слоўнік беларускай мовы";

4. Ю.Крачкоўскі г) "Нарысы быту заходнерускага селяніна"

12. Суаднясіце аўтараў і іх працы.

1. А.Семянтоўскі а) "Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні";

2. П.Шэйн б) "Беларускія песні";

3. М.Нікіфароўскі в) "Беларускі зборнік";

4. Е.Раманаў г) Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў "Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку".

13. Суаднясіце аўтараў і іх працы.

1. У.Дабравольскі а) "Смаленскі этнаграфічны зборнік";

2. М.Янчук б) “Песні пінчукоў”;

3. М.Доўнар-Запольскі в) “Па Мінскай губерні”;

4. А.Багдановіч г) “Перажыткі старажытнага светапогляду ў беларусаў”.

14. Паходжанне народа, працэс яго станаўлення і фарміравання ў выніку міксацыі, асіміляцыі, інтэграцыі розных плямён і народаў – гэта:

1) дыфузія; 3) эвалюцыя;

2) этнагенез; 4) усё пералічанае.

15. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які займае басейн верхняй Прыпяці і яе прытокаў Піны і Ясельды, на захадзе ўключае правабярэжжа Заходняга Буга, -- гэта:

1) Усходняе Палессе; 3) Заходняе Палессе;

2) Цэнтральная Беларусь; 4) Паазер’е.

16. Этнаграфічная група беларускага насельніцтва, жыхары Палесся – гэта:

1) беларусцы; 3) беларусы;

2) дрыгавічы; 4) палешукі.

17. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які займае басейн Нёмана і яго прытокаў, -- гэта:

1) Цэнтральная Беларусь; 3) Панямонне;

2) Падзвінне; 4) Усходняе Палессе.

18. Невялікая група беларускага насельніцтва, якая пражывала ў балоцістым раёне басейна сярэдняй Пцічы і вярхоўях Арэсы, -- гэта:

1) беларусцы; 3) палешукі;

2) сакуны; 4) усё пералічанае.

19. Працэс змешвання прышлага насельніцтва з мясцовым (аўтахтонным) называецца:

1) эвалюцыя; 3) асіміляцыя;

2) дыфузія; 4) экзагамія.

20. Працэс міжэтнічнага ўзаемадзеяння, калі група людзей ці цэлы народ засвойвае мову і культуру іншага народа і забывае сваю, страчвае этнічную самасвядомасць, -- гэта:

1) інтэграцыя; 3) славянізацыя;

2) асіміляцыя; 4) дэмаграфія.

21. Назва аб народанасельніцтве і законамернасцях яго развіцця – гэта:

1) геаграфія; 3) этнаграфія;

2) дэмаграфія; 4) этналогія.

22. Хто з пералічаных асоб аўтар крывіцкай канцэпцыі паходжання беларусаў?

1) В. Ластоўскі; 3) Я.Галембоўскі;

2) А. Шахматаў; 4) М.Піліпенка.

23. Частка народа, што стала ці часова пражывае за межамі сваёй краіны, -- гэта:

1) рэкруты; 3) іншаземцы;

2) дыяспара; 4) ізгоі.

24. Народ цюрскай этналінгвістычнай групы:

1) яўрэі; 3) палякі;

2) татары; 4) украінцы.

25. Суаднясіце канцэпцыю паходжання беларусаў і яе аўтара:

1) фінская 1) Я.Карскі, У.Пічэта;

2) балцкая 2) І.Ласкоў;

3) крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая

3) В.Сядоў.

26. Напішыце слова, якое адсутнічае ў сказе:
Згодна з канцэпцыяй І.Ласкова, продкамі беларусаў маглі быць ________________.

27. У адпаведнасці з канцэпцыяй узнікнення беларусаў М.Піліпенка лічыў, што ў фарміраванні беларускага этнасу мелі месца як эвалюцыя, так і ________________.

28. Паводле канцэпцыі В.Сядова, сучасныя беларусы ўтварыліся ў выніку змешвання прышлых славян і мясцовага ________________насельніцтва.

29. Спосаб мыслення, склад розуму асобнага чалавека або якой-небудзь супольнасці людзей – гэта ________________________.

30. Сукупнасць уяўленняў, пачуццяў і ведаў чалавека пра сваю прыналежнасць да пэўнай нацыі, а таксама пра сваё месца і ролю ў жыцці роднага народа, -- гэта:

1) ментальнасць;
2) Нацыянальны характар;
3) нацыянальная самасвядомасць;
4) нацыяналізм.

31. Сукупнасць асноўных адносна ўстойлівых псіхалагічных якасцей, якія сфарміраваліся ў нацыі ў канкрэтных гістарычных, сацыяльна-культурных і прыродных умовах яе развіцця, -- гэта:

1) нацыянальная самасвядомасць;
2)ментальнасць;
3) нацыяналізм;
4) нацыянальны характар.

32. Назва гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Беларусі, які займае басейн Заходняй Дзвіны, на захад распасціраецца да воз. Нарач, на поўдні – па рэдказаселеных лясных масівах паўночней Лагойска і Барысава і далей па водападзеле Дзвіны і Дняпра:

1) Цэнтральная Беларусь;
2) Падняпроўе;
3) Паазер'е;
4) Заходняе Палессе.

33. Назва гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна, які займае ўсходнюю частку Беларусі – басейны верхняга Дняпра і яго прытокаў Сажа, Друці і часткова Бярэзіны:

1) Панямонне; 3) Падняпроўе;

2) Паазер'е; 4) Усходняе Палессе.

34. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён, які займае асноўную частку Мінскай і заходнюю ўскраіну Магілёўскай абласцей, называецца:

1) Падняпроўе; 3) Усходняе Палессе;

2) Цэнтральная Беларусь; 4) Панямонне.

35. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён, які займае большую частку Палескай нізіны, -- гэта:

1) Заходняе Палессе; 3) Паазер'е;

2) Усходняе Палессе; 4) Падняпроўе.

36. Тканы, вязаны або плецены выраб, прызначаны для засцілання стала, гэта -- :

1) сурветка; 3) ручнік;

2) абрус; 4) правільны адказ не існуе.

37. У тыпавым варыянце традыцыйны комплекс мужчынскага адзення складалі:

1) кашуля; 3) штаны;

2) нагавіцы; 4) галаўныя ўборы.

38. Найбольш устойлівы кампанент у традыцыйным народным касцюме – гэта:

1) кашуля; 3) абутак;

2) нагавіцы; 4) галаўныя ўборы.

39. У тыпавым варыянце традыцыйны жаночы комплекс складалі:

1) кашуля; 3) фартух;

2) спадніца; 4) безрукаўка.

40. Адна з самых старажытных форм жаночага паяснога набедранага адзення расхіннага тыпу, што насілі паверх кашулі замест спадніцы, -- гэта:

1) андарак; 3) жупан;

2) панёва; 4) сукенка.

41. Паясное (набедранае) жаночае адзенне, аналаг спадніцы, якое шылі з тонкага ўзорнага сукна ці паўсукна дамашняй вытворчасці, -- гэта:

1) фартух; 3) андарак;

2) жупан; 4) панёва.

42. Двухдонная пляскатая пасудзіна на 5-10 л для дастаўкі вады, квасу і іншых напіткаў, -- гэта:

1)куфар; 3) вадзянка;

2)біклага; 4) гладыш.

43. Рамяство, выраб драўлянага посуду з клёпак – гэта:

1) кушнярства; 3) рымарства;

2) бондарства; 4) дрэваапрацоўка.

44. Архаічная форма пчалярства – гэта:

1) бортніцтва; 3) вуллёвае пчалярства;

2) калоднае пчалярства; 4) бондарства.

45. Выязны 4-х колавы экіпаж для коннай запрэжкі, прыстасаваны для камфортнай пасажырскай язды, -- гэта:

1) вазок; 3) пралётка;

2) брычка; 4) карэта.

46. Двухколка, двухколавая павозка для язды на кароткія адлегласці – гэта:

1) вазок; 3) бяда;

2) калёсы; 4) брычка.

47. 12.Лёгкія выязныя сані – гэта:

1) вазок; 3) бяда;

2) брычка; 4) карэта.

48. Пастка для лоўлі ваўкоў – гэта:

1) каробка; 3) пятля;

2) ваўкаўня; 4) сілок.

49. Старажытная ручная прылада для прадзення нітак – гэта:

1) верацяно; 3) калаўрот;

2) кросны; 4) правільны адказ не існуе.

50. Старажытная цяглавая прылада для апрацоўкі глебы, найбольш архаічны тып бараны – гэта:

1) смык; 3) драпач;

2) вершаліна; 4) плеценая барана.

51. Ажурны ўзор, выразаны з чорнай, белай ці каляровай паперы, -- гэта:

1) выцінанка; 3) намітка;

2) арнамент; 4) пасцілка.

52. Вытворчая пабудова для памолу зерня з выкарыстаннем энергіі ветру – гэта:

1) млын ніжняга бою;
2) млын верхняга бою;
3) вятрок;
4) вальцы.

53. Частка адзення, што надавала яму функцыянальную завершанасць, адлюстроўвала пол, узрост, сямейнае і сацыяльнае становішча, стэрэатыпы і этыку паводзін у розных бытавых сітуацыях, -- гэта:

1) жупан;
2) галаўныя ўборы;
3) шыбета;
4) пояс.

54. Рамяство па вырабу скур для пашыву абутку – гэта:

1) бондарства;
2) гарбарства;
3) шавецтва;
4) рамізніцтва.

55. Мастацкі тэкстыльны выраб, звычайна з шматколерным узорам, прызначаны пераважна для ўпрыгожвання і ўцяплення жылля, -- гэта:

1) ручнік;
2) жупан;
3) дыван;
4) посцілка.

56. Сушня для збажыны, лёну, канапель, якая ўяўляла аднапавярховае зрубное памяшканне, крыху большых памераў за асець, -- гэта:

1) ёўня;
2) павець;
3) малатарня;
4) гумно.

57. Традыцыйная прылада для памолу зерня, ручны млын – гэта:

1) ступа; 3) вальцы;

2) жорны; 4) палка-абівалка.

58. Старадаўняе верхняе мужчынскае і жаночае адзенне ў палякаў, беларусаў і іншых славянскіх народаў – гэта:

1) кафтан; 3) світка;

2) жупан; 4) панёва.

59. Абутак з дрэва, які насілі вясной і восенню, -- гэта:

1) чобаты; 3) дзеравяшкі;

2) кавярзні; 4) храсні.

60. Бандарная пасудзіна для захавання цеста на хлеб – гэта:

1) біклага; 3) жбан;

2) бочка; 4) дзяжа.

61. Здабыванне гатовых дароў прыроды, у асноўным прадметаў харчавання і лекавых траў, самы старажытны занятак насельніцтва, -- гэта ___.

62. Скураныя лапці – гэта:

1) кавярзні; 3) ліпнікі;

2) пасталы; 4) храсні.

63. Выраб рэчаў утылітарнага і дэкаратыўнага характару шляхам злучэння палос эластычнага матэрыялу пад прамым ці касым вуглом называецца:

1) кавальства; 3) пляценне;

2) бондарства; 4) усё пералічанае.

64. Самае шаноўнае і сімвалічна значнае месца ў традыцыйнай хаце:

1) покуць;
3) усё пералічанае;

2) чырвоны кут;
4) правільны адказ не існуе.

65. Старажытная ворыўная прылада – гэта:

1) саха;
3) рала;

2) плуг;
4) усё пералічанае.

66. Вытворчасць прамысловых вырабаў з дапамогай традыцыйных нескладаных інструментаў – гэта:

1) рамяство;
3) усё пералічанае;

2) промысел;
4) правільны адказ “2”.

67. Прадаўгаваты кавалак тканіны абрадавага, дэкаратыўнага і ўтылітарнага прызначэння – гэта:

1) абрус;
3) ручнік;
2)посцілка;
4) пояс.

68.Невялікая скураная сумка для дробных бытавых рэчаў:

1) лубка;
3) сявалка;

2) шабета;
4) усё пералічанае.

69. Выраб (валенне) з воўны шапак, шляп, валёнак, сукна і інш.:

1) шавецтва;
3) бондарства;

2) шапавальства;
4) усё пералічанае.

70. Кафтан з даматканага сукна:

1) світа; 3) сярмяга; 5) сукмона;

2) світка; 4) латуха; 6) катанка.

71. Выраб традыцыйных транспартных сродкаў – гэта:

1) сталярства; 3) бондарства;

2) стальмашнае рамяство; 4) усё пералічанае.

72. Традыцыйная прылада для апрацоўкі зерня на крупы:

1) жорны; 3) таўкач;

2) ступа; 4) усё пералічанае.

73. Узорысты тканы, вязаны, плецены, гафтаваны ці вышывальны выраб з лёну, баваўны, шоўку і іншых матэрыялаў для аздаблення жылога інтэр'ера – гэта:

1) ручнік; 3) сурвэтка;

2) абрус; 4) посцілка.

74. Прылада для механізаванага прадзення лёну і воўны ў хатніх умовах:

1) верацяно; 3) варштат;

2) калаўрот; 4) усё пералічанае.

75. Зроблены з суцэльнага кавалка дуплістага дрэва вулей – гэта: _________________________.

76. Чатырохколавы закрыты ці паўзакрыты конны экіпаж на рысорах называецца:

1) карэта; 3) вазок;

2) брычка; 4) пралёка.

77. Выберыце назвы гаспадарчых пабудоў, якія служылі для захоўвання збожжа, прадуктаў, бытавых рэчаў, адзення:

1) клець; 3) кладоўка;

2) камора; 4) спіжарня.

78. Ткацкі стан з навітай асновай для ткання ў хатніх умовах – гэта:

1) крэсіва; 3) калаўрот;

2) кросны; 4) прасліца.

79. Народны промысел па апрацоўцы аўчын і шкур пушных звяроў называецца:

1) гарбарства; 3) бортніцтва;

2) кушнерства; 4) рымарства.

80. Прыстасаванне, з дапамогай якога лазілі на бортныя дрэвы называецца:

1) вяроўка; 3) шост;

2) лязива; 4) драбіна.

81. 46.Валеная з воўны ці пашытая з сукна дэмісезонная мужчынская шапка:

1) кучомка; 3) канфедэратка;

2) магерка; 4) брыль.

82. Сушня для збажыны, лёну, канапель – гэта:

1) асець; 3) пуня;

2. гумно; 4) хлеў.

83. Гаспадарчая пабудова для захоўвання і апрацоўкі збажыны – гэта:

1) павець; 3) свіран;

2) гумно; 4) хлеў.

84. Выберыце лакальныя назвы гаспадарчай пабудовы для захоўвання і апрацоўкі збажыны:

1) клуня; 3) ток;

2) стадола; 4) рыга.

85. У колішняй сялянскай хаце насціл з дошак, на якім спалі, -- гэта:

1) падлога; 3) ложак; ‘

2) палаці; 4) сяннік.

86. Гаспадарчая пабудова для захавання сена, саломы – гэта:

1) пуня; 3) сянніца;

2) адрыня; 4) усё пералічанае.

87. Традыцыйная гаспадарчая пабудова для ўтрымання свойскай жывёлы:

1) асець; 3) хлеў;

2) гумно; 4) свіран.

88. Сядзібная пабудова для захавання збожжа на працяглы тэрмін:

1) свіран; 3) імбар;

2) паўклець; 4) шпіхлер.

89. Комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў разам з дваром, агародам і садам, якія складаюць індывідуальную гаспадарку селяніна, -- гэта:

1) сядзіба; 3) двор;

2) сяліба; 4) усё пералічанае.

90. Святочны абрад засялення ў новы дом – гэта:

1) наваселле; 3) уваходзіны;

2) улазіны; 4) усё пералічанае.

91. Хлебны выраб, вялікі круглы бохан з пшанічнай мукі, спечаны да якой-небудзь урачыстасці:

1) пернік; 3) печыва;

2) каравай; 4) сітні хлеб.

92. Абрадавая каша з ячных, пшанічных ці грэцкіх круп, а таксама ўрачыстая вячэра, дзе гэта каша фігуруе як абавязковая абрадавая страва, -- гэта:

1) калач; 3) узвар;

2) куцця; 4) кіяхі.

93. Дзень памінання продкаў, асеннія дзяды – гэта:

1) Радаўніца; 3) Пакроў;

2) Асяніны; 4) Мікола.

94. Абрадавыя страва на радзінах – гэта:

1) каравай; 3) калач;

2) бабіна каша; 4) куцця.

95. Комплекс абрадаў і звычаеў у спалучэнні са шматлікімі фальклорнымі элементамі, якія суправаджаюць урачыстасць шлюбу і з'яўляюцца няпісаным юрыдычным актам з'яўлення новай сям'і, -- гэта:

1) сватанне; 3) суборная субота;

2) вяселле; 4) запоіны.

96. Народны памінальны абрад, рытуальная вячэра ў памяць памерлых родзічаў – гэта:

1) Дзяды; 3) Пакроў;

2) Радаўніца; 4) Вялікдзень.

97. Назва традыцыйнага земляробчага абраду, звязанага з пачаткам веснавых палявых работ, -- гэта:

1) Радаўніца; 3) Свята першай баразны;

2) заворванне; 4) масленіца.

98. Адзін з падрыхтоўчых этапаў вяселля, на якім у прысутнасці шырокага кола сваякоў канчаткова замацоўвалася згода на шлюб, -- гэта:

1) сватанне; 3) суборная субота;

2) заручаны; 4) правільны адказ не існуе.

99. Гістарычна ўсталяваны і агульнапрыняты ў пэўным грамадстве або сацыяльна-этнічнай групе спосаб паводзін:

1) этыкет; 3) абрад;

2) звычай; 4) права.

100. Цыкл сямейных звычаяў і абрадаў, звязаных з ушанаваннем памяці нябожчыка і праводзінамі яго ў апошні шлях, -- гэта:

1) памінкі; 3) пахаванне;

2) Дзяды; 4) Радаўніца.

101. Шлюб, пры якім мужчыну прымалі ў дом і ў сям’ю жонкі і цесця, калі іх двор не меў свайго сына-наследніка:

1) адыходніцтва; 3) усё пералічанае;

2) прымацтва; 4) правільны адказ не існуе.

102. Святкаванне з нагоды нараджэння дзіцяці, адзін са звычаеў радзінай абраднасці беларусаў, -- гэта:

1) радзіны; 3) хрысціны;

2) хрэсьбіны; 4) ксціны.

103. Адзін з галоўных вясельных чынаў з боку жаніха, жанаты мужчына старэйшага ўзросту:

1) бацька жаніха; 3) кум;

2) сват; 4) сусед.

104. Адзін з галоўных вясельных чынаў з боку жаніха, замужняя жанчына:

1) маці жаніха; 3) сваха;

2) суседка; 4) свацця.

105. Абрад развітання маладой са сваімі сяброўкамі, апошні вечар яе дзявоцтва напярэдні вяселля:

1) суборная субота; 3) зборная субота;

2) вяночкі; 4) усё пералічанае.

106. Першасная этнадэмаграфічная аснова, адзін з самых старажытных сацыяльных інстытутаў грамадства – гэта:

1) род; 3) сям’я;

2) племя; 4) усё пералічанае.

107. Старажытнае свята ўраджаю – гэта:

1) багач; 3) дажынкі;

2) зажынкі; 4) Купалле.

108. Звычай пачаставаць сваякоў і блізкіх суседзяў садавінай, агароднінай, хлебам, свежанінай забітай жывёлы і інш. з нагоды новага ўраджаю, удалай рыбалкі, палявання, збору мёду:

1) бонда; 3) абед;

2) застолле; 4) талака.

109. Міфічны ўладар вадаёмаў – гэта:

1) кадук; 3) русалка;

2) вадзянік; 4) дамавік.

110. Зімовае свята народнага календара, якім завяршаліся Каляды, -- гэта:

1) Водохрышча; 3) Уздвіжанне;

2) Масленіца; 4) Асяніны.

111. Паводле павер'яў, хатні дух, які ўначы трывожыць і пужае людзей у сне, -- гэта:

1) Русалка; 3) валасень;

2) нячысцік; 4) дамавік.

112. Старадаўні звычай беларусаў на першы дзень Вялікадня абходзіць двары вёскі і віншаваць гаспадароў са святам – гэта:

1) валачобніцтва; 3) талака;

2) калядаванне; 4) згон.

113. Магічныя спосабы і дзеянні, што паводле павер’я прадракаюць будучае і расказваюць пра мінулае, -- гэта:

1) магія; 3) яснабачанне;

2) варажба; 4) правільны адказ не існуе.

114. Апошняя нядзеля перад вялікаднём – гэта:

1) Радаўніца; 3) Пакроў;

2) Вербніца; 4) Піліпаўка.

115. Даўні звычай вясковых дзяўчат збірацца асеннімі і зімовымі вечарамі з работай у адной хаце – гэта:

1) вячоркі; 3) дзявочнік;

2) суборная субота; 4) усё пералічанае.

116. Сядзібны дух, які жыве ў ёўні, у печы ці на печы, -- гэта

1) ёўнік; 3) кадук;

2) дамавік; 4) нячысцік.

117. Старадаўняе народнае свята, звязанае з заканчэннем жніва, -- гэта:

1) зажынкі; 3) багач;

2) дажынкі; 4) спас.

118. Міфічны дух дома, які жыве ў хаце або ў сенцах, каморы, клеце, -- гэта:

1) нячысцік; 3) Кадук;

2) дамавік; 4) Ваўкалак.

119. Старадаўні земляробчы звычай, звязаны з пачаткам жніва, называўся ________________________.

120. Фальклорныя творы, заснаваныя на ірацыянальнай веры ў магічную сілу слоў і малітваў называюць:

1) прысушкі; 3) прыпеўкі;

2) замовы; 4) балады.

121. Дэкараваныя курыныя яйкі – гэта:

1)пісанкі; 3) крашанкі;

2) маляванкі; 4) усё пералічанае.

122. Народнае свята з масавымі гуляннямі, прымеркаваная да пэўнай даты хрысціянскага календара, -- гэта:

1) кірмаш; 3) гулянне;

2) фэст; 4) усё пералічанае.

123. Сумеснае карыстанне той ці іншай уласнасцю: сенажаццю, пашай, рабочай жывёлай, пчоламі, -- гэта:

1) бонда; 3) талака;

2) сябрына; 4) усё пералічанае.

124. Народны звычай узаемадапамогі, калектыўная дабравольная праца “за пачастунак”:

1) бонда; 3) сябрына;

2) талака; 4) усё пералічанае.

# ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________________ А.В.Макоўчык
___________________ 20__ г.
Рэгістрацыйны № УД- _______/ вуч.

## ЭТНАЛОГІЯ БЕЛАРУСІ

вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе прыкладнай вучэбнай праграмы (________________ _______20__, №__________/ .) і вучэбнага плана спецыяльнасці 6-05-0113-01 Гістарычная адукацыя (23.02.2023, № 005-2023/у)

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Дз.У.Дубінін, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

С.А.Талмачова, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

А.А.Цобкала, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі
«Гімназія № 20 г. Мінска” І.Р.Глінская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай усеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі БДПУ
(пратакол № ___ ад ___.___ 2023).
Загадчык кафедры В.А.Йоцюс

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

(пратакол № ___ ад ___. ___ 2023).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст

вучэбна-метадычнага ўпраўлення Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Засваенне зместу вучэбнай дысцыпліны «Этналогія Беларусі» забяспечвае падрыхтоўку кваліфікаванага выкладчыка гісторыі, які глыбока ведае этналогію і гісторыка-культурную спадчыну сваёй мясцовасці; этнічныя асаблівасці беларускага народа, традыцыі і ўмовы яго існавання, механізмы і заканамернасці яго функцыянавання і трансфармацыі; важнасць месца і ролі кожнага народа ў гістарычным развіцці чалавецтва.

Вучэбная дысцыпліна «Этналогія Беларусі» непасрэдным чынам звязана з методыкай выкладання гісторыі, асновамі музеязнаўства, тэорыяй і практыкай экскурсійна-краязнаўчай работы, археалогіяй Беларусі і г.д. Такім чынам, вялікае значэнне ў вывучэнні этналогіі Беларусі мае ажыццяўленне міждысцыплінарнага падыходу.

**Мэта** вучэбнай дысцыпліны «Этналогія Беларусі» – засваенне тэарэтычных асноў выкладання вучэбнага прадмета «Этналогія Беларусі», авалодванне прафесійнымі кампетэнцыямі, неабходнымі будучым настаўнікам для фарміравання фундамента этналагічных ведаў на падставе вывучэння дасягненняў сусветнай і айчыннай этналагічнай думкі, для арганізацыі самастойнай этнаграфічнай работы ва ўстанове адукацыі.

**Задачы** вучэбнай дысцыпліны:

пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі айчыннымі і замежнымі тэорыямі і даследаваннямі, даступнымі крыніцамі па этналогіі Беларусі;

вызначыць спецыфіку фарміравання і сучаснага развіцця этнічнага саставу Беларусі, самасвядомасці і стэрэатыпаў міжэтнічных адносін; суадносіны ўплыву ўнутраных і глабальных фактараў на развіццё этнічных працэсаў Беларусі;

пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі метадамі пошуку этнаграфічнай спадчыны беларусаў;

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Этналогія Беларусі» павінна забяспечыць фарміраванне наступнай спецыялізаванай кампетэнцыі (СК-4) — выкарыстоўваць археалагічны і гісторыка-краязнаўчы матэрыял, дадзеныя нумізматыкі, палеаграфіі, геральдыкі, храналогіі ў вывучэнні і выкладанні гісторыі, а таксама для вырашэння даследніцкіх задач.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць:*

- метады этналагічных даследаванняў;
- этнагенез беларусаў, іх традыцыйную, матэрыяльную і духоўную культуру і быт;
- этнічныя меньшасці Беларусі, іх традыцыйную культуру і быт.

*умець:*

- выкарыстоўваць у навукова-даследчай рабоце разнастайныя метады этналагічных даследаванняў;
- выяўляць, фіксаваць і апісваць этнаграфічныя помнікі;

*валодаць:*

- дадзенымі этналогіі Беларусі;
- метадамі этналагічных даследаванняў;
- практычнымі ўменнямі выкарыстання ведаў і практычных навыкаў у галіне этналогіі пры вывучэнні айчыннай гісторыі;

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны вучэбнам планам адводзіцца ўсяго 100 гадзін, 48 гадзіны – аўдыторныя заняткі: 20 гадзін – лекцыі, 8 гадзін – практычныя заняткі, 20 гадзін – семінарскія заняткі, экзамен у першым семестры. На кіруемую самастойную работу па вучэбнай дысцыпліне адводзіцца 4 гадзіны, з іх 4 гадзіны – лекцыі. Самастойная (пазааўдыторная) работа – 52 гадзіны. У ходзе выканання самастойнай работы студэнты вывучаюць асноўную і дадатковую літаратуру, ажыццяўляюць падрыхтоўку да практычных і семінарскіх заняткаў, экзамену.

На завочнай форме атрымання адукацыі на вывучэнне дысцыпліны вучэбнам планам адводзіцца усяго 100 гадзін, з іх 12 – аўдыторных гадзін (4 гадзіны – лекцыі, 8 гадзін – семінарскія заняткі).

Вучэбная дысцыпліна «Этналогія Беларусі» вывучаецца студэнтамі дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі ў 1 семестры на 1 курсе. Прамежкавая форма атэстацыі ведаў і кампетэнцый – экзамен.

# РАЗМЕРКАВАННЕ БЮДЖЕТА ВУЧЭБНАГА ЧАСУ

| Назва вучэбнай дысцыпліны | Семестр | Колькасць гадзін вучэбных заняткаў | | | | | | Самастойная (пазааўдыторная) работа | Форма цякучай атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | аўдыторных | З іх | | | | | |
| | | | | лекцыі | практычныя | семінаскія | самастойная кіруемая праца | | |
| Этналогія Беларусі | 1 | 100 | 48 | 16 | 8 | 20 | 4 л | 52 | экзамен |
| Усяго гадзін | 1 | 100 | 48 | 16 | 8 | 20 | 4 л | 52 | экзамен |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Уводзіны**

Прадмет і задачы этналогіі. Паняцці «быт», «культура», «этнас», «этнічная тэрыторыя». Іх адзнакі. Метады і асноўныя праблемы этналагічных даследаванняў. Этнаграфічныя веды як фактар нацыянальнай свядомасці і жыццяздольнасці беларускага народа.

Віды крыніц этналогіі. Пісьмовыя крыніцы. Летапісы. Хронікі. Запісы паслоў і падарожнікаў. Мемуары. Актавыя дакументы.

Палявыя даследаванні. Фіксацыя звестак. Палявы сшытак і дзённік. Пашпартызацыя этнаграфічных матэрыялаў. Стацыянарны і экспедыцыйны метады. Сацыялагічны метад. Выяўленчыя матэрыялы. Малюнкі. Барэльефы. Скульптура.

Архіўныя і музейныя зборы.

Выкарыстанне матэрыялаў лінгвістыкі, археалогіі, антрапалогіі, фальклору.

Масавыя крыніцы (пісьмовыя і рэчавыя). Выкарыстанне этнаграфічных ведаў у сучасным грамадстве.

Класіфікацыя народаў свету (геаграфічная, антрапалагічная, моўная, гаспадарча-культурная).

Фарміраванне этнаграфіі як самастойнай навукі ў сярэдзіне XIX ст. Эвалюцыйны кірунак. Л. Г. Морган. Дыфузіяніскі кірунак. Ф. Грэбнеў. Псіхалагічная канцэпцыя ў этнаграфіі. Рэлятывізм. Неаэвалюцыяністы.

**Тэма 2. Гісторыя этналагічнага вывучэння Беларусі**

Першапачатковае назапашванне этнаграфічных звестак аб Беларусі. Уплыў Рускага геаграфічнага таварыства на развіццё этнаграфічных даследаванняў. Этнаграфічныя працы Я. Чачота, У. Сыракомлі, З. Хадакоўскага, Я. Тышкевіча, Ю. Крашэўскага, А. Рыпінскага, Л. Галембёўскага. Іх характар.

Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст. Дзейнасць П. Шпілеўскага, П. Бяссонава, У. Насовіча. Этнаграфічныя экспедыцыі С. Максімава, П. Чубінскага. Утварэнне Паўночна-Заходняга аддзела РГТ. Збор і друкаванне этнаграфічных матэрыялаў П. Шэйнам, М. Нікіфароўскім, Е. Раманавым, У. Дабравольскім. Этнаграфічная дзейнасць М. Янчука, М. Доўнар-Запольскага, А. Багдановіча. Вывучэнне гісторыі беларускай этнаграфіі А. Цыпіным. Вывучэнне быту і традыцыйнай культуры сялян М. Федароўскім.

Развіццё беларускай этнаграфіі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Навуковая дзейнасць А. Сержпутоўскага, У. Сербава. Уклад Я. Карскага ў беларускую этнаграфію.

Этнаграфічнае вывучэнне Беларусі ў савецкі час. Стварэнне навуковых устаноў па вывучэнні народнай культуры. Беларускае вольна-эканамічнае таварыства. Беларускі народны ўніверсітэт. Навукова-тэрміналагічная камісія.

Інстытут беларускай культуры. Першыя спробы стварэння марксісцкай гістарыяграфіі беларускай этнаграфіі (1920-я — пачатак 30-х гг. XX ст.).

Распрацоўка гісторыі беларускай этнаграфіі А. Шлюбскім. Згортванне этнаграфічных даследаванняў у 1938—1940 гг. «Выкрывальніцкія» артыкулы і брашуры А. Бабровіча, І. Шпілеўскага, М. Грынблата, М. Нікольскага.

Страты этнаграфічных матэрыялаў, навуковых рукапісаў, калекцый этнаграфічных прадметаў у час вайны.

Аднаўленне навуковага цэнтра па вывучэнні беларускай этнаграфіі пасля вызвалення рэспублікі. Пачатак сістэматычнага вывучэння беларускай этнаграфіі з сярэдзіны 1950-х гг. Стварэнне Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Распрацоўка праблематыкі сучаснай беларускай этналогіі. Даследаванне этнагенезу і этнічнай гісторыі, праблем традыцыйнай гаспадаркі і матэрыяльнай культуры, грамадскага і сямейнага быту, традыцыйнай духоўнай культуры. Абагульняючыя працы па этналогіі другой паловы XX ст. – пачатку XXI ст.

**Тэма 3. Этнічная гісторыя Беларусі**

Старажытнейшае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў эпоху старажытнакаменнага веку. Змена этнічнага складу насельніцтва ў эпоху бронзы.

Перадумовы фарміравання беларускага этнасу ў раннім сярэднявеччы. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі. Асіміляцыя мясцовага даславянскага насельніцтва і фарміраванне першапачатковых усходнеславянскіх этнічных супольнасцей: дрыгавічоў, радзімічаў, крывічоў. Значэнне ўтварэння старажытных дзяржаў у фарміраванні народнасцей. Тэрыторыя сучаснай Беларусі ў агульнаўсходнеславянскі перыяд. «Палешукі» і «беларусцы». Утварэнне беларускай мовы, яе дыялекту. Фарміраванне тэрыторыі Беларусі ў познім сярэднявеччы.

Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў: велікаруская, велікапольская, старажытнаруская, крывіцкая, крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая, балцкая, фіна-угорская, эвалюцыйна-дыфузійная.

Этнічнае развіццё беларускага народа. З’яўленне на беларускіх землях пасяленняў яўрэяў, татараў, рускіх, палякаў, літоўцаў, латышоў і інш. Становішча, заняткі гэтых нацыянальных супольнасцей і іх узаемаадносіны з мясцовым беларускім насельніцтвам. Фарміраванне беларускай нацыі. Беларуская нацыя ў 20—90-я гг. XX ст. Міжэтнічныя адносіны на сучасным этапе. Ментальнасць і нацыянальны характар беларусаў. Беларуская дыяспара. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны.

**Тэма 4. Гаспадарка і матэрыяльная культура беларусаў**

Уплыў прыродна-кліматычных і сацыяльна-эканамічных фактараў на развіццё земляробства. Сістэмы земляробства. Тыпы традыцыйных ворыўных прылад. Прылады баранавання і сеяння. Асноўныя прылады для ўборкі збожжавых культур, малацьбы і веяння. Захоўванне збожжа і бульбы.

Традыцыйныя прылады апрацоўкі збожжа, ільну і каноплі. Традыцыйная ежа. З'яўленне новых прадуктаў харчавання.

Прамысловыя і рамесныя заняткі. Здабываючыя промыслы (збіральніцтва, рыбалоўства, паляўніцтва, пчалярства, лясныя і лесахімічныя промыслы) і рамёствы (ткацтва, вышыўка, кавальства, дрэваапрацоўка, ганчарства, пляценне, скураныя рамёствы і інш.). Іх роля і месца ў быце беларусаў.

Традыцыйнае адзенне. Тыпалогія адзення. Матэрыялы. Асноўныя спосабы ўпрыгожвання. Мужчынскае адзенне. Тыповы комплекс. Верхняе адзенне сялян і шляхты. Жаночае адзенне. Адметнасці жаночай вопраткі. Тыповы жаночы комплекс.

Галаўныя ўборы. Мужчынскія і жаночыя галаўныя ўборы. Тыпалагічныя асаблівасці.

Абутак. Класіфікацыя абутку паводле матэрыялу, канструкцый, сезона года, бытавой сітуацыі.

Этнічныя асаблівасці адзення. Лакальныя адрозненні.

**Тэма 5. Беларускае народнае жыллё**

Арганізацыя жылога асяродка. Функцыі жылля. Эвалюцыя жылля, яго сацыяльныя і культурна-бытавыя асаблівасці. Асноўныя функцыянальныя і архітэктурна-будаўнічыя адметнасці беларускага традыцыйнага жылля.

Сядзіба (двор) і сядзібныя пабудовы. Жылыя, падсобныя, гаспадарчыя і прамысловыя памяшканні. Жыллёва-бытавы комплекс. Функцыі і канструкцыйныя асаблівасці кожнай з пабудоў; геаграфія распаўсюджвання, рэгіянальныя і сацыяльныя рысы. Размяшчэнне, тыпы сядзібнай забудовы (тыпы двара): замкнуты (вяночны, круглы), двухрадны, трохрадны, крыты, пагонны, г-падобны, рассеяны (свабодны, з незвязанымі пабудовамі). Забудовы. Сацыяльныя і рэгіянальныя асаблівасці сядзібнай забудовы.

Інтэр'ер жылля. Інтэр'ер як унутраная прастора, функцыянальна і эстэтычна арганізаваная.

Інтэр'ер курнай хаты (да 60-х гг. XIX ст.). Структурныя часткі: курная печ, верхнік (душнік, дымнік); спальны пол, палаці, полаг; падлога і столя; лавы, грады; красны кут (покуць), бажніца, стол, зэдаль; "бабін кут", гаспадарчы ўслон, кухонная паліца. Традыцыйная мэбля, посуд і бытавыя рэчы. Асвятленне хаты: лучнікі, светач, каганец. Агонь у светаўяўленнях, звычаях, абрадах. "Жаніцьба коміна".

Інтэр'ер гарадскога і шляхецкага жылля. Змены ў інтэр'еры народнага жылля ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Традыцыйныя элементы ў інтэр'еры сучаснага жылля.

Народнае дойлідства. Звычаі і абрады.

Драўлянае дойлідства – адно з самых распаўсюджаных і прыярытэтных рамёстваў у Беларусі. Асноўныя інструменты. Будаўнічыя канструкцыі: каркасная (слупавая) і зрубная. Фундамент (штандары, палі, падмурак, прызба). Дахі, іх форма і канструкцыя: зрубная (закотам і стажковая), каркасная (на

сохах і krokвах). Пакрыццё стрэх. Дэкор у народным дойлідстве. Культавыя пабудовы – увасабленне лепшых традыцый народнага дойлідства.

Будаўнічыя звычаі, абрады, павер'і.

**Тэма 6. Беларуская кухня**

Класіфікацыя страў: раслінныя і мясныя, посныя і скаромныя, паўсядзённыя, святочныя, абрадавыя.

Хлеб у традыцыйна-бытавой культуры беларусаў. Віды і сарты хлеба. Хлебныя вырабы: ляпні, перапечкі, сачні, варэнікі і пампушкі, праснакі, каржы, пернікі, крэндзелі, абаранкі, хрусты. Абрадавыя печывы. Бліны і аладкі. Мучныя стравы. Аўсяныя мучныя стравы. Крупяныя стравы.

Бульба і гародніна. Малако і малочныя прадукты. Мясная ежа. Рыба і рыбныя стравы. Піцво. Класіфікацыя напіткаў.

З’яўленне новых прадуктаў харчавання.

**Тэма 7. Сям’я**

